ЦЭНТРАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

ІНФАРМАЦЫЙНА-БІБЛІЯГРАФІЧНЫ АДДЗЕЛ

# *“ІХ ІМЁНАМІ НАЗВАНЫ ВУЛІЦЫ МІНСКА”*

## ФАКТАГРАФІЧНАЯ БАЗА ДАНЫХ

Фактаграфічная база даных “ІХ ІМЁНАМІ НАЗВАНЫ ВУЛІЦЫ МІНСКА” адлюстроўвае кароткія біяграфічныя звесткі аб вядомых дзеячах, імёны якіх носяць вуліцы г.Мінска. Матэрыял размешчаны ў алфавіце раёнаў г. Мінска, унутры раёна ў алфавіце персаналій, дан імянны паказальнік.

# РАЁНЫ ГОРАДА МІНСКА


**ЗАВОДСКІ РАЁН**
**КАСТРЫЧНІЦКІ РАЁН**
**ЛЕНІНСКІ РАЁН**
**МАСКОЎСКІ РАЁН**
**ПАРТЫЗАНСКІ РАЁН**
**ПЕРШАМАЙСКІ РАЁН**
**САВЕЦКІ РАЁН**
**ФРУНЗЕНСКІ РАЁН**
**ЦЭНТРАЛЬНЫ РАЁН**


## Імянны паказальнік


Авакян Газарас Авецісавіч – вул. у Кастрычніцкім раёне
Адзінцоў Лявонцій Яфімавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Адоеўскі Аляксандр Іванавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Азгур Заір Ісакавіч – вул.у Партызанскім раёне
Азізаў Дамуло – вул. у Цэнтральным раёне
Акрэсцін Барыс Сямёнавіч – вул. у Маскоўскім раёне
Аладава Алена Васілеўна – вул. у Фрунзенскім раёне
Аладаў Мікалай Ільіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Алешаў Мікалай Мікалаевіч – вул. у Савецкім раёне
Алібегаў Іван Якаўлевіч – вул. у Маскоўскім раёне
Альшэўскі Мікалай Міхайлавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Амельянюк Уладзімір Сцяпанавіч – вул. у Заводскім раёне
Анаеў Араз – вул. у Партызанскім раёне
Антонаў Аляксей Інакенцьевіч – вул. у Цэнтральным раёне
Асаналіеў Джумаш – вул. у Кастрычніцкім раёне
Багдановіч Максім Адамавіч – вул. у Савецкім раёне
Бакунін Міхаіл Аляксандравіч – вул. у Цэнтральным раёне
Барамзіна Таццяна Мікалаеўна – вул. у Кастрычніцкім раёне
Бельскі Іосіф Аляксандравіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Берут Балясклаў – вул. у Фрунзенскім раёне
Бірузоў Сяргей Сямёнавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Броўка Пятрусь – вул. у Першамайскім раёне
Брыкет Фелікс Антонавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Брыль Янка – вул. у Маскоўскім раёне
Буйло Канстанцыя Антонаўна – вул. у Маскоўскім раёне
Бумажкоў Ціхан Піменавіч – вул. у Партызанскім раёне
Бурдзейны Аляксей Сямёнавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Бяда Леанід Ігнатавіч – вул. у Савецкім раёне
Бядуля Змітрок – вул. у Партызанскім раёне
Бялецкі Яўген Міхайлавіч – вул. у Маскоўскім раёне
Бялінскі Вісарыён Рыгоравіч – вул. у Першамайскім раёне
Бяляеў Якаў Дзмітрыевіч – вул. у Першамайскім раёне

Вадалажскі Васіль Аляксандравіч – вул. у Першамайскім раёне
Валадарскі В. – вул. у Ленінскім і Маскоўскім раёне
Ванееў Уладзімір Рыгоравіч – вул. у Ленінскім і Партызанскім раёнах
Ванькові Валенцій Мельхіёравіч – вул. у Партызанскім раёне
Варанянскі Васіль Трафімавіч – вул. у Кастрычніцкім раёне
Варвашэня Іван Дзянісавіч – вул. у Заводскім раёне
Ватуцін Мікалай Фёдаравіч – вул. у Першамайскім раёне
Ваўпшасаў Станіслаў Аляксеевіч - вул. у Заводскім і Партызанскім раёнах
Верашчагін Васіль Васілевіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Веснін Мікалай Дзмітрыевіч - вул. у Заводскім раёне
Волах Анатоль Аляксандравіч – вул. у Маскоўскім раёне
Вышалескі Сяргей Мікалаевіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Гай Гая Дзмітрыевіч – вул. у Цэнтральным раёне
Гало Захар Захаравіч – вул. у Савецкім раёне
Галубок Уладзіслаў Іосіфавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Гамарнік Ян Барысавіч – вул. у Савецкім раёне
Гаравец Аляксандр Канстанцінавіч – вул. у Ленінскім раёне
Гарбатаў Аляксандр Васілевіч – вул. у Першамайскім раёне
Гарун Алесь – вул. у Фрунзенскім раёне
Гарэцкі Максім Іванавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Гастэла Мікалай Францавіч – вул. у Цэнтральным раёне
Гашкевіч Іосіф Антонавіч – вул. у Ленінскім раёне
Гвішіяні Дзімтрый Барысавіч – вул. у Першамайскім раёне
Гебелеў Міхаіл (Міхель) Лейбавіч – вул. у Маскоўскім раёне
Герасіменка Назар Яўстратавіч - вул. у Заводскім раёне
Герцэн Аляксандр Іванавіч – вул. у Цэнтральным раёне
Гікала Міхаіл Фёдаравіч – вул. у Савецкім раёне
Гінтаўт Вітольд Міхайлавіч – вул. у Першамайскім раёне
Глаголеў Васіль Васільевіч – вул. у Маскоўскім раёне
Глебка Пятро (Пётр Фёдаравіч) – вул. у Фрунзенскім раёне
Грыбаедаў Аляксандр Сяргеевіч – вул. у Цэнтральным раёне
Грызадубава Валянціна Сцяпанаўна – вул. у Кастрычніцкім раёне
Гурскі Ілья Данілавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Гусоўскі Мікола – вул. у Фрунзенскім раёне
Гурт`еў Левонцій Мікалаевіч – вул. у Першамайскім раёне
Даватар Леў Міхайлавіч – вул. у Цэнтральным раёне
Дарашэвіч Міхаіл Васілевіч – вул. у Савецкім раёне
Дастаеўскі Фёдар Міхайлавіч – вул. у Савецкім раёне
Даўман Анс Эрнеставіч – вул. у Цэнтральным раёне
Дзімітроў Георгі Міхайлаў – вул. у Цэнтральным раёне
Драздовіч Язэп Нарцызавіч – вул. у Ленінскім раёне
Дрозд Мікалай Пракопавіч – вул. у Маскоўскім раёне
Дунін-Марцінкевіч Вінцэнт (Вікенцій Іванавіч) – вул. у Фрунзенскім раёне
Ефрасіння Полацкая– вул. у Фрунзенскім раёне
Жудро Васіль Сцяпанавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Жукаў Георгій Канстанцінавіч – пр. у Маскоўскім раёне

Жыновіч Іосіф Іосіфавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Жэбрак Антон Раманавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Заборскі Георгій Уладзіміравіч – вул. у Цэнтральным раёне
Заслонаў Канстанцін Сяргеевіч – вул. у Першамайскім раёне
Захараў Іван Антонавіч – вул. у Партызанскім раёне
Зубачоў Іван Мікалаевіч – вул. у Кастрычніцкім раёне
Ігнатоўскі Усевалад Макаравіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Іскалієў Сундуткалі – вул. у Заводскім раёне
Кабушкін Іван Канстанцінавіч – вул. у Заводскім раёне
Кавалёў Іван Кірылавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Каганец Карусь – вул. у Ленінскім раёне
Казей Марат Іванавіч – вул. у Кастрычніцкім раёне
Казінец Ісай Паўлавіч – вул. у Кастрычніцкім раёне
Казлоў Васіль Іванавіч – вул. у Савецкім і Партызанскім раёнах
Калеснік Уладзімір Рыгоравіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Калеснікаў Пімен Рыгоравіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Кальцоў Аляксей Васілевіч – вул. у Савецкім раёне
Караленка Уладзімір Галакціёнавіч – вул. у Першамайскім раёне
Карастаянава Лілія Аляксандраўна – вул. у Цэнтральным раёне
Караткевіч Дзмітрый Андрэевіч – вул. у Кастрычніцкім раёне
Карват Уладзімір Мікалаевіч – вул. у Партызанскім раёне
Карбышаў Дзмітрый Міхайлавіч – вул. у Першамайскім раёне
Каржанеўскі Мікалай Канстанцінавіч – вул. у Кастрычніцкім раёне
Карыцкі Сяргей Дзям’янавіч – вул. у Заводскім раёне
Касмадзям`янская Зоя Анатольеўна – вул. у Першамайскім раёне
Кашавой Алег Васільевіч – вул. у Партызанскім раёне
Кедышка Мікалай Аляксандравіч – вул. у Першамайскім раёне
Кіжаватаў Андрэй Мітрафанавіч – вул. у Кастрычніцкім раёне
Кірыла і Мяфодзій – вул. у Цэнтральным раёне
Кісялёў Ціхан Якаўлевіч – вул. у Цэнтральным раёне
Клумаў Яўген Уладзіміравіч – вул. у Партызанскім раёне
Колас Якуб – вул. у Першамайскім і Савецкім раёнах
Корж Васіль Захаравіч – вул. у Маскоўскім раёне
Корш-Саблін Уладзімір Уладзіміравіч – вул. у Савецкім раёне
Крамской Іван Мікалаевіч – вул. у Савецкім раёне
Крапоткін Пётр Аляксеевіч – вул. у Савецкім раёне
Крыловіч Уладзімір Мікалаевіч – вул. у Савецкім раёне
Куйбышаў Валяр'ян Уладзіміравіч – вул. у Савецкім раёне
Кульман Хелена Андрэеўна – вул. у Савецкім раёне
Купала Янка – вул. у Партызанскім раёне
Купрыянаў Пётр Іванавіч – вул. у Маскоўскім раёне
Купрэвіч Васіль Феафілавіч – вул. у Першамайскім раёне
Лабанок Уладзімір Елісеевіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Ламаносаў Міхаіл Васілевіч – вул. у Савецкім раёне
Ленін Уладзімір Ільіч – вул. у Цэнтральным раёне
Лермантаў Міхаіл Юр`евіч – вул. у Маскоўскім раёне

Лук`яновіч Трыфан Андрэевіч – вул. у Савецкім раёне
Лучына Янка – вул. у Ленінскім раёне
Лынькоў Міхась (Міхась Ціханавіч) – вул. у Фрунзенскім раёне
Ляўкоў Анатоль Максімавіч – вул. у Кастрычніцкім раёне
Ляшчынскі Адам Браніслававіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Мазураў Кірыла Трафімавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Макаёнак Андрэй Ягоравіч – вул. у Першамайскім раёне
Малінін Міхаіл Сяргеевіч – вул. у Ленінскім раёне
Марат (Magat) Жан Поль – вул. у Ленінскім раёне
Масквін Іван Міхайлавіч – вул. у Цэнтральным раёне
Матросаў Аляксандр Мацвеевіч – вул. у Маскоўскім раёне
Матусевіч Іван Іванавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Маўр Янка (Фёдараў Іван Міхайлавіч) – вул. у Фрунзенскім раёне
Мачульскі Раман Навумавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Машэраў Пётр Міронавіч – пр. у Цэнтральным раёне
Маякоўскі Уладзімір Уладзіміравіч – вул. у Ленінскім раёне
Мележ Іван Паўлавіч – вул. у Савецкім раёне
Мельнікайтэ Марытэ Юазасаўна – вул. у Цэнтральным раёне
Мікуліч Уладзімір Андрэевіч – вул. у Цэнтральным раёне
Мірашнічэнка Пётр Апанасавіч – вул.у Савецкім раёне
Міхайлаў Барыс Аляксандравіч – вул. у Савецкім раёне
Мулявін Уладзімір Георгіевіч – вул. у Савецкім раёне
Нахімаў Павел Сцяпанавіч – вул. у Ленінскім раёне
Несцераў Іван Фірсавіч – вул. у Заводскім раёне
Нікіцін Іван Савіч – вул.у Савецкім раёне
Нікіфараў Вячаслаў Кандратавіч – вул. у Першамайскім раёне
Някрасаў Мікалай Аляксеевіч – вул. у Савецкім раёне
Орда Напалеон – вул. у Маскоўскім раёне
Панамароў Пётр Ціханавіч – вул. у Першамайскім раёне
Панамарэнка Панцеляймон Кандратавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Панчанка Пімен Емяльянавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Панфілаў Іван Васілевіч – вул. у Цэнтральным раёне
Пархоменка Аляксандр Якаўлевіч – вул. у Цэнтральным раёне
Паўлаў Іван Пятровіч – вул.у Цэнтральным раёне
Паўлоўскі Фёдар Іларыёнавіч – вул. у Заводскім раёне
Пашкевіч Алаіза Сцяпанаўна (псеўданім Цётка) – вул. у Цэнтральным раёне
Платонаў Барыс Віктаравіч – вул. у Першамайскім раёне
Пляханаў Георгій Валянцінавіч – вул. у Ленінскім раёне
Прытыцкі Сяргей Восіпавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Пугачоў Емяльян Іванавіч – вул. у Савецкім раёне
Пуцілаў Мацвей Мяфодзьевіч – вул. у Першамайскім раёне
Пушкін Аляксандр Сяргеевіч – пр. у Фрунзенскім раёне
Ракасоўскі Канстанцін Канстанцінавіч – пр. у Ленінскім раёне
Рафіеў Наджафкулі – вул. у Маскоўскім раёне
Ротмістраў Павел Аляксеевіч – вул. у Заводскім раёне
Русіянаў Іван Мікітавіч – вул. у Першамайскім раёне

Рыбалка Павел Сямёнавіч – вул. у Ленінскім раёне
Рылееў Кандрат Фёдаравіч – вул. у Цэнтральным раёне
Рэпін Ілья Яфімавіч – вул. у Цэнтральным раёне
Свярдлоў Якаў Міхайлавіч – вул. у Ленінскім, Кастрычніцкім, Маскоўскім
Серафімовіч Аляксандр Серафімовіч – вул. у Ленінскім раёне
Сапега Леў Іванавіч – вул. у Маскоўскім раёне
Скарына Францыск – вул. у Першамайскім раёне
Скрыганаў Вікенцій Васілевіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Скрыпнікаў Леанід Антонавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Слуцкая Вера Кліменцьеўна – вул. у Савецкім раёне
Смалячкоў Феадосій Арцемьевіч – вул. у Савецкім раёне
Смірноў Юрый Васілевіч – вул. у Маскоўскім раёне
Собінаў Леанід Віталевіч – вул. у Савецкім раёне
Солтыс Іон Сідаравіч - вул. у Заводскім і Партызанскім раёнах
Станіслаўскі Канстанцін Сяргеевіч – вул. у Ленінскім раёне
Стасаў Уладзімір Васілевіч – вул. у Маскоўскім раёне
Судмаліс Імант Янавіч – вул. у Партызанскім раёне
Сурганаў Фёдар Анісімавіч – вул. у Савецкім і Першамайскім раёнах
Сцебенеў Фёдар Аляксандравіч – вул. у Кастрычніцкім раёне
Сыракомля Уладзіслаў – вул. у Ленінскім раёне
Сямёнаў Георгій Мінавіч – вул. у Ленінскім раёне
Талаш Васіль Ісакавіч – вул. у Маскоўскім раёне
Талбухін Фёдар Іванавіч – вул. у Першамайскім раёне
Тургенеў Іван Сяргеевіч – вул. у Савецкім раёне
Украінка Леся – вул. у Цэнтральным раёне
Фамін Яўхім Майсеевіч - вул. у Кастрычніцкім раёне
Фёдараў Фёдар Іванавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Фогель Ян Янавіч – вул. у Першамайскім раёне
Фролікаў Дзмітрый Георгіевіч – вул. у Партызанскім раёне
Фучык Юліўс – вул. у Заводскім і Першамайскім раёнах
Халтурын Сцяпан Мікалаевіч – вул. у Савецкім раёне
Харужая Вера Захараўна – вул. у Савецкім раёне
Хмялеўскі Канстанцін Іосіфавіч – вул. у Маскоўскім раёне
Хмяльніцкі Багдан (Зіновій) Міхайлавіч – вул. у Савецкім раёне
Ціміразеў Клімент Аркадзевіч – вул. у Цэнтральным і Фрунзенскім раёнах
Цімашэнка Сямен Канстанцінавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Чабатароў Васіль Міхайлавіч – вул. у Партызанскім раёне
Чайкіна Елізавета Іванаўна – вул. у Заводскім раёне
Чарвякоў Аляксандр Рыгоравіч – вул. у Цэнтральным раёне
Чарнышэўскі Мікалай Гаўрылавіч – вул. у Першамайскім раёне
Чарняхоўскі Іван Данілавіч – вул. у Першамайскім раёне
Чачот Ян Антоні – вул. у Маскоўскім раёне
Чыгладзе Сярго Гедэванавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Чыжэўская Алена Антонаўна – вул. у Ленінскім раёне
Чыжэўская Марыя Паўлаўна – вул. у Ленінскім раёне
Чычэрын Георгій Васілевіч – вул. у Цэнтральным раёне

Чэкалін Аляксандр Паўлавіч – вул. у Заводскім раёне
Чэхаў Антон Паўлавіч – вул. у Цэнтральным раёне
Шаблоўскі Уладзімір Васілевіч – вул. у Кастрычніцкім раёне
Шамякін Іван Пятровіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Шаранговіч Васіль Фаміч – вул. у Фрунзенскім раёне
Шаўчэнка Тарас Рыгоравіч – бульвар у Цэнтральным раёне
Шацько Вікенцій Данілавіч – вул. у Маскоўскім раёне
Шпілеўскі Павел Міхайлавіч – вул. у Ленінскім раёне
Шугаеў Мікалай Аляксандравіч – вул. у Першамайскім раёне
Шчарбакоў Аляксандр Сяргеевіч – вул. у Ленінскім і Партызанскім раёнах
Шчэпкін Міхаіл Сямёнавіч – вул. у Савецкім раёне
Шырма Рыгор Раманавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Энгельс Фрыдрых – вул. у Цэнтральным раёне
Якубаў Гулям – вул. у Ленінскім раёне
Якубоўскі Іван Ігнатавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Янкоўскі Фёдар Міхайлавіч – вул. у Фрунзенскім раёне
Ярмак Уладзімір Іванавіч – вул. у Цэнтральным раёне
Ясенін Сяргей Аляксандравіч – вул. у Маскоўскім раёне

(на пачатак)

## Заводскі раён

(імёны)

### Амельянюк Уладзімір Сцяпанавіч (1917-1942)

**Амельянюк Уладзімір Сцяпанавіч** нарадзіўся ў 1917 у г. Дно Пскоўскай вобл., Расія.

Напярэдадні вайны студэнт Ін-та журналістыкі імя Кірава ў Мінску. З жн. 1941 ў складзе Камароўскай падпольнай групы г. Мінска. З мая 1942 член Мінскага падпольнага гаркома КП(б)Б, заг. аддзела агітацыі і прапаганды, рэдактар падпольных выданняў, 1-га нумара падпольнай газеты "Звязда". Загінуў пры выкананні баявога задання. Герой Савецкага Саюза (1965).

У Мінску яго імем названа **вуліца** (1964) у Заводскім раёне, на доме, дзе ў гады вайны жыла сям'я, устаноўлена мемарыяльная дошка, у пас. Самахвалавічы, дзе вучыўся ў школе, устаноўлены помнік.

**Літаратура:**

Амельянюк Уладзімір Сцяпанавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 1. - Мн., 1996. - С. 311.

Амельянюк Уладзімір Сцяпанавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 1. - Мн., 1993. - С. 115.

Амельянюк Уладзімір Сцяпанавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 37.

Омельянюк Владимир Степанович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 460-461.

Омельянюк Владимир Степанович // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1980. - С. 272.

Омельянюк Владимир Степанович // Герои Советского Союза: Краткий биогр. слов.: В 2 т. – Т. 1. - М., 1988.- С. 198.

Омельянюк Владимир Степанович // Говорят погибшие герои. – Т. 2. - М., 1975. - С. 234-240.

Рождение "Звязды" [В. Омельянюк] // Савицкая Я.И. Бойцы подпольного фронта. - Мн., 1982. - С. 92-120.

Сияй, "Звязда" [В. Омельянюк] // Петраченко Д. Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 105-111.

Мядзведзева, В. Рэдактар аднаго нумара; Вуліца Амельянюка / Вольга Мядзведзева // Звязда. - 2010. - 30 студз. - С. 4.

Будай Г. Мужны журналіст-падпольшчык [У. Амельянюк] // Помнікі гісторыі і культуры. - 1987. - № 1. - С. 34-40.

(імёны)

## Варвашэня Іван Дзянісавіч (1904-1957)

**Варвашэня Іван Дзянісавіч** нарадзіўся 31.12.1904 у в. Быстрыца Капыльскага р-на Мінскай вобл.

Партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР, адзін з кіраўнікоў парт. падполля і партыз. руху на тэрыторыі Мінскай вобл. у Вялікую Айчынную вайну. Скончыў Маскоўскі ін-т інжынераў чыгуначнага транспарту (1934). У 1939-1941 сакратар па транспарце Мінскага абкома КП(б)Б. У Вялікую Айчынную вайну з ліп. 1941 да мая 1943 сакратар Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б, адначасова са жн. 1942 да крас. 1943 сакратар Слуцкага падпольнага міжрайкома КП(б)Б. З 1944 сакратар Мінскага абкома, з 1950 1-ы сакратар Мінскага гаркома КП(б)Б. Член ЦК КПБ у 1952-1956. Дэпутат Вярх. Савета БССР у 1947-1957.

**Вуліца**, якая знаходзіцца у Заводскім раёне Мінска, атрымала імя І.Д.Варвашэні ў 2005 (былая вул. Енісейская), на доме № 1 па пр.Машэрава знаходзіцца мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Варвашэня Іван Дзянісавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 4. - Мн., 1997. - С. 8.

Варвашэня Іван Дзянісавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 4. - Мн., 1994. - С. 222.

Варвашэня Іван Дзянісавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 115.

Казлова В. Скрыжаванні лёсу // Наша Перамога. - Мн., 2004. - С. 97-99.

Чернушевич А. Улица имени... // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 7.

(імёны)

## Ваўпшасаў Станіслаў Аляксеевіч (1899-1976)

Гл. Партызанскі раён.

(імёны)

## Веснін Мікалай Дзмітрыевіч (1922-1944)

**Веснін Мікалай Дзмітрыевіч** нарадзіўся ў 1922 у в. Арлоўка Канстанцінаўскага р-на Амурскай вобл., Расія.

Працаваў у калгасе. У Чырв. Арміі з 1941. Удзельнік Вял. Айчын. вайны з ліп. 1941. Вылучыўся пры фарсіраванні Зах. Дзвіны ў Віцебскай вобл. 25.06.1944 ён адным з першых пад моцным агнём праціўніка пераплыў на левы бераг ракі, захапіў схаваныя гітлераўцамі лодкі і пераправіў іх для савецкіх байцоў. У гэты ж дзень у цяжкім баі на плацдарме загінуў.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 22.07.1944 пасмяротна. У Мінску яго імем названа **вуліца** ў Заводскім раёне (1964), усталявана мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Веснин Николай Дмитриевич // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1980 .- С. 105-106.

Веснин Николай Дмитриевич // Герои Советского Союза: Краткий биогр. слов.:В 2 т. – Т. 1. - М., 1987.- С. 260.

Веснин Николай Дмитриевич // Навечно в сердце народном. - Мн., 1984. - С. 92.

(імёны)

## Герасіменка Назар Яўстратавіч (1903-1942)

**Герасіменка Назар Яўстратавіч** нарадзіўся ў 1903 на чыгуначнай станцыі Пціч Мазырскага р-на Гомельскай вобл.

Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага партыйнага падполля. З 1929 працаваў у Мінску. З першых дзён ням.-фашысц. акупацыі стварыў і ўзначаліў падпольны райком КП(б)Б г. Мінска. Яго кватэра была явачнай, дзе збіраліся падпольшчыкі, прымаліся сувязныя партызанскіх атрадаў, захоўвалася зброя, боепрыпасы, медыкаменты, нелегальная літаратура.У падпольнай рабоце ўдзельнічалі жонка Таццяна, 12-гадовая дачка Люся. У кастр. 1942 гітлераўцы арыштавалі ўсю сям'ю і пасля катаванняў знішчылі яе.

У Мінску імем Герасіменка названа **вуліца** ў Заводскім раёне (1977). Ёсць мемарыяльная дошка, на тэрыторыі СШ № 25 – бюст дачки Люсі.

**Літаратура:**


Герасіменка Назар Яўстратавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 5. - Мн., 1997. - С. 170.

Герасіменка Назар Яўстратавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 2. - Мн., 1994. - С. 514.

Герасименко Назар Евстратович // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 160.

Герасименко Назар Евстратович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 139.

С верой в победу [Г.Н. Герасименко ] // Савицкая Я.М. Бойцы подпольного фронта. - Мн., 1982. - С. 79-82, 112-114.

Красноперка А. Баба сеяла горох...[Семья Герасименко] // Пионеры-герои. - Мн., 1968. - С. 36-38.


(імёны)

## Іскаліеў Сундуткалі
## (1924-1944)

**Іскаліеў Сундуткалі** нарадзіўся ў 1924 ў в. Канстанцінаўка Заходне-Казахстанскай вобл., Казахстан.

На фронце з ліпеня 1942. Аўтаматчык стралковай роты радавы Іскаліеў вызначыўся пры вызваленні Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл. У ноч на 24.06.1944 у баі каля в. Лудчыцы адзін з першых уварваўся ў траншэі праціўніка. У крытычны момант бою сваім целам закрыў амбразуру варожага дзота. Герой Савецкага Саюза (1945). Увекавечаны ў Мемарыяле воінскай славы на Лудчыцкай вышыні.

У Заводскім раёне Мінска ў 1976 яго імем названа **вуліца**.

**Літаратура:**


Іскаліеў Сундуткалі // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 7. - Мн., 1998. - С. 330.

Іскаліеў Сундуткалі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 3. - Мн., 1996. - С. 505.

Іскаліеў Сундуткалі // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 229.

Искалиев Сундуткали //Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 246.

Искалиев Сундуткали // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 180-181.

Петраченко П. Герою было двадцать [С. Искалиев] // Побратимы Матросова. - Мн., 1984. - С. 26-30.


(імёны)

## Кабушкін Іван Канстанцінавіч
## (1915-1943)

**Кабушкін Іван Канстанцінавіч** нарадзіўся 15.02.1915 у в. Малахоўцы Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл.

У Чырв. Арміі з 1935, удзельнік сав.-фінл. вайны 1939-1940. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны трапіў у акружэнне, прыйшоў у Мінск, дзе ўключыўся ў антыфашысцкую барацьбу. Выконваў разведвальныя і дыверсійныя аперацыі. З мая 1942 кіраўнік

аператыўнай групы Мінскага падпольнага гаркома КП(б)Б па барацьбе з варожымі агентамі і правакатарамі. 4.02.1943 схоплены гітлераўцамі пры выкананні баявога задання і закатаваны.

Яго імем названа **вуліца** ў Заводскім раёне Мінска (1964), у пас. Мірны Баранавіцкага р-на пастаўлены помнік.

**Літаратура:**


Кабушкін Іван Канстанцінавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 3. - Мн., 1993. - С. 514.

Кабушкин Иван Константинович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 246.

Кабушкин Иван Константинович // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1980. - С. 166.

Кабушкин Иван Константинович // Герои Советского Союза: Краткий биогр. слов.:В 2 т. – Т. 1. - Мн., 1987. - С. 599.

Кабушкин Иван Константинович // Навечно в сердце народном. - Мн., 1984. - С. 201.

Неуловимый "Жан" // Петраченко Д. Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 112-115.


(імёны)

## Карыцкі Сяргей Дзям’янавіч
## (1913-1944)

**Карыцкі Сяргей Дзям’янавіч** нарадзіўся 05.11.1913 у в. Мудроўка Мінскага р-на у сям’і селяніна.

Скончыў Варонежскі заатэхнічны інстытут, з 1938 працаваў ст. заатэхнікам саўгаса ў Смаленскай вобл. У Чырв. Арміі з 1939 Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з чэрв. 1941. Удзельнік вызвалення Луцка, Бродаў, Пярэмышля. Камандзір кавалерыйскага эскадрона, ст. лейтэнант С.Д. Карыцкі вызначыўся пры выхадзе на Чэхаславацкую граніцу 19-20 вер. 1944, калі яго эскадрон захапіў 2 варожыя батарэі, 7 аўтамашын, знішчыў шмат гітлераўцаў. У гэтым баю Карыцкі загінуў.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена пасмяротна 10.04.1945. У Мінску яго імем названа ў 1962 **вуліца** (Заводскі раён), усталявана мемар. дошка.

**Літаратура:**


Карыцкі Сяргей Дзям'янавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 8. - Мн., 1996. - С. 117.

Карыцкі Сяргей Дзям'янавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 257-258.

Корицкий Сергей Демьянович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 260.

Корицкий Сергей Демьянович // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 185.

Корицкий Сергей Демьянович // Герои Советского Союза: Краткий биогр. слов.:В 2 т. – Т. 1. - М., 1987. - С. 628.

Корицкий Сергей Демьянович // Навечно в сердце народном. - Мн., 1984.- С. 216.


(імёны)

## Несцераў Іван Фірсавіч
## (1904-1989)

**Несцераў Іван Фірсавіч** нарадзіўся 7.07.1904 у в. Таўкачы Шклоўскага р-на Магілёўскай вобл.

У 1924 на радзіме арганізаваў камсамольскую ячэйку і кіраваў ёю. З 1942 ваяваў на Сталінградскім, 2-м і 3-м Укр. франтах. Намеснік камандзіра батальёна па палітчасцы капітан І.Ф. Несцераў вызначыўся пры фарсіраванні Дуная ў Венгрыі. 4.12.1944 на чале роты ўварваўся на прыстань, рота ў рукапашным баі знішчыла каля 100 гітлераўцаў, адбіла 4 контратакі, што пасадзейнічала пераправе батальёна. Пасля вайны да 1962 на савецкай і партыйнай рабоце.

**Вуліца** атрымала імя Несцерава ў 1978 (Заводскі раён).

**Літаратура:**


Несцераў Іван Фірсавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 11. - Мн., 2000. - С. 298.

Несцераў Іван Фірсавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 5. - Мн., 1999. - С. 321.

Несцераў Іван Фірсавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 382.

(імёны)

## Паўлоўскі Фёдар Іларыёнавіч
## (1908-1989)

**Паўлоўскі Фёдар Іларыёнавіч** нарадзіўся 27.11.1908 у г.п. Міхайлаўка Запарожскай вобл. на Украіне ў сялянскай сям'і.

Скончыў палкав. школу ў 1932, курсы савецкага будаўніцтва ў 1939, курсы палітсаставу ў 1940. З 1940 у Чырв. Арміі. Удзельнік баёў на узв. Хасан 1938, сав.-фін. вайны 1939-1940. У Вял. Айчын. вайну на пач. ліп.1941 стварыў разам з Ц.П. Бумажковым і ўзначаліў партыз. атрад у Акцябрск. р-не Палескай вобл., са студз. 1942 камандзір Палескага партыз. злучэння, з мая 1942. камандзір 123-й Акцябр. Партыз. Брыгады. Званне Героя Сав. Саюза прысвоена ў ліку першых партызан. Пасля вайны на савецкай і гаспадарчай рабоце. Памёр у 1989.

Імем Паўлоўскага названа **вуліца** ў былым пас. Сосны (у 2004 увайшоў у межы Заводскага раёна Мінска).

**Літаратура:**

Паўлоўскі Фёдар Іларыёнавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 12. - Мн., 2001. - С. 209.

Паўлоўскі Фёдар Іларыёнавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 5. - Мн., 1999. - С. 440.

Павловский Фёдор Илларионович // Великая Отечественная война 1941-1945: Энцикл. - М., 1985. - С. 524.

Паўлоўскі Фёдар Іларыёнавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 490.

Павловский Фёдор Илларионович // Герои Советского Союза: Краткий биогр. слов.: В 2 т. – Т. 2. - М., 1988.- С. 224.

Павловский Фёдор Илларионович // Навечно в сердце народном. - Мн., 1984. - С. 398.

Партизанское объединение Полесской области: [Ф. Павловский ] // Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941- июль 1944). - Мн., 1983. - С. 624-636.

(імёны)

## Ротмістраў Павел Аляксеевіч
## (1901-1982)

**Ротмістраў Павел Аляксеевіч** нарадзіўся 6.7.1901 у в. Скаварова Селіжараўскага р-на Цвярской вобл., Расія.

У Чырвон. Арміі з 1919, удзельнік грамадз. 1918-1920, сав.-фін. 1939-1940 войнаў. Скончыў Ваен. Акадэмію імя Фрунзе ў 1931, акад. Генштаба ў 1953. У Вялікую Айчынную вайну знаходзіўся на Зах., Паўн.-Зах., Калінінскім, Сталінгр., Варонеж, Сцяпным, 2-м Украінскім, 3-м Беларускім франтах. Пад час Беларускай аперацыі (1944) 5-я танк. армія на чале з П.А. Ротмістравым удзельнічала ў вызваленні Барысава, Мінска. Пасля вайны на камандных пасадах у арміі, на выкладчыцкай рабоце, доктар ваенных навук (1956), прафесар (1958). Галоўны маршал бранятанкавых войск (1962). З 1964 у Міністэрстве абароны СССР, Герой Савецкага Саюза (1965). Аўтар кніг "Час і танкі", "Танкі на вайне". Памёр 6.4.1982.

У мікрараёне Шабаны (Заводскі раён) яго імем названа **вуліца**.

**Літаратура:**

Ротмістраў Павел Аляксеевіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 13. - Мн., 2001. - С. 411-412.

Ротмістраў Павел Аляксеевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 6. – Кн. 1. - Мн., 2001. - С. 122.

Ротмистров Павел Алексеевич // Великая Отечественная война. 1941-1945: Энцикл. - М., 1985. - С. 622.

Ротмістраў Павел Аляксеевіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 537.

Ротмистров Павел Алексеевич // Герои Советского Союза: Краткий биогр. слов.: В 2 т. – Т. 2. - М., 1988. - С.374.

Ротмистров Павел // Командиры Второй Мировой войны. - Мн., 1988. - С. 516-530.

Ротмистров Павел Алексеевич // Навечно в сердце народном. - Мн., 1984. - С. 442-443.

Астраханский В. Круг чтения прославленного военначальника // Библиотека. - 2002. - № 5. - С. 11-14.

(імёны)

## Солтыс Іон Сідаравіч
## (1923-1945)

Гл. Партызанскі раён.

## Фучык Юліўс
## (1903-1942)

**Фучык Юліўс** нарадзіўся 23.02.1903 у Празе, Чэхія.

Скончыў Карлаў ун-т у Празе (1923), у 1928-1938 – рэдактар часопіса “Творчасць”. Як вынік паездкі ў СССР (1930, 1934-1936), напісаў кнігу рэпартажаў “У краіне, дзе заўтра ўжо азначае ўчора”. Аўтар шматлікіх артыкулаў, нарысаў, памфлетаў. У Другую сусв. вайну з 1940 у антыфаш. падполлі. У 1942 арыштаваны гестапа, пакараны смерцю ў турме Плетцэнзе. Нататкі, зробленыя ў турме, склалі кнігу “Рэпартаж з пятлёй на шыі” (выд. 1945 ). Нацыянальны герой Чэхаславакіі.

У Мінску яго імем названа ў 1963 **вуліца** Заводскага раёна.

**Літаратура:**

Фучык Юліус // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 6. - Мн., 2003. - С. 509.

Фучик Юлиус // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 641.

Фучик Юлиус // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1980. - С. 383.

(імёны)

## Чайкіна Елізавета Іванаўна
## (1918-1941)

**Чайкіна Елізавета Іванаўна** нарадзіўся 28.08.1918 у в. Руна Пяноўскага р-на Калінінскай вобл. у сялянскай сям’і.

Працавала ў калгасе. З 1933 загадвала хатай-чытальняй. З 1939 сакратар Пяноўскага райкома УЛКСМ. У перыяд фашысцк. акупацыі сакратар падпольн. Пянаўскага РК УЛКСМ. У ліст. 1941 па даносу здрадніка была схоплена гітлераўцамі і пасля катаванняў растраляна. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 06.03.1942 пасмяротна.

У Мінску яе імем названа ў 1948 **вуліца** Заводскага раёна, у 1950 усталявана мемар. дошка, устаноўлены помнік (скульптар А. Бембель).

**Літаратура:**

Чайкина Елизавета Ивановна // Великая Отечественная война 1941-1945: Энцикл. - Мн., 1985. - С. 778.

Чайкина Елизавета Ивановна // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1980. - С. 394.

Чайкина Елизавета Ивановна // Герои Советского Союза: Краткий биогр. слов.: В 2 т. – Т. 2. - М., 1988. - С. 708.

Чайкина Елизавета Ивановна // Жучкевич В. А. Улицы помнят. - Мн., 1979. - С. 79.Чайка [Е.Чайкина ] // Петраченко Д. Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 193-196.

(імёны)

## Чэкалін Аляксандр Паўлавіч
## (1925-1941)

**Чэкалін Аляксандр Паўлавіч** нарадзіўся 25.03.1925 у в. Пяскавацкае Суvoраўскага р-на Тульскай вобл., Расія.

З 1938 жыў у г. Ліхвін (зараз г. Чэкалін). Скончыў 9 класаў. З набліжэннем лініі фронту ўступіў у знішчальны батальён, а пасля акупацыі горада ў партызанскі атрад “Перадавы”. Удзельнічаў у баях, хадзіў у разведку, быў радыстам. У пачатку ліст. 1941 быў захоплены фашыстамі і пасля катаванняў павешаны. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 4.02.1942 пасмяротна.

У Мінску яго імем названы **вуліца і завулак** Заводскага раёна (1961), усталявана мемар. дошка.

**Літаратура:**

Чекалин Александр Павлович // Великая Отечественная война 1941-1945: Энцикл. - М., 1985. - С. 778.

Чекалин Александр Павлович // Их именами названы: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 660.

Чекалин Александр Павлович // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1980. - С. 396.

Чекалин Александр Павлович // Герои Советского Союза: Краткий биогр. слов.: В 2 т. – Т. 2. - М., 1988. - С. 712.

Вставай на смертный бой! [А. Чекалин] // Петраченко Д. Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 197-199.

(на пачатак)

# Кастрычніцкі раён

(імёны)

## Авакян Газарос Авяцісавіч
## (1918–1945)

**Авакян Газарос Авяцісавіч** нарадзіўся ў 1918 в. Чаўдар Дашкесанскага р-на, Азербайджан.

Скончыў Азербайджанскі сельскагаспадарчы інстытут (1939), пяхотнае вучылішча (1941). У гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнік баёў пад Ельней, абароны Беларусі, Польшчы. Вызначыўся 6.07.1994 пры ліквідацыі варожай групоўкі ў Чэрвеньскім р-не Мінскай вобл. Загінуў у баях за вызваленне Польшчы. Герой Савецкага Саюза (1945).

**Вуліца** ў Кастрычніцкім раёне Мінска атрымала імя Г.А. Авакяна ў 1976, мемарыяльная дошка была ўстаноўлена ў 1977.

**Літаратура:**

Авакян Газарос Аветисович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн.,1987. - С. 237.

Авакян Газарос Аветисович // Минск: Энцикл. Справочник. - Мн., 1983. - С.70.

Авакян Газарос Аветисович // Навечно в сердце народном. - Мн., 1984. - С.6-7.

(імёны)

## Асаналіеў Джумаш
## (1923-1944)

**Асаналіеў Джумаш** нарадзіўся 10.05.1923 ў с. Атуз-Уул Ак-Суйскага р-на Ісык-Кульскай вобл., Кыргыстан.

Удзельнік вызвалення Беларусі ў Вялікаю Айчыннаю вайну. Наводчык кулямёта яфрэйтар Дж. Асаналіеў 24.06.1944 адзін з першых пераправіўся праз Заходнюю Дзвіну каля в. Лабейкі ў Шумілінскім р-не. Калі загінуў разлік кулямёта, адзін адбіваў атакі ворага; акружаны фашыстамі, апошняй гранатай падарваў іх і загінуў сам. Герой Савецкага Саюза (1944).

**Вуліца** ў Кастрычніцкім раёне Мінска атрымала імя Д. Асаналіева ў 1976, на адным з дамоў знаходзіцца мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Асаналіеў Джумаш // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 2. – Мн., 1996. – С.20.

Асаналіеў Джумаш // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. давед. - Мн., 1990. - С. 43.

Асаналиев Джумаш // Навечно в сердце народном. - Мн., 1984. - С. 32.

Архипов, И. Подвиг, застывший в бронзе / Иван Архипов // Рэспубліка. - 2010. - 26 студз. - С. 4.

Чернушевич А. Улица имени... [Джумаш Асаналиев] // Минский курьер. - 2004. -2 июля. - С. 3.

(імёны)

## Барамзіна Таццяна Мікалаеўна
## (1919 – 1944)

**Барамзіна Таццяна Мікалаеўна** нарадзілася 19.12.1919 г. у г. Глазаў, Расія.

Скончыла педагагічнае вучылішча. Работала настаўніцай. З 1940 вучылася ў Пермскім педагагічным інстытуце, работала выхавальніцай ў дзіцячым садзе. Скончыла школу медсястёр. У Савецкай Арміі з чэрвеня 1943. Скончыла Цэнтральную жаночую школу снайпераў у 1944.

У баях Вялікай Айчыннай вайны з красавіка 1944. Тэлефаністка батальона 252-га стралковага палка (70-я дывізія, 33 армія, 3-ці Беларускі фронт) яфрэйтар Барамзіна у баю 5.7.1944 у вёскі Пекалін (Смалявічскі раён Мінскай вобласці) знічтожыла са снайперскай вінтоўкі 20 гітлераўцаў, аказвала дапамогу параненым. Захвачана ў палон і расстраляна. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.3.1945 пасмяротна. Пахавана у вёскі Каліта Смалевічскага раёна Мінскай вобласці.

У Мінску яе імя носіць **вуліца**.

**Літаратура:**

Барамзина Татьяна Николаевна // Герои Советского Союза: краткий биографический словарь: в 2 т. – Т. 1. - М., 1987.- С. 117.

Барамзина / подготовили Наталья Яцкевич, Дмитрий Исайчук // Минский курьер. - 2008. - 23 окт. - С. 8.

(імёны)

## Варанянскі Васіль Трафімавіч
## (1901-1943)

**Варанянскі Васіль Трафімавіч** нарадзіўся 25.08.1901 у г.п. Дзіканька Палтаўскай вобл., Украіна.

У Чырвонай Арміі з 1919. Удзельнік грамадзянскай вайны, баёў у р-не возера Хасан (1938). У верасні 1941 арганізаваў і ўзначаліў партызанскую групу. З верасня 1942 камандзір партызанскай брыгады "Народныя мсціўцы" ў Мінскай вобл. Брыгадзе прысвоена імя В.Т. Варанянскага пасля яго гібелі (верасень 1943). Узнагароджаны ордэнам Леніна.

**Вуліца** ў Кастрычніцкім раёне Мінска атрымала імя В. Варанянскага ў 1967, на адным з дамоў знаходзіцца мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Варанянскі Васіль Трафімавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 115.

Ни минуты без борьбы... [Василий Трофимович Воронянский] // Петраченко Д.Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 184-188.

Чернушевич А. Улица имени... [Василий Трофимович Воронянский] // Минский курьер. - 2004. - 2 июля. - С. 3.

## Грызадубава Валянціна Сцяпанаўна
## (1910-1993)

**Грызадубава Валянціна Сцяпанаўна** нарадзілася 31.1.1910 г. у г. Харкаве, Украіна.

Савецкая лётчыца, Герой Савецкага Саюза (1938), Герой Сацыялістычнай Працы (1986), палкоўнік (1943).Скончыла Пензенскі аэраклуб (1929) , Тульскую авіяцыйную школу (1933). У Савецай Арміі з 1936 г. У 1938 разам з П.Дз. Асіпенка, М.М. Расковай здзейсніла беспасадачны пералёт Масква — Дальні Усход.

У Вялікую Айчынную вайну на фронце з чэрвеня 1941, у 1942 — 1944 камандзір 101-га авіяцыйнага палка далёкага дзеяння, самалёты якога дастаўлялі войскам боепрыпасы, лёталі ў тыл ворага да беларускіх партызан, удзельнічалі ў Беларускай аперацыі 1944. Зрабіла каля 200 баявых вылетаў. З 1946 у грамадзянскай авіяцыі.

Імем В.С. Грызадубавай названа **вуліца** ў Кастрычніцкім раёне г. Мінска (2010).

**Літаратура:**

Грызадубава Валянціна Сцяпанаўна // Беларуская энцыклапедыя: ў 18 т. Т. 5. – Мінск, 1997. – С. 478.

Гризодубова Валентина Степановна // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 6 т.]. Т. 3. – Минск, 2006. – С. 212.

Гризодубова Валентина Степановна // Герои Советского Союза : краткий биографический словарь: в 2 т. – Т. 1. – Москва, 1987. – С. 374.

Пахолкин, О. Торговая? Нет Зыбицкая / Олег Пахолкин // Минский курьер. – 2009. – 26 нояб. – С. 2.

Калашников, Б. Драма "Родины"/ Борис Калашников // Знание-сила. – 2008. – № 10. – С. 92-99.

(імёны)

## Зубачоў Іван Мікалаевіч (1898-1944)

**Зубачоў Іван Мікалаевіч** нарадзіўся 28.02.1898 у в. Падлесная Слабада Лухавіцкага р-на Маскоўскай вобл., Расія.

Адзін з кіраўнікоў абароны Брэсцкай крэпасці ў Вялікую айчынную вайну. У Чырвонай Арміі з 1918. Удзельнік грамадзянскай, савецка-фінляндскай 1939-1940 войнаў. Нам. камандзіра 44 стралковага палка капітан І.М. Зубачоў 24.06.1941 узначаліў зводную групу абаронцаў цэнтральнай часткі Брэсцкай крэпасці – Цытадэлі. Цяжка паранены і кантужаны трапіў у палон, загінуў у лагеры для ваеннапалонных. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені.

**Вуліца** ў Кастрычніцкім раёне Мінска атрымала імя І.М. Зубачова ў 1964.

**Літаратура:**

Зубачоў Іван Мікалаевіч // Беларусь у Вяликай Айчыннай вайне, 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 223.

Зубачёв Иван Николаевич // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн.,1987. - С. 237.

Зубачёв Иван Николаевич // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 178.

(імёны)

## Казей Марат Іванавіч (1929-1942)

Казей Марат Іванавіч нарадзіўся 10.10.1929 у в. Станькава Дзяржынскага р-на Мінскай вобл.

У Вялікую Айчынную вайну з лістапада 1942 у партызанскім атрадзе “25 год Кастрычніка”, са жніўня 1943 разведчык штаба 200-й партызанскай брыгады імя К.К. Ракасоўскага Мінскай вобл. У снежні 1943 здабыў ваенныя карты і планы камандавання праціўніка. 11.05.1944 пры выкананні баявога задання каля в. Хароміцкія Уздзенскага р-на быў акружаны карнікамі. Адстрэльваўся да апошняга патрона, потым гранатай падарваў сябе і гітлераўцаў, якія наблізіліся да яго. Пахаваны на радзіме, дзе ў 1987 створаны мемарыял. Герой Савецкага Саюза (1965).

**Вуліца** ў Кастрычніцкім раёне Мінска атрымала імя М.Казея ў 1964, у Мінску яму пастаўлены помнік (1959) і 2 бюсты.

**Літаратура:**

Казей Марат Іванавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 7. - Мн., 1998. - С.426.

Казей Марат Іванавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 4. – Мн., 1997. – С.8.

Казей Марат Іванавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 233.

Казей Марат (Марат Иванович) // Их именами названы: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 247 - 248.

Казей Марат Иванович // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 182.

Марат Казей // Минский курьер. – 2005. - 7 мая. - С.4.

Винник А. "Добрый день, Марат!" // Нар. газ. – 2004. - 9 кастр. - С.4.

(імёны)

## Казінец Ісай Паўлавіч (1910-1942)

**Казінец Ісай Паўлавіч** нарадзіўся ў 1910 у г. Батумі.

Напярэдадні вайны працаваў у Беластоку. У пачатку акупацыі Мінска арганізаваў і ўзначаліў падпольную групу ў Кастрычніцкім р-не горада. Уваходзіў у Мінскі падпольны гарком КП(б)Б, адказваў за сувязь з падпольшчыкамі гета, кіраваў адпраўкай партызанам папаўнення, зброі, медыкаментаў. Адзін з арганізатараў падпольнай друкарні, дзе выдаваў лістоўкі, падпольны лісток “Вестник Родины”. 27.03.1942 арыштаваны і пасля катаванняў павешаны. На месцы пакарання смерцю ў Цэнтральным скверы – мемарыяльны знак. Герой Савецкага Саюза (1965).

**Вуліца** ў Кастрычніцкім раёне Мінска яго імем названы плошча, вуліца (1964) і 2 завулкі. На доме па вул.Казінца, 1 знаходзіцца мемарыяльная дошка (1967).

**Літаратура:**

Казінец Ісай Паўлавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 7. - Мн., 1998. - С.426.

Казінец Ісай Паўлавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 4. – Мн., 1997. – С.10.

Казінец Ісай Паўлавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 233.

Казинец Исай Павлович // Их именами названы: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 247 - 248.

Казинец Исай Павлович // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 182.

Свердлов Ф.Д. Казинец Исай Павлович // В строю отважных. - М., 1992. - С. 125-126.

Казинец Исай Павлович // Навечно в сердце народном. - Мн., 1984. - С. 206.

Исай Казинец // Минский курьер. - 2005. - 7 мая. - С.5.

Чернушевич А. Улица имени... // Минский курьер. - 2004. - 2 июля. - С.12.

(імёны)

## Караткевіч Дзмітрый Андрэевіч (1904-1943)

**Караткевіч Дзмітрый Андрэевіч** нарадзіўся 16.10.1904 у в. Дроздава Талачынскага р-на Віцебскай вобл.

Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага патрыятычнага падполля. Скончыў Рэспубліканскую школу прапагандыстаў пры ЦК КП(б)Б. З 1926 на савецкай і прафсаюзнай рабоце ў Талачынскім р-не, у органах міліцыі. З 1937 1-ы сакратар Заслаўскага РК КП(б)Б. У 1938-1940 член ЦК КП(б)Б. З першых дзён акупацыі Мінска кіраваў стварэннем падпольных партыйных груп. З мая 1942 член Мінскага падпольнага гаркома КП(б)Б, узначальваў разведвальную работу. У кастрычніку 1942 арыштаваны і закатаваны гітлераўцамі. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені.

**Вуліца** ў Кастрычніцкім раёне Мінска атрымала імя Д. Караткевіча ў 1964, на адным з дамоў знаходзіцца мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Караткевіч Дзмітрый Андрэевіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 8. - Мн., 1998. - С.57.

Караткевіч Дзмітрый Андрэевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 4. – Мн., 1997. – С.111.

Караткевіч Дзмітрый Андрэевіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 251.

Денисова С. Совсем другой Короткевич / Светлана Денисова // Женский журнал. - 2011. - № 2. - С. 42.

(імёны)

## Каржанеўскі Мікалай Канстанцінавіч
## (1904-1943)

**Каржанеўскі Мікалай Канстанцінавіч** нарадзіўся ў 1904 у Мінску.

Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага патрыятычнага падполля ў Вялікую Айчынную вайну. Перад вайной пракурор Баранавіцкай вобл. З першых дзён нямецка-фашысцкай акупацыі Мінска ўключыўся ў падпольную барацьбу. У жніўне 1941 стварыў падпольныя групы на пладова-агароднінных базах. З верасня 1942 сакратар Кастрычніцкага падпольнага райкома КП(б)Б Мінска, удзельнічаў у распаўсюджванні падпольнай газеты "Звязда". 2.10.1942 схоплены гітлераўцамі і пасля спалены ў Трасцянецкім лагеры смерці.

**Вуліца** ў Кастрычніцкім раёне Мінска атрымала імя М. Каржанеўскага у 1971, на доме № 6 знаходзіцца мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Каржанеўскі Мікалай Канстанцінавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 8. - Мн., 1997. - С.70.

Каржанеўскі Мікалай Канстанцінавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 251.

До последнего дыхания... [Николай Константинович Корженевский] // Петраченко Д.Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 120-123.

Чернушевич А. Улица имени... [Николай Корженевский] // Минский курьер. - 2004. - 2 июля. - С. 12.

(імёны)

## Кіжаватаў Андрэй Мітрафанавіч
## (1907-1941)

**Кіжаватаў Андрэй Мітрафанавіч** нарадзіўся 22.08.1907 у с. Кіжаватава Бяссонаўскага р-на Пензенскай вобл.

Удзельнік абарончых баёў на Беларусі у Вялікую Айчынную вайну. У Чырв. Арміі з 1929. Адлічыўся пры абароне Брэсцкай крэпасці. Пад яго камандаваннем воіны 9-й пагранзаставы прынялі першы бой з ням.-фаш. захопнікамі, адбілі 6 атак, двойчы пераходзілі ў контратакі. Лейтэнант А.М. Кіжаватаў кіраваў участкам абароны каля Цярэспальскіх варот, быў некалькі разоў паранены. Загінуў у баі, прыкрываючы групу прарыву. Імя Кіжаватава прысвоена пагранічнай заставе, дзе ўстаноўлены яго бюст. Герой Савецкага Саюза (1965).

**Вуліца** ў Кастрычніцкім раёне Мінска атрымала імя А. Кіжаватава ў 1979, на доме № 36 знаходзіцца мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Кіжаватаў Андрэй Мітрафанавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 8. - Мн., 1997. - С.70.

Кіжаватаў Андрэй Мітрафанавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990.- С. 262.

Командир 9-й заставы лейтенант А.М. Кижеватов // Долготович Б.Д. Беларусь в годы Великой Отечественной войны. - Мн., 1994. - С. 15-16.

Пограничники: [О лейтенанте А.М. Кижеватове] // Смирнов С.С. Брестская крепость. - Мн., 1991. - С. 211-212.

Кижеватов Андрей Митрофанович // Навечно в сердце народном. - Мн., 1984. - С. 223.

Андрей Кижеватов // Минский курьер. - 2005. - 7 мая. - С.11.

Чернушевич А. Улица имени... [Андрей Митрофанович Кижеватов] // Минский курьер. - 2004. - 2 июля. - С. 12.

(імёны)

## Ляўкоў Анатоль Максімавіч (1922-1943)

**Ляўкоў Анатоль Максімавіч** нарадзіўся ў 1922 у Мінску.

Удзельнік Мінскага патрыятычнага падполля. Узначальваў камсамольска-маладзёжную групу ў Кастрычніцкім раёне. Члены групы выводзілі ваеннапалонных у партыз. атрады, рабілі дыверсіі ў раёне чыгуначнага вузла, здабывалі і перадавалі партызанам зброю і боепрыпасы. Асабіста ўдзельнічаў у арганізацыі ўзрыву нафтабазы ў Чырвоным Урочышчы, 2 цыстэрнаў з гаручым і 2 платформ на ст. Мінск. Пры арышце цяжка паранены. Загінуў у фаш. засценках. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

**Вуліца** ў Кастрычніцкім раёне Мінска атрымала імя А. Ляўкова ў 1974, на доме № 52 знаходзіцца мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Левков Анатолий Максимович // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990.- С. 313.

Левков Анатолий Максимович // Их именами названы: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 354-355.

Юность мужает в борьбе: [Анатолий Левков] // Петраченко Д.Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 148-151.

Анатолий Левков // Минский курьер. - 2005. - 7 мая. - С.9.

(імёны)

## Свярдлоў Якаў Міхайлавіч (1885 – 1919)

Гл. Ленінскій раён.

(імёны)

## Сцебенеў Фёдар Аляксандравіч (1899-1971)

**Сцебенеў Фёдар Аляксандравіч** нарадзіўся 21.09.1899 у в. Падсосенне Верхаважскага р-на Валагодскай вобл.

У Чырв. Арміі з 1919. Удзельнік грамадз. вайны. У 1921 скончыў Сімферопальскія камандныя пяхотныя курсы, у 1943 - курсы “Выстрэл”. Удзельнік вызваленчага пахода Чырв. Арміі у Зах. Беларусь 1939. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1941 – палкоўнік, камандзір палка. Вызначыўся ў Беларускай аперацыі. 27.06.1944 полк на чале з Ф.А. Сцебеневым захапіў чыгуначную станцыю Орша. Удзельнічаў у вызваленні Барысава і Мінска, фарсіраваў Нёман каля Гродна, захапіў і ўтрымліваў плацдарм да падыходу падмацавання. Герой Савецкага Саюза (1945). У 1946 звольнены ў запас. Жыў і працаваў у Маскве. Памёр 8.02.1971.

**Вуліца і завулак** ў Кастрычніцкім раёне Мінска названы яго імем 1973.

**Літаратура:**

Сцебенеў Фёдар Аляксандравіч // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя: У 12 т. - Т.10. - Мн., 1976. - С. 144.

Стебенев Фёдор Александрович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 574.

Стебенев Фёдор Александрович // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 383.

(імёны)

## Фамін Яўхім Майсеевіч
## (1909-1941)

**Фамін Яўхім Майсеевіч** нарадзіўся 15.01.1909 у в. Калышкі Лёзненскага р-на Віцебская вобл.

Скончыў Пскоўскую акруговую партшколу (1929). З 1932 у Чырв. Арміі. Удзельнік паходу Чырв. Арміі ў Заходнюю Украіну восенню 1939. З крас. 1941 палкавы камісар у Брэскай крэпасці. 22.06.1941 арганізаваў і кіраваў абаронай каля Холмскіх варот цытадэлі, з 24 чэрв. – нам.камандзіра зводнай баявой групы абаронцаў крэпасці. Цяжка паранены трапіў у палон, расстраляны фашыстамі каля Холмскіх варот.

У Кастрычніцкім раёне Мінска яго імем названа **вуліца** (1964).

**Літаратура:**

Фамін Яўхім Майсеевіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т.16. - Мн., 2003. - С. 314.

Фамін Яўхім Майсеевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 6. Кн. 2. - Мн., 2003. - С. 25.

Фомин Ефим Моисеевич // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 419.

(імёны)

## Шаблоўскі Уладзімір Васілевіч
## (1908-1941)

**Шаблоўскі Уладзімір Васілевіч** нарадзіўся 15.07.1908 у в. Запалянне Слаўгарадскага р-на Магілёўскай вобл.

З 1930 у Чырвонай Арміі, з 1940 камандзір батальёна 125 стралковага палка, раскватараванага ў Брэсцкай крэпасці. З 22.06.1941 капітан У.В. Шаблоўскі ўзначаліў абарону Кобрынскага ўмацавання. 24.061941 паранены трапў у палон, загінуў пры спробе ўцячы. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені.

**Вуліца** Кастрычніцкага раёна Мінска носіць яго імя з 1964.

**Літаратура:**

Шаблоўскі Уладзімір Васілевіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т.17. - Мн., 2003. - С. 354.

Чернушевич А. Улица имени... // Минский курьер. - 2004. - 2 июля. - С. 29.

(на пачатак)

# Ленінскі раён

(імёны)

## Валадарскі В.
## (1891 – 1918)

**Валадарскі В**. (партыйны псеўданім Гальдштэйна Майсея Маркавіча) нарадзіўся 1891г. у м Астропаль Валынскай губерніі.

Удзельнік барацьбы за Савецкую ўладу ў Петраградзе. З рамеснікаў. Член Камуністычнай п жніўня 1917. Далучаўся да Бунда. З 1905 да 1917 меншавік. У 1913 эмігрыраваў у Амерыку. З Петраградзе, далучаўся да «міжраёнцаў». Член Петраградскага камітэта РСДРП(б). Прад Петраградскага ВРК на 2-м з'ездзе армій Заходнега фронту [7-12(20—25).11.1917] у Мінску. Быў ка па справах друку, агітацыі і прапаганды, адначасова рэдактарам «Красной газеты» ў Петраградз Прэзідыума ВЦВК. Забіты эсэрам.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (1922).

**Літаратура:**

Валадарскі В. // Беларуская савецкая энцыклапедыя. Т. 2. – Мінск, 1970. – С. 565.

Бейдер, В. Х. Ретроспектива : [документальная повесть о В. Володарском] / В.Х Бе Ленинград : Лениздат, 1989. –334с. – (История в биографиях).

(імёны)

## Ванееў Уладзімір Рыгоравіч
## (1896-1941)

Гл. Партызанскі раён.

(імёны)

## Гаравец Аляксандр Канстанцінавіч
## (1915-1943)

**Гаравец Аляксандр Канстанцінавіч** нарадзіўся 27.02.1915 . у в. Машканы Сенненскага павета Магілёўскай вобл.

Чл. КПСС з 1939. У Чырв. Арміі з 1932. Скончыў Віцебскі аэраклуб, Ульянаўскую лётную школу (1935).З чэрв. 1942 на Паўн.-Каўказскім, Варонежскім франтах. Зрабіў 74 баявыя вылеты, удзельнічаў у 11 паветр. баях, знішчыў 11 самалётаў ворага, 40 аўтамашын, 24 павозкі з боепрыпасамі. Намеснік камандзіра эскадрыллі авіяпалка знішчальнікаў. На Курскай дузе ўступіў у бой з 20 варожымі бамбардзіроўшчыкамі. Збіў 9 варожых самалётаў, урэзаўся ў строй ворага. Гаравец – адзіны ў свеце лётчык, які ў адным паветр. баі збіў столькі самалётаў ворага. Загінуў у гэтым баі. Герой Савецкага Саюза (1943).

**Вуліца** ў Ленінскім раёне г. Мінска атрымала імя А. Гараўца ў 1975 , на доме № 26 устаноўлена мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Верамейчык В. Аляксандр Гаравец // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя: У 12 т. – Т. 3. - Мн., 1971. - С. 344-345.

Гаравец А.К. // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 152.

Горовец А.К. // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 158.

Горовец А.К. // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 124-125.

Кононович, Е. Подвиг в облаках / Евгений Кононович // Народная газета. - 2010. - 5-11 авг. - С. V. -( Союзное Вече).

Крушинская, Л. Полет в бессмертие / Людмила Крушинская // Сов. Белоруссия (Беларусь сегодня). - 2010. - 8 мая. - С. 12.

Иоффе Э. Герой среди героев // Нар. газ. – 2005. - 12 сак. - С. 2.

Крэпак, Б. «Только он не вернулся из боя…» // Культура. – 2005. – 5 – 13 мая. – С.22 – 23.

(імёны)

## Гашкевіч Іосіф Антонавіч
## (1815 – 1875)

**Гашкевіч Іосіф Антонавіч**, дыпламат, вучоны-мовазнавец, даследчык Далёкага Усходу, натураліст. Дзяцінства правёў у Якімавай слабадзе Рэчыцкага павета Мінскай губерніі Скончыў Мінскую духоўную семінарыю, Пецярбургскую духоўную акадэмію (1839).

У 1839—1849 у складзе Рускай духоўнай місіі ў Пекіне. Вывучаў кітайскую, карэйскую, японскую, маньчжурскую, англійскую, нямецкую, французскую, лацінскую, грэчаскую, яўрэйскую і інш. мовы, даследаваў культуру і філасофію Кітая і Японіі. У 1852—1855 як перакладчык суправаджаў на фрэгаце «Палада» (з рускім пісьменнікам І.А. Ганчаровым) дыпламатычную місію адмірала Я.В. Пуцяціна ў Японію. З удзелам Гашкевіча заключаны руска-японскі дагавор 1855. У 1858—1865 першы расійскі консул у Японіі. Першы іншаземец, якому было дазволена выехаць за межы японскай сталіцы і зрабіць падарожжа па краіне. У 1861 сустракаўся ў Хакадатэ з М.А. Бакуніным. З 1867 у адстаўцы, жыў у маёнтку Малі (цяпер Астравецкі раён Гродзенскай вобласці). Выдадзены ім першы ў Расіі «Японска-рускі слоўнік» (1857; разам з Тацібана но Каасай) адзначаны медалём Пецярбургскай АН і Дзямідаўскай прэміяй.

Аўтар працы «Карані японскай мовы» (Вільня, 1899). Калекцыі флоры і фауны Паўд. Афрыкі і Паўд-Усх. Азіі, сабраныя ў час падарожжаў, Гашкевіч перадаў заалагічнаму музею АН у Пецярбургу. У г. Хакадатэ на в. Хакайда Гашкевічу пастаўлены помнік. У 1994 помнік Гашкевічу адкрыты ў Астраўцы (скульпт. Ф.Янушкевіч).

У Мінску яго імем названа **вуліца.**

**Літаратура:**

Гашкевіч Іосіф Антонавіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Т. 5. – Мінск, 1997. – С. 96.

Гашкевіч Іосіф Антонавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Т. 2. – Мінск, 1994. – С. 499-500.

Гузанаў, В.Р. Адысей з Беларусі : дакументальная аповесць : [пераклад з рускай] / Віталь Рыгоравіч Гузанаў. – Мінск : Полымя, 1993. – 309, [2]с., 1л. партр. :іл. – ( Нашы славутыя землякі).

**(імёны)**

## Драздовіч Язэп Нарцызавіч
## (1888 – 1954)

**Драздовіч Язэп Нарцызавіч** нарадзіўся 13.10.1888 у б. засценак Пунькі, Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці.

Беларускі мастак, скульптар, этнограф, фальклярыст, археолаг, пісьменнік. Адзін з заснавальнікаў нацыянальнага гістарычнага жывапісу. Скончыў Віленскую школу рысавання (1908). Выкладаў маляванне ў беларускіх школах. Заснавальнік мастацкай студыі пры Віленскай беларускай гімназіі (1927). Прадстаўнік рамантычнага кірунку ў беларускім мастацтве. У пейзажах (графічная серыя «Старажытная будоўля  на Беларусі»,1910 — пач. 20-х г.), «Вёска Стадолішча», 1919), тэматьгчных кампазіцыях «Усяслаў Чарадзей у парубе пад палатамі кіеўскага князя» (1923), «Усяслаў Чарадзей пад Гародняй», «Песня Баяна» (1940-я г.), партрэтах Ф. Багушэвіча, Я. Пачопкі, полацкіх і смаленскіх князёў асноўную ўвагу аддае адлюстраванню праз паэтызаваныя, сімвалічныя вобразы старажытнай беларускай гісторыі. Шэраг работ прысвечаны Ф. Скарыне («Францыск Скарына. Развітанне з родным Полацкам, або У свет па навуку», «Са свету з навукай», «Друкарня Францішка Скарыны ў Вільні ў 1525 годзе» (1927 — 1-я пал. 40-х г.). У 2-й пал. 1920-х г. стварьгў графічныя серыі, прысвечаныя старажытнай замкавай архітэктуры Беларусі і Літвы («Мір», «Крэва», «Ліда» і інш.). Этнаграфічнае і гістарычна-краязнаўчае значэнне маюць замалёўкі сялянскіх тыпажоў, узораў народнага дойлідства, прылад працы і прадметаў побыту, адзення. Асобную групу складаюць творы з сімволіка-алегарычнымі вобразамі («Мужык з панам цягаецца», 1935, «Пагоня», 1927, «Дух цемры», 1932, і інш.). Касмічная тэма прадстаўлена серыямі «Жыццё на Марсе» (1931), «Жыццё на Сатурне» і «Жыццё на Месяцы» (абедзве 1932), творамі «Пейзаж» (1930-я г.), «Трывень» (1932—1933), «Космас» (1940), «Артаполіс» (1934—1935) і інш., у якіх спалучаецца гуманістычны зямны пачатак з наіўным бачаннем ірэальнага. Прымаў удзел у афармленні час. «Саха» (1912—1915), «Рунь» (1920) і інш., кніг «Беларускі каляндар на 1910 год», «Курганная кветка» К. Буйло (1914), «Школьны спеўнік» А. Грыневіча (1920), «Лемантар» (1919), уласнай кнігі «Вар'ят без вар'яцтва, або Вялікая шышка» (1923, псеўд. Я. Нарцызаў), брашуры «Нябесныя бегі» (1931). Маляваў насценныя дываны. У аснову іх кампазіцыі паклаў раслінныя, зааморфныя, арх.-сюжэтныя матывы. Стварыў партрэты-барэльефы А. Грыневіча, Я. Пачопкі, М. Машары, маці (пач. 1930-х г.), бюст Ф. Скарыны, «Плач Гарыславы» (1920-я г.). Працаваў у галіне плаката. Запісваў фальклор і апрацоўваў для слоўнікаў народную лексіку Дзісеншчыны і Піншчыны. Праводзіў археалагічныя даследаванні, вёў археалагічныя дзённікі «Дзісенская дагістарычная старына».

У Мінску яго імем названа **вуліца.**

**Літаратура:**

Драздовіч Язэп Нарцызавіч // Беларуская энцыклапедыя: ў 18 т. Т. 6. – Мінск, 1996. – С. 194-195.

Язэп Драздовіч : альбом-манаграфія / уклад. М. Купава. – Мінск : Беллітфонд, 2002. – 179с.: іл. – ( Мастакі Беларусі).

Драздовіч Язэп Нарцызавіч, 1888 – 1954 : [творчы партрэт беларускага мастака: альбом / аўт.тэксту Т.В. Габрусь]. – Мінск : Інфармпрагрэс, 1993. – 28с.: іл.

Горава, Г. Касмалагічныя Тэзісы Язэпа Драздовіча ў кантэксце еўрапейскай касмалогіі і астраноміі / Галіна Горава // Роднае слова. – 2010. – № 4. – С. 98-102.

Габрусь, Т. Зорны шлях вечнага вандроўніка / Тамара Габрусь // Роднае слова. – 2008. – № 10. – С. 98-101.

Содаль, У. Маляваў і роднае слова шанаваў / Уладзімір Содаль // Роднае слова. – 2008. – № 10. – С. 102-104.

13 кастрычніка - 120 год з дня нараджэння Я.Н. Драздовіча (1888 - 1954), мастака, скульптара, этнографа, фальклярыста, археолага, пісьменніка : [бібліяграфічны спіс] / складальнікі Т.Я. Мамедава, Н.А. Шашэнька; рэдактар К.Д. Варанько // Новыя кнігі. Па старонках беларускага друку. Даты беларускага календара (кастрычнік 2008 г.). – 2008. – №6. – С. 4-6.

Мяснікоў, А.Ф. Язэп Драздовіч (1888-1954). Жыў для духоўнага ўзвышэння народа ... / А.Ф. Мяснікоў // Сто асоб беларускай гісторыі: гістарычныя партрэты / А.Ф. Мяснікоў. – Мінск, 2008. – С. 205-207.

(імёны)

## Каганец Карусь
## (1868 – 1918)

**Каганец Карусь** (сапр. Кастравіцкі Казімір Карлавіч) нарадзіўся 10.2.1868 у г. Табольск, Расія Беларускі пісьменнік, перакладчык, мастак, мовазнавец. Сын удзельніка паўстання 1863— 1864, сасланага ў Сібір. З 1874 на Беларусі, у в. Засулле каля Стоўбцаў і Прымагілле каля Койданава (цяпер г. Дзяржынск). Вучыўся ў Мінскім гарадскім вучылішчы, Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства. Працаваў у Мінску, Рызе, Лідзе, Вільні, фальварку Жортай на Барысаўшчыне. Адзін з арганізатараў Беларускай сацялістычнай грамады**.** За рэвалюцыйную агітацыю сярод сялян быў зняволены ў мінскую турму (1905—1906, 1910—1911).

Друкаваўся з 1893. Паэзія Каганца агітацыйная, блізкая да народнай песні. Яна працягвала традыцыі народных антыпрыгонніцкіх і рэкруцкіх песень, прасякнута нацыянальнымі матывамі («Пра пана Ленскага», «Наша доля маладзецка», «На мабілізацыю», «Наш покліч», «Плач беларуса»). Цэнтральны герой яго лірыкі — кабзар, лірнік («Кабзар»). Проза Каганца — апрацоўкі мясцовых легенд і паданняў («Прылукі», «Навасадскае замчышча», «Вітаўка»). Аўтар гіст. («Старажовы курган», апубл. 1919; «Сын Даніла», апубл. 1920) і бытавых («У іншым шчасці няшчасце схавана», нап. 1903, апубл. 1919; «Двойчы прапілі», нап. 1910, апубл. 1919) драм. Дасюль папулярная яго камедыя «Модны шляхцюк» (паст. 1910 у Вільні і Полацку Першай беларускай трупай І.Буйніцкага), у якой высмеяў беларускага выраджэнца, які адракаецца ад усяго роднага. Гэта модны шляхцюк Пранцішак Карчэўшчык — папярэднік Адольфа Быкоўскага ў «Паўлінцы» Я. Купалы.

Апрацоўваў народныя казкі, паданні; пісаў навукова-папулярныя нарысы для дзяцей. Выступаў як публіцыст. Адзін з аўтараў «Беларускага лемантара, або Першай навукі чытання» (Пб., 1906, выд. ананімна). На беларускую мову пераклаў навукова-папулярную брашуру «Гутаркі аб небе і зямлі» (1907, з С. Шаўлоўскім). Шмат увагі аддаваў мове, навуковай тэрміналогіі (працаваў над «Беларускай граматыкай», не закончана). З твораў выяўленчага мастацтва збераглiся графічныя малюнкі «За сахою», «На ростаньках», палітычныя карыкатуры; ляпіў з гліны, выразаў з дрэва і косці, афармляў кнігі (вокладка «Другога чытання для дзяцей беларусаў» Я. Коласа,

Пб., 1909). На магіле Каганца ў в. Навасёлкі Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці пастаўлены помнік.

У Мінску яго імем названа **вуліца.**

**Літаратура:**

Каганец Карусь (сапр. Кастравіцкі Казімір Карлавіч) // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Т. 7. – Мінск, 1998. – С. 402.

Лаўшук, С. А ён і сёння яшчэ "модны" : п'еса "Модны шляхцюк" Каруся Каганца / Сцяпан Лаўшук // Роднае слова. – 2008. – № 2. – С. 8-9.

Каспяровіч, М. Там, дзе тварыў Каганец : літаратурная экскурсія / Мікола Каспяровіч // Полымя. – 2007. – № 1. – С. 190-198.

Баградовіч І.Э. Патрыятычная і духоўная паэзія Каруся Каганца / І.Э. Багдановіч // Авангард і традыцыя / І.Э. Багдановіч. – Мінск, 2001. – С.101-115.

Марціновіч, А. Каб знаці, хто мы такія. Карусь Каганец / А. Марціновіч // Элегіі забытых дарог / А. Марціновіч. – Мінск, 2001. – С.453-464.

(імёны)

## Лучына Янка
## (1851 – 1897)

**Лучына Янка (сапр. Неслухоўскі Іван Люцыянавіч)** нарадзіўся 6.7.1851 г.

Беларускі паэт. Вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце на матэматычным факультэце (1870 — 1871), скончыў Пецярбургскі тэхналагічны інстытут (1877). У 1877—1879 працаваў у чыгуначных майстэрнях Тыфліса, потым — у тэхнічным бюро Лібава-Роменскай чыгункі ў Мінску. Упершыню выступіў у друку ў 1886. Пісаў на беларускай, польскай, рускіх мовах. Друкаваўся ў газеце «Минский лнсток», «Паўночна-Заходнім календары на 1893 год» пад рэд. А. Слупскага, польскіх часопісах і штотыднёвіках «Glos Polski» («Польскі голас»), «КLosy» («Калоссе»), «Кгаj» («Край»), «Рrawda» («Праўда»), «Zycie» («Жыццё») і інш. Творчасць Лучыны выяўляла розныя ўзроўні масацкага асэнсавання беларускай рэчаіснасці 1880—1890-х г., але была мэтанакіраванай у дэмакрычным сцвярджэнні ідэалу свайго часу. Прадаўжаючы эстэтычныя традыцыі літаратуры Беларусі сярэдзіны 19 ст., ён заставаўся традыцыйным у польска- і рускамоўных творах і адначасова быў наватарам у вершах, напісаных па-беларуску, дзе ўзаемадзейнічалі рэалістычныя і рамантычныя пачаткі. Тэматычна яго паэзія звязана пераважна з жыццём беларускай вёскі; галоўны яе герой — селянін як найбольш варты прадстаўнік радзімы і носьбіт сапраўднай маральнасці. Не прымаў буржуазных стасункаў у грамадстве, разам з тым верыў у асветніцкі, тэхнічны прагрэс, народжаны часам. Супярэчнасць у поглядах абумовіла яго ўвагу да ўнутраных перажыванняў асобы. Паэзіі Лучыны ўласцівы мяккі лірызм, роздумнае паглыбленне ў псіхалагічны стан чалавека. Яна спрыяла развіццю беларускай філасофскай лірыкі. Польскамоўная паэма «Паляўнічыя акварэлькі» і беларускі аўтапераклад яе раздзела «Стары паляўнічы» адкрылі перад беларускімі паэтамі шляхі пошукаў у напісанні нацыянальных эпічных твораў («Новая зямля» Я. Коласа і інш.). У нарысе «З крывавых дзён» (1889) Лучына ўзнаўляе карціны паўстання 1863—1864 на Міншчыне. Пяру Лучыны належыць драматургічны абразок без назвы. Збіраў беларускі фальклор і дасылаў яго П. Шэйну. Перакладаў з польскай мовы на беларускую (У. Сыракомлю) і рускую (У. Сыракомлю, А. Асныка), з рускай на польскую (І. Крылова, М. Някрасава, В.Чуміну-Міхайлаву і інш.), з нямецкай (Г. Гейнэ), стараж.-грэч. (Гамера). Польскія творы Лучыны на беларускую мову пераклалі М. Арочка, Р. Барадулін, М. Клімковіч, У. Мархель, М. Машара, П. Пестрак, Г. Тумаш, К. Цітоў, І. Чыгрын і інш.

У Мінску яго імем названа **вуліца.**

**Літаратура:**

Лучына Янка (сапр. Неслухоўскі Іван Люцыянавіч) // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. Т. 9. – Мінск, 1999. – С. 380.

Янка Лучына ў кантэксце самаідэнтыфікацыі беларускай літаратуры : матэрыялы рэспубліканскай канферэнцыі (Мінск, 25 мая 2001г.) / [гл. рэд.У. Гніламёдаў]. – Мінск : РІВШ БДУ, 2002. – 151с.,1л.партр.

Марціновіч, А Агеньчык у цемры. Янка Лучына / А. Марціновіч // Хто мы, адкуль мы... / А. Марціновіч. – Мінск, 2008. – С. 327-340.

Мяснікоў, А.Ф Янка Лучына (1851-1897): З марай аб "добрай долі" людзей... / А.Ф. Мяснікоў // Сто асоб беларускай гісторыі : гістарычныя партрэты / А.Ф. Мяснікоў. – Мінск, 2008. – С. 119-121.

(імёны)

## Малінін Міхаіл Сяргеевіч
## (1899-1960)

**Малінін Міхаіл Сяргеевіч** нарадзіўся 28.12.1899 у в. Палуціна Антропаўскага р-на Кастрамской вобл., Расія.

Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1931). У гады Вялікай Айчыннай вайны з 1941 – начальнік штаба механізаванага корпуса, арміі, фронту на Заходнем, Данскім, Цэнтральным, 1-м Беларускім франтах. Удзельнічаў у падрыхтоўцы і правядзенні аперацый па разгроме фашысцкіх войск у час Беларускай аперацыі (1944). Герой Савецкага Саюза (1945). З 1945 – начальнік штаба і намеснік галоўнакамандуючага групай савецкіх войск у Германіі. Генерал арміі (1953).

**Вуліца** ў Ленінскім раёне г. Мінска атрымала яго імя ў 1974, на адным з дамоў у 1976 устаноўлена мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Малінін М.С. // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 10. - Мн., 2000. - С. 33.

Малінін М.С.. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 5. - Мн., 1999. - С. 59.

Малінін М.С // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 327.

Малинин М.С. // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 210.

Михаил Малинин // Минский курьер. - 2005. - 7 мая. - С. 11.

(імёны)

## Марат (Marat) Жан Поль
## (1743 – 1793)

**Марат (Marat) Жан Поль** нарадзіўся 24.5.1743 у г. Будры, Швейцарыя.

Французскі палітычны дзеяч, вучоны, публіцыст. Доктар медыцыны (1775). У 1762 — 1765 вывучаў у Парыжы медыцыну, філасофію, прыродазнаўства. З 1765 у Вялікабрытаніі, дзе набыў вядомасць працамі ў галіне медыцыны, фізікі і паліталогіі. З 1776 зноў у Парыжы, працаваў урачом. У палітычна-юрыдычным трактаце «План крымінальнага заканадаўства» (1780) сцвярджаў, што крымінальныя законы складзены багатымі ў сваіх інтарэсах, права ўладання выцякае з права на жыццё і таму бедныя маюць права на паўстанне супраць прыгнятальнікаў. З першых дзён французскай рэвалюцыі 1789—1799 яе актыўны ўдзельнік на баку радыкальна-дэмакратычных сіл. З вер. 1789 выдаваў газету «L'Ami du peuple» («Сябра народа»), у якой адстойваў эканамічныя і палітычныя інтарэсы гарадской беднаты, рэзка выступаў супраць лідэраў правячага ліберальна-дэмакратычнага блока (Ж. Некера, А.Г.Р. Мірабо, М.Ж. дэ Лафаета). Зазнаў ганенні ўлад, выдаваў газету ў падполлі, у студз.— маі 1790 і снеж. 1791 — крас. 1792 хаваўся ў Англіі. Пасля звяржэння манархіі (10.8.1792) член Назіральнага камітэта Камуны Парыжа, з вер. 1792 — дэп. Канвента ад Парыжа. Выступаў з ідэяй масавага тэрору супраць ворагаў рэвалюцыі і спекулянтаў, на баку якабінцаў вёў барацьбу супраць жырандыстаў. У крас. 1793 прыцягнуты жырандыстамі да суда Рэвалюцыйнага трыбунала па абвінавачанні ў закліках да роспуску Канвента, забойстваў і рабаўніцтваў, але быў апраўданы. З М.Рабесп'ерам і інш. якабінцамі падрыхтаваў нар. паўстанне ў Парыжы 31.5—2.6.1793, якое прывяло да падзення ўлады жырандыстаў і ўстанаўлення якабінскай дыктатуры. Забіты Ш. Кардэ, звязанай з жыран-дыстамі.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1937).

**Літаратура:**

Марат (Marat) Жан Поль // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. Т. 10. – Мінск, 2000. – С. 105.

Молчанов, Н. Н. Монтаньяры / Николай Николаевич Молчанов. – Москва : Молодая гвардия, 1989 . – 557, [7] с., [24] л. ил. – ( Жизнь замечательных людей; вып. 11(699)).
Котов, П. Великомученик революции / Павел Котов // Вокруг света. – 2010. – № 6. – С. 32-33.

(імёны)

## Маякоўскі Уладзімір Уладзіміравіч
## (1893 – 1930)

**Маякоўскі Уладзімір Уладзіміравіч** нарадзіўся 19.7.1893г, у г. Багдаты.

Расійскі паэт, драматург. Вучыўся ў кутаіскай (з 1902) і маскоўскай (1906—1908) гімназіях, у Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства (1911—1914), дзе зблізіўся з Д.Бурлюком**.** У 1923—1928 узначальваў літаратурнае-мастацкае аб'яднанне ЛЕФ**,** у 1929—1930 — Рэвалюцыйны фронт мастацтваў. Рэдагаваў час. «ЛЕФ» (1923—1925) і «Новый ЛЕФ» (1927—1928). Дэбютаваў вершамі «Ноч» і «Ранак» (1912). Першая кніга «Я!» (1913). У ранняй лірыцы, трагедыі «Уладзімір Маякоўскі» (паст. 1913, рэжысёр і выканаўца галоўнай ролі Маякоўскі), паэмах «Воблака ў штанах» (1915), «Флейта-пазваночнік» (1916), «Чалавек» (1918) супярэчнасць паміж рамантычна-утапічным ідэалам паэта і рэальнасцю, багаборніцкія матывы. Разуменне вайны як сусветнай бяды, найвялікшага злачынства перад чалавекам у вершах і паэмах перыяду 1-й сусветнай вайны («Вайна аб'яўлена», 1914; «Вам!», 1915; паэма «Вайна і мір», 1915—1916, выд. 1917). Пасля 1917 спроба стварэння міфа пра сацыялістычную светабудову (п'еса «Містэрыя-буф», 1918; паэмы «150 000 000» 1921; «Уладзімір Ільіч Ленін», 1924; «Добра!», 1927). З 1919 выпускаў у Маскве агітплакаты «Вокны РОСТА» (ствараў паэтычныя тэксты і малюнкі). Многія сюжэты браў з падзей на Беларусі і Заходнем фронце («Што павінен ведаць чырвонаармеец Заходняга фронту», «Радуецца пан, растапырыў рот...» і інш.). У гэтых плакатах, вытворчай і кніжнай графіцы 1920-х г. ярка выявіўся талент Маякоўскага як мастака (з 1910-х г. рабіў партрэтныя замалёўкі, эскізы лубкоў, тэатральныя работы). У лірычных паэмах «Люблю» (1922) і «Пра гэта» (1923) сцверджанне непадзельнасці жыцця і кахання. З 2-й пал. 1920-х г. пераважаюць сатырычныя творы: камедыі «Клоп» (1928, паст. 1929, экранізавана 1962) і «Лазня» (1929, паст. 1930) — антыутопія, не зразумелая сучаснікамі. Паэма «На ўвесь голас» (1930) — сцверджанне шчырасці свайго шляху і надзея на разуменне. Аўтар аўтабіяграфіі «Я сам» (1922, 2-я рэд. 1928), кн. «Савецкая азбука» (1919), нарысаў «Маё адкрыццё Амерыкі» (1925), сцэнарыяў фільмаў «Паненка і хуліган» паводде «Настаўніцы рабочых» Э.Д'Амічыса, «Не для грошай нарадзіўся» паводле «Марціна Ідэна» Дж. Лондана, (абодва 1918, зняўся ў галоўных ролях), артыкулаў па пьгтаннях літаратуры («Як рабіць вершы», 1926), мастацтва і інш. Пісаў для дзяцей («Што такое добра, што такое дрэнна», 1925). Творчай манеры Маякоўскага ўласцівы рамантычнае светаадчуванне, гранічная аголенасць пачуцця, зліццё аўтара з лірычным героем, устаноўка на прамы зварот да аўдыторыі, канцэнтраваная эмацыянальнасць і энергія верша.

У. Маякоўскі — рэфарматар паэтычнай мовы. Зрабіў вялікі ўплыў на паэзію 20 ст. Да вопыту Маякоўскага звярталася не адно пакаленне беларускіх паэтаў. Ёсць падставы гаварыць пра пэўную тыпалагічную сувязь акцэнтнага верша Я. Купалы і У. Маякоўскага ўжо ў дакастрычніцкій перыяд іх творчасці, што вынікала з характэрнага для іх абвостранага адчування свету ў процістаянні і барацьбе высокага і нізкага, чалавечнага і бесчалавечнага. Яго ўплыў адчулі М. Чарот, М. Грамыка, А. Куляшоў, П. Броўка, М. Лужанін, У. Хадыка, П. Глебка, якія шукалі новых сродкаў выразнасці. Маякоўскі неаднаразова прыязджаў на Беларусь, выступаў перад чытачамі (у 1914, 1925 і 1927 у Мінску, у 1924 у Гомелі, у 1927 у Віцебску). На беларускім матэрыяле стварыў сатырычны верш «Піва і сацыялізм» (пач. назва «Віцебскія думкі») і антырэлігійны верш «Не для вас папоўскія святы» (па просьбе рэдакцыі газ. «Красная смена», дзе ўпершыню апубл. 12.4.1923). У газ. «Звязда» 4.2.1923 надрукаваны яго артыкул «Сённяшні Берлін». На працягу 1923—1924 у перыядычных выданнях Беларусі публікаваліся творы Маякоўскага, атрыманыя ад Прэс-бюро Агітпропа ЦК РКП(б). На першамайскім свяце 1921 у Мінску рэжысёры Е. Міровіч і Л. Літвінаў паставілі масавае дзейства «Праца і капітал» з выкарыстаннем тэкстаў з агітплакатаў «Вокны РОСТА».

Уздзеянне Маякоўскага на беларускую паэзію было надзвычай дабратворным, за выключэннем выпадкаў, калі ўплыў падмяняўся простым пераймannем элементаў яго паэтыкі, верша (т. зв. «лесвічка»). Пачатая ім традыцыя паказу абагульнена-маштабнага чалавека не перарвалася (паэзія П. Панчанкі, М. Танка, К. Кірэенкі, А. Русецкага, Р. Барадуліна, В. Зуёнка, П. Макаля, С. Гаўрусёва, У. Паўлава і інш.). П'есы Маякоўскага ставіліся ў тэатрах Беларусі. Творы Маякоўскага перакладаліся на беларускую мову. Маякоўскаму прысвечаны многія верша беларускіх паэтаў.

У Мінску яго імем названа **вуліца** і **завулак.**

**Літаратура:**


Маякоўскі Уладзімір Уладзіміравіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 10. – Мінск, 2000. – С. 242-243.

Давидов, М. Убийство или самоубийство? // Наука и жизнь. – 2010. – № 11. – С. 98-107.

Горбачёв, А.Ю. Владимир Маяковский и футуризм: дооктябрьское творчество поэта / А.Ю. Горбачёв // Русский язык и литература.-( Серия "У дапамогу педагогу". – 2010. – № 9. – С. 56-61; № 10. – С. 17-28.

Исайчук, Д. Проездом / Дмитрий Исайчук // Минский курьер. – 2010. – 14 сент. – С. 13.

Румянцева, Н. Возможно, было так. Версия смерти Владимира Маяковского / Наталия Румянцева // Новый мир. – 2009. – № 8. – С. 151-173.

Казачёнок, Л.Г. "Я сам расскажу о времени и о себе" (по поэме В.В. Маяковского "Во весь голос") / Л.Г. Казачёнок // Русский язык и литература. – (Серия "У дапамогу педагогу"). – 2009. – № 2. – С. 16-18.


(імёны)

## Нахімаў Павел Сцяпанавіч
## (1802 – 1855)

**Нахімаў Павел Сцяпанавіч** нарадзіўся 5.7.1802 у с. Гарадок (б.с. Гарадок на тэрыторыі сучаснага Вяземскага раёна Смаленскай вобласці), Расія.

Расійскі флатаводзец. Адмірал (1855). Скончыў Марскі кадэцкі корпус (1818), служыў на Балтыйскім флоце. Удзельнік кругасветнага плавання на фрэгаце «Крэйсер» пад камандаваннем М.П. Лазарава (1822—1825), Наварынскай бітвы 1827, руска-турэцкай вайны 1828—1829. Камандаваў фрэгатам «Палада» (з 1829), потым на Чарнаморскім флоце лінейным караблём «Сілістрыя» (з 1834), брыгадай караблёў (з 1845), флоцкай дывізіяй (з 1852). У Крымскую вайну 1853—1856 разграміў галоўныя сілы турэцкага флоту ў Сінопскай бітве 1853, адзін з кіраўнікоў Севастопальскай абароны 1854—1855 (з лют. 1855 камандзір Севастопальскага порта і ваенны губернатар). 10.7.1855 смяротна паранены на Малахавым кургане. Помнік у Севастопалі (з 1959) і бюст у Вязьме (з сярэдзіны 1990-х г.). У СССР у 1944—1991 існавалі ваенныя ўзнагароды — ордэн Нахімава 1-й і 2-й ступеняў і медаль Нахімава Імем Нахімава назван шэраг баявых караблёў савецкага і расійскага ВМФ.

У Мінску яго імем названы **вуліца і завулак** (1952).

**Літаратура:**


Нахімаў Павел Сцяпанавіч // Беларуская энцыклапедыя : ў 18 т. Т. 11. – Мінск, 2000. – С. 218.

Бекир-Заде, Э. Адмирал Нахимов / Эмин Бекир-Заде. – Москва : Олимп, 1999. – 266с., [8]л. цв. ил. – (Портреты великих).

Фирсов, И, Исторические портреты : Павел Нахимов, Федор Ушаков, Степан Макаров... / Иван Фирсов. – Москва : АСТ, 2008. – 541, [2] с.:ил. – (Русские флотоводцы).

Экштут, С. Жизнь и судьба / Семен Экштут // Знание-сила. – 2005. – № 7. – С. 102-109.

Джалагония, В. Единственное дело адмирала Нахимова / Валерий Джалагония // Эхо планеты. – 2005. – № 29. – С. 20-21.


(імёны)

# Пляханаў Георгій Валянцінавіч
# (1856 – 1918)

**Пляханаў Георгій Валянцінавіч** нарадзіўся 11.12.1856 у в. Гудалаўка, цяпер Краснінскі раён Ліпецкай вобласці, Расія.

Расійскі палітычны дзеяч, тэарэтык сацыялізму, заснавальнік расійскай сацыял-дэмакратыі. Вучыўся ў Горным інстытуце (Санкт-Пецярбург, 1874—1876). У 1876 член народніцкага гуртка «бунтароў» (паслядоўнікаў М.А. Бакуніна). З ліпеня 1877 член кіраўніцтва «Зямлі і волі» вёў працу сярод рабочых. Пасля расколу «Зямлі і волі» (1879) лідэр «Чорнага перадзелу». У 1879 наведаў Мінск, дзе выдаваліся падпольныя чорнапярадзельскія газеты «Черный передел», «Зерно» і пракламацыі. З 1880 у эміграцыі; у сваіх ідэйных пошуках паступова схіляўся да марксізму.

У 1883 заснаваў групу «Вызваленне працы», якая набыла ў Жэневе друкарню А. Трусава, прапагандавала марксізм на тэрыторыі Расійскай імперыі, у т.л. на Беларусі. У працах «Сацыялізм і палітычная барацьба» (1883) і «Нашы рознагалоссі» (1885) Пляханаў з марксісцкіх пазіцый крытыкаваў тэорыю і практыку народніцтва. Тэарэтычныя распрацоўкі Пляханава высока цаніў Ф. Энгельс. Працы «Анархізм і сацыялізм» (1894), «Да пытання аб развіцці маністычнага погляду на гісторыю» (1895) і «Да пытання аб ролі асобы ў гісторыі» (1898) былі ўкладам у тэорыю гістарычнага матэрыялізму. Пляханаў —удзельнік устаноўчага кангрэсу Інтэрнацыянала 2-га (1889, Парыж), член Міжнароднага сацыялістычнага бюро (з 1900). У палеміцы з Э. Бернштэйнам адстойваў неабходнасць сацыялістычнай рэвалюцыі і магчымасць навуковага сацыялізму, але пагаджаўся з ім у тым, што «на блізкае ажыццяўленне сацыялістычнага ідэалу... нельга разлічваць». З 1900 адзін з арганізатараў і член рэдакцыі газеты «Искра», актыўны ўдзельнік распрацоўкі праграмы Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП), змагаўся супраць «эканамізму». На 2-м з'ездзе РСДРП (1903) абраны членам рэдакцыі газеты «Искра» (Цэнтральнага органа партыі) і старшынёй Савета партыі. Пасля з'езду адзін з лідэраў меншавікоў. У час рэвалюцыі 1905—1907 палемізаваў з бальшавікамі, якія лічылі буржуазію і лібералаў рэакцыйнай сілай, крытыкаваў іх за Снежаньскае ўзброенае паўстанне 1905, якое лічыў непадрыхтаваным, за байкот выбараў у 1-ю Дзяржаўную думу, адстойваў праграму муніцыпалізацыі зямлі. У час існавання трэццячэрвеньскага палітычнага рэжыму прадказваў паўтарэнне рэвалюцыі ў недалёкім будучым. крытыкаваў «ліквідатараў» (прыхільнікаў ператварэння РСДРП ў легальную рэфармісцкую партыю).

У працах «Асноўныя пытанні марксізму» і «Ваяўнічы матэрыялізм» (1908) дапоўніў тэорыю гістарычнага матэрыялізму палажэннем аб сацыяльна-псіхалагічнай кампаненце грамадскай свядомасці як звяне паміж сацыяльна-палітычным. ладам і ідэалагічнай надбудовай, адстойваў філасофскі матэрыялізм, крытыкаваў прыхільнікаў эмпірыякрытыцызму ў кіраўніцтве РСДРП. У 1-ю сусветную вайну стаяў на пазіцыях абарончніцтва і сац.-патрыятызма. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 вярнуўся ў Расію. Выступіў супраць абвешчанага У. Леніным у крас. 1917 курсу на сацыялістычную рэвалюцыю. Зыходзячы з марксісцкай тэорыі эканамічнай эвалюцыі Пляханаў лічыў, што «сацыялістычны лад мае на ўвазе па меншай меры дзве перадумовы: 1) высокую ступень развіцця прадукцыйных сіл...; 2) вельмі высокі ўзровснь свядомасці ў працоўным насельніцтве краіны» і таму называў ленінскія планы сацыялістычнага пераўладкавання тагачаснай Расіі «несумненнай і вельмі шкоднай утопіяй». Прыхільнік захавання тэрытарыяльнай цэласнасці Расіі і вядзення вайны да пераможнага канца. Цяжка хворы Пляханаў узначальваў сацыял-дэмакратычную арганізацыю «Адзінства», выступаў як публіцыст у яе газ. «Единство». Кастрычніцкую рэвалюцыю 1917 успрыняў адмоўна.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (1956).

**Літаратура:**

Пляханаў Георгій Валянцінавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т. 12. – Мінск, 2001. – С. 441-442.

Безелянский, Ю. Отец русского марксизма// Наука и жизнь. - 2010. - № 3. - С. 67-73.

(імёны)

## Ракасоўскі Канстанцін Канстанцінавіч
## (1896-1968)

**Ракасоўскі Канстанцін Канстанцінавіч** нарадзіўся 08.12.1896 у г. Варшава, па інш. звестках у г. Вялікія Лукі Пскоўскай вобл., Расія.

У арміі з 1914, у Чырв. гвардыі з 1917, у Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, баёў на Кіт.-Усх. чыгунцы (1929). Скончыў курсы ўдасканалення камсаставу кавалерыі (1925) і вышэйшага начсаставу пры Ваен. акадэміі імя Фрунзе (1929). Камандзір палка, брыгады, дывізіі (з 1930 на Беларусі), з 1936 кав.корпуса. У жн. 1937 – сак. 1940 рэпрэсіраваны. З 1940 на камандных пасадах. У Вялікую Айчынную вайну камандаваў корпусам, арміяй, войскамі Бранскага, Данскога, Цэнтральнага, з лют. 1944 – 1-га Беларускага, а з ліст. 1944 – 2-га Беларускага франтоў. Удзельнік Смаленскай бітвы (1941), Маскоўскай бітвы (1941 – 1942), Сталінградскай бітвы (1942 – 1943), Курскай бітвы (1943), Чарнігаўска-Прыпяцкай аперацыі (1943), Калінкавіцка-Мазырскай, Рагачоўска-Жлобінскай, Беларускай аперацый (1944), Вісла-Одэрскай, Усходне-Прускай, Усходне-Памеранскай, Берлінскай аперацый (1945). 24.06.1945 камандаваў Парадам Перамогі ў Маскве. У 1945 – 1949 галоўнакамандуючы Паўн. групай войск. З 1949 міністр нац. абароны і нам. старшыні Савета Міністраў ПНР. З 1956 у СССР – нам. міністра абароны СССР (1956 – 1957, 1958 – 1962). У 1964 удзельнічаў у святкаванні 20-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў у Мінску. Маршал Савецкага Саюза (1944). Двойчы Герой Савецкага Саюза (1944, 1945). Узнагароджаны ордэнам “Пабеда”. Аўтар мемуарных твораў “Сталінградская эпапея” (1968), “Курская бітва” (1970), “Няскораная Беларусь” (1963) і інш.

**Праспект** у Ленінскім раёне г. Мінска атрымаў імя К.К. Ракасоўскага ў 1971, на доме № 33 устаноўлена мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Ракасоўскі К.К. // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 521-522.

Рокоссовский К.К. // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 319.

Ляхов П.Р. Рокоссовский К.К. // Ляхов П.Р. Великие полководцы. - М., 1997. - С. 332-336.

Кардашов В. Рокоссовский К.К. // Шикман А.П. Деятели отечественной истории. - М., 1997. - С. 227-228.

Бугайская Е. Маршал, который всегда побеждал // Сов. Белоруссия (Беларусь сегодня). – 2005. - 1 февр. - С. 8-9.

Иоффе Э. Он командовал парадом Победы // Нар. газ. – 2003. - 5 снеж. - С. 13.

(імёны)

## Рыбалка Павел Сямёнавіч
## (1894-1948)

**Рыбалка Павел Сямёнавіч** нарадзіўся 04.11.1894 ў в. Малы Выстарап Лебядзінскага р-на Сумскай вобл.

Удзельнік Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. У Чырв. Арміі з 1919. Скончыў Ванную акадэмію імя Фрунзе (1934). У час Вялікай Айчыннай вайны камандаваў танкавымі арміямі на Бранскім, Паўд.-Заход., Варонежскім, 1-м Беларускім і 1-м Укарінскім франтах. Маршал бранятанкавых войскаў (1945). Двойчы Герой Савецкага Саюза (1943, 1945). Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра і вызваленні Кіева. Маршал бранятанкавых войск (1945). Пасля вайны камандуючы бранятанкавымі і міханізаванымі войскамі Савецкай Арміі (1947). Узнагароджаны ардэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Суворава, Кутузава, Багдана Хмяльніцкага. Памёр 28.8.1948. Пахаваны ў Маскве.

**Вуліца** ў Ленінскім раёне Мінска носіць яго імя з 1948, на доме № 1 мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Рыбалка Павел Сямёнавіч // Беларуская Савецкая Энцыкапедыя: У 12 т. - Т. 9. - Мн. - С. 203.

Рыбалко Павел Семенович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 525.

Рыбалко Павел Семенович // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 357.

Филиппович А. Их называли "рыбалковцы" // Минский курьер. – 2005. - 6 мая. - С. 3.

Серафімовіч Аляксандр Серафімавіч

(1863-1949)

Серафімовіч (сапр. Папоў) Аляксандр Серафімавіч нарадзіўся 19.1.1863 у станіце Ніжнекурмаярская Цымлянскага раёна Растоўскай вобласці, Расія.

Рускі пісьменнік. Вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце (1883—1887). За рэвалюцыйную дзейнасць сасланы ў Архангельскую губернію (1897—1890). У 1926—1929 рэдагаваў часопіс «Октябрь».

Адзін з арганізатараў Саюза пісьменнікаў СССР. Друкаваўся з 1899. Першая кніга — «Апавяданні і нарысы» (1901). У ранніх творах раскрываў драматызм штодзённай барацьбы чалавека за выжыванне. У аповесці «Пяскі» (1908), рамане «Горад у стэпе» (1912) — маральная праблематыка, звязаная з развіццём капіталізму ў горадзе. Раман «Жалезны паток» (1924), у аснове якога гістарычны факт — паход Таманскай арміі (1918), лічыўся класікай сацыялістычнага рэалізму. Аўтар нарысаў пра калектывізацыю (серыя «Па данскіх стэпах», 1931), грамадзянскую і Вялікую Айчыннаю войны, артыкулаў пра літаратуру.

Серафімовіч наведваў Беларусь, быў асабіста знаёмы з Я. Купалам, Я. Коласам, Ц. Гартным, П. Галавачом, М. Лыньковым і інш., удзельнічаў у рабоце 2-га пленума праўлення БелАПП (1931). На беларускую мову яго творы перакладалі С. Іва, П. Місько, С. Хурсік і інш. Дзяржаўная прэмія СССР 1943.

У Мінску яго імем названа вуліца (1949).

Літаратура:

Серафімовіч Аляксандр Серафімавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 14. – Мінск, 2002. – С. 344.

А. Серафимович (1863-1949) // Русская литература XX века : в 2 т. Т. 1. 1920-1930-е годы / под ред. Л.П. Кременцова. – Москва, 2005. – С. 38-41.

Евграфов К. Одно неохватное сердце / К. Евграфов // Знакомые незнакомцы / К. Евграфов. –Москва, 1988. – С. 30-50.

Котов А. А.С. Серафимович / А. Котов // Статьи о русских писателях / А. Котов. – Москва, 1986. – С. 104-109.

Михайлова М. Стилевое своеобразие социалистического реализма в творчестве А.С. Серафимовича 1910-х годов / М. Михайлова // Из истории русского реализма конца XIX-начала XX в. / под редакцией А.Г.Соколова. – Москва, 1986. – С. 26-36.

(імёны)

## Свярдлоў Якаў Міхайлавіч
## (1885 – 1919)

**Свярдлоў Якаў Міхайлавіч** нарадзіўся 4.6.1885 г. у г. Ніжні Ноўгарад, Расія .

Савецкі палітычны і дзяржаўны дзеяч. З сям'і рамесніка-гравёра, ураджэнца г. Полацк. Член РСДРП з 1901, бальшавік з 1903. З 1904 прафесійны рэвалюцыянер. Удзельнік рэвалюцыі 1905—1907 на Урале. За рэвалюцыйную дзейнасць 14 разоў арыштаваны, 12 гадоў прабыў у турмах і ссылках. Член ЦК і Рускага бюро ЦК (з 1912), сакратар ЦК партыі (з 1917). Адзін з кіраўнікоў кастрычніцкага ўзброенага паўстання 1917 у Петраградзе. З 8.11.1917, застаючыся сакратаром ЦК партыі, старшыня ВЦВК Саветаў. Адзін з ініцыятараў «чырвонага тэрору» і «расказачвання». На пасяджэнні ЦК КП(б)Б 1.2.1919 абвясціў пастанову ЦК РКП(б) аб неабходнасці стварэння адзінай Літоўска-Беларускай Сацыялістычнай Рэспубліцы, на 1-м Усебеларускім з'ездзе Саветаў (2—3.2.1919) абвясціў пастанову Прэзідыума ВЦВК аб прызнанні незалежнасці БССР. Адзін са стваральнікаў Камуністычнага Інтэрнацыянала.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (1922).

**Літаратура:**

Свярдлоў Якаў Міхайлавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 14. – Мінск, 2002. – С. 272.

Панкратов, В. А. Яков Свердлов / Виктор Алексеевич. – Москва / : Политиздат, 1989. – 159с., 1л.фот. – (Когда им было 20).

О Якове Свердлове : воспоминания, очерки, статьи современников. – Москва : Политиздат, 1985. – 288с., [1] л. портр.

Свердлова, К. Т. Яков Михайлович Свердлов / К.Т. Свердлова. – Москва : Молодая гвардия, 1985. – 399 с.:ил.

Костюковский, Б.А. И нет счастливее судьбы : повесть о Я.М.Свердлове / Борис Костюковский, Семен Табачников. –Москва : Политиздат, 1984. – 334, [1]с.

(імёны)

## Серафімовіч Аляксандр Серафімовіч
## (1863 – 1949)

**Серафімовіч (сапр. Папоў) Аляксандр Серафімавіч** нарадзіўся 19.1.1863 у станіце Ніжнекурмаярская Цымлянскага раёна Растоўскай вобласці, Расія.

Рускі пісьменнік. Вучыўся ў Пецярбургскім універсітэце (1883—1887). За рэвалюцыйную дзейнасць сасланы ў Архангельскую губернію (1897—1890). У 1926—1929 рэдагаваў часопіс «Октябрь».

Адзін з арганізатараў Саюза пісьменнікаў СССР. Друкаваўся з 1899. Першая кніга — «Апавяданні і нарысы» (1901). У ранніх творах раскрываў драматызм штодзённай барацьбы чалавека за выжыванне. У аповесці «Пяскі» (1908), рамане «Горад у стэпе» (1912) — маральная праблематыка, звязаная з развіццём капіталізму ў горадзе. Раман «Жалезны паток» (1924), у аснове якога гістарычны факт — паход Таманскай арміі (1918), лічыцца класікай сацыялістычнага рэалізму. Аўтар нарысаў пра калектывізацыю (серыя «Па данскіх стэпах», 1931), грамадзянскую і Вялікую Айчынную вайны, артыкулаў пра літаратуру.

Серафімовіч наведваў Беларусь, быў асабіста знаёмы з Я. Купалам, Я. Коласам, Ц. Гартным, П. Галавачом, М. Лыньковым і інш., удзельнічаў у рабоце 2-га пленума праўлення БелАПП (1931). На беларускую мову яго творы перакладалі С. Іва, П. Місько, С. Хурсік і інш. Дзяржаўная прэмія СССР 1943.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (1949).

**Літаратура:**

Серафімовіч Аляксандр Серафімавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т. 14. – Мінск, 2002. – С. 344.

А. Серафимович (1863-1949) // Русская литература ХХ века : в 2 т. Т. 1. 1920-1930-е годы / под ред. Л.П. Кременцова. – Москва, 2005. – С. 38-41.

Евграфов К. Одно неохватное сердце / К. Евграфов // Знакомые незнакомцы / К. Евграфов. –Москва, 1988. – С. 30-50.

Котов А. А.С. Серафимович / А. Котов // Статьи о русских писателях / А. Котов. – Москва, 1986. – С. 104-109.

Михайлова М. Стилевое своеобразие социалистического реализма в творчестве А.С. Серафимовича 1910-х годов / М. Михайлова // Из истории русского реализма конца XIX-начала XX в. / под редакцией А.Г.Соколова. – Москва, 1986. – С. 26-36.

## Станіслаўскі Канстанцін Сяргеевіч
## (1863-1938)

**Станіслаўскі (сапр. Аляксееў) Канстанцін Сяргеевіч** нарадзіўся 17.1.1863 у г. Масква.

Расійскі рэжысёр, акцёр, педагог, тэарэтык тэатральнага мастацтва. Народны артыст СССР (1936). Рэфарматар тэатра, заклаў фундамент навукі аб сцэнічным мастацтве. Тэатральную дзейнасць пачаў у 1877 на аматарскай сцэне як акцёр і рэжысёр. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Таварыства мастацтва і літаратуры (1888). Найбольш поўна і ярка талент Станіслаўскага раскрыўся ў Маскоўскім мастацкім тэатры (МХТ), які ён заснаваў з У. Неміровічам-Данчанкам у 1898. У першай пастаноўцы «Цар Фёдар Іаанавіч» А.К. Талстога дасягнуў гістарычнай праўды, акцёрскай верагоднасці, дакладнай распрацоўкі масавых сцэн. З адкрыццём новага кірунку ў сцэнічным мастацтве звязаны пастаноўкі п'ес А. Чэхава «Чайка» (1898), «Дзядзька Ваня» (1899), «Тры сястры» (1901), «Вішнёвы сад» (1904, усе з Неміровічам-Данчанкам), якім уласцівы глыбокі псіхалагізм, высокая паэтычнасць, ансамблевасць ігры, зладжанасць усіх мастацкіх кампанентаў. Грамадзянскім гучаннем вызначаліся пастаноўкі драматургіі М. Горкага «Мяшчане» і «На дне» (1902, апошняя з Неміровічам-Данчанкам). Наватарствам, дакладным прачытаннем літаратурных твораў адметныя спектаклі «Гора ад розуму» А. Грыбаедава (1906), «Рэвізор» М. Гогаля (1908), «Жывы труп» Л. Талстога (1911), «Дзе тонка, там і рвецца» І. Тургенева (1912, усе з Неміровічам-Данчанкам). Сацыяльнай напоўненасцю і завостранасцю, яркасцю фарбаў вызначаліся спектаклі «Гарачае сэрца» А. Астроўскага (1926), «Жаніцьба Фігаро» П. Бамаршэ (1927), «Мёртвыя душы» паводле Гогаля (1932). Вобразам, створаным Станіслаўскім-акцёрам, уласціва тонкая псіхалагічная распрацоўка (Трыгорын — «Чайка», Астраў — «Дзядзька Ваня», Вяршынін — «Тры сястры»), высокі грамадзянскі пафас (Сацін — «На дне», Штокман — «Доктар Штокман» Г. Ібсена), сатырычная завостранасць, тэатральная яркасць, кідкасць (Фамусаў — «Гора ад розуму», Круціцкі — «На ўсякага мудраца хапае прастаты» Астроўскага, Арган — «Прытворна хворы» Мальера).

Вёў педагагічную работу ў драматычных і оперных студыях. Распрацоўваў метады работы над п'есай, роляй, вёў пошукі новых шляхоў у сцэнічнай творчасці.

З дзейнасцю Станіслаўскага звязаны новы кірунак ў тэатральным мастацтве, вышэйшы этап у развіцці сцэнічнага рэалізму. Дасягненні абгрунтаваў у тэарэтычных працах. Практычная дзейнасць Станіслаўскага, тэарэтычныя працы зрабілі вялікі ўплыў на сусветнае сцэнічнае мастацтва, у т.л. на беларускае.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (1953).

**Літаратура:**

Станіслаўскі (сапр. Аляксееў) Канстанцін Сяргеевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т. 15. – Мінск, 2002. – С. 147.

Климова, Л.П. К.С. Станиславский в русской и советской критике / Л.П. Климова. – Ленинград : Искусство, 1986. – 149с.

Соловьева, И.Н. К.С. Станиславский : [фотоальбом] / И.Н. Соловьева, В.В. Шитова. – Москва: Искусство, 1986. – 168с. – (Человек. События. Время).

Полякова, Е. Станиславский / Елена Ивановна Полякова. – Москва: Искусство, 1977. – 463с.,[24]л.фот.,1л.портр.

## Сыракомля Уладзіслаў
## (1823 – 1862)

**Сыракомля Уладзіслаў** (сапр. Кандратовіч Людвік) нарадзіўся 29.9.1823 у в. Смольгава Любанскага раёна Мінскай вобласці, польскі і беларускі паэт. Гады маленства

правёу на Міншчыне ў арандаваных бацькам фальварках Яськавічы (Салігорскі раён), Кудзінавічы (Капыльскі раён), Мархачоўшчына (Стаўбцоўскі раён).

Вучыўся ў дамініканскіх школах у Нясвіжы (1833—1835) і Навагрудку (1836—1837). Працавау у Нясвіжскай канцылярыі кіраўніцтва радзівілаўскімі маёнткамі (1841 — 1844). У 1844—1852 арандаваў фальварак Залучча (Стаўбцоўсі раён), з 1853 — Барэйкаўшчына (каля Вільні). За патрыятычныя выступленні на антыцарскіх маніфестацыях у 1861 арыштаваны і зняволены ў віленскую турму.

Першае выступление ў друку — вершаваная гутарка «Паштальён» (1844; у скарочаным варыянце ў перакладзе Л.Трэфалева стала папулярнай рускакй народнай песняй «Ямшчык»).

Творчасць Сыракомлі цесна звязана з гісторыяй Беларусі, з вераваннямі, звычаямі і вуснай паэзіяй беларускага народа; яна глыбока дэмакратычная, антыпрыгоннщкага характару.

Паэт апяваў высокую духоўнасць, сумленнасць і дабрыню простага чалавека («Улас», «Споведзь пана Корсака»), маляваў бязрадасныя карціны сялянскага жыцця («Гуляй, душа!», «Нядзеля», «Непісьменны», «3 уражанняў палескага падарожжа», «Грабар»), ганьбаваў прыгнятальнікаў народа («Ілюмінацыя», «Лялька», «Дзічына», «Эпітафія землеўласніку»), абураўся іх абыякавасцю да лёсу прыгонных («Вызваленне сялян»), выступаў супраць самадзяржаўя («Самуэлю Неслухоўскаму», «Мазурка», «Сахар-мароз»), разам з тым прытрымліваўся ідэй класавага салідарызму.

Сувязь яго твораў з беларускім фальклорам выяўлялася ў перакладах і апрацоўках народных песень («Народная песенька з ваколіц Вільні», «Доля», «Груган», «Жніўная песня»), запазычанні матываў і сюжэтаў («Хадыка», «Пра зачараваны скарб») і інш. Стварыў вершаваную гутарку, дзе стылістычна свабодна з прыкметамі імправізацыі апавядалася пра павучальную жыццёвую гісторыю паводле народных уяўленняў пра дабро і зло. Як праніклівы фальклярыст і знаўца вуснай паэзіі беларусаў Сыракомля раскрыўся ў рэцэнзіі на кнігу А.Глінскага «Польскі казачнік» (1853) і у «Кароткім даследаванні мовы і характару паэзіі русінаў Мінскай правінцыі» (1856). Вывучэнню Беларусі прысвяціў гісторыка-краязнаўчыя працы «Вандрокі па маіх былых ваколіцах» (1853), «Мінск» (1857), «Неман ад вытокаў да вусця» (1861) і інш.

Падтрымліваў сувязь з мінскім літаратурным асяроддзем, выступаў у польскім друку з водгукамі пра беларускія творы В. Дуніна-Марцінкевіча (1855, 1857, 1861), дзе выказаў зацікаўленасць перспектывамі развіцця беларуская літарутуры і мовы, напісаў у гонар беларускага паэта верш «Тост у доме В. Марцінкевіча». Прыхільнік пачынанняў А. Вярыгі-Дарэўскага, скіраваных на ўмацаванне кантактаў паміж літаратарамі і культурнымі дзеячамі Беларусі («Альбом» Вярыгі-Дарэўскага адкрываецца запісам С.). Падтрымаў прыход у літаратуру В. Каратынскага, разам з якім збіраўся выдаць кнігу вершаў на беларускай мове (задума не ажыццёўлена). 3 беларускіх твораў Сыракомлі збергліся агітацыйны антыцарскі верш «Добрыя весціі» (нап. 1848—186і, апубл. 1862) і вершаваная лірычная мініяцюра «Ужо птушкі пяюць усюды...» (нап. 1861), дзе закраналіся новыя для беларускай літаратуры тэмы і паняцці, выкарыстоўваліся не асвоеныя яшчэ беларускімі аўтарамі мастацкія сродкі.

Творчасць Сыракомлі, сугучная праблемам роднага краю ў перыяд разгортвання нацыянальна-вызваленчага руху, прыкметна паўплывала на фарміраване беларускай літаратуры новага часу. На беларускую мову яго творы перакладалі А. Абуховіч, Я. Лучына, Я. Купала, А. Паўловіч, Г. Леўчык, М. Машара, У. Дубоўка, М. Лужанін, К. Цвірка, К. Паўтаржыцкі, У. Мархель, Х. Лялько і інш. Вобраз Сыракомлі выведзены ў аповесці А. Мальдзіса «Восень пасярод вясны» (1984).

Яго імем названа **вуліца** ў мікраараёне Лошыца.

**Літаратура:**

Сыракомля Уладзіслаў // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т.15. – Мінск, 2002. – С. 321-322.

Мархель,У.І. Творчасць Уладзіслава Сыракомлі / Уладзімір Іосіфавіч Мархель. – Мінск : Беларуская навука, 2005. – 238с.

Уладзіслаў Сыракомля : матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 180-годдзю з дня нараджэння польскага і беларускага паэта і этнографа : Мінск-Любань, 29-30 верасня 2003 года / [укладальнік Т. Пятровіч]. – Мінск : Беларускі кнігазбор,2004. – 159 с.,1 л. партр.

Асіноўскі, С. Беларускія карані рускай народнай песні / Святаслаў Асіноўскі // Архівы і справаводства. – 2010. – № 5. – С. 142-151.

Багдановіч, І. Апошняя князёўна са старадаўняга роду / Ірына Багдановіч // Маладосць. – 2009. – № 6. – С. 73-74.

Янушкевіч, Я. "О, якое ж ты пекла, наш дзевятнаццаты век..." : Уладзіслаў Сыракомля і Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч / Язэп Янушкевіч // Роднае слова. – 2008. – № 9. – С. 13-17.

Сацукевіч, Д. Літаратурная Лошыца / Дар`я Сацукевіч // ЛіМ. – 2008. – 11 студз. – С. 15.

Бутэвіч, А.І. Славуты аўтар народнай песні : "вясковы лірнік" Уладзіслаў Сыракомля / Анатоль Бутэвіч // Бутэвіч, А.І. Пад небам беларускага слова. – Мінск, 2007. – С. 37-44.

Марціновіч, А. Нёс народу добрыя весці. Уладзіслаў Сыракомля / Алесь Марціновіч // Марціновіч, А. Хто мы, адкуль мы... – Мінск, 2008. – С. 169-186.

(імёны)

## Сямёнаў Георгій Мінавіч
## (1908 – 1942)

**Сямёнаў Георгій Мінавіч** (падпольныя псеўданімы Жук, Жорж) нарадзіўся ў 1908 г. у Мінску.

Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага патрыятычнага падполля ў Вялікую Айчынную вайну. У пачатку вайны на фронце, з акружэння трапіў у Мінск. У жніўні 1941 удзельнічаў у стварэнні падпольнай групы, у лістападзе — снежні на яго кватэры адбылася нарада прадстаў-нікоў падпольных арганізацый горада, створаны падпольны гарком КП(б)Б; абраны членам і загадчыкам ваеннага аддзела гаркома. Стварыў падпольную арганізацыю вуліц К.Лібкнехта і Р.Люксембург. У сакавіку 1942 арыштаваны акупантамі і пасля катаванняў павешаны.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1964), устаноўлена мемарыяльная дошка (1966).

**Літаратура:**

Сямёнаў Георгій Мінавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.15. - Мінск, 2002. - С. 346.

Гастелло Николай Францевич // Их именами названы…: энциклопедический справочник. - Минск,1987. - С. 540 - 541.

Семёнов Георгій Міновіч // Минск: энциклопедический справочник – Минск,1983. - С.364 – 365.

Их именами названы улицы. Участники Минского подполья / подготовил Дмитрий Исайчук // Минский курьер. - 2008. - 2 июля. - С. 10-11.

(імёны)

## Чыжэўская Алена Антонаўна
## (1924-1943)
## Чыжэўская Марыя Паўлаўна
## (1899-1943)

**Чыжэўская Алена Антонаўна** і яе маці **Чыжэўская Марыя Паўлаўна** (былая настаўніца) уваходзілі ў падпольную групу, якая выконвала заданні разведвальна-дыверсійнай групы “Юрый” па знішчэнню ката беларускага народа генеральнага камісара Беларусі групанфюрэра СС і генерал-лейтэнанта паліцыі Курта фон Готберга. Патрыёты устанавілі, што на 30.10.1943 у Лошыцы намечана нарада высокапастаўленых гітлераўцаў з удзелам Готберга. Была зманціравана міна, якую А.А. Чыжэўская і М.П. Чыжэўская перанеслі ў дом Фрайтага і залажылі у печ гасцінага пакоя. Але аб гэтым стала вядома

фашыстам. Падпольшчыцы арыштаваны і пасля катаванняў іх пакаралі смерцю. На месце іх згубы ўстаноўлены мемарыяльны знак.

**Вуліца і завулак** у Ленінскім раёне Мінска атрымалі імя Чыжэўскіх.

**Літаратура:**

Чижевские Елена Антоновна и Мария Павловна // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 439.

Панкратьева, Ю. Однажды на улице Чижевских / Юлия Панкратьева // Минский курьер. - 2010. - 27 окт. - С. 9.

(імёны)

## Шпілеўскі Павел Міхайлавіч (1823-1861)

**Шпілеўскі Павел Міхайлавіч** нарадзіўся 12.11.1823 г. у в. Шыпілавічы Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці.

Беларускі і рускі этнограф, фальклярыст, пісьменнік, публіцыст, тэатральны крытык. Кандыдат багаслоўя (1847). Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1843), Пецярбургскую духоўную акадэмію (1847). З 1847 выкладаў славеснасць у Варшаўскім пав. духоўным вучылішчы, з 1853 служыў у Галоўным педагагічным інстытуце ў Пецярбургу, у 1855—1859 настаўнік школы пры Экспедыцыі падрыхтоўкі дзяржаўных папер.

Друкаваўся з 1846. Супрацоўнічаў з пецярбургскімі перыядычнымі выданнямі. Пісаў пад псеўданімам Драўлянскі, Знаёмы чалавек, Барон Ікс. Вывучаў гісторыю, побыт, вусную народную творчасць і мову беларусаў.

Аўтар нарысаў і артыкулаў «Беларускія народньа павер'і» (1846—1852), «Апісанне пасольства Льва Сапегі ў Маскве ў 1600 г. » (1850), «Народныя прыказкі з тлумачэннем паходжання і значэння іх» (1852), «Даследаванне пра ваўкалакаў: На падставе беларускіх павер'яў» (1853), «Вясельныя абрады ў засцянкоўцаў (акалічан) Віцебскай губерні» (1854), «Мазыршчына: (З падарожжа па заходнярускім краі)» (1859), «Паездка ў заходнія губерні» (1860). Цыклы белетрызаваных нарысаў «Падарожжа па Палессі і беларускім краі» (1853—1855) і «Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе казках» (1853—1856) прынеслі Шпілеўскаму вядомасць у расійскім друку як аднаму з першых даследчыкаў і папулярызатараў беларускай гісторыі, этнаграфіі і фальклору. Нарысы сумяшчалі аўтарскія навуковыя разважанні і лірычныя адступленні, гістарычныя даведкі і маляўнічыя апісанні беларускіх гарадоў, вёсак і мястэчак, фальклорныя запісы і этнаграфічныя замалёўкі.

Шпілеўскаму належыць таксама спроба стварэння слоўніка і граматыкі беларускай мовы («Слоўнік і караняслоў беларускай гаворкі», 1845, рукапіс). Даследаваў таксама гісторыю, мову і фальклор літ. народа («Нарысы Жмудзі», 1855). Аўтар зб. «Беларускія прыказкі» (1853), апавяданняў «Нарысы польскіх звычаяў» (1854), аповесці для дзяцей «Цыганё» (1855), серыі апавяданняў «Заходнярускія нарысы» (1858—1859). У аснову драмы «Дажынкі» (1857), якая ўяўляе сабой варыяцыю на тэму «Ідыліі» В. Дуніна-Марцінкевіча, пакладзены беларускі этнаграфічны абрад. У журналісцкія агляды ўключаў весткі з Беларусі, першы паведаміў пра творчасць Дуніна-Марцінкевіча, рэцэнзаваў спектаклі Мінскага тэатра.

Непаслядоўнасць і супярэчлівасць светапогляду Шпілеўскаг, які вагаўся ад дэмакратызму і памяркоўнай ліберальнасці да адкрытай рэакцыйнасці, выклікалі нападкі на яго расійскіх кансерватараў і рэзкую крытыку з боку дэмакратычных колаў (палеміка вакол «Заходнярускіх нарысаў»).

Творы Шпілеўскага, прысвечаныя Беларусі, сцвярджалі нацыянальную самабытнасць беларускага народа, садзейнічалі фарміраванню беларускай нацыянальнай культуры і літаратуры.

У Мінску яго імем названа **вуліца.**

**Літаратура:**

Шпілеўскі Павел Міхайлавіч // Беларуская энцыклапедыя : ў 18 т. Т. 17. – Мінск, 2003. – С. 457-458.

Прыгодзіч, М. Лексікаграфічныя вопыты Паўла Шпілеўскага / Мікалай Рыгоравіч Прыгодзін // Роднае слова. – 2010. – № 5. – С. 35-38.

Вашчанка, А. Краязнаўца Павел Шпілеўскі / Аляксандр Вашчанка // Полымя. – 2009. – № 12. – С. 186-187.

Вашчанка, А. Жыццё, аддадзенае радзіме / Аляксандр Вашчанка // Маладосць. – 2008. – № 12. – С. 120-125.

Ващенко, А. Минский Гиляровский / Александр Ващенко // Вечер. Минск. – 2008. – 11 нояб. – С. 3; 12 нояб. – С. 3.

Вашчанка, А. Падарожжа да гаючай крыніцы фальклору/ Аляксандр Вашчанка // Роднае слова. – 2008. – № 11. – С. 98.

Вашчанка, А. "Дудар" П. Шпілеўскага/ Аляксандр Вашчанка // Полымя. – 2008. – № 10. – С. 137-142.

Сацукевіч, Д. Літаратурная Лошыца / Дар`я Сацукевіч // ЛіМ. – 2008. – 11 студз. – С. 15.

Мяснікоў, А.Ф. Павел Шпілеўскі (1823-1861): Ён любіў нас, людзей... / А.Ф. Мяснікоў // Сто асоб беларускай гісторыі: гістарычныя партрэты / А.Ф. Мяснікоў. – Мінск, 2008. – С. 101-104.

Марціновіч, А. Ліхтар на шляху беларускасці. Павел Шпілеўскі / А. Марціновіч // Элегіі забытых дарог / А. Марціновіч. – Мінск, 2001. – С.220-244.

**(імёны)**

## Шчарбакоў Аляксандр Сяргеевіч
## (1901-1945)

Гл. Партызанскі раён.

## Якубаў Гулям
## (1915-1944)

**Якубаў Гулям** нарадзіўся ў 1915 ў кішлаку Мірзабад Ферганскай вобл.

Удзельнік баёў на Беларусі ў Айчынную вайну. На фронце з 1942. Капітан, камандзір роты. Вызначыўся пры вызваленні Магілёўскай вобл. Рота Якубава за 20 гадзін адбіла 40 контратак, знішчыла 425 гітлераўцаў. Якубаў загінуў у баі. Герой Савецкага Саюза (1945).

**Вуліца** ў Ленінскім раёне Мінска атрымала імя Г. Якубава ў 1976 г., устаноўлена мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Якубаў Гулям // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя: У 12 т. – Т. 11. - Мн., 1974. - С. 534-535.

Якубов Гулям // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 410.

Якубов Гулям // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 410.

(на пачатак)

# Маскоўскі раён

(імёны)

## Акрэсцін Барыс Сямёнавіч
## (1923-1944)

**Акрэсцін Барыс Сямёнавіч** нарадзіўся 18.02.1923 у Маскве.

Працаваў авіяцыйным тэхнікам, лётчыкам-інструктарам. У Вялікую Айчынную вайну з 1942 на Сталінградскім, Украінскім і 3-м Беларускім франтах. Намеснік камандзіра эскадрыллі 74-га авіяпалка, ст. лейтэнант. Да канца снежня 1943 зрабіў 381 баявы вылет, знішчыў больш за 40 танкаў, 2 бронемашыны, 2 самалёты. У ліпені 1944 у баі з гітлераўскай групоўкай, якая прарывалася з Мінскага "катла", яго самалёт быў падбіты. Ахоплены полымем самалёт Б. Акрэсцін накіраваў на калону жывой сілы і скапленне тэхнікі ворага. Пахаваны ў Мінску. Герой Савецкага Саюза (1944).

**Вуліца і завулак** у Маскоўскім раёне Мінска былі названы яго імем у 1964.

**Літаратура:**

Акрэсцін Барыс Сямёнавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 1. - Мн., 1993. - С. 83-84.

Окрестин Борис Семенович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 458.

Улица Окрестина // Виногоров Н.А. Улицы Московского района г. Минска. - Мн., 1999. - С. 44.

Король, Н. В небе над Обчаком / Николай Король // Рэспубліка. - 2010. - 6ліп. - С. 4.

В честь героев минувших боев [Б.С.Окрестин] // Жучкевич В.А. Улицы помнят. - Мн., 1979. - С. 70.

Вся жизнь - подвиг [Б.С.Окрестин] // Петраченко Д.Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С.59-62.

(імёны)

## Алібегаў Іван Якаўлевіч
## (1886-1941)

**Алібегаў Іван Якаўлевіч** нарадзіўся 3.12.1886 у г. Кутаісі.

З 1915 у Мінску, ствараў бальшавіцкія арганізацыі ў войсках Заходняга фронту. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 член выканкома Мінскага Савета, з верасня 1917 старшыня Мінскага камітэта РСДРП(б). З лістапада 1917 сакратар Прэзідыума Аблвыкамзаха, камісар працы Заходняй вобл. Удзельнік барацьбы за Савецкую ўладу на Беларусі. У 1918 нам. старшыні Паўночна-Заходняга камітэта РКП(б), адзін з кіраўнікоў камуністычнага падполля на тэрыторыі Беларусі, акупіраванай германскімі войскамі. На І-м з'ездзе КП(б)Б (1918) выбраны членам ЦК КП(б)Б. З 1919 у Маскве: працаваў у Наркамаце шляхоў зносін, вучыўся ў Інстытуце чырвонай прафесуры. У 1935 - 1941 загадчык кафедры і дэкан Маскоўскага інстытута гісторыі, філасофіі, літаратуры. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны ў Маскоўскім народным апалчэнні. Загінуў у 1941 у баі пад г. Вязьма Смаленскай вобл.

Яго імем названа **вуліца** ў мікрараёне «Паўднёвы Захад». На доме № 5 у 1983 устаноўлена мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Алібегаў Іван Якаўлевіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 1. - Мн., 1996. - С. 254.

Алібегаў Іван Якаўлевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 1. - Мн., 1993. - С. 102-103.

Алибегов Иван Яковлевич // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 29-30.

Улица Алибегова // Виногоров Н.А. Улицы Московского района г. Минска. - Мн., 1999. - С. 10.

(імёны)

## Брыль Янка
## (1917 – 2006)

**Брыль Янка (Иван Антонавич)** нарадзіўся 4.8.1917 г. у г. Адэса.

Беларускі пісьменнік. Народны пісьменнік Беларусі (1981). У 1922 пераехаў з бацькамі на іх радзіму (в. Загор'е Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці).

Скончыў польскую сямігадовую школу (1931), працаваў на гаспадарцы, займаўся самаадукацыяй. З сакавіка 1939 служыў у польскай марской пяхоце. Удзельнік баёў на Вэстэрплятэ. У верасні 1939 трапіў у нямецкі палон, адкуль уцёк увосень 1941. З кастрычніка 1942 сувязны партызанскай брыгады імя Жукава Баранавіцкага злучэння, у сакавіку—ліпені 1944 партызан-разведчык брыгады «Камсамолец», рэдактар газеты «Сцяг свабоды» і сатырычнага антыфашысцкага лістка «Партызанскае жыгала».

З кастрычніка 1944 у Мінску. Працаваў у рэдакцыях газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну», часопісаў «Вожык», «Маладосць», «Полымя», у Дзяржаўным выдавецтве Беларусі.

У 1966—1971 сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Друкуецца з 1938. Першыя зборнікі «Апавяданні» (1946), «Нёманскія казакі» (1947) вылучылі яго як

арыгінальнага майстра лірыка-псіхалагічнай прозы, добрага знаўцу жывой народнай мовы. Жыццё даваеннай і пасляваеннай заходне-беларускай вёскі, усенародная барацьба супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў — асноўная тэматыка творчасці Брыля (зборнік апавяданняў «Вераснёвая рунь», 1949; аповесць «У Забалоцці днее», 1950, Дзяржаўная прэмія СССР 1952; зборнікаў «На Быстранцы», 1955; «Надпіс на зру-бе», 1958; «Мой родны кут», 1959; «Працяг размовы», 1962, Літаратурная прэмія імя Я.Коласа 1963, і інш.). Апавяданні «Галя», «Надпіс на зрубе», «Маці» і інш. сталі хрэстаматыйныя. Яны кранаюць задушэўнасцю тону, сагрэты любоўю да людзей, славяць высокую гуманнасць, патрыятызм.

Стылю празаіка ўласціва паэтычнасць бачання свету, сплаўленая з тонкім псіхалагізмам і пластычнасцю малюнка. Чалавек у яго творах даследуецца ў складаных сацыяльна-псіхалагічных абставінах, лірызм і эмацыянальнасць арганічна спалучаны з цвярозай аналітычнасцю і псіхалалагічнай дакладнасцю. Героі Брыля — людзі тонкай душы і дасціпнага розуму, схільныя да аналізу і самааналізу (Лёня Жывень з аповесці «Апошняя сустрэча», 1959; Алесь Руневіч з рамана «Птушкі і гнёзды», 1963, і інш.). У аснове рамана «Птушкі і гнёзды» — роздум пра чалавека, народ, Радзіму, паказ пакутлівых пошукаў заходне-беларускім юнаком Руневічам — чалавекам уражлівай душы і высокіх духоўных парыванняў — шляхоў да свядомай барацьбы з фашызмам.

Паказваючы «біяграфію адной душы», пісьменнік здолеў разгарнуць шырокую панараму жыцця, выкрыць знутры «філасофію» таталітарызму і фашызму, паказаць нараджэнне супраціўлення яму ў душах людзей. Людзі актыўнага дзеяння, наіўныя рамантыкі заходне-беларускага падполля П.Жалезняковіч і Р.Сяржант — героі вядомых нарысаў Брыля «Сэрца камуніста» і «Партрэт старэйшага таварыша». З калабруньёнскім гумарам і журботаю, з псіхалагічнай глыбінёй паказана жыццё заходне-беларускай вёскі 1920—1930-х г. у яго аповесцях «Ніжнія Байдуны» (1975) і «Золак, убачаны здалёк» (1978, Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Я.Коласа 1982). Аповесць «Муштук і папка» (1990) пра брата, закатаванага ў 1938 у Белай Царкве на Украіне. Шырокае прызнанне атрымалі лірыка-філасофскія мініяцюры, псіхалагічныя абразкі (зборнікі «Жменя сонечных промняў», 1965, «Вітраж», 1972, «Вячэрняе», 1994 і інш.). Піша таксама для дзяцей, вобразы якіх малюе шчыра, светла, замілавана (зборнікікі «Ліпка і клёнік», 1949; «Зялёная школа», 1951; «Светлае ранне», 1954; «Пачатак сталасці», 1957; «Жыў-быў вожык», 1976). Адзін з аўтараў кнігі «Я з вогненнай вёскі...» (1975, з ААдамовічам і У.Калеснікам), у якой сабраны і сродкамі мастацкай публіцыстыкі пракаменціраваны расказы нешматлікіх людзей, што перажылі жахі соцень спаленых разам з жыхарамі беларускіх вёсак. Кніга гэтая — напамінак свету пра зверствы гітлераўцаў, выключнай сілы прысуд фашызму, гімн мужнасці няскоранага народа.

Эстэтычныя погляды пісьменніка, яго аналіз сучаснага літаратурнага працэсу — у зборніках «Роздум і слова» (1963), «Трохі пра вечнае» (1978).

На беларускую мову пераклаў асобныя творы Л.Талстога, А.Чэхава, І.Крылова, М.Горкага, П.Бажова, Г.Траяпольскага, АВішні, А.Даўжэнкі, І.Друцэ, Э.Ажэшкі, М.Канапніцкай, Б.Пруса, Л.Кручкоўскага, Я.Івашкевіча, Я.Бранеўскай і інш.

У Мінску яго імем названа **вуліца.**

**Літаратура:**

Брыль Янка (Иван Антонавич) // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 3. – Мінск, 1996. – С. 275-276.

Калеснік, У. Янка Брыль : нарыс жыцця і творчасці / Уладзімір Андрэевіч Калеснік. – Мінск : Народная асвета, 1990. – 256с. :іл. – ( Народныя пісьменнікі БССР).

Старасценка, Т. Стылістычны аналіз нарыса "Пошукі слова" Янкі Брыля / Таццяна Старасценка// Роднае слова. – 2010. – № 2. – С. 59-60.

Навумчык, М.І. Вывучэнне аповесці Янкі Брыля "Сірочы хлеб" / М.І. Навумчык// Беларуская мова і літаратура. – (Серыя "У дапамогу педагогу"). – 2010. – № 1. – С. 33-36.

Сухава, Г.А. Апавяданне Я.Брыля "Галя": формула чалавечага шчасця : урок-разважанне з элементамі дыскусіі ў 9 класе / Галіна Анатольеўна Сухава// Народная асвета. – 2009. – № 8. – С. 32-35.

Андраюк, С. Творчасць як працяг біяграфіі / Серафім Андраюк// Полымя. – 2009. – № 4. – С. 133-144.

Бугаёў, Д. Мы працяглы час жылі ў адным доме : некалькі згадак пра Янку Брыля / Дзмітрый Бугаёў // Полымя. – 2009. – № 1. – С. 159-163.

Бутэвіч, А. Постаць высакародная, волатаўская/ А. Бутэвіч// Пад небам беларускага слова / А. Бутэвіч. – Мінск, 2007. – С. 229-242.

(імёны)

## Буйло Канстанцыя Антонаўна
## (1893-1986)

**Буйло (сапр. Калечыц) Канстанцыя Антонаўна** нарадзілася 14.1.1893 у Вільні.

Беларуская паэтэса. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1968). Скончыла настаўніцкія курсы ў Вільні (1914). Настаўнічала на Лідчыне, загадвала беларускай кнігарняй у Полацку (1915—1916). З 1923 жыла ў Маскве. З 1933, пасля незаконнага арышту мужа В.А. Калечыца, працавала на заводзе.

Друкавалася з 1909 у газеце «Наша ніва». Першы зборнік «Курганная кветка» (Вільня, 1914, факсімільнае выд. Мінск, 1989) адрэдагаваў Я. Купала.

Шырока выкарыстоўвала фальклорныя матывы. Эмацыянальны пачатак, вобразна-экспрэсіўныя элементы народнай паэтыкі выразна выступаюць у рамантычных вершах, інтымнай і патрыятычнай лірыцы («Люблю», «Беларусі», «Звон», «Курганная кветка», «Ляці, думка», «Ці помніш ты?»). Аўтар вершаваных драм «Кветка папараці» (1914), у якой выкарыстаны народныя міфалагічныя вобразы, звязаныя з купальскай абраднасцю, «Сённяшнія і даўнейшыя» (1914, паст. 1917) пра абуджэнне моладзі да новага жыцця. Пісала і апавяданні («Русалкі», 1910).

Роздум над доляй селяніна, героіка вайны, працоўныя будні, матывы любові да Бацькаўшчыны, праблемы сучаснасці, лёс чалавека і роднага народа, яго мовы і культуры, прыроды, інтымны свет чалавека — асноўныя тэмы яе паэзіі (зб. «Світанне», 1950; «На адноўленай зямлі», 1961; «Май», 1965; «Роднаму краю», 1973; «Вясной», 1984, і інш). Для дзяцей выдала зборнік «Юрачка» (1957), «У бляску зор» (1968).

Шчырасць, задушэўнасць, лірызм абумовілі меладычнасць яе твораў. Верш «Люблю» (муз. М. Равенскага) стаў папулярнай народнай песняй. Пахавана ў в. Вішнева Валожынскага раёна.

Яе імем названа **вуліца і завулак** ў Мінску.

**Літаратура:**

Буйло (сапр. Калечыц) Канстанцыя Антонаўна // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Т. 3. – Мінск, 1996. – С. 320-321.

Мартинович, А. Цветок, над которым не властно время /Алесь Мартинович // Неман. – 2013. – № 1. – С. 176-187.

Бельскі, А.І. Паэзія Канстанцыі Буйло і Ганны Ахматавай у кантэксце ідэі роднай зямлі / А. І. Бельскі // Галасы і вобразы / А. І. Бельскі. – Мінск, 2008. – С. 47-54.

Ляшук, В.Я. [Канстанцыя Буйло (1893-1986)] / В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко // Літаратурная Берасцейшчына / В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко. – Мінск, 2008. – С. 189-192.

(імёны)

## Бялецкі Яўген Міхайлавіч

**Бялецкі Яўген Міхайлавіч** генерал-лейтэнант авіяцыі, камандзір 1 гвардэйскага авіяцыйнага корпуса. Лётчыкі корпуса ўнеслі вялікі ўклад у вызваленне г. Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Імем Я. Бялецкага названа **вуліца** ў Маскоўскім раёне Мінска. На доме № 1 устаноўлена мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Улица Белецкого // Виногоров Н.А. Улицы Московского района г. Минска. - Мн., 1999. - С. 11.

Борисов А. В небе над Минском // Минский курьер. – 2003. - 24 нояб. - С. 7.

(імёны)

## Валадарскі В.
## (1891 – 1918)

Гл. Ленінскій раён.

(імёны)

## Волах Анатоль Аляксандравіч
## (1917-1943)

**Волах Анатоль Аляксандравіч** нарадзіўся ў 1917 у Мінску.

Працаваў на вагонарамонтным заводзе. З 1941 на Паўднёва-Заходнем і Варонежскім франтах. У верасні 1943 пры вызваленні г. Лебядзін Сумскай вобл. сяржант А.Волах на браневіку сярод першых уварваўся ў горад і вёў бой з ворагам. Загінуў у разведцы на шляху да Дняпра 01.10.1943. Пасмяротна ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза (1943). Пахаваны на цэнтральнай плошчы г. Лебядзін Сумскай вобл.

Яго імем названы **вуліцы** ў гарадах Мінск (1967) і Лебядзін. На доме № 3 па вул. Волоха ў Маскоўскім раёне Мінска рашэннем Мінгарвыканкама ў 1975 устаноўлена мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Волах Анатоль Аляксандравіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 4. - Мн., 1997. - С. 261.

Волах Анатоль Аляксандравіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 2. - Мн., 1994. - С. 351.

Волох Анатолий Александрович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 120-121.

Улица Волоха // Виногоров Н.А. Улицы Московского района г. Минска. - Мн., 1999. - С. 15-16.

В честь героев минувших боев [А.А. Волох] // Жучкевич В.А. Улицы помнят. - Мн., 1979. - С. 73.

Шаг в бессмертие [А.А. Волох] // Петраченко Д.Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 67-70.

(імёны)

## Гебелеў Міхаіл Лейбавіч
## (1905-1942)

Гебелеў Міхаіл (Міхель) Лейбавіч нарадзіўся у 1905 у в. Вузляны Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.

У 1920-я гады працаваў сталяром, потым на парт. рабоце. Вучыўся ў Рэспубліканскай школе прапагандыстаў пры ЦК КП(б)Б 1938 – 1939. З ліп. 1941 вязень Мінскага гета. З кастр. 1941 член кіруючага цэнтра падп. парт. арг-цыі гета, з ліст. 1941 упаўнаважаны па гета Мінскага падп. гаркома КП(б)Б, з мая 1942 сакратар Тэльманаўскага падп. райкома КП(б)Б (дзейнічаў у гета). Адзін з арганізатараў першай падп. друкарні гаркома, наладжваў прыём і распаўсюджванне зводак Саўінфармбюро, кіраваў вывадам вязняў гета ў партыз. атрады. У ліп. 1942 арыштаваны і павешаны ў мінскай турме.

**Вуліца** ў Маскоўскім раёне Мінска названа яго імем у 2005 (былы завулак Мэблевы).

**Літаратура:**

Гебелеў Міхаіл (Міхель) Лейбавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 5. - Мн., 1997. - С. 128.

Иоффе, Э. Секретарь подпольного райкома / Эмануил Иоффе // Вечер. Минск. – 2005. – 21 сент. – С. 2.

(імёны)

## Глаголеў Васіль Васільевіч
## (1898-1947)

**Глаголеў Васіль Васільевіч** нарадзіўся 04.03.1898 у г. Калуга Маскоўскай вобл.

У Чырвонай арміі з 1918. У Айчынную вайну на фронце з чэрвеня 1941, камандзір дывізіі, корпуса, камандуючы арміямі. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра на тэр. Украіны. Камандаваў 31-й арміяй, якая ў Беларускай аперацыі 1944 прарвала абарону ворага пад Дуброўнам, удзельнічала ў вызваленні Оршы, Барысава, Мінска, Гродна. Герой Савецкага Саюза (1943). Пасля вайны камандуючы арміямі, з красавіка 1946 камандуючы паветранна-дэсантнымі войскамі.

Яго імем названы **вуліца і 3 завулка.** На доме № 42 па вул. Глаголева ў Маскоўскім раёне Мінска ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Глаголеў Васіль Васільевіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 5. - Мн., 1997. - С. 281.

Глаголев Василий Васильевич // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 142.

Улица Глаголева // Виногоров Н.А. Улицы Московского района г. Минска. - Мн., 1999. - С. 17-18.

В честь героев минувших боев [В.В. Глаголев] // Жучкевич В.А. Улицы помнят. - Мн., 1979. - С. 66.

Командир Глаголев [В.В. Глаголев] // Петраченко Д.Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 23-27.

Василий Глаголев // Минский курьер. – 2005. – 7 мая. – С.11.

(імёны)

## Дрозд Мікалай Пракопавіч
## (1890-1943)

**Дрозд Мікалай Пракопавіч** нарадзіўся ў 1890 у в. Селішча Навагрудскага р-на Гродзенскай вобл.

З 1939 працаваў на лямцавай фабрыцы “Чырвоны Кастрычнік”. У час акупацыі Мінска нямецка-фашысцкімі захопнікамі арганізаваў і ўзначаліў падпольную групу. На яго кватэры захоўваліся зброя, медыкаменты, боепрыпасы, хаваліся падпольшчыкі і ваеннаслужачыя, якія трапілі ў акружэнне. У 1941 адбыліся 2 пасяджэнні Мінскага падпольнага гаркома КП(б)Б. Удзельнічаў у аперацыі па знішчэнні В.Кубэ. 24.09.1943 арыштаваны і пасля катаванняў загублены у Трасцянецкім лагеры смерці.

**Вуліца** ў Маскоўскім раёне Мінска атрымала імя М.П.Дрозда ў 2005 (былы завулак Шпалерны), на доме, дзе ён жыў (вул. Заслаўская, 31) знаходзіцца мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Дрозд Мікалай Пракопавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 6. - Мн, 1998. - С. 208.

Дрозд Мікалай Пракопавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 3. - Мн, 1996. - С. 278.

Дрозд Мікалай Пракопавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн, 1990. - С. 199.

**(імёны)**

## Жукаў Георгій Канстанцінавіч
## (1896-1974)

**Жукаў Георгій Канстанцінавіч** нарадзіўся 01.12.1896 у в. Стралкоўка Калужскай вобл., Расія.

У арміі з 1915, удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў. У Чырвонай арміі з 1918. З 1930 камандзір 2-й кавалерыйскай брыгады 7-й дывізіі (штаб ў Мінску), у 1933 – 1937 – 4-й кавалерыйскай дывізіі (у Слуцку), 3-га кавалерыйскага корпусу (у Мінску). У 1938 – 1939 нам. Па кавалерыі каманд. Войскамі Беларускай асобай ваеннай акругі. У 1939 камандаваў савецка – мангольскай групоўкай у час кнфлікту з Японіяй на р.Халхін-Гол. З 1940 каманд. Войскамі Кіеўскай асобай ваеннай акругі. У студз. - ліп. 1941 начальнік Генштаба, намеснік наркома абароны СССР.

З 23.06.1941 член Стаўкі ВГК, з жн. 1942 1-ы намеснік наркома абароны СССР і намеснік Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Адзін з кіраўнікоў абароны Ленінграда, Масквы і разгрому нямецка-фашысцкіх войск пад Масквой. Як прадстаўнік Стаўкі каардынаваў дзеянне франтоў у Сталінградскай бітве, у час прарыву блакады Ленінграда, Курскай бітве 1943 і бітве за Дняпро 1943, у Беларускай аперацыі 1944. Камандаваў 1-м Беларускім фронтаму Вісла-Одэрскай аперацыі 1945 і Берлінскай аперацыі 1945. Падпісаў за савецкі бок акт аб капітуляцыі Германіі 8.05.1945 у Карлсхосце. 24.06.1945 прымаў Парад Перамогі ў Маскве.

У 1945 –1946 камандуючы савецкімі акупацыйнымі войскамі і начальнік Савецкай ваеннай адміністрацыі ў Германіі. Адначасова галоўнакамандуючы сухапутнымі войскамі і нам. Міністра Узброенных Сіл СССР. З 1946 камандуючы войскамі Адэскай, з 1948 Уральскай ваенных акруг. З 1953 1-ы намеснік, у 1955-1957 міністр абароны СССР. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1941 – 1958. У 1958 зняты з усіх пасад і адпраўлены ў адстаўку.

Маршал Савецкага Саюза (1943), чатыры разы Герой Савецкага Саюза (1939, 1944, 1945, 1956). Узнагароджаны ордэнам “Пабеда”. Аўтар кнігі “Успаміны і роздум”. Імем Г. Жукава названа малая планета.

Рашэннем Мінгарвыканкама № 438 ад 04.11.1977 імя Жукава было прысвоена **праспекту** ў Маскоўскім раёне Мінска.

**Літаратура:**


Жукаў Георгій Канстанцінавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 8. - Мн., 1999. - С. 444-445.

Жукаў Георгій Канстанцінавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 3. - Мн., 1996. - С. 372-373.

Жуков Георгий Константинович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 220.

Суворов,Виктор. Тень Победы. – Донецк, 2003.

Жуков Георгий Константинович // Лубенков Ю.Н. Самые знаменитые полководцы России. - М., 2000. - С. 598-612.

Проспект Жукова // Виногоров Н.А. Улицы Московского района г. Минска. - Мн., 1999. - С. 23-24.

Жуков Георгий Константинович // Командиры второй мировой войны. - Мн., 1998. - С. 431-445.

Жуков Георгий Константинович // Имена в истории. - Мн., 1993. - С. 64-65.

Яковлев,Н.Н. Избранные произведения: Маршал Жуков. - М., 1990

Жуков Георгий Константинович // Евланов В.А., Петров С.Д. Почетным оружием награжденные. - М., 1988. - С. 202-207.

В честь героев минувших боев [Г.К. Жуков] // Жучкевич В.А. Улицы помнят. - Мн., 1979. - С. 66.

Рокоссовская А. Победитель // Сов. Белоруссия (Беларусь сегодня). – 2005. - 22 февр. - С. 8-9.

Песков В. Я с ними говорил... // Комс. правда в Белоруссии. – 2005. - 3 февр. - С. 6.

Борткевич В. Музей Жукова открылся в школе // Вечер. Минск. – 2004. - 17 мая. - С. 1.

Иоффе Э. Рожденный побеждать [Г.К. Жуков] // Бел. час. – 2004. - 16 нояб. - С. 21.

Макет памятника готов // Сов. Белоруссия. – 2003. - 12 марта. - С. 3.

Сульянов А. Маршал Жуков:страницы жизни...// Неман. - 1997. -№ 5. - С. 175-240.


(імёны)

## Корж Васіль Захаравіч
## (1899-1967)

**Корж Васіль Захаравіч** (партыз. псеўданім Камароў) нарадзіўся 1.01.1899 у в. Хораства Салігорскага р-на.

Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі. Удзельнік партызанскага руху ў Заходней Беларусі ў 1922-1925. Удзельнік вайны ў Іспаніі (1936-1939). З 1940 заг. сектара Пінскага абкома КП(б)Б. Арганізаваў і ўзначаліў адзін з першых

партызанскіх атрадаў, які з ліпеня 1941 вёў баі з фашыстамі. З лістапада 1942 камандзір Пінскага партызанскага злучэння. Генерал-маёр (1943), Герой Савецкага Саюза (1944). У 1949-1953 намеснік міністра лясной гаспадаркі БССР, потым да 1963 старшыня калгаса «Партызанскі край».

Рашэннем Мінгарвыканкама № 385 ад 25.12.1974 імя Каржа было прысвоена адной з **вуліц** ў Маскоўскім раёне Мінска.

**Літаратура:**

Корж Васіль Захаравіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 8. - Мн., 1999. - С. 418.

Корж Васіль Захаравіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 4. - Мн., 1997. - С. 237.

Корж Василий Захарович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 300.

Ярашэня В. Герой Савецкага Саюза В.З Корж / В. Ярашэня // Народы СССР в годы Великой Отечественой войны 1941 – 1945 гг.-Минск, 2006.- С. 143-149.

Улица Коржа // Виногоров Н.А. Улицы Московского района г. Минска. - Мн., 1999. - С. 28-29.

В честь героев минувших боев [В.З. Корж] // Жучкевич В.А. Улицы помнят. - Мн., 1979. - С. 81.

Партизанский генерал [В.З. Корж] // Петраченко Д.Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 173-176.

Смирнов Н. Уроки Василия Коржа // Неман. - 2009. - № 2. - С. 109-125.

Василий Корж // Минский курьер. – 2005. – 7 мая. – С9.

Суслов А. Полесская быль // Рэспубліка. – 2005. - 29 студз. - С. 6.

Бандарэнка М. Жыццё з вінтоўкай і за плугам [В.З. Корж] // ЛіМ. – 2004. - 23 студз. - С. 4.

(імёны)

## Купрыянаў Пётр Іванавіч
## (1926-1944)

**Купрыянаў Пётр Іванавіч** нарадзіўся ў 1926 у г. Жодзіна Смалявіцкага р-на Мінскай вобл..

У Айчынную вайну ваяваў ў партызанскім атрадзе «Радзіма» брыгады «Разгром». У Чырвонай Арміі з 1944. У ліст. 1944 яфрэйтар Купрыянаў у баі за вышыню ў Кулдыгскім раёне (Латвія) гранатамі знішчыў 2 кулямёта праціўніка, але агонь варожага дзота не даваў магчымасці наступаць. Купрыянаў падпоўз да дзота, кінуўся ўперад і закрыў сваім целам амбразуру. Каля в. Ліелдзэльда Кулдыгскага раёна яму ўстаноўлены помнік. Герой Савецкага Саюза (1945).

Імя Купрыянава ў 1964 было прысвоена адной з **вуліц** у Маскоўскім раёне Мінска. На доме № 1 установлена мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Купрыянаў Пётр Іванавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 9. - Мн., 1999. - С. 39.

Купрыянаў Пётр Іванавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 4. - Мн., 1997. - С. 311.

Куприянов Петр Иванович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С.341.

Улица Куприянова // Виногоров Н.А. Улицы Московского района г. Минска. - Мн., 1999. - С. 34-35.

Дончик В. Где летает белый аист [П.И. Куприянов] // Побратимы Матросова. - Мн., 1984. - С. 7-17.

В честь героев минувших боев [П.И. Куприянов] // Жучкевич В.А. Улицы помнят. - Мн., 1979. - С. 72-73.

Из плеяды Матросовых [П.И. Куприянов] // Петраченко Д.Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 51-54.

(імёны)

# Лермантаў Міхаіл Юр`евіч
# (1814-1841)

**Лермантаў Міхаіл Юр`евіч** нарадзіўся 15.10.1814 у Маскве.

Рускі пісьменнік. Вучыўся ў Маскоўскім універсітэце (1830—32), скончыў школу гвардзейскіх падпрапаршчыкаў і кавалерыйскіх юнкераў у Пецярбургу (1834). За верш «Смерць Паэта» пра гібель А. Пушкіна (1837) высланы ў Грузію. Другі раз сасланы на Каўказ у 1840. Удзельнік бітвы на р. Валерык у Чэчні. Забіты на дуэлі ў Пяцігорску М. Мартынавым.

Першыя вершы напісаў у 1828. Друкаваўся з 1830. Лірыцы Лермантава ўласцівы рамантызм, мяцежны герой, які паўстае супраць законаў бяздушнага грамадства і імкнецца да недасяжнага ідэалу, пачуццё адзіноты і расчаравання, бязмежнасці кахання і пакуты, тэмы свабоды, радзімы і яе гістарычнага лёсу: вершы «Ветразь», «Барадзіно», «Дума», «Хмары», «Радзіма» і інш. Стварыў вяршынныя ўзоры рускай рамантычнай паэмы: «Уцякач» (1838), «Мцыры» (1839), «Дэман» (1829—39) і інш. Распрацоўваў рэалістычную паэму: «Сашка» (1836), «Песня пра цара Івана Васілевіча...» (1838) і інш. Асноўныя рысы Лермантава-празаіка — тонкі псіхалагізм, лаканізм, афарыстычнасць, умелае валоданне мастацкай дэталлю — выявіліся ў рамане «Герой нашага часу» (1839—40), дзе стварыў новую раманную форму і новага героя, поўнага сіл і расчараванага ў дзеянні. Аўтар гістарычнага рамана пра Пугачоўскае паўстанне «Вадзім» (1832— 34), рамана на аўтабіяграфічнай аснове «Княгіня Лігаўская» (1836), у якім дадзены першы накід характару Пячорына, драм у вершах «Іспанцы» (1830), «Маскарад» (1835—36), нарысаў і інш. Займаўся жывапісам, пісаў акварэлі, карціны алеем, малюнкі (пейзажы, жанравыя сцэны, партрэты і карыкатуры; лепшыя з іх звязаны з каўказскай тэмай). Вершы Лермантава сталі асновай для опернай («Дэман» А. Рубінштэйна), сімфанічнай («Уцёс» С. Рахманінава, «Тры пальмы» А.Спендыярава) і рамансавай (А. Даргамыжскі, М. Балакіраў і інш.) творчасці, народнымі песнямі («Выходжу адзін я на дарогу...»).

Творы Лермантава здаўна папулярныя на Беларусі, якая займала значнае месца ў творчасці паэта. Пад уздзеяннем твораў А. Міцкевіча (галоўным чынам яго паэма «Гражына» і «Конрад Валенрод») у сюжэтах паэм Лермантава прысутнічаюць вобразы «дзевы-воіна» («Літвінка», 1832), баярына Оршы (аднайменная паэма, 1835—36), Арсенія («Літвінка», «Баярын Орша») і інш. Лермантаў імкнуўся адлюстраваць сацыяльна-бытавыя і гісторыка-палітычныя падзеі мінулых эпох.

Адна з першых крыніц на Беларусі, дзе з вялікай прыхільнасцю ўпамінаецца імя Лермантава — ананімная паэма «Тарас на Парнасе». У 1889 газета «Минский листок» змясціла артыкул «Міхаіл Юр'евіч Лермантаў», прысвечаны адкрыццю помніка паэту ў Пяцігорску. Хоць беларуская паэзія 19 ст. тыпалагічна адрознівалася ад творчасці Лермантава сваімі параўнаўча нераспрацаванымі «чалавеказнаўчымі» магчымасцямі і ў мастацка-стылявым плане, у ёй выкарыстоўваліся лермантаўскія матывы і сімвалы. Верш Ф. Багушэвіча «Хмаркі» ідэйна і эстэтычна блізкі да аднайменнага верша Лермантава. Паэзія Цёткі звязана з яго традыцыямі грамадзянскай лірыкі. Наследаванне Лермантаву праглядаецца ў вершах Я. Купалы «Мой дом», «Прыстаў я жыць...» і інш. Героі рамантычных паэм Я. Купалы («Курган», «Бандароўна», «Магіла льва») блізкія рамантычным героям Лермантава. Матывы пра ролю паэта ў жыцці народа творча распрацоўваў Я. Колас («Пясняр», «Паэту» і інш.). Рамантычная паэма Я. Коласа «Сымон - музыка» сугучная паэме «Мцыры». Надзвычай блізкі да Лермантава быў М. Багдановіч; да 100-годдзя з дня нараджэння Лермантава ён змясціў у яраслаўскай газеце «Голос» (2.10.1914) артыкул «Адзінокі», у яком раскрыў значэнне і своеасаблівасць Лермантава сярод рускіх паэтаў. Паэма Багдановіча «Максім і Магдалена» стваралася не без уплыву «Песні пра... купца Калашнікава» і «Баярына Оршы». Напружанасць духоўнага эмацыянальнага жыцця характэрна асуджаным на адзіноту галоўным героям паэмы «Дэман» і паэмы Багдановіча «Страцім-Лебедзь», у якой некаторыя даследчыкі адзначаюць пэўную палеміку. Пра захапленне паэзіяй Лермантава пісаў у аутабіярафіі З. Бядуля. Пад уплывам Лермантава напісаны першыя лірычныя вершы К. Крапівы. У артыкулу «Тры сустрэчы» А.

Куляшоў пісаў, што пачаты ў даваенны час пераклад на беларускую мову твораў Лермантава ў многім вызначыў кірунак яго паэтычнай дзейнасці. П. Панчанка ў артыкулы «Нязгасны агонь» падкрэсліваў, што Лермантаў стаў асабліва блізкім і дарагім у гады Вялікай Айчыннай вайны. На беларускай мове першыя пераклады паэм «Мцыры» і «Дэман» апублікаваны ў 1920-я г. у Вільні. У канцы 1930-х г. Я. Колас пераклаў 1-ю частку «Дэмана». У 1950 асобным выданнем выйшаў пераклад паэм «Дэман» (пер. Я.Колас, А. Зарыцкі, А.Бялевіч), «Баярын Орша» і «Каўказскі нявольнік» (пер. Зарыцкі і А. Вялюгін), «Ізмаіл-Бей» (пер. У. Шахавец), «Песня пра... купца Калашнікава» (пер. М. Клімковіч). У 1969 выдадзены зборнік перакладаў Куляшова (выбраныя вершы Лермантава, паэмы «Мцыры», «Дэман»), за які разам з перакладамі твораў інш. пісьменнікаў яму прысуджана Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Я. Купалы 1970. Творы Лермантава перакладалі В. Зуёнак, П. Макаль, Я. Міклашэўскі (Я. Верабей) і інш. Лермантаву прысвяцілі свае вершы і артыкулы П. Броўка, М. Танк, Я. Брыль, С. Грахоўскі і інш.

Упершыню на Беларусі да творчасці Лермантава звярнуўся тэатр А.К. Басевіча У Пінску, які 13.4.1880 ажыццявіў пастаноўку драмы «Маскарад». П'еса ўваходзіла і ў рэпертуар Мінскага таварыства аматараў прыгожых мастацтваў. У 1953 гэтая драма пастаўлена Брэсцкім абласным драматычным тэатрам. Падзеяй у тэатральным жыцці Беларусі стаў спектакль Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра Беларусі «Маскарад» (1966). Беларускі тэатр оперы і балета ажыццявіў пастаноўку оперы Рубінштэйна «Дэман» (1951). Трагедыю «Іспанцы» ставіў Гродзенскі абласны драматычны тэатр (1955).

**Вуліца** ў Маскоўскім раёне Мінска носіць імя паэта з 1941 года.

**Літаратура:**

Лермантаў Міхаіл Юр`евіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т.9.- Мн., 1999. - С. 211-212.

Лермантаў Міхаіл Юр`евіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. Т. 3. - Мн., 1986. - С. 237-239.

Лермантаў Міхаіл Юр`евіч // Краткая литературная энциклопедия: В 8 т. Т.4. – М., 1967. – С. 142-155.

Лермонтовская энциклопедия / гл.ред. В.А. Мануйлов. - М., 1981. - 784с.

М.Ю. Лермонтов. Лирика: Анализ текста. Осн.содерж.Сочинения / [Авт.-сост.Н.В.Сечина]. - М., 2001. - 112с. - (Школьная программа).

Русские писатели: из биографической библиотеки Ф.Ф. Павленкова: Н.К. Карамзин, И.А. Крылов, А. Грибоедов, Н. Гоголь, М. Лермонтов / Сост.В.Г. Бехтина. - Мн., 2000. - 462с. - (Школьная библиотека).

Кормилов, С.И. Поэзия М.Ю. Лермонтова: в помощь преподавателям, старшеклассникам и абитуриентам.- М, 1998. - 129с. - ( Перечитывая классику; Вып.11).

Долинина, Н.Г. Почитаем "Онегина" вместе; Печорин и наше время. - Мн., 1996. - 377с. - (Б-ка школьника и абитуриента).

Михаил Юрьевич Лермонтов: Точка зрения / [сост.и примеч.И.Подольской]. - М., 1993. - 223с. - (Классическая гимназия).

Афанасьев, В.В. Лермонтов / Виктор Васильевич Афанасьев. - М., 1991. - 560с. - (Жизнь замечательных людей; Вып.719).

Махлевич, Я.Л. "И Эльбрус на юге..." - М., 1991. - 183с.

Суздалев, П.К. Врубель и Лермонтов. - М., 1991 - 240с.

Чекалин, С.В. Лермонтов: Знакомясь с биографией поэта... - М., 1991 - 255с.

Лотман, Ю.М. В школе поэтического слова: Пушкин. Лермонтов. Гоголь: книга для учителя / Ю.М. Лотман. - М., 1988 - 351с.

Марченко, А.М. С подорожной по казенной надобности. Лермонтов: роман в документах и письмах / Алла Марченко. - М., 1984. - - 333с. (Писатели о писателях).

Белинский, В.Г. Статьи о Пушкине, Лермонтове, Гоголе / Виссарион Григорьевич Белинский. - Москва, 1983. - 272с. - (Школьная библиотека).

Афанасьев, В.В. Тропа к Лермонтову. - Москва, 1982. - 286с.

Нестор, (иеромонах). Роман М.Ю. Лермонтова "Герой нашего времени" / Нестор // Литература в школе. - 2007. - № 4. - С. 6-10.

Волкова, Е.В. "Дом" и "дорога" как реалии и как символы в работах Ю.М. Лотмана / Е.В. Волкова // Вопросы философии. - 2007. - № 1. - С. 169-174.

Либан, Н.И. М.Ю. Лермонтов. Лирика / Н.И. Либан // Лазурь. - 2005. - № 12. - С. 4-7.

Стрельцов, В.И. Творческие взаимосвязи русской и английской литератур в критике В.Г. Белинского (Лермонтов - Байрон) / В.И. Стрельцов // Лит. в школе. - 2005. - №8. - С. 16-18.

Крылов, В.Н. Жанровые особенности литературных портретов М. Ю. Лермонтова в русской критике конца XIX - начала XX века / В.Н. Крылов // Лит. в школе. - 2005. - № 8. - С. 11-15.

Щеблыкин, И.П. М. Ю. Лермонтов в движении истории / И.П. Щеблыкин // Лит. в школе. - 2005. - № 8. - С. 8-10.

Скатов, Н. Всеведенье пророка / Н. Скатов // Лит. в школе. - 2005. - № 8. - С. 2-7.

Мельников, Л. После дуэли... / Л. Мельников // Природа и человек (Свет). - 2005. - № 7. - С. 66-68.

Кошелев, В.А. Нужен ли Печорину "личный психолог"? / В.А. Кошелев // Лит. в школе. - 2005. - № 3. - С. 26-27.

Егоров, О.Г. Нервический характер в русской литературе / О.Г. Егоров // Лит. в школе. - 2005. - № 3. - С. 23-25.

Зылевич, Д.П. Эволюция мотивов обмана и абсурда в лирике М.Ю. Лермонтова / Д.П Зылевич // Нар. асвета. - 2004. - № 12. - С. 42-45.

Эльзон, М. Об авторе стихотворения "Прощай, немытая Россия..." / М. Эльзон // Звезда. - 2004. - № 2. - С.205-209.

Мороз, Д.П. Знаковое издание сочинений М.Ю. Лермонтова / Д.П. Мороз // Здабыткі. - Мн., 2002. - С. 159-167.

Ляшчэня, Т. Паэзія Міхаіла Лермантава ў творчасці Анатоля Багатырова / Т. Ляшчэня // Род. Слова - 2002. - № 10. - С. 93-97.

Мильдон, В. Лермонтов и Киркегор: феномен Печорина / В. Мильдон // Октябрь. - 2002. - № 4. - 177-187.

Семёнова, С.Г. Вестничество Лермонтова / С.Г. Семёнова // Человек. - 2002. - № 1. - С. 169-185.

Нетупская, О. Драмы Лермонтова на современной сцене в свете романтизма и антиромантизма / О. Нетупская // Новый мир. - 2002. - № 3. - С. 168-174.

(імёны)

## Матросаў Аляксандр Мацвеевіч (1924-1943)

**Матросаў Аляксандр Мацвеевіч** нарадзіўся ў 1924 у г. Днепрапятроўск, Украіна.

У Чырвонай Арміі з 1942. Ваяваў на Калінінскім фронце. 23 лютага 1943 у баі за в. Чарнушкі (Пскоўская вобл.), гвардыі радавы Матросаў сваім целам закрыў амбразуру нямецкага дзота, гэтым забяспечыў поспех атакі падраздзялення. Герой Савецкага Саюза (1943). У гады Вялікай Айчыннай вайны подзвіг А.М. Матросава паўтарылі многія савецкія воіны, у т.л. беларус П.І. Купрыянаў.

Імем А. Матросава названа **вуліца** ў Маскоўскім раёне Мінска.

**Літаратура:**

Матросаў Аляксандр Мацвеевіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 10. - Мн., 2000. - С. 205.

Матросов Александр Матвеевич // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 409.

Улица Матросова // Виногоров Н.А. Улицы Московского района г. Минска. - Мн., 1999. - С. 40–41.

В честь героев минувших боев [А.М. Матросов] // Жучкевич В.А. Улицы помнят. - Мн., 1979. - С. 72.

Пламенное сердце [А.М. Матросов] // Петраченко Д.Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 48-50.

(імёны)

# Орда Напалеон
# (1807 – 1883)

**Орда Напалеон** нарадзіўся 11.2.1807 у в. Варацэвічы Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці.

Піяніст, кампазітар, педагог, муз. пісьменнік, мастак. Творчасць звязана з мастацкім жыццём Беларусі і Польшчы. З 1823 вучыўся ў Віленскім універсітэце, з якога ў 1827 выключаны за прыналежнасць да тайнага студэнцкага таварыства «Заране». Удзельнік паўстання 1830 — 1831, пасля яго задушэння эмігрыраваў у Францыю, дзе ў 1833 удасканальваў майстэрства ігры на фартэпіяна ў Ф.Шапэна. У 1838 выдаў «Альбом твораў польскіх кампазітараў», свае творы для фартэпіяна (паланэзы, вальсы, серэнады, мазуркі), рамансы і песні на словы С.Вітвіцкага і А.Плуга. У сярэдзіне 1840-х г. — дырэктар Італьянскай оперы ў Парыжы; там жа атрымаў мастацкую адукацыю ў студыі П.Жэрара. З 1856 жыў у Варацэвічах, у 1862—1863 у Гродне, потым на Валыні, быў хатнім настаўнікам музыкі. Лепшыя яго музычныя творы, асабліва паланэзы, вызначаюцца маштабнасцю, віртуозным стылем, меладычнасцю, драматызмам, разнастайнасцю і багаццем фактуры; у некаторых творах пераважае лірычны пачатак, у паланэзахназіраецца імкненне да «паэмнасці», што характэрна для эвалюцыі жанру ў сярэдзіне 19 ст. Аўтар «Граматыкі музыкі» (Варшава, 1873). Шмат падарожнічаў па Беларусі, Украіне, Польшчы і Літве, рабіў замалёўкі мясцін, звязаных з жыццём вядомых людзей, і архітэктурных помнікаў. Вялікую каштоўнасць для гісторыі архітэктуры маюць архітэктурныя замалёўкі (больш за 200 па Беларусі), якія вызначаюцца строгай дакументальнасцю. Паводле яго малюнкаў і акварэлей у 1873—83 створаны (мастак А.Місуровіч) і выдадзены ў Варшаве літаграфіі (260 графічных аркушаў у 8 серыях).

У Мінску яго імем названа **вуліца** (2007).

**Літаратура:**

Орда Напалеон // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 11. – Мінск, 2000. – С. 443-444.

Несцярчук, Леанід Міхайлавіч. Напалеон Орда. Шлях да Бацькаўшчыны : [кніга-альбом] / Леанід Несцярчук. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2009. – 429, [1]с.

Спадчына Напалеона Орды (з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі) / Нацыянальная бібліятэка Беларусі. – Мінск: Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2007. – 1 электронны аптычны дыск (CD-ROM).

Климчук, Виталий Андреевич. Наполеон Орда. Творец архитектурного пейзажа / В.Климчук. – Брест : Альтернатива, 2007. – 39с.:ил.

Напалеон Орда : [альбом] : з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі / [укладальнікі: В.К.Чаропка, Дз.Э.Герасімовіч]. – Мінск : Беларусь, 2006. – 163с., 1л.партр.

Лакотка, А. Напалеон Орда: жыццё, творчасць, мастацкая спадчына / Аляксандр Лакотка // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 3. – С. 76-78.

Кенько, Т. Наполеон Орда и Михаил Микешин / Татьяна Кенько // Всемирная литература. – 2007. – № 3. – С. 223-239.

Чаропка, В. Творчы геній Напалеона Орды / Вітаўт Чаропка // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 2. – С. 48-55.

11 лютага - 200 год з дня нараджэння Напалеона Орды (1807-1883), кампазітара, піяніста, педагога // Новыя кнігі. Па старонках беларускага друку. – 2006. – № 11. – С. 20 - 23.

Мароз У. За брамай забытых мелодый // За брамай забытых мелодый / У. Мароз. – Мінск, 2004. – С. 106-114.

Карпук, І. Зноў на радзіме...: апошні перыяд жыцця Напалеона Орды / І. Карпук // Роднае слова. – 2003. – № 12. – С.66-67.

Карпук, І. Водар Парыжа... : Напалеон Орда ў Францыі / І. Карпук // Роднае слова. – 2003. – № 9. – С.92-94.

Карпук, І. З Варанцэвічаў у Парыж... : дзяцінства і юнацтва Напалеона Орды / І. Карпук // Роднае слова. – 2003. – № 4. – С.95-97.
Гапоненка, В. Напалеон Орда (1807-1883) / В. Гапоненка // Славутыя імёны Бацькаўшчыны. – Мн., 2000. – Вып.1. – С.220-232.

**(імёны)**

## Рафіеў Наджафкулі
## (1912-1970)

**Рафіеў Наджафкулі** нарадзіўся 21.04.1912 у г. Ордубад Нахічэванскай АССР, Азербайджан.

Скончыў 9 класаў, працаваў шафёрам. У Чырв. Арміі з 1935. З 1941 на Паўднева-Заходнім і 1-м Беларускім франтах. Камандзір танкавага ўзвода малодшы лейтэнант Н. Рафіеў асоба вызначыўся ў Беларускай аперацыі 1944: танкісты завалодалі пераправай праз р. Пціч, перарэзаў шляхі адыходу праціўніка ў напрамку Бабруйск – Глуск. 27.06.1944 танкавы ўзвод варваўся ў населены пункт Леніна Магілёўскай вобл. Герой Савецкага Саюза (1944). Пасля вайны скончыў Вышэйшую афіцэрскую школу самаходнай артылерыі (1951). З 1956 маёр запаса Н. Рафіеў жыў і працаваў у Баку. Памёр 24.12.1970.

Рашэннем Мінгарвыканкама № 208 ад 24 чэрвеня 1976 імем Н. Рафіева названа **вуліца** ў Маскоўскім раёне Мінска. На доме № 1 па вул. Рафіева ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Рафиев Наджаф-Кули // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 512.
Улица Рафиева // Виногоров Н.А. Улицы Московского района г. Минска. - Мн., 1999. - С. 49.

## Сапега Леў Іванавіч
## (1557-1633)

**Сапега Леў Іванавіч** нарадзіўся 4.4.1557 у в. Астроўна Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці.

Беларускі дзяржаўны дзеяч ВКЛ. З магнацкага роду Сапегаў. Пісар вялікі ВКЛ у 1581—1585, падканцлер у 1585—1589, канцлер у 1589—1623, ваявода віленскі з 1623 і адначасова гетман вялікі з 1625. Вучыўся ў кальвінісцкіх настаўнікаў у Нясвіжы, у 1570—1573 у Лейпцыгскім універсітэце, дзе перайшоў у кальвінізм. У 1579—1581 прымаў удзел у Лівонскай вайне 1558—1583. Разам з канцлерам А.Б.Валовічам і падканцлерам К.Радзівілам удзельнічаў у стварэнні Трыбунала Вялікага княства Літоўскага. У 1584 падпісаў у Маскве пагадненне аб перамір'і. У 1586 перайшоў у каталіцтва. У час бескаралеўя ў 1587 прапанаваў план федэрацыі Польшчы, ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы з адным каралём, якім прапаноўваўся цар Фёдар Іванавіч. Калі гэты план не быў рэалізаваны, падтрымаў кандыдатуру Жыгімонта III Вазы. Узначальваў соймавую камісію па падрыхтоўцы Статута Вялікага княства Літоўскага 1588, адрэдагаваў яго тэкст і фінансаваў яго выданне ў віленскай друкарні Мамонічаў. На царкоўным саборы ў Брэсце ў 1596 як каралеўскі камісар выступіў у абарону царкоўнай уніі. Паводле яго загаду ў 1594—1607 былі нанава перапісаны кнігі Метрыкі Вялікага княства Літоўскага, каб пры карыстанні яны не прыходзілі ў непрыгоднасць (новыя кнігі захаваліся да нашага часу). У 1600-1601 узначальваў пасольства ў Маскву, у выніку якога перамір'е працягнута яшчэ на 20 гадоў. Сапега не падтрымаў Ілжэдзмітрыя I, бо лічыў за лепшае заключыць унію з Маскоўскай дзяржавай. У 1609, пераканаўшыся, што унія з Масквой не адбудзецца, выступіў за вайну Рэчы Паспалітай з

Расіяй 1609—1618 і падтрымаў Ілжэдзмітрыя II. У 1617—1618 садзейнічаў арганізацыі і фінансаванню паходу каралевіча Уладзіслава на Маскву. Удзельнічаў у перагаворах з маскоўскімі пасламі, у выніку чаго падпісана Дэулінскае перамір'е 1618. Пасля забойства уніяцкага полацкага архіепіскапа Іасафата Кунцэвіча віцебскімі праваслаўнымі мяшчанамі ў 1623 Сапега ўзначаліў судовую камісію, якая вынесла суровыя пакаранні ўдзельнікам забойства. У 1625 удзельнічаў у вайне Рэчы Паспалітай са Швецыяй 1600-1629 на чале дывізіі ў Інфлянтах. У сваёй палітыцы адстойваў суверэнітэт ВКЛ у складзе федэратыўнай Рэчы Паспалітай, няўхільна прытрымліваўся 12-га артыкула 3-га раздзела Статута ВКЛ 1588, які забараняў раздаваць польскай шляхце маёнткі і займаць ёй дзяржаўныя пасады ў ВКЛ.

У Мінску яго імем названа **вуліца.**

**Літаратура:**

Сапега Леў Іванавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 14. – Мінск, 2002. – С. 166.

Саверчанка І.В. Канцлер Вялікага Княства. Леў Сапега : / Іван Васільевіч Саверчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 63с., [8]л.іл. – (Нашы славутыя землякі).

Мяснікоў, А. "Языком... своим власным права списаныя маем..." : жыццё і дзейнасць канцлера Льва Сапегі / Анатоль Мяснікоў // Полымя. – 2009. – № 5. – С. 197-203.

Дудзюк, З. Берасцейскі староста : урывак з эсэ пра Льва Сапегу / Зінаіда Дудзюк // Маладосць. – 2008. – № 11. – С. 138-139.

Мяснікоў, А.Ф. Леў Сапега (1557-1633): "Айцец Айчыны" "залатога веку" / Анатоль Фёдаравіч Мяснікоў // Сто асоб беларускай гісторыі: гістарычныя партрэты / Анатоль Фёдаравіч Мяснікоў. – Мінск, 2008. – С. 60-63.

Казбярук, У.М. Пасольства Льва Сапегі / Уладзімір Міхайлавіч Казбярук // Нашы вытокі: пошукі гісторыка-літаратурнай праўды: эсэ, разважанні, палемічныя артыкулы / Уладзімір Міхайлавіч Казбярук. – Мінск, 2007. – С. 116-142.

Чаропка, В. Спакой Айчыны да скону дзён буду сцерагчы"/ Вітаўт Чаропка // Лёсы ў гісторыі / Вітаўт Чаропка. – Мінск, 2005. – С. 211-219.

Ліставанне Льва Сапегі і Ясафата Кунцэвіча // Анталогія даўняй беларускай літаратуры : XI - першая палова XVIII стагоддзя / [навуковы рэдактар В.А.Чамярыцкі]. – Мінск, 2003. – С.665-673.

**(імёны)**

## Свярдлоў Якаў Міхайлавіч
## (1885 – 1919)

Гл. Ленінскій раён.

**(імёны)**

## Смірноў Юрый Васілевіч
## (1925-1944)

**Смірноў Юрый Васілевіч** нарадзіўся 02.09.1925 у в. Дзешуава Макар’еўскага раёна Кастрамской вобл., Расія.

На фронце з 1943. Стралок гвардыі малодшы сяржант Смірноў вызначыўся пры вызваленні Віцебскай вобл. 24 чэрв. 1944 у складзе танкавага дэсанта прарваўся ў тыл ворага каля в. Шалашына Дубровенскага раёна. Цяжка паранены трапіў у палон. Нягледзячы на катаванні не выдаў ворагу ваеннай тайны і быў распяты на сцяне бліндажа. Пахаваны ў г.п. Арэхаўск. У в. Шалашына на месце яго гібелі установлены помнік. Герой Савецкага Саюза (1944).

Рашэннем Мінгарвыканкама № 349 ад 26 сакавіка 1953 яго імем была названа **вуліца** ў Маскоўскім раёне Мінска.

**Літаратура:**

Смірноў Юрый Васільевіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 15. - Мн., 2002. - С. 58.

Смирнов Юрий Васильевич // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 559.

Улица Смирнова // Виногоров Н.А. Улицы Московского района г. Минска. - Мн., 1999. - С. 51-52.

В честь героев минувших боев [Ю.В. Смирнов] // Жучкевич В.А. Улицы помнят. - Мн., 1979. - С. 73.

Навечно в строю [Ю.В.Смирнов] // Петраченко Д.Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 55-58.

(імёны)

## Стасаў Уладзімір Васілевіч
## (1824 – 1906)

**Стасаў Уладзімір Васілевіч** нарадзіўся 14.01.1824 у С.-Пецярбургу.

Рускі мастацкі і музыкальны крытык, гісторык мастацтва. Сын Васіля Пятровіча Стасова, вядомага рускага архітэктара. Ганаровы член Расійскай Акадэміі навук (1900).

Скончыў Вучылішча правазнаўства (1843). З 1872 загадчык мастацкага аддзела Публічнай бібліятэкі (цяпер Публічная бібліятэка імя М. Салтыкова-Шчадрына).

З 1847 публікаваў у друку артыкулы па літаратуры, мастацтве, музыцы. Выступаў супраць акадэмізму, быў прыхільнікам рэалістычнага мастацтва, дэмакратызацыі мастацкага жыцця. Актыўна ўдзельнічаў у творчым жыцці Арцелі мастакоў, Таварыства перасоўнікаў, кампазітараў «Новай рускай музычнай школы», названай ім «Магутнай кучкай». Даследаваў і прапагандаваў творчасць М. Глінкі (больш за 30 работ). Аўтар манаграфій пра кампазітараў А. Барадзіна, М. Мусаргскага, мастакоў М. Антакольскага, К. Брулова, В. Верашчагіна, М. Ге, А. Іванава, І. Крамскога, В. Пярова, І. Рэпіна, творчых партрэтаў майстроў выканальніцкага мастацтва (А. Рубінштэйна і інш.). Адзін з першых пачаў збіраць і публікаваць эпісталярную спадчыну рускіх мастакоў і кампазітараў.

**Вуліца** ў Маскоўскім раёне Мінска носіць імя У.В. Стасава з 1966 года.

**Літаратура:**

Стасаў Уладзімір Васілевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т.15.- Мн., 2002. - С. 168.

Стасов Владимир Васильевич // Популярная художественная энциклопедия : в 2 т. Т.2. – М., 1986. – С. 259.

Стасов Владимир Васильевич // Музыкальная энциклопедия: в 6 т. Т.5. – М., 1981. – С. 260-264.

Лебедев, А.К., Солодовников, А.В. В.В. Стасов. - М., 1982. - 191с. - (Человек. События. Время).

Стасов, В.В. Избранные статьи о русской живописи. – М., 1984. – С. 8-14.

Лебедев, А.К. Художник и судьбы народа. – М., 1983. – С. 27-68.

Салита, Е.Г. Стасовы в Петербурге – Петрограде. – М., 1982. – С. 138-150.

Алексеев, А.И. Искания правды. – М., 1980. – С. 46-56

(імёны)

## Талаш Васіль Ісакавіч
## (1844-1946)

**Талаш Васіль Ісакавіч** нарадзіўся 25.12.1844 у в. Белка Петрыкаўскага р-на Гомельскай вобл.

Удзельнік партызанскага руху на Беларусі ў грамадз. 1918 – 1920 і Вялікую Айчынную войны. Народны герой. У 1919 арганізаваў і ўзначаліў партызанскі атрад (300 чал). Пасля грамадзянскай вайны з 1921 старшыня Навасёлкаўскага сельсавета. Узнагароджаны ордэнам Чырв. Сцяга. У час Айчыннай вайны 100-гадовы Талаш памагаў партызанам, за што арыштаваны акупантамі і пасаджаны ў петрыкаўскую турму. Пасля вызвалення супрацоўнічаў з Мінскім падпольным абкомам КП(б)Б. У пачатку 1943 з партызанскага аэрадрома Зыслаў перапраўлены ў Маскву, дзе выступаў перад рабочымі, воінамі, якія адпраўляліся на фронт. Лістоўкі з заклікам Талаша да барацьбы супраць гітлераўцаў распаўсюджваліся на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Узнагароджаны ордэнам

Айчыннай вайны 1-й ступені. У г. Петрыкаў яму пастаўлены помнік. Прататып дзеда Талаша ў аповесці Я. Коласа “Дрыгва”. У в. Навасёлкі Дом-музей дзеда Талаша.

Яго імем названа **вуліца** ў Маскоўскім раёне Мінска.

**Літаратура:**

Талаш Васіль Ісакавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 15. - Мн., 2002. - С. 400.

Талаш Василий Исакович // Их именами названы...: Энцикл. справ. – Мн., 1987. - С. 590.

Улица Талаша // Виногоров Н.А. Улицы Московского района г. Минска. - Мн., 1999. - С. 54.

Дед Талаш // Петраченко Д.Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 177-180.

Жигоцкий Н. Народный герой // Нар. газ. – 2004. - 28 снеж. – С. 3.

Карпович О. Улыбка Талаша // Сов. Белоруссия (Беларусь сегодня). – 2004. - 18 дек. - С. 13.

(імёны)

## Хмялеўскі Канстанцін Іосіфавіч (1905-1943)

**Хмялеўскі Канстанцін Іосіфавіч** нарадзіўся ў 1905 у Мінску.

З 1921 рабочы на чыгунцы, шчацiннай фабрыцы, на гаспадарчай рабоце. У час акупацыі Мінска з вер. 1941 удзельнічаў у арганізацыі падполля, разам з М.К. Каржанеўскім кіраваў партыйным падполлем у Кастрычніцкім р-не г. Мінска, накіроўваў дзейнасць камсамольска-маладзёжных груп. З мая 1942 сакратар Кастрычніцкага райкома КП(б)Б. З чэрв. 1942 член Мінскага падпольнага гаркома КП(б)Б, загадчык аддзела па арганізацыі дыверсій. Удзельнічаў у распаўсюджванні падпольнай газеты «Звязда» і лістовак. У кастр. 1942 арыштаваны і вясной 1943 закатаваны ў фашысцкіх засценках.

Імем К.І. Хмялеўскага названа **вуліца** ў Маскоўскім раёне Мінска.

**Літаратура:**

Хмялеўскі Канстанцін Іосіфавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 17. - Мн., 2003. - С. 35.

Хмялеўскі Канстанцін Іосіфавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 6. - Кн. 2. - Мн., 2003. - С. 70.

Улица Хмелевского // Виногоров Н.А. Улицы Московского района г. Минска. - Мн, 1999. - С. 56-57.

В честь героев минувших боев [К.И. Хмелевский] // Жучкевич В.А. Улицы помнят. - Мн., 1979. - С. 85.

Портрет героя [К.И. Хмелевский] // Петраченко Д.Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 102-104.

Жаворонков Б. Ей уже сорок лет // Минский курьер.- 2004. - 12 нояб. - С. 24.

(ім ёны)

## Чачот Ян Антоні (1796 – 1847)

**Чачот Ян Антоні** нарадзіўся 7.7.1796 у в. Малюшычы Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці.

Беларускі. і польскі паэт, фалькларыст, этнограф. Скончыў Навагрудскую дамініканскую школу (1815), дзе пасябраваў з А.Міцкевічам. Вучыўся ў Віленскім універсітэце (1815—1816). Працаваў у бюро па ўпарадкаванні архіваў кн. Радзівілаў (Вільня). З 1818 член таварыства філаматаў, пісаў песні і вершы на беларускай і польскай мовах для студэнцкіх сходаў. З 1820 узначальваў літаратурны (блакітны) аддзел таварыства філарэтаў. У 1823 за прыналежнасць да студэнцкіх згуртаванняў зняволены ў Віленскую турму, дзе склаў рукапісны зб. «Песенькі і іншыя вершы». У 1824 сасланы на Урал (турэмнае зняволенне адбываў у крэпасці Кізіл), у 1825 пераведзены ва Уфу, у 1831 — у

Цвер. У 1833 вярнуўся на радзіму, працаваў на Лепельшчыне і ў бібліятэцы Храптовічаў на Навагрудчыне.

Пісаць пачаў у філамацкі перыяд. У 1818—1819 напісау каля 10 балад (збераглося 8), засн. на беларускім фальклоры («Свіцязь», «Бекеш», «Узногі», «Мышанка», «Калдычэўскі шчупак», «Наваградскі замак», «Падземны звон на горцы ў Пазяневічах», «Радзівіл, альбо Заснаванне Вільні»). Адстойваў інтарэсы самага бяспраўнага ***класа*** тагачаснага беларускага грамадства — сялянства, выказваўся за адмену прыгоннага права («Узногі»). Збіраў і вывучаў фальклор. Выдаў 6 фальклорных зборнікаў “Сялянскія песні” (1837—1846), куды ***ўвай***шлі 1000 песень у перакладзе на польскую мову і ў арыгінале, прыказкі і прымаўкі, слоўнік беларускай мовы (200 слоў) і ўласныя вершы. Аўтар кніг «Аповесці для маладых дзяўчат» (1845), «Некаторыя заўвагі, якія асабліва датычацца стылю трэцяй песні «Анафеляс» з «Вітаўтавых баёў» П.Крашэўскага» (1846), лібрэта аперэты «Малгажата з Зембаціна». Выяўлены вялікі цыкл яго песень-балад на польскай мове «Спевы пра даўніх ліцвінаў да 1434 г.» (нап. ў 1842—1844, апубл. ў перакладзе на беларускую мову 1996). Многія яго вершы пакладзены на музыку Т.Занам. На беларускую мову творы Чачота пераклаў К.Цвірка.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (2007).

**Літаратура:**


Чачот Ян Антоні // Беларуская энцыклапедыя: у18 т. Т. 17. – Мінск,2003. – С. 264-265.

[Ян Чачот (1796-1847)] // Ляшук В.Я., Снітко, Г.М. Літаратурная Берасцейшчына. – Мінск, 2008. – С. 108-112.

Русаковіч, Н. Адраджэнцы, збіральнікі народнай песні Ян Чачот і Аляксандр Пушкін / Ніна Русаковіч // Роднае слова. – 2008. – № 9. – С. 10-12.

Марціновіч А. Лятуць дзікія гусі...Ян Чачот // Хто мы, адкуль мы...: гістарычныя эсэ, нарысы. У 3 кн. Кн. 1 / А. Марціновіч. – Мінск, 2008. – С. 390-408.

Тарасюк, Л.К. Мастацкія кірункі і плыні ў літаратуры Беларусі XIX стагоддзя / Л.К. Тарасюк // Беларуская мова і літаратура. – 2006. – № 4. – С. 33-38.

Петрушкевіч, А. "Толькі Айчына і Зося": вершы Яна Чачота да Зосі Малеўскай / Ала Петрушкевіч// Роднае слова. – 2006. – № 6. – С. 14-16.

Чаропка, В. Адданы народнай паэзіі // Лёсы ў гісторыі / В. Чаропка. – Мн., 2005. – С. 415-424.

Бароўская, І. "Плакала бяроза ды гаварыла..." / І. Бароўская // Род. слова. - 2004. - № 10. - С.24-27.

Цвірка, К. Абарваная песня Яна з Мышы // Камяні тых сядзібаў / К. Цвірка. - Мн., 2004. - С.47-81.


**(імёны)**

## Шацько Вікенцій Данілавіч
## (1918-1944)

**Шацько Вікенцій Данілавіч** (падп. псеўданім Огнеў) нарадзіўся 1.04.1918 у Мінску.

У 1932-1939 працаваў на заводзе імя Кірава. З 1939 на партыйнай рабоце ў Беластоцкім р-не. З 1941 кіраўнік падпольнай групы на Мінскім чыгуначным вузле. Пад яго кіраўніцтвам падпольшчыкі толькі ў красав. - маі 1943 узарвалі 4 эшалоны ворага з гаручым і авіябомбамі. У 1943 арыштаваны і пакараны смерцю.

Імем В.Д. Шацько названа **вуліца** ў Маскоўскім раёне Мінска.

**Літаратура:**


Улица Шатько // Виногоров Н.А. Улицы Московского района г. Минска. - Мн., 1999. - С. 59.

Его кличка "Огнев" [В.Д. Шатько] // Петраченко Д.Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 155-157.


**(імёны)**

## Ясенін Сяргей Аляксандравіч
## (1895-1925)

**Ясенін Сяргей Аляксандравіч** нарадзіўся 3.10.1895, в. Канстанцінава (цяпер Ясеніна) Рыбнаўскага р-на Разанскай вобл. Рускі паэт.

Скончыў царкоўна-настаўніцкую школу ў Спас-Клепіках (1912). У 1912-15 працаваў канторшчыкам, карэктарам, вучыўся ў Народным універсітэце імя А. Шаняўскага ў Маскве, удзельнічаў у Сурыкаўскім літаратурна-музейным гуртку. Скончыў жыццё самагубствам 28.12.1925 у Ленінградзе. Пахаваны ў Маскве.

Друкаваўся з 1914 (верш “Бяроза”). З першых зборнікаў “Радуніца”(1916), “Блакіт”, “Ператварэнне”, “Сельскі часаслоў” (усе 1918) выступіў як тонкі лірык, майстар глыбока псіхалагізаванага пейзажу, пясняр вясковай Русі, знаўца народнай мовы і народнай душы. У 1919-23 уваходзіў у групу імажыністаў. У паэмах “Балада пра дваццаць шэсць”, кнізе “Русь Савецкая” (абедзве 1924) імкненне спасцігнуць паслярэвалюцыйную Расію. У паэме “Ганна Снегіна” (1925) рамантычнае каханне на фоне рэвалюцыйных падзей у роднай вёсцы. Пачуццём душэўнага прасвятлення, светлага кахання, шчырай любові да Радзімы прасякнуты цыкл вершаў “Персідскія матывы” (1925). Аўтар драматычных паэм “Пугачоў” (1922), “Краіна нягоднікаў” (1924-26), аповесці “Яр” (1916), апавяданняў “Бабыль і Дружок” (1917) і іншыя.

Творчасць Ясеніна зрабіла ўплыў на многіх паэтаў свету, у тым ліку і на беларускіх (А. Астрэйка, А. Куляшоў і іншыя). Асабліва блізкая беларускай паэзія яго лірыка, у якой праз карціны і вобразы прыроды выяўлены глыбокія чалавечыя пачуцці. Артыкулы і рэцэнзіі пра творы рускага паэта пісалі З. Бядуля, С. Грахоўскі і іншыя, яго памяці прысвяцілі свае вершы А. Дудар, М. Танк, С. Законнікаў і іншыя, на беларускую мову асобныя творы паэта перакладалі і перакладаюць Ю. Гаўрук, А. Дудар, Р. Барадулін, С. Грахоўскі і іншыя.

На радзіме Ясеніна мемарыяльны музей, праводзяцца святы паэзіі, у якіх удзельнічаюць і беларускія паэты.

Яго імем у 1987 названа **вуліца** ў Мінску (мікраёраён Малінаўка).

**Літаратура:**

Ясенін Сяргей Аляксандравіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18т. Т. 18. Кн. 1. – Мн., 1996. – С. 308.

Ясенін Сяргей Аляксандравіч // Беларуская савецкая энцыклапедыя: у 12т. Т. 11. – Мн., 1974. – С. 564-565.

Ясенін Сяргей Аляксандравіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі:у 5т. Т. 5. – Мн., 1987. – С. 696-697.

Есенин Сергей Александрович // Краткая литературная энциклопедия: в 8т. Т. 2. – М., 1966. – С. 898-900.

Маслов, А.В. Загадочная петля. Тайна последних дней Сергея Есенина / Александр Васильевич Маслов. - Ростов-на-Дону, 2006. - 286с.

Соколов, Б. Сергей Есенин. Красная нить судьбы / Борис Соколов. - Москва, 2005 - 510с.

Хлысталов, Э. Тайна гибели Есенина. Записки следователя из "Англетера" / Эдуард Хлысталов. - Москва, 2005. - 479с. - (Русские тайны ).

Куняев, С.Ю. Жизнь Есенина. Снова выплыли годы из мрака... / Станислав Куняев, Сергей Куняев. - М., 2001. - 603с. - (Бессмертные имена).

Голикова, Н.Ю. История любви. Айседора Дункан. Сергей Есенин. - М., 1998. - 142с.

Куняев, С.Ю. Сергей Есенин : [биография и исследование лит.и полит.жизни] / Станислав Куняев, Сергей Куняев. - М., 1995. - 572с. - (Жизнь замечательных людей; Вып. 727).

Сидорина, Н. Златоглавый: тайны жизни и гибели Сергея Есенина. - М., 1995. - 301с.
Дункан, А. Моя исповедь / Айседора Дункан. - Минск, 1994. - 222с.

Хлысталов, Э.А. 13 уголовных дел Сергея Есенина: по материалам секретных архивов и спецхранов. - М., 1994. - 151с.

Как жил Есенин: мемуарная проза / [сост., авт. послесл., коммент. А.Л. Казаков]. - Челябинск, 1992. - 381с.

Крученых, А.Е. Есенин и Москва кабацкая. - Мн., 1992. - 37с.

Любовь и смерть Сергея Есенина: [Как убили Есенина; Исповедь Айседоры Дункан; Дневник Галины Бениславской]. - М., 1992. - 158с. - (Чудеса и приключения).

Кошечкин, С.П. Весенней гулкой ранью...: этюды-раздумья о Сергее Есенине. - Мн., 1989. - 239с.

Жизнь Есенина : рассказывают современники / [сост., вступ.ст. и примеч. С.П. Кошечкин]. - М., 1988. - 607с. - ( Литературные воспоминания).

Эвентов, И.С. Сергей Есенин : книга для учащихся / И.С. Эвентов.- М., 1987. - 159с. - (Биография писателя).

В мире Есенина : сборник статей / [составители: А.А. Михайлов, С.С. Лесневский]. - Москва, 1986 - 654с.

Сергей Есенин : воспоминания родных / [сост. Т. Флор, Н. Есенина, С. Митрофанова]. - М., 1985. - 157с.

Сергей Есенин: "Я знаю, ты умереть готова, но смерть твоя будет жива" // Аннинский, Л. Серебро и чернь. - М., 1997. - С. 188-204.

Дзямко, В. Тодар Кляшторны і Сяргей Ясенін як прадстаўнікі экзістэнцыялізму / Вольга Дзямко // Роднае слова. - 2007. - № 4. - С. 12-13.

Занковская, Л.В. С. Есенин и Б. Пастернак в контексте русской литературы XX века / Людмила Васильевна Занковская // Литература в школе. - 2005. - № 12. - С. 13-19.

Макашева, С.Ж. Эволюция есенинского имажинизма ("органической образности") / Салтанат Жолдасбековна Макашева // Литература в школе. - 2005. - № 12. - С. 2-5.

Мишин, Е. Есенина не убивали / беседовала с судэкспертом Евгением Мишиным Татьяна Ромашенкова // Огонёк. - 2005. - № 51. - С. 54-55.

Шубникова-Гусева, Н.И. "Пришёл в этот мир поэт..." / Наталья Игоревна Шубникова-Гусева // Лит. в школе. - 2005. - № 11. - С. 8-14.

Радечко, П. Чародей русского слова / Петр Радечко // Нёман. - 2005. - № 10. - С. 182-190.

Адуло, Т. Роща золотая / Тадеуш Адуло // Бел. думка. - 2005. - № 10. - С. 102-108.

Коленчикова, Н. Была бы душа жива... / Нина Коленчикова // Немига литературная. - 2005. - № 4. - С. 115-128.

Кенька, М. Сяргей Ясенін у беларускіх перакладах / М. Кенька // Род. слова. - 2004. - № 2. - С.32-36.

Радзечка, П. Сяргей Ясенін і беларуская паэзія / П. Радзечка // Полымя. - 2004. - № 1. - С.204-212.

(на пачатак)

## Партызанскі раён

(імёны)

### Азгур Заір Ісакавіч
### (1908-1995)

**Азгур Заір Ісакавіч** нарадзіўся 15.01.1908 у в. Маўчаны Сенненскага р-на Віцебскай вобл.

Беларускі скульптар. Народны мастак Беларусі (1944), народны мастак СССР (1973). Дзяржаўная прэмія СССР 1946. Член Акадэміі мастацтваў СССР (1958), Герой Сацыялістычнай Працы (1978).

Вучыўся ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме, Ленінградскім і Кіеўскім мастацкіх інстытутах. Працаваў у галіне станкавай і манументальнай скульптуры. У канцы 1920-х –30-я гады стварыў партрэты дзеячоў сацыялістычнага і рэвалюцыйнага руху для Дома ўрада ў Мінску. Стварыў галерэю партрэтаў герояў Вялікай Айчынай вайны, партрэты пісьменнікаў Лу Сіня і Р. Тагора.

Найбольш значныя манументальныя работы: помнікі-бюсты С. І. Грыцаўцу, Я. Купалу ў Мінску, В. І. Талашу ў Петрыкаве, П. М. Машэраву ў Віцебску, помнік Я. Коласу ў Мінску і інш. Сярод станковых работ 1980–х партрэт М. Гусоўскага.

З 1980 кіраўнік Творчай майстэрні скульптуры ў Мінску. Аўтар публіцыстычных твораў па праблемах выяўленчага мастацтва і мемуараў.

**Вуліца** атрымала імя Заіра Азгура у 2000. Мемарыяльная дошка ўстаноўлена ў 2001.

**Літаратура:**

Азгур Заір // Беларуская энцыклапедыя: у18 т. Т. 1. – Мн., 1996. - С. 154.
Азгур Заір // Беларусь: Энцыклапедыя: у 2 т. Т. 1. – Мн., 2002. - С. 22-23.
Азгур Заір // Беларусь: Энцыклапедычны даведнік. – Мн., 1995. - С. 22.
Азгур Заір // Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. Т. 4, 5, 6. – Мн., 1990-1994.
Азгур Заір // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 1. – Мн., 1993. - С. 69.
Азгур Заир // Популярная художественная энциклопедия: в 2т. Т.1. - М., 1986. - С. 16.
Азгур Заір // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва: у 5 т. Т. 1. – Мн., 1984. - С. 58–59.
Азгур,З.І. Тое, што помніцца…: аповед пра час, пра людзей і пра мастацтва : у 5 кн. - Мн., 1994.
Елатомцева, И. С жаждой строить и жить (о З. Азгуре) // И. Елатомцева. Очерки по истории белорусской советской станковой скульптуры. - Мн.,1974.- С. 76-79.
Рудніцкая,В. «Мне хацелася перадаць рухі душы паэта…»: вобразы народных песняроў у творчасці З. Азгура / В. Рудніцкая // Роднае слова. - 2003. - № 1. – С. 85-87.
Свірко, І. Гасцей чакаюць у музеі Азгура / І. Свірко // Рэспубліка. - 2000. - 22 лют. - С. 3.

(імёны)

## Анаеў Араз
## (1913–1943)

**Анаеў Араз** нарадзіўся ў 1913 у аўле Кодж, Туркменія.

У 1935 – 1937 служыў у пагранвойсках. Працаваў у міліцыі. На франтах Вялікай Айчыннай вайны з 1942. Праявіў мужнасць і гераізм пры пераправе праз Днепр у р-не Камарына. Вызначыўся 4.10.1943 у баю бліз в. Калыбань Брагінскага р-на Гомельскай вобл. Звязкай гранат падарваў варожую бронемашыну, знішчыў 7 гітлераўцаў і 2 куляметы. Загінуў у гэтым баі. Герой Савецкага Саюза (1944).

**Вуліца** ў Партызанскім раёне Мінска атрымала імя А. Анаева ў 1976.

**Літаратура:**

Аннаев Ораз // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 33.
Аннаев Ораз // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 78.
Аннаев Ораз // Жучкевич В.А. Улицы помнят. - Мн., 1979. - С. 76.
Чернушевич А. Улица имени... [Ораз Аннаев] // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 6.

**(імёны)**

## Бумажкоў Ціхан Піменавіч
## (1909-1941)

**Бумажкоў Ціхан Піменавіч** нарадзіўся 02.07.1909 у г. Дальнярэчанск Прыморскага краю, Расія.

Скончыў Мінскі хіміка-тэхналагічны тэхнікум. З 1935 працаваў дырэктарам завода, старшынёй Петрыкаўскага райвыканкама, з 1939 1-ы сакратар Акцябрскага РК КП(б)Б Палескай вобл. 26.06.1941 сумесна з Ф.І. Паўлоўскім стварыў партызанскі атрад “Чырвоны Кастрычнік”, які з часцямі Чырвонай Арміі 18.07.1941 разграміў штаб нямецкай дывізіі ў в. Воземля Акцябрскага р-на. Першы з савецкіх партызан атрымаў званне Герой Савецкага Саюза (1941). З жн. 1941 начальнік палітаддзела кавалерыйскай групы на Паўдн.-Заходнім фронце. Загінуў у Палтаўскай вобл.

**Вуліца** Партызанскага р-на атрымала імя Ц. Бумажкова ў 1951. Яго імя носяць завулак і праезд.

**Літаратура:**

Бумажкоў Ціхан Піменавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 3. - Мн., 1996. - С. 336-337.

Бумажкоў Ціхан Піменавіч // Беларусь у Вяликай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 104.

Бумажков Тихон Пименович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 97.

Чернушевич А. Улица имени... [Т.П. Бумажков ] // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 6.

(імёны)

## Бядуля Змітрок (сапр. Плаўнік Самуіл Яфімавіч) (1886-1941)

**Бядуля Змітрок** (сапр. Плаўнік Самуіл Яфімавіч) нарадзіўся 23.04.1886 у в. Пасадзец Лагойскага р-на Мінскай вобл.

Беларускі пісьменнік. Вучыўся ў яўрэйскай пачатковай школе і духоўнай семінарыі. У 1912-15 у Вільні; працаваў у выдавецкім таварыстве “Наша ніва”. З 1915 – у Мінску, з 1920 працаваў у газеце “Савецкая Беларусь”, часопіс “Зоркі”. Уваходзіў у літаратурнае аб’яднанне “Маладняк”, пасля – ва “Узвышша”.

Першы друкаваны твор – абразок “Пяюць начлежнікі” (1910) Друкаваўся таксама ў часопісах “На берегах Невы” (Пецярбург) і “Молодые порывы” (Вільня). Першая кніга – зборнік лірычных імпрэсій-мініяцюр “Абразкі”, жанрава блізкіх да вершаў у прозе.

У апавяданнях “Пяць лыжак зацiркі”, “Умарыўся”, “Злодзей” і іншыя – праблема беларускага сялянства. 1920–30-я – перыяд ідэйна-творчага росту пісьменніка. Зборнікі паэзіі - “Пад родным небам”, “Буралом” і іншыя, зборнікі апавяданняў – “На зачарованых гонях” і іншыя, сацыяльна-псіхалагічны раман “Язэп Крушынскі”, аўтабіяграфічныя аповесці “Набліжэнне”, “У дрымучых лясах”.

Выступаў як публіцыст, пісаў творы для дзяцей, літаратурна-крытычныя артыкулы, нарысы, перакладчык, даследваў пытанні этнаграфіі і фальклору. Памёр 03.11.1941.

Імем пісьменніка названы **вуліца** ў Мінску ў 1956 , устаноўлены мемарыяльная дошка ў 1957 г.

**Літаратура:**

Бядуля Змітрок // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т. 3. - Мн., 1996. - С. 392-393.

Бядуля Змітрок // Тэатральная Беларусь:Энцыклапедыя: у 2 т. Т. 1. - Мн., 2002. - С.191-192.

Бядуля Змітрок // Беларусь:Энцыклапедычны даведнік. - Мн., 1995. - С. 139.

Бядуля Змітрок // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. - Т. 2. - Мн., 1994. - С. 159-161.

Бядуля Змітрок // Беларускія пісьменнікі: бібліяграфічны слоўнік: у 6 т. Т. 1. - Мн., 1994. - С. 451-452.

Бядуля Змітрок // Беларускія пісьменнікі,1917-1990.Даведнік. - Мн., 1994. - С. 80-82.

Бядуля Змітрок // Гісторыя беларускага мастацтва: У 6 т. Т. 4, 5, 6. - Мн., 1990-1994.

Бядуля Змітрок // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. - Мн., 1988. - С. 178-179.

Бядуля Змітрок // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. Т. 1. - Мн., 1984. - С. 539.

Бядуля Змитрок // Их именами названы…: энциклопедический справочник. - Мн., 1987. - С. 100-101.

Бядуля Змитрок // Краткая литературная энциклопедия? Т.1. - М., 1962. - С. 810.

Ранняя творчасць Змятрака Бядулі: сувязь з эстэтыкай сімвалізму і імпрэсіянізму // Максімовіч В. Беларуская літаратура першай трэці ХХ стагоддзя. - Мн., 2006. - С. 208-233.

Бядуля Змітрок // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя: у 4 т. Т. 1-4. - Мн., 2001-2003.

Аўрамчык,М. Зменлівае ўражанне // Аўрамчык М.Я. Знаёмыя постаці. - Мн., 2004.-С. 64-67.

(імёны)

## Ванееў Уладзімір Рыгоравіч (1896-1941)

**Ванееў Уладзімір Рыгоравіч** нарадзіўся 6.08.1896 у в. Шыпічоўшчына Кацельніцкага р-на Кіраўск. вобл., Расія.

Партыйны і дзярж. дзеяч БССР. З 1915 на Зах. фронце. Удзельнік грамадзянскай вайны. Вучыўся ў прамысл. Акадэміі ў Маскве. У 1919 –1936 на савецкай і партыйнай рабоце. З кастр. 1937 старшыня выканкома Мінскага гарсавета, са жн. 1938 нарком гандлю БССР, з сак. 1939 намеснік старшыні СНК БССР, з сак. 1941 3-ці сакратар ЦК КП(б)Б. У Вялікую Айчынную вайну з ліп. 1941 брыгадны камісар, член ваенсавета 19-й арміі Заходняга фронту. Удзельнічаў у абароне Віцебска, Смаленска,Масквы. Загінуў у баі.

**Вуліца і плошча** атрымалі імя У. Ванеева ў 1966, мемарыяльная дошка устаноўлена у 1977.

**Літаратура:**

Ванееў Уладзімір Рыгоравіч // Беларуская энцыклапедыя : У 18 т. Т. 2. - Мн., 1996. - С. 502.

Ванееў Уладзімір Рыгоравіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 2. - Мн., 1994. - С. 218.

Ванееў Уладзімір Рыгоравіч // Беларусь ў Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 114.

Чернушевич А. Улица имени... [В.Г. Ванеев] // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 7.

(імёны)

## Ваўпшасаў Станіслаў Аляксеевіч (1899-1976)

**Ваўпшасаў Станіслаў Аляксеевіч** нарадзіўся 27.071899 у в. Груздҗай, Шаўляйскага р-на, Літва.

Адзін з аганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. У Чырвонай Арміі з 1918. Удзельнік грамадз. вайны. У 1920 – 1925 на падпольнай рабоце ў Заходняй Беларусі. З 1925 на гаспадарчай рабоце, з 1930 у органах дзяржбяспекі, удзельнік нацыянальна-рэвалюцыйнай вайны ў Іспаніі, савецка-фінляндскай вайны. У пачатку Вял. Айч. вайны камандзір батальёна асобай мотастралковай брыгады спецпрызначэння, якая абараняла Маскву. З сак. 1942 у тыле ворага: камандзір спецатрада “Мясцовыя”, які дзейнічаў у Мінскай вобл., у 1943 член Мінскага падпольнага гаркома КП(б)Б. У 1945, у час вайны з Японіяй, узначальваў у Маньчжурыі аператыўную групу. Да 1958 у органах дзярж. бяспекі. Герой Савецкага Саюза (1944).

**Вуліца**, якая знаходзіца ў Партызанскім і Заводскім раёнах Мінска, носіць імя С. Ваўпшасава (1977), мемарыяльная дошка ўстаноўлена ў 1981.

**Літаратура:**

Ваўпшасаў Станіслаў Аляксеевіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 4. - Мн., 1997. - С. 44.

Ваўпшасаў Станіслаў Аляксеевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 2. - Мн., 1994. - С. 237.

Ваўпшасаў Станіслаў Аляксеевіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 118.

Ваупшасов Станислав Алексеевич // Великая Отечественная война. 1941-1945: Энцикл. - М., 1985. - С. 122.

Ваўпшасаў Станіслаў Аляксеевіч // Беларусь: Энцыкл. давед. - Мн., 1995. - С. 154.

Ваупшасов Станислав Алексеевич // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 108.

Ваупшасов Станислав Алексеевич // Герои Советского Союза: Краткий биограф. слов.: В 2 т. – Т. 1. - М., 1987. - С. 251.

Ваупшасов Станислав Алексеевич // Тимохович И.В. Битва за Белоруссию. 1941-1944. - Мн., 1994. - С.73, 94, 100.

Ваупшасов Станислав Алексеевич // Навечно в сердце народном. - Мн., 1984. - С. 89.

Так начинали //Лещеня С.К. С паролем горкома. - Мн., 1981. - С. 70-75.

Долготович, Б. Станислав Ваупшасов / Борис Долготович // Вечер. Минск. - 2010. - 10 сент. - С. 4.

Сенюков Г. Под носом у фашистов // Вечер. Минск. – 2005. - 18 марта. - С. 2.

Чернушевич А. Улица имени... [С.А. Ваупшасов] // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 7.

(імёны)

## Ванькові́ч Валенцій Мельхіёравіч
## (1800-1842)

**Ванькові́ч Валенцій Мельхіёравіч** нарадзіўся 12.5.1800 г. у в. Калюжыца Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці.

Беларускі жывапісец, прадстаўнік рамантызму. З роду Ваньковічаў, пляменнік паэта А. Гарэцкага. Вучыўся ў Полацкім езуіцкім калегіуме (1811), на факультэце вольных навук Полацкай акадэміі (1813—1817), у Віленскім універсітэце ў Я. Дамеля і Я. Рустэма (1818—1824), Пецярбургскай АМ (1825—1828). За малюнкі з натуры адзначаны 2-м (1825) і 1-м (1826) сярэбранымі медалямі, за твор «Подзвіг маладога кіяўляніна...» (1827) — залатым медалём і правам вучыцца за мяжой за кошт акадэміі.

Найбольш вядомы як партрэтыст: партрэты Адама Міцкевіча («Міцкевіч на скале Аюдаг», 1828), Э. Ромера, Ю. Корсака, А. Адынца, М. Шыманоўскай, А. Пушкіна, К. Ліпінскага, В. Жукоўскага і інш.

З 1829 жыў у Мінску, меў майстэрню ў Вялікай Сляпянцы і Мінску (разам з Ч. Манюшкам). Тут стварыў партрэты бацькі, сястры С. Гарноўскай, Д. Манюшкі, жонкі з дзецьмі (мініяцюры), А. Гарэцкага, В. Пуслоўскага і членаў яго сям'і, С. і К. Пясецкіх, К. і А. Тавянскіх і інш. Пад уплывам Тавянскага захапіўся тэорыяй містыцызму, асобай Напалеона, біблейскімі сюжэтамі: «Маці Божая Вастрабрамская», «Мадонна з Ісусам Хрыстом і Іаанам Хрысціцелем», «Напалеон каля вогнішча» (1834). У канцы 1830-х г. пакінуў Мінск; працаваў у Дрэздэне, Берліне, Мюнхене; з 1841 у Парыжы, жыў у сям'і Міцкевічаў. Напісаў манументальныя палотны «Апафеоз Напалеона», «Напалеон плача над картай Еўропы», абразы «Евангеліст Іаан», «Святая Клара».

Твораў Ваньковича захавалася вельмі мала. Яны знаходзяцца пераважна ў Англіі, Францыі, Італіі, Польшчы, Літве, Расіі.

У Мінску яго імем названа **вуліца**.

**Літаратура:**

Ваньковіч Валенцій Мельхіёравіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Т. 3. – Мінск, 1996. – С. 505-506.

Валенцій Ваньковіч / [аўтар тэксту і складальнік Н. В. Сычова]. – Мінск : Беларусь, 2012. – 22, [41] с.:іл. – (Славутыя мастакі з Беларусі = Знаменитые художники из Беларуси = Famous artists from Belarus).

Белявец, А. Пэндзаль, варты бронзы / Алеся Белявец // Мастацтва. – 2011. – № 2. – С. 17.

Купрэвіч, Н. Валенцій каля дома Ваньковічаў / Наталі Купрэвіч // Краязнаўчая газ. – 2011. – 4 студз. – С. 1, 2.

Крэпак, Б. Блукаючы рамантык Валенцій Ваньковіч / Барыс Крэпак // Культура. – 2010. – 11-17 верас. – С. 15.

Дом Ваньковічаў // Я – мінчанін. – Мінск, 2005. – С. 52-55.

Казакова, А. Золотой след в искусстве / А. Казакова // Минский курьер. – 2005. – 4 янв. – С. 3.

(імёны)

## Захараў Іван Антонавіч
## (1898-1944)

**Захараў Іван Антонавіч** нарадзіўся 18.09.1898 у в. Сямёнаўка Маскоўскай вобл., Расія.

Дзяржаўны дзеяч БССР. Удзельнік грамадзянскай вайны. З 1926 на партыйнай і гаспадарчай рабоце ў Маскоўскай вобл. Скончыў Прамакадэмію лёгкай прамысловасці СССР (1937). Працаваў у Віцебску дырэктарам ільнопрадзільнай фабрыкі, старшынёй гарвыканкома, з 1938 намеснік старшыні СНК БССР. У Вялікую Айчынную вайну выконваў даручэнні ЦК КП(б)Б і БШПР па кіраўніцтве партызанскім рухам ў Беларусі. Памёр 19.03.1944, пахаваны ў Маскве.

**Вуліца** ў Партызанскім раёне носіць імя І. Захарава з 1947.

**Літаратура:**

Захараў Іван Антонавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 7. - Мн, 1998. - С. 430.

Захараў Іван Антонавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 234.

Захараў Іван Антонавіч // Беларусь: Энцыкл. давед. - Мн., 1995. - С. 354.

Захаров Иван Антонович // Тимохович И.В. Битва за Белоруссию. 1941-1944. - Мн., 1994. - С. 75, 98, 100, 141, 240.

(імёны)

## Казлоў Васіль Іванавіч
## (1903-1967)

Гл. Савецкі раён.

(імёны)

## Карват Уладзімір Мікалаевіч
## (1958 - 1996)

**Карват Уладзімір Мікалаевіч** нарадзіўся 28 11.1958 г. у г. Брэст, Беларусь.

Першы Герой Беларусі (1996), падпалкоўнік. Скончыў Армавірскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў (1981).

Ва Узброенных Сілах СССР з 1977 г.

У 1981-1994 гг. у ваенна-паветраных сілах на Далёкім Усходе: камандзір звяна, эскадрыллі, намеснік камандзіра палка па лётнай падрыхтоўцы.

Са жніўня 1994 г. на Беларусі, начальнік паветрана-агнявой і тактычнай падрыхтоўкі авіябазы. У час начнога вучэбнага палёту 23.05.1996 г. падпалкоўнік Карват адвёў палаючую машыну ад в. Вялікае Гацішча Баранавіцкага раёна і загінуў.

Яго імем названа **вуліца** ў Мінску.

**Літаратура:**

Карват Уладзімір Мікалаевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т . – Т. 8. – Мінск, 1999. – С. 64.

Корват Владимир Николаевич // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 6 т.]. – Т. 4. – Минск, 2007. – С. 210.

Батраев, С. Герои суверенной Беларуси / Сергей Батраев // Белорусская военная газета. Во славу Родины. – 2011. – 7 июля. – С. 6.

Гибок-Гибковский, А. Огромное небо Владимира Карвата / Алесь Гибок-Гибковский // Советская Белоруссия (Беларусь сегодня). Союзное вече. – 2011. – 19-25 мая. – С. V.

Долг, И. Жизнь и подвиг / Иван Долг // Минский курьер. – 2009. – 27 мая. – С. 14.

Данилов, А. Прерванный полет / Андрей Данилов // Во славу Родины. – 2008. – 28 нояб. – С. 3.

Первый Герой Беларуси / подготовили Игорь Голод, Галина Малаховская // Минский курьер. – 2008. – 26 нояб. – С.13.

Барыс, С. Героі Беларусі / Сымон Барыс // Беларускі гістарычны часопіс.- 2008.- № 4.- С. 54-55.

## Кашавой Алег Васільевіч
## (1926-1943)

**Кашавой Алег Васільевіч** нарадзіўся 08.06.1926 у г. Прылукі Чарнігаўскай вобл., Украіна.

З 1940 жыў у г. Краснадон, вучыўся ў школе. У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнічаў у стварэнні падпольнай камсамольскай арганізацыі "Маладая гвардыя", камісар і член яе штаба. Арганізатар і кіраўнік шматлікіх баявых аперацый. З раскрыццём арганізацыі спрабаваў перайсці лінію фронту, 26.01.1943 схоплены фашыстамі на ст. Картушына. Пасля катаванняў 09.02.1943 расстраляны. Герой Савецкага Саюза (1943). Пахаваны ў брацкай магіле на цэнтр. плошчы г. Равянькі.

**Вуліца** ў Партызанскім раёне атрымала імя А. Кашавога ў 1953. Устаноўлены бюст (1971) і мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Кошевой Олег Васильевич // Великая Отечественная война. 1941-1945: Энцикл. - М., 1985. - С. 373.

Кошевой Олег Васильевич Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 314.

Кошевой Олег Васильевич // Герои Советского Союза: Краткий биограф. слов.: В 2 т. – Т. 1. - М., 1987. - С. 760.

Чернушевич А. Кошевой Олег Васильевич // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 14.

(імёны)

## Клумаў Яўген Уладзіміравіч (1876-1944)

**Клумаў Яўген Уладзіміравіч** нарадзіўся 16.12.1876 у Маскве.

Працаваў земскім урачом у Рэчыцкім павеце. У 1-ю сусветную і грамадзянскую войны хірург і ўрач шпіталяў на Заходнім фронце. З 1921 працаваў у медыцынскіх установах Мінска. У гады нямецка-фашысцкай акупацыі дапамагаў параненым падпольшчыкам і партызанам у 1-й гарадской бальніцы Мінска. Забяспечваў партызан медыкаментамі, абсталяваў 2 партызанскія шпіталі. У кастр. 1943 арыштаваны і загублены ў душагубцы. Герой Савецкага Саюза (1965).

**Вуліца** Партызанскага раёна атрымала імя Я. Клумава ў 1964. Яго імя носяць завулак (1968) і 3-я клінічная бальніца, на будынку якой устаноўлена мемарыяльная дошка (1965).

**Літаратура:**

Клумаў Яўген Уладзіміравіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 8. - Мн., 1999. - С. 350.

Клумаў Яўген Уладзіміравіч // Беларусь ў Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 268.

Клумаў Яўген Уладзіміравіч // Беларусь: Энцыкл. давед. - Мн., 1995. - С. 392.

Мядзведзева, В. Вулица Клумава / Вольга Мядзведзева // Звязда. - 2010. - 8 мая. - С. 4.

Анісавец М. Дбаў-думаў пра Лоеўшчыну Клумаў // Краязнаўчая газ. - 2005. - № 9 (сак.). - С. 6.

Долготович, Б. Евгений Клумов / Борис Долготович // Вечер. Минск. - 2010. - 27 окт. - С. 3.

Чернушевич А. Клумов Евгений Владимирович // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 12.

(імёны)

## Купала Янка (сапр. Луцэвіч Іван Дамінікавіч) (1882-1942)

**Купала Янка** (сапр. Луцэвіч Іван Дамінікавіч) нарадзіўся 7.07.1882 у фальварку Вязынка Маладзечанскага раёна Мінскай вобл.

Народны паэт Беларусі, драматург, публіцыст, перакладчык, грамацкі дзеяч. Класік беларускай літаратуры. Заснавальнік новай беларускай літаратуры і беларускай літаратурнай мовы. Акадэмік АН Беларусі і АН Украіны.

Скончыў Бяларуцкае народнае вучылішча (1898), вучыўся на агульнаадукаванных курсах А.С. Чарняева ў Пецярбургу (1909–13), у народным універсітэце імя А.Л. Шаняўскага ў Маскве (1915).

У Мінску з 1919. З 1921 актыўна удзельнічаў у літаратурна-грамадскім і культурна-мастацкім жыцці Беларусі, удзельнічаў у стварэнні БДУ, нацыянальнага тэатра, рэспубліканскіх выдавецтваў.

Творчасць Купалы - летапіс жыцця беларускага народа, адбітак нацыянальнага характару, нацыянальнага светаразумення і паэтычнага светаўспрымання на пераломных гістарычных рубяжах 1-й паловы 20 стагоддзя. Ранняя лірыка – зборнікі "Жалейка"(1908), "Гусляр"(1910), паэма-трагедыя "Адвечная песня"(1908), "Курган"(1910), "Бандароўна"(1913), "Магіла льва"(1913), камедыя "Паўлінка"(1912), драма "Раскіданае гняздо"(1913) і інш.

З 2-й паловы 1920-х Купала трапіў пад рэзкую крытыку сацыёлагаў, у гэты перыяд паэтычная актыўнасць рэзка зменшылася і ажывілася ў сярэдзіне 1930-х. (ляўкоўскі цыкл і іншыя). У цэлым яго паэтычны геній выразна праяўляўся ў біяграфічных і пейзажных ("За ўсё", "Сонцу"і іншыя), а таксама некаторых дзіцячых вершах. Паэма "Над ракою Арэсай"(1933), "Тарасова доля"(1939) і інш.

Творы Купалы перакладзены на многія замежныя мовы. Яго п'есы ставіліся ў шматлікіх тэатрах. Пераклаў на беларускую мову творы вядомых рускіх і замежных аўтараў. Памёр 28.06.1942.

У 1959-65 прысуджалася Літаратурная прэмія імя Купалы, з 1965 прысуджаецца Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Янкі Купалы (за творы паэзіі і драматургіі). Імем паэта названы Інстытут літаратуры Нацыянальнай АН Беларусі , Нацыянальны акадэмічны тэатр ў Мінску, бібліятэкі, школы, вуліцы ў многіх гарадах Беларусі і інш. **Вуліца** ў Мінску атрымала імя Янкі Купалы ў 1945.

У 1996 створаны Міжнародны фонд Янкі Купалы.

**Літаратура:**


Янка Купала: энцыклапедычны даведнік. - Мн., 1986. – 727 с.

Купала Янка // Беларуская энцыклапедыя: у 18т. Т.9. - Мн., 1999. - С. 25-34.

Купала Янка // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5т. Т.3. - Мн., 1986. - С. 165-174.

Купала Янка // Тэатральная Беларусь: Энцыклапедыя. у 2т. Т.1. - Мн., 2002. - С. 554-558.

КупалаЯнка // Краткая литературная энциклопедия: в 8т. Т.3 . - М., 1966. - С. 903.

Купала Янка // Беларусь:Энцыклапедычны даведнік. - Мн., 1995. - С. 409-410.

КупалаЯнка // Их именами названы…: энциклопедический справочник. - Мн., 1987. - С. 338-340

Купала Янка // Беларускія пісьменнікі: бібліяграфічны слоўнік: у 6т. Т.3. - Мн., 1994. - С. 489-494.

Купала Янка // Беларускія пісьменнікі,1917-1990:даведнік. - Мн., 1994. - С. 317-319.

Купала Янка // Гісторыя беларускага мастацтва: у 6т. Т.4,5,6. - Мн., 1990-1994.

Купала Янка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4т. Т.1-4. - Мн., 2001.

Купала Янка // Гісторыя кінамастацтва Беларусі: у4т. Т.3. - Мн., 2004. - С. 132-141.

Купала Янка // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: мінск. - Мн., 1988. - С. 107-108, - С. 217-219, - С. 229-231.

КупалаЯнка // Музычны тэатр Беларусі,1960-1990. - Мн., 1997. - С. 112-115.

Исайчук, Д. Упали росы на Купалье... / Дмитрий Исайчук // Минский курьер. - 2010. - 6 мая. - С. 13.

Аўрамчык М. З імем Купалы - у сэрцы // Аўрамчык М.Я. Знаёмыя постаці. - Мн., 2004. - С. 3-38.

Паэзія Я. Купалы і кніжная графіка // Баразна М.Р. Беларуская кніжная графіка 1960-1990 гадоў. - Мн., 2001. - С. 78-87.


(імёны)

## Солтыс Іон Сідаравіч

## (1923-1945)

**Солтыс Іон Сідаравіч** нарадзіўся ў 1923 у с. Кузьмін Каменскага р-на, Малдавія.

Працаваў у калгасе. З мая 1944 - у дзеючай арміі. Куляметчык 548 стралковага палка (1-шы Украінскі фронт). У баі пад г. Лузіенталь на тэрыторыі Польшчы пры прарыве абароны ворага адзін з першых фарсіраваў р. Бабер. Агнём прыкрываў пераправу роты. Паўтарыў подзвіг А. Матросава, засланіўшы сабою амбразуру дзота, дзе вёў агонь кулямет. Герой Савецкага Саюза (1945).

**Вуліца** атрымала імя І. Солтыса ў 1976 (знаходзіцца ў Партызанскім і Заводскім р-нах Мінска).

**Літаратура:**

Солтыс Ион Сидорович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 568.

Солтыс Ион Сидорович // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 373.

Солтыс Ион Сидорович // Герои Советского Союза: Краткий биограф. слов.: В 2 т. – Т. 2. - М., 1988. - С. 503.

Чернушевич А. Солтыс Ион Сидорович // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 27.

(імёны)

## Судмаліс Імант Янавіч
## (1916-1944)

**Судмаліс Імант Янавіч** нарадзіўся 18.03.1916 у г. Цэсіс, Латвія.

З 1932 быў членам падпольнага камуністычнага саюза моладзі Латвіі. З 1940 1-шы сакратар Ліепайскага камітэта камсамола і член ЦК камсамола Латвіі. У чэрвіні 1941 прымаў удзел у абароне Ліепаі, потым ваяваў у партызанскіх атрадах у Асвейскай зоне. З восені 1943 упаўнаважаны аператыўных груп ЦК КП(б) і ЦК ЛКСМ Латвіі, стварыў і ўзначаліў Рыжскі падпольны гарком ЛКСМ. 13.11.1943 арганізаваў у Рызе ўзрыў міны ў момант правядзення фашысцкага мітынгу. 19.02.1944 схоплены фашыстамі і пакараны смерцю. Герой Савецкага Саюза (1957).

**Вуліца** ў Партызанскім раёне атрымала імя І. Судмаліса ў 1976, на доме № 18 знаходзіцца мемарыяльная дошка (1976).

**Літаратура:**

Судмаліс Імант Янавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 15. - Мн., 2002. - С. 251.

Чернушевич А. Улица имени... // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 27.

(імёны)

## Фролікаў Дзмітрый Георгіевіч
## (1918-1945)

**Фролікаў Дзмітрый Георгіевіч** нарадзіўся 08.11.1918 у с. Краснае Сапажкоўскага р-на Разанскай вобл., Расія.

Удзельнік савецка-фінлянскай вайны. У баях Вялікай Айчыннай вайны з 1941. Камандзір танкавага ўзвода. Вызначыўся ў Беларускай аперацыі 26.06.1944. Узвод захапіў скрыжаванне дарог Масква – Мінск і Орша – Смаляны, разбіў аўтакалону з 150 машын, падбіў 2 варожых танка. 03.07.1944 яго ўзвод адзін з першых увайшоў у Мінск. Загінуў у баі 02.02.1945. Герой Савецкага Саюза (1945).

**Вуліца** Партызанскага раёна атрымала імя Дз. Фролікава ў 1964, на адным з дамоў вуліцы ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Фроликов Дмитрий Георгиевич // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 638.

Фроликов Дмитрий Георгиевич // Герои Советского Союза: Краткий биограф. слов.: В 2 т. – Т. 2. - Мн., 1988. - С. 420.

Чернушевч А. Улицы имени... // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 27.

(імёны)

## Чабатароў Васіль Міхайлавіч
## (1918-1944)

**Чабатароў Васіль Міхайлавіч** нарадзіўся 25.06.1918 у в. Гаўрылаўка Какчэтаўскай вобл., Казахстан.

Працаваў трактарыстам, шахцерам-забойшчыкам. Скончыў снайперскую школу і школу Галоўнага ўпраўлення контрразведкі "Смерш". У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1942, снайпер. На Ленінградскім і Волхаўскім франтах знішчыў больш за 60 гітлераўцаў. 27.06.1944 у варожым тыле каля г.п. Бобр Мінскай вобл. знішчыў да 10 фашыстаў, паланіў нямецкага афіцэра. У час вяртання з разведкі акружаны ворагам. Цяжка паранены, трапіў у палон і быў закатаваны.

**Вуліца** Партызанскага раёна атрымала імя В. Чабатарова ў 1976, на доме № 12 знаходзіцца мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Чабатароў Васіль Міхайлавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. - Т. 6. Кн. 2. - Мн., 2003. - С. 131.

Смирнов Н. Лейтенант из контрразведки [Чеботарев Василий Михайлович] // Вечер. Минск. - 2005. - 3 февр. - С. 4.

Чернушевич А. Улица имени... // Минский курьер. – 2004. - 2 июля.- С. 29.

(імёны)

## Шчарбакоў Аляксандр Сяргеевіч (1901-1945)

**Шчарбакоў Аляксандр Сяргеевіч** нарадзіўся 27.09.1901 у г. Руза Маскоўскай вобл., Расія.

Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, з 1924 на партыйнай рабоце. У 1938 – 1945 першы сакратар Маскоўскага гарадскога і абласнога камітэтаў ВКП(б), сакратар ЦК ВКП(б), начальнік Галоўнага палітычнага упраўлення Чырвонай Арміі. Адзін з арганізатараў і удзельнікаў абароны Масквы (1941). З 1942 намеснік наркома абароны СССР, начальнік Саўінфармбюро. Памёр 10.05.1945. Пахаваны на Краснай плошчы ў Маскве.

**Вуліца і завулак** носяць імя А. Шчарбакова з 1948 (Партызанскі і Ленінскі раёны Мінска).

**Літаратура:**

Щербаков Александр Сергеевич // Великая Отечественная война. 1941-1945: Энцикл. - М., 1985. - С. 800.

Щербаков Александр Сергеевич // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 697.

(імёны)

(на пачатак)

# Першамайскі раён

(імёны)

## Броўка Пятрусь (Пётр Усцінавіч) (1905 – 1980)

**Броўка Пётр Усцінавіч** нарадзіўся 12.06.1905 у в. Пуцілкавічы Ушацкага р-на Віцебскай вобласці, беларускі паэт і грамадскі дзеяч. Народны паэт Беларусі (1962). Акадэмік Акадэміі наук Беларусі (1966, член-карыспандэнт з 1953). Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1975). Герой Сацыялістычнай Працы (1972).

Скончыў БДУ (1931). З 1918 працаваў перапісчыкам у Велікадолецкім ваенным камісарыяце, справаводам у валвыканкоме, рахунказодам у саўгасе, старшынёй Маладолецкага сельсавета. У 1925 накіраваны на працу ў Полацкі акруговы камітэт ЛКСМБ. У1927-28 адказны сакратар газеты "Чырвоная Полаччына". З 1940 рэдактар часопіса "Полымя". У 1941-42 працаваў у франтавой газеце "За Савецкую Беларусь", супрацоўнічаў у партызанскім друку. З 1943 адказны сакратар СП БССР, з 1945 рэдактар часопіса "Полымя". У 1948–67 старшыня праўлення СП БССР, у 1967–80 галоўны рэдактар выдавецтва "Беларуская Савецкая Энцыклапедыя".

Друкаваўся з 1926. Першыя зборнікі “Гарады як шторм” і “Прамова фактамі” (1930), “Цэхавыя будні” і аповесць “Каландры” (1931). Ранняя лірыка прасякнута матывамі ўслаўлення рэвалюцыі, новай рэчаіснасці. Пераадольваючы пэўную рытарычнасць і рамантычны схематызм, паэт авалодаў прынцыпамі канкрэтна-рэалістычнага адлюстравання жыцця (зборнік “Прыход героя”, 1935). У героіка- рамантычнай паэме “Праз горы і стэп” (1932), прысвечанай падзеям грамадзянскай вайны, і рэалістычна-бытавой паэме “1914” (1935) канкрэтнасць лірычнага перажывання праўдзівасць у раскрыцці чалавечых характараў. У зборніках “Вясна Радзімы” (1937) і “Шляхамі баравымі” побач з грамадскімі праблемамі значнае месца займае інтымная і пейзажная лірыка. Паэт плённа вучыцца ў Я. Купалы, арганічна засвойвае асаблівасці народна-паэтычнага мыслення.У гады Вялікай Айчыннай вайны узмацняецца патрыятычнае гучанне паэзіі Броўкі. Подзвіг народа, тэма вернасці Радзіме, пераемнасці гераічных традыцый атрымалі глыбокае лірычнае і шырокае эпічнае увасабленне ў “Паэме пра Смалячкова” (1943), паэмах “Беларусь” (1943) і “Ясны кут” (1944), вершах “Кастусь Каліноўскі”, “Надзя–Надзейка”, “Рана”, “ Магіла байца”, “ Будзем сеяць, беларусы!”. Многія творы Броўкі пасляваеннага часу (паэма “Паланянка”, 1945; вершы “Парк Перамогі”, “Смерць героя”) яшчэ звязаны з яго франтавой лірыкай, але пафас творчасці паэта вызначае тэма мірнай працы (паэма “Хлеб”, 1946). У зборніках “У роднай хаце” (1946), “Дарога жыцця” (1950, Дзяржаўная прэмія СССР 1951), “Сонечнымі днямі” (1950), “Цвердымі крокамі” (1954), рамане “Калі зліваюцца рэкі” (1956, Літаратурная прэмія імя Я. Коласа 1959; па матывах рамана балет Г. Вагнера “ Святло і цені”, паст. 1963). За паэму “ Хлеб”, вершы “ Думы пра Маскву”, “ Брат і сястра”, “Народнае дзякуй”,” Каб мне стаць...”, “Спатканне” прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР 1947. у 1960-70-я ўзмацнілася ўвага паэта да маральна-этычных, агульначалавечых праблем, шырокае гучанне набыла інтэрнацыянальная тэма. У паэзіі дасягнуў цэласнасці лірычнага характару, гарманічнасці ў выяўленні асабістага і грамадскага. Творчасць Броўкі напоўнілася матывамі, звязанымі з асабістай біяграфіяй, з камсамольскім юнацтвам, маладосцю, авеянымі героікай рэвалюцыйнай барацьбы. Вяршынным дасягненнем творчасці Броўкі сталі зборнікі “Пахне чабор” (1959), “ А дні ідуць” (1961, Ленінская прэмія 1962), “Заўсёды з Леніным” (1967), “Між чырвоных рабін” (1969, Дзяржаўная прэмія БССР імя Я. Купалы 1970), “Калі ласка” (1972), “І ўдзень і ўночы...” і кніга прозы “Разам з камісарам” (1974). У паэме “Голас сэрца” (1960) пранікнена адгукнулася памяць пра маці, закатаваную ў фашысцкім канцлагеры. Напісаў лібрэта опер “Міхась Падгорны”, “ Алеся” (з Я. Рамановічам). На беларускую мову пераклаў творы У. Маякоўскага, П. Тычыны, М. Бажана, А. Твардоўскага, М. Ісакоўскага, А. Пракоф’ева, У. Бранеўскага, Дж. Байрана і інш. Дзяржаўная прэмія БССР за ўдзел у выданні Беларускай Савецкай Энцыклапедыі.

Ганаровы грамадзянін Мінска (1980). Яго імем названа **вуліца** ў Мінску, заснаваны літаратурны музей, на доме, дзе жыў, мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**


Броўка Пятрусь (Пётр Усцінавіч) // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. - Т.3. - Мн., 1997. - С. 262-263.

Броўка Пятрусь (Пётр Усцінавіч) // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5т. - Т.1. - Мн., 1985. - С. 471-472.

Броўка Пятрусь (Пётр Усцінавіч) // Беларускія пісьменнікі : бібліяграфічны слоўнік. у 6 т.т.Т.1. – Мн, 1992.- С.305-306.

Броўка Пятрусь // Гісторыя беларускай літаратуры 20 ст.: у 4-х т.– Т.2. – Мн.: Бел.навука, 1999. – С. 194-196, 413-418, 420-426, 428-431, 433-441, 443-453.

Навумовіч У.А. Беларуская літаратура. - Мн., 2000. – С. 243-248.

Рагойша В. Плён шчодрай сяўбы // Рагойша В. І Адгукнецца слова ў слове... – Мн., 1992. – С.33-42.

Бярозкін Р. “ Хвалі бударажаць майстры...” // Бярозкін Р. Паэзія – маё жыццё. – Мн., 1989. – С. 78-85.

Бечык В. Што сэрца праспявала... // Бечык В. Выбранае. – Мн.: Маст. літаратура, 1989. – С.150-167.

Гніламёдаў У. Старонкі ўспамінаў // Гніламёдаў У. Класікі і сучаснікі. – Мн., 1987. – С.280-284.

(імёны)

## Бялінскі Вісарыён Рыгоравіч
## (1811 – 1848)

**Бялінскі Вісарыён Рыгоравіч** нарадзіўся 30.05.1811 у г. Свеаборг (цяпер Суаменліна, Фінляндыя). Рускі літаратурны крытык, філосаф, публіцыст.

Вучыўся ў Маскоўскім універсітэце, з якога выключаны. У 1833 збіраўся працаваць настаўнікам рускай мовы ў Беларусі, пазней адмовіўся. Зблізіўся з гуртком М.У. Станкевіча, дзе вывучаў філасофскія сістэмы Канта, Фіхтэ, Шэлінга, пазней зацікавіўся філасофіяй Гегеля.

Супрацоўнічаў у выданнях М.І. Надзеждзіна "Телескоп" і "Молва" (1833-36), рэдагаваў часопіс "Московский наблюдатель" (1836-39). З 1839 у Пецярбургу, працаваў у "Отечественных записках" А.А. Краеўскага. У 1846-48 кіраваў крытычным аддзелам часопіса "Современник" М.А. Някрасава і І.І. Панаева. Бялінскаму ўласцівыя выключныя эстэтычная чуйнасць, рознабаковы падыход да з'яў мастацтва. У крытыка-публіцыстачных артыкулах, аглядах, рэцэнзіях ён звяртаўся да пытанняў філасофіі (эвалюцыя ад ідэалізму да матэрыялізму), адстойваў ідэі рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху, на аснове дыялектыкі распрацаваў теорыю мастацтва і літаратуры (галоўнымі крытэрыямі каштоўнасці мастацкага твора лічыў прастату вымыслу, дасканаласць праўды жыцця, народнасць, арыгінальнасць), гісторыі літаратуры (вылучаў ламаносаўскі, карамзінскі, пушкінскі, празаічна-апавядальная перыяды і інш.), тэорыі і гісторыі крытыкі як найбольш яркага ўвасаблення развіцця грамадскай думкі.

Сярод прац "Літаратурныя мары: (Элегія ў прозе)" (1834), "Аб рускай аповесці і аповесцях спадара Гогаля ("Арабескі" і "Міргарад")" (1835), "Нішто аб нічым, або Справаздача спадара выдаўцу "Тэлескопа"..." (1836) "Герой нашага часу... Твор М. Лермантава", "Гора ад розуму. Твор А.С. Грыбаедава" (абодва 1840), "Вершы М. Лермантава", "Раздзяленне паэзіі на роды і віды", "Агульнае значэнне літаратура" (усе 1841), "Прыгоды Чычыкава, або Мертвыя душы" і "Слова пра крытыку" (1842), а таксама пагадовыя агляды рускай літаратуры 1840-47. Асаблівае месца ў творчасці Бялінскага належыць цыклу з 11 артыкулаў "Творы Аляксандра Пушкіна" (1843-46) – фактычна першай спробе манаграфічнага аналізу творчасці пісьменніка на фоне гістарычных і літаратурных працэсаў. "Ліст да Гогаля" (1847), напісаны за мяжой, стаў своеасаблівым завяшчаннем крытыка.

Імем Бялінскага названа **вуліца** ў Мінску, таксама яго імя прысвоена Мінскай сярэдняй школе № 42.

**Літаратура:**

Бялінскі Вісарыён Рыгоравіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. - Т.2. - Мн., 1996. - С. 124-125.

Бялінскі Вісарыён Рыгоравіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі:у 5 т. - Т.1. - Мн., 1985. - С. 542-544.

Белинский Виссарион Григорьевич // Краткая литературная энциклопедия: в 8 т. - Т.1. – М., 1962. – С. 503-510.

Современный словарь-справочник по литературе. – М., 2000. – С.50-53.

Хозиева С.И. Русские писатели и поэты. – М., 1999. – С.58-61.

Егоров Б.Ф. Литературно-критическая деятельность В.Г. Белинского: Пособие для учителя. - М.: Просвещение, 1982. – 175с.:ил.

(імёны)

## Бяляеў Якаў Дзмітрыевіч
## (1918-1941)

**Бяляеў Якаў Дзмітрыевіч** нарадзіўся 15.03.1918 у в. Піхалёва Кінешамскага р-на Іванаўскай вобл., Расія.

У Чырвонай Арміі з 1938. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939 - 1940. У Вялікую Айчынную вайну камандзір бронемашыны сяржант Я.Д. Бляеў вызначыўся ў абарончых баях 25.06.1941 каля в. Астрашыцкі Гарадок Мінскага р-на, 6.07.1941 загінуў у рукапашным баі у Крупскім р-не Мінскай вобл. Герой Савецкага Саюза (1941).

Яго імем названа **вуліца** ў Першамайскім раёне Мінска.

**Літаратура:**

Бляеў Якаў Дзмітрыевіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 3.- Мн., 1996. - С. 405.

Чернушевич А. Улица имени... // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 6.

(імёны)

## Вадалажскі Васіль Аляксандравіч (1937 – 1992)

**Вадалажскі Васіль Аляксандравіч** нарадзіўся 9.2.1937 г. у сяле Хатомля Харкаўскай вобласці, Украіна.

Ваенны лётчык, Герой Расіі (1995). Палкоўнік (1981). Скончыў 160-е ваеннае авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў (1958).

З 1960 у БВА: з 1975 г. намеснік камандзіра верталётнага палка па лётнай падрыхтоўцы, з 1982 г. намеснік камандзіра корпуса па авіяцыі, намеснік начальніка аддзела авіяцыі 5-га асобнага армейскага корпуса.

У жніўні - кастрычніку 1986 г. кіраваў зводнай аператыўнай групай верталётнага саставу па ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, здейсніў 126 вылетаў на верталёце Мі-26, скінуў 300 т грузу сумесей для склейвання радыеактыўнага пылу і для мантажу спецыяльных установак з фільтрам у рэактары. Абучыў 33 экіпажы верталётаў правілам скідвання на рэактар грузу з вонкавай падвескі. Атрымаў смяротную дозу апрамянення.

У гонар В.А. Вадалажскага ў Мінску названа **вуліца**, установлена мемарыяльная дошка (1997) на доме, у якім у 1982 - 1992 г.г. ён жыў (вуліца Садовая, 2).

**Літаратура:**

Вадалажскі Васіль Аляксандравіч // Беларуская энцыклапедыя: ў 18 т. – Т. 18, кн. 1. – Мінск, 2004. – С. 359.

Водолажский Василий Александрович // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 6 т.]. – Т. 2. – Минск, 2006. – С. 750.

(імёны)

## Ватуцін Мікалай Фёдаравіч (1901-1944)

**Ватуцін Мікалай Фёдаравіч** нарадзіўся 16.12.1901 у с. Чапухіно Белгароджскай вобл., Расія.

Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1929), Акадэмію Генштаба (1937). У Вялікую Айчынную вайну начальнік штаба шэрагу франтоў, нам.начальніка Генштаба, камандуючы войскамі Паўд. – Зах., Варонежскага і 1-га Укр. франтоў. Удзельнік Сталінградскай і Курскай бітваў, вызвалення Украіны. Генерал арміі (1943). Памёр 15.04.1944 пасля цяжкага ранення. Герой Савецкага Саюза (1965).

**Вуліца** Першамайскага раёна Мінска названа яго імем (1947), на доме № 1 мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Ватуцін Мікалай Фёдаравіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 4. - Мн., 1997. - С. 37.

Ватутин Николай Фёдорович // Герои Советского Союза: Краткий биограф. слов.: В 2 т. - Т.1.- Мн., 1987. - С. 251.

Чернушевич А. Улица имени... // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 7.

(імёны)

## Гарбатаў Аляксандр Васілевіч
## (1891-1973)

**Гарбатаў Аляксандр Васілевіч** нарадзіўся 23.03.1891 г. у в. Аахоціна Палехскага р-на Іванаўскай вобл., Расія.

У Арміі з 1912, у Чырв. Арміі з 1919. Удзельнік 1-й сусветнай, грамадз. войнаў. Скончыў кав. камандныя курсы, курсы ўдасканалення вышэйшага камсаставу. У чэрв. 1941 камбрыг. З ліп. 1941 на Паўд.-Зах., Данскім, Сталінградскім, Бранскім, Цэнтр., Бел., 1-м і 2-м Бел. франтах: нам. камандзіра корпуса, камандзір дывізіі, корпуса, інспектар кавалерыі фронту, нам. камандуючага арміяй. У чэрв. 1943 – маі 1945 камандуючы 3-й арміяй, якая ўдзельнічала ў Курскай бітве, Гомельска-Рэчыцкай аперацыі 1943, Рагачоўска-Жлобінскай аперацыі 1944, Беларускай аперацыі 1944, вызваленні гарадоў Касцюковічы, Прапойск, Рагачоў, Мінск, у акружэнні і знішчэнні гітлераўцаў пад Бабруйскам, у фарсіраванні Сожа, Дняпра, Бярэзіны. Удзельнік вызвалення Польшчы, баёў ва Усх. Прусіі. Герой Савецкага Саюза (1945). Генерал Арміі (1955). Аўтар кнігі “Гады і войны”.

Яго імем названа **вуліца** ў Першамайскім раёне Мінска.

**Літаратура:**

Гарбатаў Аляксандр Васільевіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 5. - Мн., 1997. - С. 54.

Гарбатаў Аляксандр Васільевіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 155.

Горбатов Александр Васильевич // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 152.

Горбатов Александр Васильевич // Герои Советского Союза: Краткий биограф. слов.: В 2 т. – Т. 1. - М., 1987. - С. 349.

Горбатов Александр Васильевич // Навечно в сердце народном. - Мн., 1984. - С. 122-123.

(імёны)

## Гвішіяні Дзімтрый Барысавіч
## (1978 – 1999)

**Гвішыяні Дзмітрый Барысавіч** нарадзіўся 5 лістапад 1978 года. ў Брэсце, Беларусь. Курсант Ваеннай акадэміі Беларусі.

28 жніўня 1999 года ў 22 гадзіны 50 хвілін цягнік № 660 «Брэст - Мінск», на якім ехалі Д. Б. Гвішыяні і яго аднакурснікі, раптам загарэўся. Гвішыяні стаў тушыць пажар, падчас чаго, з прычыны выбуху паліўнага бака цеплавоза, яго абліло падпаленай саляркай.

З наймацнейшымі апёкамі ён быў дастаўлены верталётам у Мінск у 432-гі Галоўны ваенны клінічны шпіталь.

Ад атрыманых апёкаў ў ноч с 31 жніўня на 1 верасня памёр.

За выключную адвагу і асабістую храбрасць, праяўленыя пры выратаванні людзей падчас пажару, курсант Дзмітрый Гвішыяні быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам «За асабістую мужнасць».

Навечна залічаны ў спісы асабістага складу 1-га ўзвода 2-га курса агульнавайсковага факультэта Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь.

31 жніўня 2004 г. на тэрыторыі Ваеннай акадэміі быў урачыста адкрыты помнік Дзмітрыю Гвішыяні.

Цеплавоз ТЭП60 № 774 Беларускай чыгункі прыпіскі лакаматыўнага дэпо Мінск названы «Курсант Дзмітрый Гвішыяні». 23 лютага 2006 года адбыўся першы рэйс імяннога лакаматыва.

У 2007 г. яго імем названа **вуліца** ў мікрараёне Усход.

**Літаратура:**

Макаров, А. Он бы стал хорошим офицером! / Александр Макаров // Армия. – 2009. – № 4 (июль-август) . – С. 28-30.

Иванюшко, А. Просто защитник... / Алексей Иванюшко // Минский курьер. – 2008. – 3 сент. – С. 3.

(імёны)

## Гінтаўт Вітольд Міхайлавіч
## (1922-1987)

**Гінтаўт Вітольд Міхайлавіч** нарадзіўся 07.031922 г. у в. Слабадшчына Мінскага р-на.

На фронце з 1941 – механік-вадзіцель танка. Удзельнік баёў на Калінінскім напрамку, пад Ржэвам, Курскай бітвы, вызвалення Украіны, Польшчы, баёў у Германіі. Старшына Гінтаўт вызначыўся ў баі пад Вінніцай: у складзе экіпажа танка знішчыў 6 варожых машын, самаходную гармату. На баявым рахунку экіпажа 17 танкаў, 4 самаходныя гарматы “фердынанд”, 23 палявыя гарматы, 80 аўтамашын з ваенным грузам. Герой Савецкага Саюза (1944). З 1947 на гаспадарчай рабоце ў Мінску.

Яго імем названа **вуліца** ў Першамайскім раёне Мінска.

**Літаратура:**

Гінтаўт Вітольд Міхайлавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 5. - Мн., 1997. - С. 241.

Гінтаўт Вітольд Міхайлавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 165.

Гинтовт Витольд Михайлович // Герои Советского Союза: Краткий биограф. слов.: В 2 т. – Т. 1. - М., 1987. - С. 324.

Гинтовт Витольд Михайлович // Навечно в сердце народном. - Мн., 1984. - С. 116.

(імёны)

## Гурт`еў Левонцій Мікалаевіч
## (1891-1943)

**Гурт`еў Левонцій Мікалаевіч** нарадзіўся 1891 у г.Шемаха, Азербайджан.

Удзельнік 1-й сусветнай вайны, у Чырв. Арміі з 1919. З 1936 пам. начальніка, начальнік Омскага ваеннага вучылішча. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны з 1942 камандзір Рагачоўскай гвардзейскай стралковай дывізіі, якая з баямі прайшла ад Сталінграда да Берліна. 3.08.1943 у баі за г. Арол генерал-маёр Л.М. Гурт`еў быў смяротна паранены. Герой Савецкага Саюза (1943).

В Мінску яго імем названа **вуліца** Першамайскага раёна (1966).

**Літаратура:**

Гуртьев Леонтий Николаевич // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 145

(імёны)

## Заслонаў Канстанцін Сяргеевіч
## (1910-1942)

**Заслонаў Канстанцін Сяргеевіч** нарадзіўся 7.01.1910 у г. Асташкаў Цвярской вобл., Расія.

Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў падполля і партызанскага руху у гады Вялікай Айчыннай вайны ў Віцебскай вобл. Скончыў прафесіна-тэхнічную школу ў Вялікіх Луках (1930). З 1939 начальнік паравознага дэпо ст. Орша. У верасні 1941 створаны з чыгуначнікаў у Маскве партызанскі атрад на чале з К.С. Заслонавым перайшоў лінію фронту і накіраваўся ў тыл ворагу. Уладкаваўся на працу ў Аршанскае дэпо. У акупіраванай Оршы стварыў і ўзначаліў некалькі дыверсійных груп, якія паралізавалі работу на чыгуначным вузле. У лютым 1942 вымушаны быў пакінуць Оршу. Стварыў і узначаліў партызанскую брыгаду “Дядя Косця”. Арганізоўваў дыверсіі на чыгунцы, узначальваў баявыя дзеянні супраць ворага на тэрыторыі Аршанскага, Багушэўскага, Лёзненскага, Сенненскага раёнаў. Загінуў у час Купавацкага бою (1942). Герой Савецкага Саюза (1943). У Оршы створаны мемарыяльны музей, у Оршы, Сянно і на месцы гібелі К.С. Заслонава пастаўлены помнікі.

**Вуліца** Першамайскага раёна атрымала імя К. Заслонава ў 1950.

**Літаратура:**

Заслонаў Канстанцін Сяргеевіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 6. - Мн., 1997. - С. 548.

Заслонаў Канстанцін Сяргеевіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 218.
Заслонов Константин Сергеевич // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 181-182.
Заслонов Константин Сергеевич // Герои Советского Союза: Краткий биограф. слов.: В 2 т. – Т. 1. - М., 1987. - С. 532.
Заслонов Константин Сергеевич // Навечно в сердце народном. - Мн., 1984. - С. 181-182.
Заслонов Константин Сергеевич // Жучкевич В. А. Улицы помнят. - Мн., 1979. - С. 80.
Заслонов Константин Сергеевич // Петраченко Д. Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 163-167.

(імёны)

## Каліноўскі Кастусь
## (1838-1864)

**Каліноўскі Кастусь Вікенцій канстанцін Сямёнавіч** нарадзіўся 2.2.1838 у в. Мастаўляны Беластоцкага ваяводства, Польшча.

Лідэр беларускага нацыянальнага вызваленчага руху; адзін з кіраўнікоў паўстання 1863—1864. Скончыў Свіслацкае павятовае вучылішча (1852), Пецярбургскі універсітэт (1860). У Пецярбургу член рэвалюцыйнага гуртка З. Серакоўскага.

У пачатку 1861 вярнуўся ў Беларусь з мэтай падрыхтоўкі ўзброеннага паўстання. У 1861—1862 стварыў у Гродне і Гродзенскай губерніі шэраг нелегальных рэвалюцыйных арганізацый, каардынаваў сваю дзейнасць з рэвалюцыйнымі сіламі Польшчы. Адзін са стваральнікаў восенню 1861 Камітэта руху — арганізацыйнага цэнтра «чырвоных» па падрыхтоўцы паўстання. 3 кастрычніка 1862 старшыня Літоўскага правінцыяльнага камітэта. 1.2.1863 узначаліў Часовы правінцыяльны ўрад Літвы і Беларусі. У сакавіку 1863 адхілены «белымі» ад кіраўніцтва і накіраваны на пасаду рэвалюцыйнага камісара Гродзенскага ваяводства. Са жніўня 1863 зноў на чале ўзброеннай барацьбы ў Літве і Беларусі, старшыня Выканаўчага аддзела Літвы. У лютым 1864 арыштаваны, паводле рашэння ваенна-палявога суда павешаны на Лукішскай плошчы ў Вільні. Выканаўчы аддзел Літвы ў час старшынства Каліноўскага наз. ўрадам («Літоўска-беларускі чырвоны жонд»), а самога Каліноўскага — «дыктатарам паўстання».

Ён адзін з выдаўцоў, аўтар і рэдактар газеты для сялян на беларускай мове «Мужыцкая праўда»; пісаў пад псеўд. «Яська-гаспадар з-пад Вільні». У 1863 — 1864 ім выдаваліся таксама газеты «Chorągiew swobody» («Сцяг свабоды»), «Glos z Litwy» («Голас з Літвы»), на старонках якіх праводзіліся ідэі сацыяльнай і нацыянальнай свабоды, неабходнасці аб'яднання беларускіх і літоўскіх зямель у суверэнную дзяржаву. Выступаў у абарону уніяцтва, супраць прымусовага пераводу беларускіх сялян у праваслаўе. З публіцыстычнай дзейнасцю Каліноўскага звязана развіццё ў Беларусі рэвалюцыйнага дэмакратызму.

Садзейнічаў станаўленню беларускай літаратурнай мовы. Этапнай з'явай у гісторыі беларускай літаратуры сталі яго публіцыстыка («Лісты з-пад шыбеніцы») і вершы («Марыська, чарнаброва галубка мая», прысвечаны нарачонай Марыі Ямант, і «Калі за нашу праўду Бог нас стаў караці» - развітанне з беларускім народам). Каліноўскі пераклаў на беларускую мову з польскай рэвалюцыйныя песні (мазурка Дамброўскага «Яшчэ Польшча не загінула» і інш.).

Яго імем названа **вуліца** ў Мінску (1963).

**Літаратура:**

Каліноўскі Кастусь (Вікенцій Канстанцін Сямёнавіч ) // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Т. 7. – Мінск, 1998. – С. 470-471.
Каліноўскі, К. За нашую вольнасць : творы, дакументы / Кастусь Каліноўскі ; [укладанне, прадмова, пасляслоўе, пераклады, каментарыі Г. Кісялёва ; навуковы рэдактар Я. Янушкевіч]. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1999. – 459 с. – (Беларускі кнігазбор).
Якімовіч, А.І. Кастусь Каліноўскі : аповесць. – Мінск : Юнацтва, 1994. – 253с. – (Школьная бібліятэка).

Мяльніцкі, Я. Вакол Каліноўскага / Ян Мяльніцкі // Маладосць. – 2013. – № 1. – С. 121-123.
Грыгаровіч, А. "Muzyckaya prauda" Кастуся Каліноўскага: графіка-арфаграфічныя асаблівасці выдання / Андрэй Грыгаровіч // Роднае слова. – 2010. – № 5. – С. 39-41.
*Босы, І.Ч.* Жыццёвы і творчы шлях Кастуся Каліноўскага / І. Ч. Босы // Беларуская мова і літаратура. – 2010. – № 1. – С. 37-41.
Шумов, С. Кастусь Калиновский / С. Шумов // Удивительная Беларусь / С. Шумов. – Москва, 2008. – С. 433-445.
Чаропка, В. Дыктатар Літвы / В. Чаропка // Лёсы ў гісторыі / В. Чаропка. – Мінск, 2005. – С. 535-556.
Авакян, Г. С. Змагар за народнае шчасце (Кастусь Каліноўскі) / Г. С. Авакян // Палітычныя мысліцелі і гуманісты Беларусі / Г. С. Авакян. – Мінск, 2002. – С. 70-77.

(імёны)

## Караленка Уладзімір Галакціёнавіч (1853 – 1921)

**Караленка Уладзімір Галакціёнавіч** нарадзіўся 15.07.1853 у г. Жытомір, Украіна. Рускі пісьменнік, публіцыст, грамадскі дзеяч. Ганаровы акадэмік Пецярбургскай АН (1900, у 1902 адмовіўся ад звання).

Вучыўся ў Тэхналагічным (1871-73) і Горным (1877-78) інстытутах у Пецярбургу, у Пятроўскай земляробчай і лясной акадэміі ў Маскве. Яго светапогляд фарміраваўся пад уплывам ідэй народнікаў. У 1876–77 у ссылцы ў Кранштаце, у 1879 у Вяцкай губерніі, у 1881–84 у Якуціі. З 1885 жыў у Ноўгарадзе, з 1896 – у Пецярбургу, з 1894 член рэдакцыі, адзін з кіраўнікоў народніцкага часопісу “Русское богатство”. З 1900 у Палтаве. Друкаваўся з 1878.

Жыццё народа, яго духоўнае багацце – асноўныя матывы творчасці Караленкі. У апавяданнях “Дзіўная” (1880), “Забойца”, “Сон Макара” (1885), “Сляпы музыка” (1886), “Марусіна заімка” (1889), “Рака гуляе”, “Ат-Даван” (1892), “Агеньчыкі” (1901) і іншых выступаў супраць беззаконня самадзяржаўных улад. Водгукам на актуальныя з’явы і праблемы грамадска-палітычнага жыцця былі яго нарысы “У галодны год” (1893), “Мултанскае ахвярапрынашэнне” (1895-96), “Гомельская судовая драма” (1905), “Сарачынская трагедыя” (1907), “Бытавая з’ява” (1910) і інш. Аповесць “Без языка” (1895) – назіранні пісьменніка ад падарожжа ў Амерыку. Мемуары “Гісторыя майго сучасніка” (1906 - 22) – мастацкі летапіс пакалення 1870-х гадоў.

Творчасць Караленкі вызначаецца рэалістычнасцю, спалучэннем эпічных і лірычных плыняў, паглыбленым псіхалагізмам, гуманізмам.

Асобныя творы Караленкі тэматычна звязаны з Беларуссю. Быў асабіста знаёмы з Я. Купалам. Яго творы друкаваліся ў беларускай газеце “Наша ніва”, у 1920 – 30-я гады на беларускай мове былі выдадзены яго аповесці “Сляпы музыка”, “Судны дзень”, “Лес шуміць”, “Дзеці падзямелля” і інш. У 1922 у тэатры імя Я. Купалы (БДТ-1) інсцэніраваны яго твор “Лес шуміць”. На беларускую мову асобныя творы Караленка пераклалі А. Александровіч, С. Дарожны, М. Краўцоў, А. Кудравец, К Чорны, Я. Шарахоўскі.

У Мінску імем У. Караленка названа адна **з вуліц** Першамайскага раёна.

**Літаратура:**

Короленко Владимир Галактионович // Краткая литературная энциклопедия: Т.3. – М.: Сов. Энциклопедия, 1966. – С.754-756.
Хозиева С.И. Русские писатели и поэты. – М, 1999. – С.269-272.
Бялый, Григорий Абрамович. В.Г.Короленко : [исследование творчества русского писателя] / Г.А.Бялый. – Ленинград : Художественная литература, Ленинградское отделение, 1983. - 350с.
Курков, И. Русские классики о белорусах / Илья Курков // Обозреватель. - 2010. - 2 апр. - С. 21.
Сосновская, И.В. "Сердце сердцу весть подаёт, сердце сердце чует" // Литература в школе. - 2003. - № 7. - С.42-44.

Фолимонов, С.С. Пейзаж в творчестве В.Г. Короленко // Литература в школе. - 2001. - № 7. - С.2-9.

(імёны)

## Карбышаў Дзмітрый Міхайлавіч (1880-1945)

**Карбышаў Дзмітрый Міхайлавіч** нарадзіўся 26.10.1880 г. у г. Омск, Расія.

Доктар ваенных навук. Удзельнік руска-японскай, 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў. У 1926 -1940 на выкладчыцкай рабоце ў ваенных акадэміях. Аўтар больш за 100 навуковых прац. Генерал-лейтэнант інжэнерных войск. У чэрвені 1941 інспектаваў будаўніцтва ваенных умацаванняўу раёне Гродна. 8.07.1941 пад Магілёвам цяжка паранены быў захоплен у палон. Вёў антыфашысцкую агітацыю сярод ваеннапалонных у лагерах смерці (Острув-Мазавецкі, Замосць, Майданек, Дахаў, Заскенхаўзен і інш.). У канцлагеры Маўтхаўзен закатаваны фашыстамі. Герой Савецкага Саюза (1946).

**Вуліца**, якая знаходзіцца ў Першамайскім раёне Мінска, атрымала імя Д.Карбышава ў 1974.

**Літаратура:**

Карбышаў Дзмітрый Міхайлавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 8. - Мн., 1997. - С. 64.

Карбышаў Дзмітрый Міхайлавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 251.

Карбышев Дмитрий Михайлович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 259-260.

Карбышев Дмитрий Михайлович // Герои Советского Союза: Краткий биограф. слов.: В 2 т. – Т. 1. - М., 1987. - С. 626.

Карбышев Дмитрий Михайлович // Жучкевич В.А. Улицы помнят. - Мн., 1984. - С. 68.

Карбышев Дмитрий Михайлович // Навечно в сердце народном. - Мн., 1984. - С. 215.

Карбышев Дмитрий Михайлович // Петраченко Д. Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 18-22.

Устинчик, В. Белорусские дороги генерала Карбышева / Василий Устинчик // Белорусская военная газета (Во славу Родины). - 2010. - 26 окт. - С. 7.

Новикова, С. Дмитрий Карбышев: жизнь во имя жизни / Светлана Новикова // Женский Журнал. - 2010. - № 2. - С. 27. Дмитрий Карбышев // Минский курьер. – 2005. - 7 мая. - С. 9.

Бандарэнка М. Дзмітрый Карбышаў // Голас Радзімы. – 2005. - 10 лют. - С. 5.

Бандарэнка М. Карбышаў - змагар, патрыёт, герой // ЛіМ. – 2005. - 28 студз. - С. 4.

Чернушевич А. Улица имени... // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 12.

(імёны)

## Касмадзям`янская Зоя Анатольеўна (1923-1941)

**Касмадзям`янская Зоя Анатольеўна** нарадзілася 13.091923 у с. Асінавыя Гаі Гаўрылаўскага р-на Тамбоўскай вобл., Расія.

У кастрычніку 1941 вучаніца 10-га класа 201-й маскоўскай шолы З. Касмадзям`янская добраахвотна уступіла ў знішчальны партызанскі атрад. У лістападзе 1941 у час выканання баявога задання ў варожым тыле схоплена гітлераўцамі. Пасля жорсткіх катаванняў павешана ў в. Пятрышчава Маскоўскай вобл. Герой Савецкага Саюза (1942). На месцы яе гібелі ўстаноўлены помнік.

У Першамайскім раёне Мінска **вуліца** носіць яе імя з 1947, на доме № 1 мемарыяльная дошка, каля школы-інтэрната № 13, ул.Солтыса,227 устаноўлены бюсты Зоі Касмадзям`янскай і яе брата Героя Савецкага Саюза Аляксандра Касмадзям`янскага.

**Літаратура:**

Касмадзям'янская Зоя Анатольеўна // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 8. - Мн., 1997. - С. 144.

Космодемьянская Зоя Анатольевна // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 308.

Космодемьянская Зоя Анатольевна //Герои Советского Союза: Краткий биограф. слов.: В 2 т. – Т. 1. - М., 1987. - С. 743.

Космодемьянская Зоя Анатольевна // Жучкевич В.А. Улицы помнят. - Мн., 1979. - С. 78.

Космодемьянская Зоя Анатольевна // Петраченко Д.Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 189-192.

(імёны)

## Кедышка Мікалай Аляксандравіч (1923-1943)

**Кедышка Мікалай Аляксандравіч** нарадзіўся 13.08.1923 у Мінску.

Быў рабочым Мінскага будаўнічага трэста. Восенню 1941 з групай камсамольцаў стварыў і ўзначаліў падпольную групу, якая да 1943 вырасла ў буйную арганізацыю і з лютага 1943 увайшла ў склад Мінскага падпольнага гаркома ЛКСМБ. Удзельнічаў у дыверсіях на электрастанцыі, чыгуначным вузле і інш. Загінуў у баі з гітлераўцамі, якія акружылі явачную кватэру. Герой Савецкага Саюза (1965).

**Вуліца** ў Першамайскім раёне Мінска названа яго імем (1962, былая Іпадромная), ГПТВ № 4 (1968), дзе ён вучыўся, мемарыяльныя дошкі на доме № 2 і на доме, дзе размяшчаўся штаб арганізацыі (вул.Магілёўская, 68).

**Літаратура:**

Кедышка Мікалай Аляксандравіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 8. - Мн., 1997. - С. 220.

Кедышка Мікалай Аляксандравіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 261.

Кедышко Николай Александрович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 266.

Кедышко Николай Александрович // Герои Советского Союза: Краткий биограф. слов.: В 2 т. – Т. 1. - М., 1987. - С. 644.

Кедышко Николай Александрович // Долготович Б. Д. Беларусь в годы Великой Отечественной войны в вопросах и ответах. - Мн., 1994. - С. 44.

Кедышко Николай Александрович // Навечно в сердце народном. - Мн., 1984. - С. 222-223.

Кедышко Николай Александрович // Жучкевич В.А. Улицы помнят. - Мн., 1979. - С. 86.

Кедышко Николай Александрович // Петраченко Д.Н. Именами героев. - Мн., 1978. - С. 131-137.

Николай Кедышко // Минский курьер. – 2005. – 7 мая. – С.8.

(імёны)

## Колас Якуб (сапр. Міцкевіч Канстанцін Міхайлавіч) (1882 – 1956)

**Якуб Колас (сапр. Міцкевіч Канстанцін Міхайлавіч)** нарадзіўся 3.11.1882 у в. Акінчыцы Мінскай вобл. Беларускі паэт, празаік, драматург, перакладчык, вучоны, педагог, грамадскі дзеяч. Народны паэт Беларусі (1926); акадэмік Акадэміі навук Беларусі (1928); заслужаны дзеяч навук Беларусі (1944).

Скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю (1902). У 1902-06 настаўнічаў у в. Люсіна (Ганцавіцкі раён) і в. Пінкавічы (Пінскі раён), у Верхменскім народным вучылішчы (Смалявіцкі раён). За ўдзел у нелегальным настаўніцкім з’ездзе 9 – 10.07.1906 у в. Мікалаеўшчына (Стаўбцоўскі раён) звольнены з працы і аддадзены пад суд. Працаваў у газеце “Наша ніва”(1907). 15.09.1908 засуджаны на 3 гады турэмнага зняволення. У 1912 – 14 настаўнік Пінскага прыходскага вучылішча. У верасні 1915 мабілізаваны ў армію. Летам 1917 у званні падпаручніка накіраваны на Румынскі фронт. У 1918 дэмабілізаваны. У 1921 вярнуўся ў Мінск. Працаваў у Навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамасветы, у

літаратурнай камісіі па збіранні вуснай народнай творчасці Інбелкульта, выкладаў у Белпедтэхнікуме, БДУ. З 1929 віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук Беларусі. У Вялікую Айчынную вайну жыў у Клязьме (пад Масквой), Ташкенце, Маскве. З 1944 у Мінску.

Першыя літаратурныя спробы Коласа адносяцца да часу вучобы ў настаўніцкай семінарыі (вершы на рускай мове, празаічны твор “Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле”). Першы апублікаваны твор – верш “Наш родны край” (газета “Наша доля”, 1.09.1906). Першы зборнік вершаў – “Песні-жальбы” (1910). Колас значна пашырыў жанравыя магчымасці беларускай паэзіі, узбагаціў яе пейзажнай і філасофскай лірыкай (“Нёман”, “Першы гром”, “Вясною” і інш.). Колас – адзін з пачынальнікаў мастацкай прозы ў беларускай літаратуры (апавяданне “Слабода”). Яго проза вызначаецца непаўторным нацыянальным каларытам (зборнікі “Апавяданні”, 1912; “Родныя з’явы”, 1914 і інш.). Глыбокім філасафічным зместам і мастацкай дасканаласцю вызначаюцца яго алегарычныя апавяданні (цыкл “Казкі жыцця”, выд. 1921). У зборніку вершаў “Водгулле” (1922) адлюстраваны складанасці часу, трывога за лёс Беларусі ў новых гістарычных умовах. У эпічнай паэме “Новая зямля” (апублікавана ў 1923) праўдзіва адлюстравана становішча працоўнага сялянства на рубяжы 19 – 20 стст., выяўлена яго імкненне стаць гаспадаром на ўласнай зямлі. Наватарства паэмы ў эстэтызацыі сялянскага побыту, паэтызацыі працы. Сімвалічная ліра-эпічная паэма “Сымон музыка” (1911 - 25) – твор аб народных вытоках мастацтва, лёсе таленту з народа, духоўным адраджэнні нацыі. Выключнае значэнне для станаўлення жанру беларускага рамана мелі “Палескія аповесці” (“У Палескай глушы”, 1923, і “У глыбі Палесся”, 1927, якія пазней увайшлі ў трылогію “На ростанях”; завершана трылогія ў 1954). Аповесць “На прасторах жыцця” (1926) прысвечана моладзі 1920-х гадоў, яе вучобе, імкненню да пераўтварэння жыцця. Драматызм калектывізацыі адлюстраваны ў даволі схематызаванай аповесці “Адшчапенец”(1930 – 31). У аповесці “Дрыгва” (1933), п’есах “Вайна вайне” (1927 - 31), “У пушчах Палесся” (1938), няскончанай паэме “На шляхах волі” (1926 – 56) Колас звяртаўся да паказу 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў. За вершы ваенных гадоў (зборнікі “Адпомсцім”, 1942; “Голас зямлі”, 1943) Дзяржаўная прэмія СССР 1946. У 1947 Колас завяршыў паэму “Рыбакова хата” (Дзяржаўная прэмія СССР 1949), у якой на прыкладзе вёскі Петрушы паказаў жыццё і барацьбу за свае правы працоўных Заходняй Беларусі.

Я. Колас – адзін з пачынальнікаў беларускай дзіцячай літаратуры. Псіхалогія дзяцей тонка раскрыта ў паэмах “Новая зямля” і “Сымон-музыка”, апавяданнях “Дзеравеншчына”, “Сірата Юрка” і інш., у паэтычных творах для дзяцей “ Рак вусач”, “Міхасёвы прыгоды”. Аўтар падручнікаў “Другое чытанне для дзяцей-беларусаў” (1909), “Методыка роднае мовы” (1926), публіцыстычных артыкулаў па найбольш актуальных праблемах грамадска-палітычнага, культурнага і літаратурнага жыцця.

Працаваў у галіне перакладу (“Палтава” А. Пушкіна, некаторыя творы М. Лермантава і інш.).

З імем Коласа звязана станаўленне норм беларускай літаратурнай мовы. Ён адзін з рэдактараў “Руска-беларускага слоўніка” (1953). Творы Коласа перакладзены на многія замежныя мовы.

У Мінску імя Я. Коласа носіць **вуліца, завулак і плошча**, на будынках устаноў, дзе ён працаваў, устаноўлены мемарыяльныя дошкі, на плошчы яго імя – помнік (1972); створаны літаратурны музей пісьменніка.

**Літаратура:**

Колас Якуб // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Т.8. - Мн., 1999. - С. 382-384.

Колас Якуб // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5т. - Т.1. - Мн., 1986. - С. 93-96.

Колас Якуб // Беларускія пісьменнікі: Бібліяграфічны слоўнік : у 6 т. Т.3. – Мн.: БелЭн, 1994. – С. 299-371.

Налівайка А.М. Якуб Колас // Гісторыя Беларускай літаратуры: 20 ст. (20-50-я ). – Мн., 2000. – С. 257-296.

Навумовіч У.А. Беларуская літаратура. – Мн., 2000. – С.158-184.

Аўрамчык М. Духоўны прарок і зямны чалавек. // Аўрамчык М. Знаёмыя постаці. – Мн., 2004.
Рытар І. Якуб Колас // На суд гісторыі. – Мн., 1994. – С.90-97.
Рагуля А.У. Пафас станаўлення // Рагуля А.У. Пафас станаўлення. – Мн., 1991. – С.52-75.
Рагойша В. Якуб Колас // Рагойша В. Вяршыні. – Мн., 1991. – С.86-139.
Мушынскі М.І. Якуб Колас: летапіс жыцця і творчасці. – Мн.: Маст.літ., 1982. –543с.:іл.

(імёны)

## Купрэвіч Васіль Феафілавіч
## (1897-1969)

**Купрэвіч Васіль Феафілавіч** нарадзіўся 24.1.1897 у в. Кальнікі Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці.

Беларускі вучоны ў галіне батанікі, заснавальнік глебавай энзімалогіі; дзяржаўны дзеяч Беларусі. Чл.-кар. АН СССР (1953). Акад. АН Беларусі (1952), доктар біялагічных навук (1942), праф. (1950). Герой Сацыялістычнай Працы (1969). Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1967). Скончыў Інстытут павышэння кваліфікацыі кадраў народнай асветы (Масква, 1931).

З 1934 у Інстытуце біялагічных навук Беларусі. З 1938 у Бат. інстытуце АН СССР (з 1949 дырэктар). З 1952 прэзідэнт АН Беларусі, адначасова з 1953 у Інстытуце біялогіі АН Беларусі, з 1958 у Аддзеле фізіялогіі і сістэматыкі ніжэйшых раслін АН Беларусі. Навуковыя працы па фізіялогіі хворых раслін, сістэматыцы грыбоў. Выявіў пазаклетачнае выдзяленне ферментаў у аблігатных паразітаў і кончыкамі каранёў вышэйшых раслін, даказаў магчымасць засвойвання раслінамі вуглекіслаты, якая трапляе ў каранёвую сістэму з вадою із глебы.

Яго імем названы Інстытут эксперыментальнай батанікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, **вуліца** ў Мінску.

**Літаратура:**

Купрэвіч Васіль Феафілавіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Т. 9. – Мінск, 1999. – С. 39.
Академик В. Ф. Купревич // Люди белорусской науки : воспоминания современников / [составители: О.А. Гапоненко, Н.В. Токарев]. – Минск, 2007. – Вып.1. – С. 245-302.
Ліпскі, У.С. Урокі Купрэвіча : дакументальная аповесць / У.С. Ліпскі. – Мінск : Беларусь, 1987. – 238с. – (Нашы славутыя землякі).

(імёны)

## Макаёнак Андрэй Ягоравіч
## (1920 – 1982)

**Макаёнак Андрэй Ягоравіч** нарадзіўся 12.11.1920 у в. Борхаў Рагачоўскага р-на. Беларускі сав. Драматург. Народны пісьменнік БССР (1977).

Скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КП(б)Б (1949). Удзельнік Вялікай Айчыйннай вайны, быў цяжка паранены. Дэмабілізаваўшыся, працаваў (1942 – 43) у Акаурцкай СШ (Грузія). У 1944 – 47 на камсамольскай і партыйнай рабоце на Беларусі. З 1949 у часопсе “Вожык”, з 1956 літаратурны кансультант Саюза пісьменнікаў Беларусі, у 1966 – 77 галоўны рэдактар часопіса “Неман”. Друкаваўся з 1946. Пісаў гумарэскі, фельетоны, нарысы.

Першая п’еса – драма “Добра, калі добра канчаецца» (1946). У 1952 на сцэне Беларускага тэатра імя Янкі Купалы пастаўлена яго палітычная драма «На досвітку» пра пасляваенную Францыю. У 1954 пастаўлена камедыя «Выбачайце, калі ласка», у 1959 – камедыя «Каб людзі не журыліся», у 1961 – «Лявоніха на арбіце» (Літаратурная прэмія імя Янкі Купалы 1962). Сацыяльна–палітычнай накіраванасцю вызначаюцца наватарскія п`есы «Зацюканы апостал» (1971), «Трыбунал» (1970). У канцы 1970 – пачатку 1980–х г. на сцэне з`явіліся трагікамедыя “Пагарэльцы”, камедыя “Верачка”. Апошні закончаны твор драматурга – трагікамедыя “Дыхайце эканомна” (1983).

А. Макаёнак – аўтар кінааповесці “Твой хлеб” (1956), сцэнарыяў фільмаў “Шчасце трэба берагчы” (1958), “Кандрат Крапіва” (1961), “Рагаты басціён” (1975), “Пасля кірмашу” (1973).

Імя А. Я. Макаенка носіць **вуліца** ў Мінску, на доме, дзе жыў, устаноўлена мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Макаёнак Андрэй Ягоравіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Т.9. - Мн., 1999. - С. 526.

Макаёнак Андрэй Ягоравіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. - Т.3. - Мн., 1986. - С. 399-400.

Макаёнак Андрэй Ягоравіч // Беларускія пісьменнікі: бібліяграфічны слоўнік. у 6 т. Т.4 – Мн., 1994. – С.167-169.

Гісторыя беларускай літаратуры 20 ст.: у 4-х т.т. Т.4. Кн.1. – Мн., 2002. – С.68-72; 237-269.

Навумовіч У.А. Беларуская літаратура. – Мн., 2000. – С.319-328.

Бугаёў Дз. Лёс драматурга (літаратурны партрэт Андрэя Макаёнка) // Бугаёў Дз. Спавядальнае слова. – Мн., 2001. – С.281-322.

Лаўшук С. Рыцар ідэйнай чысціні // Іменем чалавечнасці. – Мн: Нар.асвета, 1986. – С.142-148.

Колас Г. Аўтографы Андрэя Макаёнка. – Мн.: Маст.літ., 1992. – 285с.

Бугаёў Дз. Лёс драматурга. // Полымя. – 1997. - № 6. – С. 269-311.

(імёны)

## Нікіфараў Вячаслаў Кандратавіч (1909-1943)

**Нікіфараў Вячаслаў Кандратавіч** нарадзіўся у 1909.

Перад вайной працаваў у Бел. канторы Галоўнафтазбыту. З першых дзён акупацыі Мінска ўключыўся ў падпольную дзейнасць, адзін з ініцыятараў стварэння і кіраўнік падпольнай групы работнікаў Галоўнафтазбыту. Удзельнічаў у выратаванні савецкіх ваеннапалонных, прымаў па радыё і распаўсюджваў зводкі Саўінфармбюро. На яго кватэры падпольшчыкі праводзілі нарады, хавалі савецкую літаратуру, пісалі антыфашысцкія лістоўкі. У жн. – вер. 1942 кіраваў падрыхтоўкай матэрыялаў і выпускам № 2 – 4 падпольнай газеты “Звязда”. 25.09.1942 схоплены фашыстамі. Знішчаны ў Трасцянецкім лагеры смерці.

Яго імем названа **вуліца** ў Першамайскім раёне Мінска.

**Літаратура:**

Нікіфараў Вячаслаў Кандратавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 11. - Мн., 1997.- С. 341-342.

Нікіфараў Вячаслаў Кандратавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 383.

(імёны)

## Панамароў Пётр Ціханавіч (1924-1943)

**Панамароў Пётр Ціханавіч** нарадзіўся 11.07.1924 у в. Курдзюм Тацішчаўскага р-на Саратаўскай вобл., Расія.

Працаваў слесарам на Саратаўскім заводзе зубастрагальных станкоў. У Чырвонай Арміі з 1942. Наводчык гарматы радавы П.Ц. Панамароў вызначыўся пры вызваленні Прапойскага р-на. 26.10.1943 на працягу дня адбіў 6 контратак праціўніка, знішчыл 2 танкі і 35 гітлераўцаў, акружаны варожымі аўтаматчыкамі, адстрэліваўся да апошняга патрона і загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў в. Рабавічы. Герой Савецкага Саюза (1944).

Яго імем названа **вуліца** ў Першамайскім раёне Мінска (1965).

**Літаратура:**

Пономарев Петр Тихонович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 491-492.

Пономарев Петр Тихонович // Навечно в сердце народном. - Мн., 1984. - С. 419-420.

Пономарев Петр Тихонович // Жучкевич В.А. Улицы помнят. - Мн., 1979. - С. 73.

(імёны)

## Платонаў Барыс Віктаравіч
## (1903 – 1967)

**Платонаў Барыс Віктаравіч** нарадзіўся 24.07.1903 у Мінску.

Беларускі савецкі акцер, педагог. Народны артыст СССР (1948). Народны артыст БССР (1946).

Удзельнік Грамадзянскай вайны. З 1920 працаваў у самадзейным калектыве пры "Беларускай хатцы" і тэатры рэвалюцыйнай сатыры ў Мінску. З 1922 у Беларускім тэатры імя Янкі Купалы, у 1961 – 63 – яго мастацкі кіраўнік. З 1965 загадчык кафедры майстэрства акцёра і рэжысуры Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Акцёр шырокага творчага дыяпазону. Спалучаў тонкі псіхалагічны малюнак ролі. Сярод лепшых работ: Заслонаў ("Канстанцін Заслонаў" А. Маўзона), Туміловіч ("Пяюць жаваранкі" К.Крапівы), Трыгорын ("Чайка" А. Чэхава), Быкоўскі ("Паўлінка" Я. Купалы), Лявон ("Лявоніха на арбіце" А. Макаёнка), Рамэо ("Рамэо і Джульета" У. Шэкспіра), Эзоп ("Ліса і вінаград" Г. Фігейтрэду), Пётр ("Апошнія" М. Горкага) і інш. Выступаў на Беларускім радыё з чытаннем твораў прозы і паэзіі. Зняўся ў фільмах "Кастусь Каліноўскі", "Песня вясны", "Паўлінка", "Пяюць жаваранкі", "Хто смяецца апошнім"і інш. Пра Б.В. Платонава зняты дакументальны фільм "Думкі і вобразы" (1965).

Імем Б. В. Платонава ў Мінску названа **вуліца,** на адным з дамоў якой устаноўлена мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Платонаў Барыс Віктаравіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Т.12. - Мн., 2001. - С. 414.

Платонаў Барыс Віктаравіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. - Т.4. - Мн., 1987. - С. 308-309.

Сабалеўскі А. Барыс Платонаў: жыццё і творчасць вялікага беларускага артыста. – Мінск: Беларусь, 1989. – 140с., [16]л.іл.

(імёны)

## Пуцілаў Мацвей Мяфодзьевіч
## (1923 – 1942)

**Пуцілаў Мацвей Мяфодзьевіч** нарадзіўся у 1923 г. у в. Ільінка Омскай вобласці, Расія.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. На фронце з сакавіка 1942. Тэлефаніст роты сувязі радавы Пуцілаў вызначыўся у баях на Сталінградскім фронце. 25.10.1942 паранены ў руку Пуцілаў забяспечыў сувязь камандзіра дывізіі з групай воінаў, якія на працягу 2 сутак утрымлівалі дом, які быў акружаны фашыстамі, і карэкціравалі агонь савецкай артылерыі. Калі паранены у другі раз Пуцілаў адчуў, что ён паміpae, ён зажаў канцы тэлефоннага провада зубамі, чым забяспечыў сувязь, якая працавала і пасля яго смерці.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (1966).

**Літаратура:**

Путилов Матвей Мефодьевич // Их именами названы…: энциклопедический справочник. - Минск,1987. - С. 503.

Путилов Матвей Мефодьевич // Минск: энциклопедический справочник. - Минск,1983. - С.347.

(імёны)

## Русіянаў Іван Мікітавіч
## (1900-1984)

**Русіянаў Іван Мікітавіч** нарадзіўся 11.09.1900 у в.Шчуплы Смаленскага р-на, Расія

У Чырв. Арміі з 1919. Удзельнік грамадз. вайны. Скончыў курсы "Выстрал" (1932), курсы ўдасканалення пры Ваеннай акадэміі Генштаба (1941), ваенную акадэмію Генштаба (1949). У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1941. Пад яго камандаваннем 100-я стралковая дывізія у чэрв. 1941 абараняла Мінск у раёне Астрашыцкага Гарадка.

Удзельнічаў у баях пад Смаленскам і Ельняй, у Маскаоўскай, Сталінградскай, Курскай бітвах, у вызваленні Украіны, Венгрыі, Аўстрыі. Да 1958 у радах Савецкай Арміі. Герой Савецкага Саюза (1978).

Імем І.М.Русіянава названа **вуліца** Першамайскага раёна Мінска.

**Літаратура:**


Русіянаў Іван Мікітавич // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 13. - Мн., 1997. - С. 458.

Русіянаў Іван Мікітавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 545.

Руссиянов Иван Никитович //Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 523-524.

Руссиянов Иван Никитович // Герои Советского Союза: Краткий биограф. слов.: В 2 т. – Т. 2. - М., 1987. - С. 385.

Руссиянов Иван Никитович // Навечно в сердце народном. - Мн., 1984. - С. 449.


(імёны)

## Скарына Францыск
## (1490(?) – 1551(?))

**Скарына Францыск** (каля 1490, г. Полацк Віцебскай вобл. — каля 1551), беларускі і ўсходня-славянскі першадрукар, асветнік-гуманіст, пісьменнік, грамадскі дзеяч, вучоны-медык. Дакладная дата нараджэння невядома. Супастаўленне звестак пра паступленне у Кракаўскі ун-т (1504) і абароны доктарскай дысертацыі ў Падуанскім ун-це (1512), дзе ён названы «маладым чалавекам», дае падставы прыняць 1490 як прыблізны год яго нараджэння (дапушчальна і 2-я пал. 1480-х г.). Звесткі пра сям'ю Скарыны вядомы з канца 15 ст. Бацька — Лук'ян Скарына згадваецца ў спісе расійскіх пасольскіх прэтэнзій 1492 да полацкіх купцоў. Старэйшы брат — Іван названы ў каралеўскім дэкрэце адначасова віленскім мешчанінам і палачанінам. Невядома і хроснае імя Скарыны.

Гіпотэза пра тое, што Скарына іменаваўся Георгіем, новымі дакументальнымі адкрыццямі не пацвярджаецца. У сваіх выданнях Скарына больш за 100 разоў выкарыстоўвае імя «Франциск», зрэдку «Францишек». У актах ВКЛ на лацінскай мове яго імя называюць «Franciscus», на беларускай мове «Франьцышак», «Франьцышко». Першапачатковую адукацыю атрымаў у Полацку. Тут або ў сталіцы ВКЛ Вільні прайшоў ён і далейшыя школьный навукі, авалодаў лацінскай мовай. У зімовы семестр 1504 Скарына паступіў у Кракаўскую акадэмію на факультэт вольных мастацтваў або філасофіі. У Кракове Скарына ўсвядоміў навучныя і асветніцкія магчымасці друкаванай кнігі. У 1506 ён вытрымаў экзамен на ступень бакалаўра вольных мастацтваў. Невядома, дзе Скарына знаходзіўся ў 1507—12. Магчыма, ён скончыў ун-т і у Празе, дзе атрымаў ступень доктара філасофіі, але больш верагодна, што доктарскі дыплом ён атрымаў у Кракаве. Не пазней восені 1512 Скарына прыбыў у г. Падуя, каб набыць ступень доктара медыцыны. Можна меркаваць, што грунтоўную медыцынскую адукацыю ён атрымаў у Кракаве або ў Падуі ці Балонскім ун-це. 9.11.1512 Скарына абараніў ступень доктара медыцынскіх навук.

Інтэнсіўная выдавецкая дзейнасць Скарыны ў Празе ў 1517—19 дазваляе думаць, што ён пасяліўся тут не пазней як у 1516. 6.8.1517 Скарына выдаў сваю 1-ю кнігу «Царстваў». У пач. 1520-х г. Скарына пераехаў у Вільню, дзе каля 1522 выдаў «Малую падарожную кніжку», якая складаецца з 23 частак. У 1525 у Вільні Скарына выдаў кнігу «Апостал».

З сярэдзіны 1520-х г. Скарына служыў сакратаром віленскага біскупа Яна, займаўся і медыцынскай дзейнасцю. У Вільні ён ажаніўся з Маргарытаю, удавой віленскага радцы Юрыя Адверніка, і жыў у яе камяніцы на Нямецкай вул., недалёка ад палаца князёў Слуцкіх. Як лічаць даследчыкі, у канцы 1520 —пач. 1530-х г. Скарына наведаў Маскву, каб распаўсюдзіць там свае выданні. У 1530 па нейкіх прычынах ездзіў у Кёнігсберг да герцага Альбрэхта. Відаць, гэга было звязана з распаўсюджаннем у 1529— 30 у Прускім герцагстве пандэміі. У канцы 1520 — пач. 1530-х г. матэрыяльнае становшча Скарыны пагоршылася: памерлі амаль усе апекуны яго выдавецкай дзейнасш (Якуб Бабіч, Багдан Онкаў, Рыгор Адвернік). Скарына быў зняволены на некалькі месяцаў у пазнанскай турме; пажар 1530 знішчыў значную частку Вільні, магчыма, і яго друкарню; апякун Скарыны віленскі біскуп Ян у 1536 пераведзены ў Познань, дзе неўзабаве памёр.

Спалучэнне розных абставін і адсутнасць падтрымкі вымусілі Скарыну пакінуць ВКЛ і ад'ехаць у Прагу.

У канцы 1530-х г., магчыма, і ў 1540-я г. Скарына працаваў садоўнікам каралеўскага парку на Градчанах.

Некататорыя даследчыкі лічаць, што Скарына памёр да 1541. Месца пахавання таксама невядома.

Заснаванне Скарынай беларускага кнігадрукавання стала вяршыняй яго духоўнай дзейнасці, найбольш яскравым і выразным пралогам беларускага Адраджэння.

Імя Ф. Скарыны з 2006 года **носіць вуліца** ў Першамайскім раёне Мінска.

**Літаратура:**

Скарына Францыск // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.14. – Мн.: БелЭн, 2002. – С. 442-450.

Скарына Францыск // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Т.6. Кн.1. - Мн.: БелЭн, 2001. – С. 309-319.

Скарына Францыск // Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыклапед. даведнік.- Мн.: БелЭн, 1995. – С. 123-136.

Францыск Скарына і яго час: Энц.даведнік. – Мн.: БелСЭ, 1988.

Агіевіч У.У. Імя і справа Скарыны. – Мн.: Бел.навука, 2002.

Дварчанін І.С. Францішак Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай ніве. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991.

Лойко О.А. Скорина. - М.: Молодая гвардия, 1998. – (Жизнь замечат. людей).

Немировский Е.А. Франциск Скорина: Жизнь и деятельность белорусского просветителя. – Мн.: Маст. літ., 1990.

Мальдзис А. Титан эпохи Возрождения. // Из тьмы веков светлеющие лики. – Мн.: Беларусь, 1994. – С. 57-69.

Васілеўскі П. Хлеб і кніга: "Залаты век" Беларусі ў люстэрку года Скарыны. // З гісторыяй на "Вы". – Мн.: Маст.літ., 1994. – Вып.2. – С. 36-50.

Калеснік У. Постаць Скарыны // Калеснік У. Тварэнне легенды. – Мн.: Маст.літ., 1987. – С. 3-122.

Александровіч С. Францыск, Скарынін сын з Полацка. // Александровіч С. Тут зямля такая. – Мн.: Нар.асвета, 1985. – С. 3-15.

Па слядах Францыска Скарыны. // Александровіч С. Слова – багацце. – Мн.: Маст.літ., 1981. – С. 4-76.

(імёны)

## Сурганаў Фёдар Анісімавіч
## (1911-1976)

Гл. Савецкі раён.

## Талбухін Фёдар Іванавіч
## (1894-1949)

**Талбухін Фёдар Іванавіч** нарадзіўся ў 1894 у в. Андронікі, цяпер Талбухінскага р-на, Яраслаўскай вобл., Расія.

Скончыў камерцыйнае вучылішча. У арміі з 1914, у Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік 1-й сусветнай і грамадз. войнаў. Скончыў школы прапаршчыкаў (1915), штабной службы (1919), курсы ўдасканалення (1930), Ваенную акадэмію імя М.Фрунзе (1934). З 1938 нач. штаба Закаўказскай ваеннай акругі. У гады Вялікай Айчыннай вайны начальнік штаба Закаўказскага, Каўказскага і Крымскага франтоў, намеснік камандуючага войскамі Сталінградскай ваеннай акругі. З ліп. 1943 камандуючы войскамі 57-й і 68-й армій, з кастр. 1943 – 4-га Укр., з мая 1944 – 3-га Укр франтоў. Войскі пад яго камандаваннем удзельнічалі ў Сталінградскай бітве, у вызваленні Украіны і Крыма, у Яска-Кішынёўскай аперацыі 1944, вызваленні Румыніі, Балгарыі, Югаславіі, Венгрыі і Аўстрыі. З ліп. 1945 галоўнакамандуючы Паўднёвай групай войскаў, адначасова Старшыня саюзнай кантрольнай камісіі ў Румыніі і Балгарыі.. З 1946 Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР. Са студз. 1947 камандуючы войскамі

Закаўказскай ваеннай акругі. Узнагароджаны ордэнам “Перамога” Пахаваны на Чырвонай плошчы ў Маскве (1949).

**Вуліца** Першамайскага раёна Мінска носіцьімя Ф.І. Талбухіна з 1949, на доме № 1 мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Талбухін Фёдар Іванавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 15. - Мн., 2002. - С. 401.

Толбухин Федор Иванович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 605.

Толбухин Федор Иванович // Жучкевич В.А. Улицы помнят. - Мн., 1979. - С. 66-67.

(імёны)

## Фогель Ян Янавіч
## (1898-1944)

**Фогель Ян Янавіч** нарадзіўся 24.12.1898 у п. Дурэ Гулбенскага р-на, Латвія.

У Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік грамадзянская вайны. Скончыў Ваенную акадэмію імя М.Фрунзе (1933). У Вялікую Айчынную вайну з 1943 на Бранскім, Цэнтр., Бел., 1-м Бел. франтах. Стралковая дывізія на чале з генерал-маёрам Я. Фогелем вызначылася ў Беларускай аперацыі 1944. З 24.06 да 08.07.1944 дывізія пад яго камандаваннем прайшла з баямі ад р. Друць да Навагрудка, вызваліла 250 населеных пунктаў, захапіла шмат варожай тэхнікі і зброі, узяла ў палон больш за 2800 нямецкіх салдат і афіцэраў, замкнула аблогу групоўкі праціўніка ў бабруйскі “кацёл”. Смяротна паранены ў баі, памёр 14.07.1944 ад ранення. Герой Савецкага Саюза (1945).

**Вуліца** Першамайскага раёна Мінска носіць яго імя з 1966.

**Літаратура:**

Фогель Ян Янавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 16. - Мн., 2003. - С. 433.

Фогель Ян Янавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 607.

Фогель Ян Янович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 634-635.

Фогель Ян Янович // Навечно в сердце народном. - Мн., 1984. - С. 541.

(імёны)

## Чарнышэўскі Мікалай Гаўрылавіч
## (1828 – 1889)

**Чарнышэўскі Мікалай Гаўрылавіч** нарадзіўся 24.7.1828 у г. Саратаў, Расія.

Рускі філосаф, пісьменнік, літаратурны крытык. Магістр (1855). Вучыўся ў Саратаўскай духоўнай семінарыі (1842— 1845), скончыў Пецярбургскі універсітэт (1850). Працаваў выкладчыкам літаратуры ў Саратаўскай гімназіі. З 1853 у Пецярбургу: супрацоўнічаў у часопісе «Отечественные записки», галоўны рэдактар часопіса «Современик». У 1862 арыштаваны за дачыненне (не даказанае) да напісання пракламацыі «Панскім сялянам ад іх дабрадзеяў паклон», а ў 1864 прыгавораны сенацкім судом да катаргі і вечнага пасялення ў Сібіры. У 1883 пераехаў у Астрахань, потым у Саратаў. Светапогляд Чарнышэўскага фарміраваўся пад уплывам ідэй класічнай нямецкай філасофіі (Г.Гегель, Л.Феербах), англійскай палітычнай эканоміі (Д.Рыкарда), французскага утапічнага сацыялізму (Ш.Фур'е і інш.), а таксама В.Р.Бялінскага, А.І.Герцэна, П.Леру, П.Ж.Прудона. У асноўнай філасофскай працы «Антрапалагічны прынцып у філасофіі» (1860) сцвярджаў, што чалавек мае адну рэальную натуру — матэрыяльную. У адрозненне ад Феербаха бачыў у чалавеку не толькі родавае, але і сацыяльна-гістарычнае стварэнне. Лічыў, што на аснове сялянскай абшчыны, злучанай з навукова-тэхнічнымі дасягненнямі Захаду, Расія ў стане перайсці да сацыялізму; шляхам да такога пераходу лічыў сацыялістычную рэвалюцыю. У рамане «Што рабіць?» (1863) даў вобразны малюнак «светлай і цудоўнай» будучыні чалавецтва — сацыялізму, які грунтуецца на грамадскай уласнасці. Эстэтыку разглядаў як «сістэму агульных прынцыпаў мастацтва ўвогуле і паэзіі ў асаблівасці». На яго думку, творы мастацтва ўзнікаюць на глебе сапраўдных патрэбнасцей чалавека (праўды, любові і паляпшэння быту), таму прадметам мастацтва можа і павінна стаць рэальная рэчаіснасць, а

не штосьці абсалютнае і недасягальнае. У яго этычных поглядах узвялічваецца праца і людзі працы, асуджаецца марнае жыццё, адстойваецца разумны эгаізм асобы. Развітыя Чарнышэўскім рэалістычныя традыцыі ў разуменні суадносін мастацтва і рэчаіснасці паўплывалі на творчасць многіх беларускіх пісьменнікаў і дзеячаў мастацтва пачатку 20 стагоддзя. Пад ідэйным уплывам Чарнышэўскага фарміраваўся светапогляд К.Каліноўскага. Сярод вучняў і паслядоўнікаў Чарнышэўскага былі браты А.Д. і Б.Д. Трусавы і інш. Ідэйная спадчына Чарнышэўскага стала адной з тэарэтычных крыніц станаўлення беларускай эстэтыкі; у 1920-я г. яе вывучалі С.Вальфсон, І.Герчыкаў і інш.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1939), 2 завулка, праезд.

**Літаратура:**

Чарнышэўскі Мікалай Гаўрылавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.17. - Мінск, 2003. – С.241.

Чернышевский Николай Гаврилович // Их именами названы…: энциклопедический справочник. - Минск,1987. - С. 666.

Чернышевский Николай Гаврилович // Минск: энциклопедический справочник – Минск,1983.-С.438.

(імёны)

## Чарняхоўскі Іван Данілавіч
## (1906 – 1945)

**Чарняхоўскі Іван Данілавіч** нарадзіўся 29.6.1906 г. у с. Аксаніна Уманскага раёна Кіеўскай вобласці, Украіна.

Савецкі ваенны дзеяч. Генерал арміі (1944). Двойчы Герой Савецкага Саюза (1943, 1944). Скончыў Кіеўскую артылерыйскую школу (1928), Ваенную акадэмію механізацыі і матарызацыі РСЧА (1936). У Чырвонай Арміі з 1924. У 1938—1941 у БВА: камандзір легкатанкавага палка, намеснік камандзіра танкавай дывізіі. У Вялікаю Айчы вайну з 1941 на Паўнёва-Заходнім, Варонежскім, Цэнтральным, 1-м Украінскім франтах: камандзір танкавай і стралковай дывізій, танкавага корпуса, камандуючы арміяй. Удзельнік абароны Ноўгарада, Варонежа; вызначыўся ў Курскай бітве, Чарнігаўска-Прыпяцкай аперацыі 1943, Варонежска-Касторненскай, Кіеўскай, Жытомірска-Бярдзічаўскай, Роўна-Луцкай наступальных аперацыях. З красавіка 1944 камандуючы войскамі 3-га Беларускага фронту, якія разам з 1-м Прыбалтыйскім фронтам ажыццявілі Віцебска-Аршанскую аперацыю 1944, а з 1-м і 2-м Беларускімі франтамі — Мінскую аперацыю 1944, стварылі мінскі «кацёл»; вызвалілі Віцебск, Оршу, Барысаў, Мінск, Ліду, Вільнюс і інш. населеныя пункты. Войскі на чале з Чарняхоўскім першыя ўступілі ва Усходнюю Прусію і Паўночную Польшчу, выйшлі на подступы да г. Кёнігсберг. Каля г. Мельзак (цяпер г. Пянежна, Польшча) Чарняхоўскі быў смяротна паранены.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (1947), на доме № 1 мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Чарняхоўскі Іван Данілавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.17. - Мінск, 2003. – С.243-244.

Черняховский Иван Данилович // Их именами названы…: энциклопедический справочник.- Минск,1987.- С. 667.

Черняховский Иван Данилович // Минск: энциклопедический справочник – Минск,1983.-С.438.

Легендарный Черняховский. Вся жизнь – подвиг / [составление, предисловие А.Я.Сухарева]. – Москва : Зарницы, 2005. - 382с.,1л.портр. - ( Полководцы Великой Отечественной).

Черняховский Иван Данилович // Долготович Б.Д. Беларусь в годы Великой Отечественной войны в вопросах и ответах / Б.Д. Долготович. - Минск, 1994.- С. 103-105.

Зайцев,Н. По дорогам шинельного цвета / Николай Зайцев, Григорий Лянькевич, Виталий Пальцев // Беларуская думка.- 2007.- № 5.- С. 127-133.

(імёны)

## Шугаеў Мікалай Аляксандравіч
## (1912-1943)

**Шугаеў Мікалай Аляксандравіч** нарадзіўся у 1912 у г. Сормава Ніжагародскай вобл., Расія.

У пачатку 30-х гадоў у ліку 25-тысячнікаў накіраваны на Беларусь. Працаваў у саўгасе “10-годдзе БССР” Любанскага р-на, інструктарам ЦК КП(б)Б, у апараце Наркамата паліўнай пра-сці БССР.. З першых дзён акупацыі ўключыўся ў падпольную барцьбу супраць фашысцкіх захопнікаў. Стварыў і ўзначаліў дыверсійную групу ў Варашылаўскім р-не г. Мінска. З мая 1942 сакратар Варашылаўскага падп. райкома КП(б)Б. Пры яго ўдзеле створана партызанская брыгада “Штурмавая”. Арыштаваны акупантамі ў кастр. 1942 і закатаваны ў мінскай турме.

Імем М.А. Шугаева названа **вуліца** Першамайскага раёна Мінска.

**Літаратура:**

Шугаеў Мікалай Аляксандравіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 17. - Мн., 2003. - С. 481.

Шугаеў Мікалай Аляксандравіч //Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 641.

(на пачатак)

## Савецкі раён

(імёны)

## Алешаў Мікалай Мікалаевіч
## (1903-1970)

**Алешаў Мікалай Мікалаевіч** нарадзіўся ў г. Яраслаўле, Расія.

Удзельнік Грамадзянская вайны, у Чырвонай Арміі з 1918. У 1926 скончыў кавалерыйскую школу, у 1941 – 1 курс Ваеннай акадэміі імя М.В. Фрунзе.

На франтах Вялікай Айчыннай вайны з чэрвеня 1941. 3 ліпеня 1944 г. распараджэннем камандуючага 31-й арміяй генерал-палкоўніка В.В. Глаголева камандзір 36-га стралковага корпуса генерал Мікалай Алешаў быў назначан камендантам Мінска. За 10 дзён яго падначаленныя расчысцілі вуліцы, абясшкодзілі тысячы мін, аднавілі электрастанцыю і водазабеспячэнне. У хуткім часе генерал Алешаў вярнуўся на фронт.

Камандыр 113-га стралковага корпуса 39-й арміі Забайкальскага фронта генерал-лейтынант М.М. Алешаў прымаў удзел у савецка-японскай вайне 1945, у фарсіраванні храбта В. Хінган. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена ў 1945.

Пасля вайны служыў ў войску. У 1948 годзе скончыў Ваенную акадэмію Генштаба, з 1963 – у адстаўцы. Узнагароджаны 8 ордэнамі, медалямі.

Адна з **вуліц** Савецкага раёна носіць яго імя.

**Літаратура:**

Олешев Николай Николаевич // Герои Советского Союза : в 2 т. Т. 2. – Москва, 1988.- С.196.

Бабусенко, Г. Минский “котел” / Галина Бабусенко // Вечер. Минск. – 2004. – 2 июля. – С. 3.

(імёны)

## Багдановіч Максім Адамавіч
## (1891-1917)

**Багдановіч Максім Адамавіч** нарадзіўся 9.12.1891 у Мінску.

Беларускі паэт, перакладчык, літаратуразнавец, празаік.

Раннія дзіцячыя гады правёў у Гродне (1892—1896), жыў і вучыўся ў Ніжнім Ноўгарадзе (1896—1908) і Яраслаўлі (1908—1916). Скончыў Дзямідаўскі юрыдычны ліцэй у Яраслаўлі (1916) і восенню прыехаў у Мінск. Працаваў сакратаром губернскай харчовай камісіі. У лютым 1917 цяжка хворы выехаў на лячэнне ў Ялту. Там памёр і пахаваны.

Першы друкаваны твор — алегарычная казка-прытча «Музыка» (1907). Адзіны прыжыццёвы зборнік вершаў «Вянок» (1913). Яго паэзія развівалася ва ўмовах рэакцыі, у атмасферы вострых сацыяльна-палітычных канфліктаў. Асноўны кірунак творчасці —

патрыятычнае служэнне сацыяльнаму і нацыянальнаму вызваленню беларускага народа, сцвярджэнне ідэй роўнасці і братэрства, барацьба за гуманістычныя ідэалы.

Багдановіч-мастак асноўнай сваёй задачай лічыў узбагачэнне роднай літаратуры новымі тэмамі і формамі. Яго вершы — шматгранны паказ жыцця чалавека ў разнастайных сувязях з грамадствам і прыродай. Галоўнае ў іх — жыццялюбства («Прывет табе, жыццё на волі!», «Выйшаў з хаты»), актыўнае стаўленне да рэчаіснасці («Рушымся, брацця, хутчэй», «Кінь вечны плач свой аб старонцы!»), захапленне красой жыцця («Па-над белым пухам вішняў», «Зімой»), маладосцю («Маладыя гады»), мудрасцю, працавітасцю, таленавітасцю народа («Летапісец», «Слуцкія ткачыхі»). Матывы смутку паглыбляліся асабістай драмай паэта, з 18 гадоў хворага на сухоты.

Багдановіч з Я. Купалам — заснавальнікі пейзажнай і інтымнай любоўнай лірыкі ў беларускай паэзіі («Я бальны, бесскрыдлаты паэт», трыялет «Мне доўгае расстанне з Вамі», «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы»). Вялікая заслуга паэта ў распрацоўцы гістарычнай тэмы («Летапісец», «Безнадзейнасць», «Перапісчык», «Агата», цыкл «Места», «Песня пра князя Ізяслава Полацкага») і ўрбаністычных матываў («Вулкі Вільні зіяюць і гулка грымяць», «На глухіх вулках — ноч глухая»).

Творчасць Багдановіча мела першаступеннае значэнне ў гістарычным самапазнанні народа і сцвярджэнні яга месца ў гісторыі чалавецтва. Яго вершы вызначаюцца майстэрскім выкарыстаннем вобразна-выяўленчых сродкаў класічнай і песенна-народнай паэтыкі. Выхаваны на паэзіі А.Пушкіна, Л.Фета, Ф.Цютчава, добра знаёмы з сучаснай яму рускай паэзіяй, узбагаціў родную літаратуру перадавымі ідэямі і багатым эстэтычным вопытам. Зборнік «Вянок» стаў у беларускай паэзіі ўзорам творчага засваення класічнай паэтыкі на нацыянальнай глебе. Школай высокага майстэрства з'яўляюцца змешчаныя тут санеты, трыялеты, рандо, актавы, тэрцыны, пентаметры. Класічную культуру нёс роднаму слову Багдановіч і як перакладчык Гарацыя, Авідзія, Ф.Шылера, Г.Гейнэ, А.Ф.Арвера, П.Верлена, Э.Верхарна, Ю.Святагора, А.Пушкіна, А.Майкава, А.Крымскага, М.Розенгейма, А.Алеся. Перакладаў на рускую мову творы Я.Купалы, Т.Шаўчэнкі, І.Франко, В.Стафаніка, У.Самійленкі. Вялікае месца ў творчасці Багдановіча займаў фальклор: выкарыстанне беларускай міфалогіі («Чуеш гул? — Гэта сумны, маркотны лясун», «Вадзянік», «Змяіны цар»), вобразаў, матываў, рытміка-інтанацыйнага складу беларускай народнай песні («Не кувай ты, шэрая зязюля», нізка «На сінім Дунаі»). Вершы т. зв. беларускага складу — узор лірыкі, стылізаванай пад песенна-народную паэтыку («Бяседная», «Лявонка», «Скірпуся»). Паэмы Багдановіча — пошук нацыянальнага эпасу: гераічнага — «Максім і Магдалена», «Страцім-лебедзь», сацыяльна-бытавога — «Мушка-зелянушка і камарык — насаты тварык». Пісаў у класічных і песенна-народных формах іншых паэзій (песні «Руская», «Украінская», «Сербская», «Скандынаўская», «Іспанская», у форме рубаі — «Персідскія», у форме танкі — «Японскія»). Праца Багдановіча-крытыка накіравана на абарону рэалізму і народнасці — эстэтычных асноў перадавой беларускай літаратуры пач. 20 ст. («Глыбы і слаі», 1911; «За тры гады», 1913; «Забыты шлях», 1915). Адзін з заснавальнікаў навуковай гісторыі беларускай літаратуры («Кароткая гісторыя беларускай пісьменнасці да XVI сталецця», «Новы перыяд у гісторыі беларускай літаратуры»). Лепшыя апавяданні Багдановіча стаяць каля вытокаў беларускай нацыянальнай прозы («Апокрыф», 1913; «Апавяданне аб іконніку і залатару...», 1914). Даследаваў літаратуру і гісторыю славянскіх народаў (артыкулы пра Т.Шаўчэнку, М.Ламаносава, А.Пушкіна, М.Лермантава, гісторыка-этнаграфічныя нарысы «Украінскае казацтва», «Галіцкая Русь», «Угорская Русь», «Браты-чэхі» і інш.). Яго публіцыстыка звязана з супрацоўніцтвам (1913—1916) у яраслаўскай газеце «Голос». Прозу, літаратуразнаўчыя і публіцыстычныя артыкулы часткова пісаў на рускай і украінскай мовах. Паэзія Багдановіча ўвайшла ў духоўную скарбніцу беларускага народа. Яна уплывае на развіццё беларускай паэзіі і сёння, асабліва сваім глыбокім пранікненнем у духоўны свет чалавека і высокай культурай паэтычнага слова. Некаторыя вершы сталі народнымі песнямі («Зорка Венера», «Слуцкія ткачыхі»), многія пакладзены на музыку кампазітарамі. На лібрэта А.Бачылы кампазітар Ю.Семяняка напісаў оперу «Зорка Венера» (паст. 1970).

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1991) і **завулак** (1966), гарадская бібліятэка № 8, сярэдняя школа № 40, на доме № 25 мемарыяльная дошка (1959, новы варыянт 1982). У 1981 створаны Літаратурны музей М. Багдановіча, у скверы на плошчы Парыжскай Камуны ўстаноўлены помнік паэту.

**Літаратура:**


Багдановіч Максім Адамавіч// Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.2. - Мінск, 1996. - С. 205 –206.

Богданович Максим Адамович // Минск: энциклопедический справочник – Минск,1983.-С.104.

Навуменка, Іван Якаўлевіч. Вывучэнне творчасці Максіма Багдановіча ў школе : дапаможнік для настаўнікаў / І.Я. Навуменка, Т.І. Мароз. – Мінск : Беларуская навука, 2001.- 156с.

Міклашэўскі, Я.В. Каханне і смерць, або Лёс Максіма Багдановіча : раман-даследаванне. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1995. - 367с.:іл.

Максимович, В. Диалектика мысли и чувства: опыт литературно-психологического исследования критического наследия Максима Богдановича / В. Максимович // Неман. - 2008. -№ 5. - С. 157-167.

Адамовіч, Г. Жыццё і творчасць Максіма Багдановіча як прыклад "адарванасці" // Роднае слова. - 2008. - № 4. - С. 3-7.

Максімовіч, В. Праявы акмеізму ў творчасці Максіма Багдановіча / В. Максімовіч // Роднае слова. - 2008. - № 4. - С. 8-11.

Журавлев, В. Молодость голоса пушкинской и национальной литературной традиции / Василь Журавлев; перевод с белорусского В. Борисевича // Неман. - 2007. - № 12. - С.154-160.

Бутэвіч, А. Маладыя гады - маладыя жаданні: драма кахання - для няспешнага чытання / Анатоль Бутэвіч // Маладосць. - 2007. - № 10. - С. 75-97.


(імёны)

## Бяда Леанід Ігнатавіч
## (1920-1976)

**Бяда Леанід Ігнатавіч** нарадзіўся 16.08.1920 ў с. Новапакроўка Урыцкага р-на Кустанайскай вобл., Казахстан.

Скончыў Чкалаўскую ваенную авіяцыйную школу пілотаў (1942). З жн. 1942 на Сталінградскім, Паўднёвым, 4-м Украінскім, 3-м Беларускім франтах – пілот, камандзір эскадрыллі штурмавога авіяпалка. Удзельнік Сталінградскай бітвы, вызвалення Украіны, Беларусі, Літвы, наступальных аперацый ва Усх. Прусіі і Польшчы. Зрабіў 214 баявых вылетаў. Двойчы Герой Савецкага Саюза (1944, 1945). Пасля вайны скончыў Ваенна-паветраную акадэмію (1950), Ваенную акадэмію Генштаба (1957). Камандаваў авіяцыйным палком, дывізіяй, авіяцыяй БВА. Генерал-лейтэнант авіяцыі (1972). Заслужаны ваенны лётчык СССР. Загінуў у аўтакатастрофе.

**Вуліца** ў Савецкім раёне атрымала імя Л.І. Бяды ў 1977 г. На доме, дзе ён жыў (вул. Я. Купалы, 7) — мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**


Бяда Леанід Ігнатавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 3. - Мн., 1996. - С. 392.

Бяда Леанід Ігнатавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 2. - Мн. - С. 159.

Бяда Леанід Ігнатавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 108.

Антонович, С. В небе - "черная смерть" // Судьба до востребования / Славомир Антонович. - Минск, 2011. - С. 237-249.

Наливайко Б. М. На грозных "илах": О дважды Герое Советского Союза Л.И. Беде. - Мн.: Беларусь, 1981

Николаева, С. Легендарному командиру эскадрильи // Минский курьер. - 2008. - 27 июня. - С. 3.

Чернушевич А. Улица имени... // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 6.


(імёны)

## Гало Захар Захаравіч
## (1923-1944)

**Гало Захар Захаравіч** нарадзіўся 18.03.1923 у Мінску.

Удзельнік Мінскага партыйнага падполля. Член ВЛКСМ. З восені 1941 па заданні падпольнага партыйнага камітэта працаваў сакратаром бюро пропускаў Мінскай гарадской управы. Забяспечваў падпольшчыкаў бланкамі пашпартоў, перадаваў звесткі аб падрыхтоўцы гітлераўцамі аблаў, карных экспедыцый. Быў звязаны з падп. групамі на чыг. вузле, Лагойскім падп. РК КП(б)Б, спецгрупай ЦШПР. Узначальваў дыверсійную групу, якая ў ліп.-верас. 1943 г. замініравала 6 эшалонаў, што ішлі на фронт. Перапраўляў зброю і боепрыпасы ў партызанскі атрад імя Суворава брыгады "Народныя мсціўцы". Актыўна ўдзельнічаў у вызратаванні сав. Ваеннапалонных і адпраўцы іх у партыз. Атрады. 25.10.1943 арыштаваны. Загінуў у фашысцкіх засценках.

**Вуліца** ў Савецкім раёне атрымала імя З.З. Гало ў 1964 г.

**Літаратура:**

Гало Захар Захаравіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 150.

Захар Гало // Минский курьер. – 2005. – 7 мая. - С. 11.

Чернушевич А. Улица имени... // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 7.

(імёны)

## Гамарнік Ян Барысавіч
## (1894 — 1937)

**Гамарнік Ян Барысавіч** нарадзіўся ў 1894 у г. Жытомір, Украіна.

Савецкі партыйны і ваенны дзеяч, армейскі камісар 1-га рангу (1935). З 1915 вучыўся ў Кіеўскім універсітэце.

У рэвалюцыйную дзейнасць уключыўся ў 1913, з 1916 член РСДРП. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 член, сакратар Кіеўскага камітэта РСДРП(б), член рэўкома. У1918—1920 член Усеўкраінскага падпольнага цэнтра; адзін з кіраўнікоў камуністычнага падполля на Украіне, член РВС Паўднёвай групы12-й арміі, камісар дывізіі, старшыня Адэскага, Кіеўскага губкомаў КП(б)У, Кіеўскага губвыканкома. З 1923 старшыня Дальрэўкома, крайвыканкома, сакратар Далькрайкома ВКП(б). З лістапада 1928 1-ы сакратар ЦК і член Бюро ЦК КП(б)Б, член РВС Беларускай ваеннай акругі. З кастрычніка 1929 начальнік Палітупраўлення Чырвонай Арміі, член РВС СССР, адказны рэдактар газеты «Красная звезда». З 1930 намеснік наркома абароны і намеснік старшыні РВС СССР. Член ЦК ВКП(б) у 1927—1937. Член ЦВК СССР і ЦВК БССР у 1929. У час рэпрэсій абвінавачаны як «вораг народа», скончыў самагубствам. Рэабілітаваны ў 1955.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1968).

**Літаратура:**

Гамарнік Ян Барысавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 5. - Мінск, 1997.- С. 10.

Гамарник Ян Борисович // Их именами названы…: энциклопедический справочник.- Минск,1987. - С. 135.

Гамарник Ян Борисович // Минск: энциклопедический справочник –Минск, 1983.- С.133.

Иоффе, Э. Кто руководил Беларусью // Обозреватель. - 2007. - 4 мая. - С. 45.

Марціновіч, Д. Ян Гамарнік: штрыхі да палітычнага партрэта // Маладосць. - 2007. - № 7. - С. 130-137.

(імёны)

## Гікала Мікалай Фёдаравіч
## (1897-1938)

**Гікала Мікалай Фёдаравіч** нарадзіўся ў г. Адэса, Украіна .

Савецкі ваенны і партыйны дзеяч. Скончыў Тыфліскую ваенна-фельчарскую школу (1915). З 1917 член РСДРП(б). У 1918 у г. Грозны: старшыня Савета, камандуючы часцямі Чырвонай Арміі. У 1919—1920 член Каўказскага краявога камітэта РКП(б), ваенны камісар

Церскай вобласці і Дагестана. З 1921 на партыйнай рабоце на Каўказе і ў Сярэдняй Азіі. З 1929 сакратар ЦК КП(б) Узбекістана, Азербайджана. З 1931 сакратар Маскоўскага абкома і гаркома ВКП(б). Са студзеня 1932 да студзеня 1937 1-ы сакратар ЦК КП(б)Б, з лютага 1937 1-ы сакратар Харкаўскага гаркома КП(б)У. Член Бюро ЦК КП(б)Б, член Прэзідыума ЦВК БССР, Рэўваенсавета БВА (1932—1937). Член Цэнтральнай Рэвізійнай камісіі ВКП(б) у 1930—1934. Кандыдат у члены ЦК ВКП(б) з 1934. Член ЦВК СССР. Удзельнічаў у разгортванні масавых рэпрэсій у БССР, сам стаў ахвярай гэтай палітыкі. Рэабілітаваны пасмяротна.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1967), на доме № 1 мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Гікала Мікалай Фёдаравіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т.- Т. 5.-Мінск, 1997.-С. 242.

Гикало Николай Фёдорович // Их именами названы…: энциклопедический справочник.- Минск,1987.- С. 141.

Гикало Николай Фёдорович // Минск: энциклопедический справочник –Минск, 1983.-С.135.

(імёны)

## Дарашэвіч Міхаіл Васільевіч
## (1900-1968)

**Дарашэвіч Міхаіл Васільевіч** нарадзіўся у г. Орша Віцебскай вобл.

Беларускі дзяржаўны дзеяч, вучоны-геадэзіст. Прафесар (1961). Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі (1954). Скончыў Беларускую сельска-гаспадарчую акадэмію (1927).

З 1933 у БПІ; з 1947 рэктар. З 1959 міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

Навуковыя працы па розных відах геадэзічных здымак, камеральнай апрацоўцы палявых матэрыялаў, выяўленні і вывучэнні тарфяных радовішчаў.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1968), на доме № 2 мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Дарашэвіч Міхаіл Васільевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.6. - Мінск, 1998. - С. 52

Дорошевич Михаил Васильевич // Республика Беларусь: энциклопедия : [в 6 т.]. Т. 3.- Минск, 2006 .- С. 426.

Дорошевич Михаил Васильевич // Их именами названы…: энциклопедический справочник.- Минск,1987.- С. 196-197.

Дорошевич Михаил Васильевич // Минск: энциклопедический справочник – Минск,1983.-С.163.

(імёны)

## Дастаеўскі Фёдар Міхайлавіч
## (1821 — 1881)

**Дастаеўскі Фёдар Міхайлавіч** нарадзіўся 11.11.1821 у Маскве.

Рускі пісьменнік. Род Дастаеўскіх беларускага паходжання; у 1506 яго продкі атрымалі грамату на в. Дастоева (Іванаўскі р-н Брэсцкай вобл.). Скончыў Пецярбургскае ваенна-інжынернае вучылішча (1843). Дэбютаваў перакладам рамана А.Бальзака «Яўгенія Грандэ» (1844). Першы раман «Бедныя людзі» (1846) паставіў Дастаеўскага ў шэраг вядомых прадстаўнікоў натуральнай школы, У 2-й палове 1840-х г. захапляўся ідэямі сацыялістаў-утапістаў. За ўдзел у гуртку М.Петрашэўскага прыгавораны (1849) да пакарання смерцю, замененага катаргай (адбываў у Омску, 1850—1854), потым праходзіў салдатчыну. На катарзе перажыў духоўны крызіс: страціў веру ў мажлівасць перабудовы грамадства рэвалюцыйным шляхам. У той жа час абвастрыліся яго ўспрыманне чалавечых пакут і трывога за лёс чалавецтва. З 1859 жыў у Пецярбургу. Напісаў і выдаў творы «Дзядзечкаў сон», «Сяло Сцяпанчыкава і яго жыхары» (абодва 1859), «Прыніжаныя і зняважаныя» (1861). У «Запісках з Мёртвага дома» (1861—1862) паказаў жахі катаргі. З братам Міхаілам выдаў часопіс «Время» (1861—1863) і «Эпоха» (1864-1865), у якіх прапагандаваў ідэі т.зв.

почвеніцтва. У 1863 напісаў аповесць «Запіскі з падполля», якія сталі вяхой на шляху распрацоўкі ім філасофскага рамана.

Раманы «Злачынства і кара», «Гулец» (абодва 1866), «Ідыёт» (1868), «Падлетак» (1875), «Браты Карамазавы» (1879—1880) адлюстравалі глыбокія супярэчнасці расійскай рэчаіснасці і грамадскай думкі ў эпоху вялікіх сацыяльных зрухаў у Расіі і Заходней Еўропе. У іх Дастаеўскі выказаў бязмернасць пакут абяздоленага чалавека. Свет чалавечых пакут — аснова ўсёй рэалістычнай творчасці пісьменніка. Пафас яго твораў — барацьба супраць арэчаўлення чалавека, нівеліроўкі і абясцэнь вання асобы ва ўмовах капіталізму. Самыя вострыя праблемы часу Дастаеўскі пераносіў у раманы, як у «лабараторныя» ўмовы, каб паказаць іх магчымы кірунак і вынік у маштабах усяго чалавецтва. Герой Дастаеўскага — чалавек ідэі, непаўторнага светаўспрымання. Свядомасць галоўных герояў Дастаеўскага — арэна барацьбы пунктаў погляду. Звычайна героі яго твораў паказваюцца ў момaнты крызісу, пералому, калі ідэя авалодвае глыбінямі іх натуры, пераходзіць у моцнае пачуццё. У паказе здзеку з чалавечай годнасці, у перадачы самых тонкіх перажыванняў Дастаеўскі дасягае незвычайных мастацкіх вышынь. У рамане «Злачынства і кара» ён выкрыў буржуазны індывідуалізм, паказаў заганнасць, антычалавечнасць тэорыі «права моцнага», «права на праліццё крыві». У ім гранічная напружанасць думкі і філасофска-псіхалагічнага дыялога. Дыялог у творах Дастаеўскага разгортваецца як споведзь герояў. У рамане «Ідыёт» высакародны чалавек сутыкаецца з бесчалавечным грамадствам, раскрываецца яго трагічнае бяссілле перад амаралізмам і прагаю грошай. Вельмі моцна гучыць заўсёднае імкненне пісьменніка зберагчы веру ў чалавека, знайсці і ўвасобіць свой ідэал. Адначасова пісьменнік ідэалізаваў пакорлі-васць і ўзвышаныя пакуты чалавека, праводзіў ідэю маральнага самаўдасканалення на рэлігійнай аснове. Самы супярэчлівы твор Дастаеўскага раман «Д'яблы» (1871— 1872). Гэта ў нейкай ступені памфлет на рускую рэвалюцыйную дэмакратыю, якую ён беспадстаўна атаясамліваў з буржуазным індывідуалізмам. Разам з тым у творы ёсць і больш значны, глыбокі ідэйна-мастацкі змест, які робіць яго сугучным нашым сённяшнім адносінам да разбуральнага, цалкам амаральнага экстрэмізму. Раман «Падлетак» — пра драпежніцтва і маральны распад буржуазіі. Вяршыняй фі-ласофскіх, сацыяльных і псіхалагічных пошукаў пісьменніка з'яўляецца яго апошні раман «Браты Карамазавы». У ім адбіўся жах аўтара перад звярыным у чалавеку, перад яго разбэшчанасцю і эгаізмам, абвастрылася пакутлівае хістанне пісьменніка паміж ідэалізацыяй пакорлівасці і бунтам супраць яе. Дастаеўскі стварыў новы тып рамана, блізкага да трагічнага тэатра. Ён выявіў важныя тэндэнцыі грамадскага раз-віцця, паставіў праблемы сусветнай значнасці. Многія яго творы экранізуюцца і інсцэніруюцца.

Творы Дастаеўскага зрабілі велізарны ўплыў на рускую, беларускую і сусветную літаратуру. М.Гарэцкі (драма «Антон» і інш.), шукаючы адказы на шмат якія праблемы нацыянальнага характару, апіраўся і на мастацка-псіхалагічныя адкрыцці аўтара «Братоў Карамазавых». Беларускі раман, які рабіўся ўсё больш псіхалагічным і аналітычным (творчасць К.Чорнага), вельмі плённа выкарыстоўваў вопыт Дастаеўскага. Прыкметныя сляды вучобы ў Дастаеўскага ў творах М.Зарэцкага («Сцежкі-дарожкі» і інш.). У беларускім перакладзе выйшлі раман Дастаеўскага «Бедныя людзі» (1930, пер. Я.Плашчынскі), аповесці «Белыя ночы» і апавяданне «Палзункоў» (1971, пер. Л.Салавей). Першыя пастаноўкі твораў Дастаеўскага на Беларусі адбыліся ў пачатку 20 ст. Аматарскімі і прафесійнымі калектывамі ставіліся спектаклі паводле раманаў Дастаеўскага «Ідыёт» (Мінскае таварыства аматараў прыгожых мастацтваў, 1903; Таварыства рускай драмы, 1921; Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут, 1970), «Прыніжаныя і зняважаныя» (тэатр імя Я.Коласа, 1957, 1973), «Злачынства і кара» (Мінскае таварыства аматараў прыгожых мастацтваў, 1903; тэатр імя Я.Коласа, 1962), «Дзядзечкаў сон» (тэатр імя Я.Купалы, 1978). У в. Дастоева працуе літаратурна-краязнаўчы музей Дастаеўскага.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1919) і завулак.

**Літаратура:**

Дастаеўскі Фёдар Міхайлавіч// Беларуская энцыклапедыя : у 18 т.- Т. 6.-Мінск, 1998.- С. 60-61.

Достоевский Фёдор Михайлович // Их именами названы…: энциклопедический справочник.- Минск,1987.- С. 197.

Достоевский Фёдор Михайлович // Минск: энциклопедический справочник – Минск,1983.-С.163.
Исаева, Л. Достоевского исток// Союзное государство.- 2008.- № 5.- С. 114-115.
Мильдон, В. От Раскольникова к Смердякову. Два закона философской антропологии Ф. Достоевского // Октябрь. - 2007. - № 9. - С.161-166.
Померанц, Г. Божий след в творчестве Достоевского // Октябрь. - 2007. - № 9. - С. 153-160.
Кантор, В. Бесы versus Мадонна // Октябрь. - 2007. - № 9. - С. 138-145.
(Новик), И.В. Христианские персонализм и дионисизм Ф.М.Достоевского // Октябрь. - 2007. - № 9. - С. 146-152.
Фатхутдинова, И.А. "Человек есть тайна..." // Литература в школе. - 2007. - № 6. - С.42-44.

(імёны)

## Казлоў Васіль Іванавіч
## (1903-1967)

**Казлоў Васіль Іванавіч** нарадзіўся 18.02.1903 у в. Заграддзе Жлобінскага р-на Гомельскай вобл.

У 1928-1940 на савецкай і партыйнай рабоце. З сак. 1941 сакратар Мінскага абкома КП(б)Б, з 1942 камандзір Мінскага партызанскага злучэння. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў падполля і партызанскага руху на Беларусі. Герой Савецкага Саюза (1942). Генерал-маёр (1943). У 1944 –1948 1-ы сакратар Мінскіх абкома і гаркома КП(б)Б. З 1948 – 1967 на кіруючых пасадах у Вярхоўным Савеце БССР, Прэзідыўме Вярхоўнага Савета БССР і СССР. Аўтар некалькіх кніг успамінаў.

**Вуліца** ў Партызанскім і Савецкім раёнах, і Мінскі электратэхнічны завод атрымалі імя В. Казлова ў 1967. На доме, дзе ён жыў, і на вул.Казлова ўстаноўлены мемарыяльныя дошкі.

**Літаратура:**

Казлоў Васіль Іванавіч // Беларуская энцыклапедыя : У 18 т. - Т.7. - Мн., 1998. - С. 430.
Казлоў Васіль Іванавіч // Беларусь у Вяликай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 234.
Казлоў Васіль Іванавіч // Беларусь: Энцыкл. давед. - Мн., 1995. - С. 354.
Козлов Василий Иванович // Их именами названы…: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 286.
Козлов Василий Иванович // Герои Советского Союза: Краткий биограф. слов.: В 2 т. – Т. 1. - М., 1987. - С. 685.
Клочкова В.А. Василий Иванович Козлов // Клочкова В.А. Мы из XX века. - Мн., 2002. - С. 61-70.
Козлов Василий Иванович // Тимохович И.В. Битва за Белоруссию. 1941-1944. - Мн., 1994. - С. 75, 98, 100, 141, 240.
Козлов Василий Иванович //Навечно в сердце народном. - Мн., 1984. - С. 241.
Козлов Василий Иванович // Жучкевич В.А. Улицы помнят. - Мн., 1979. - С. 58.
Казлова, В. Вузельчыкі лёсу // Полымя. – 2005. - № 5. – С.176 – 188.
Лагоўская Т. Ён цешыўся кветкамі // ЛіМ. – 2005. - 18 сак. - С. 4.
Чернушевич А. Козлов Василий Иванович // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 14.
Адамушко В. Человек своего времени // Рэспубліка. – 2003. - 18 лют. - С. 5.

(імёны)

## Кальцоў Аляксей Васілевіч
## (1809-1842)

**Кальцоў Аляксей Васілевіч** нарадзіўся ў 1809 г. у Варонежы, Расія.

Паэт дэбютаваў ананімна ў 1830. Адзіны прыжыццёвы зборнік паэзіі «Вершы» (1835). На лёс Кальцова як паэта і на фарміраванне яго ідэйна-мастацкіх поглядаў паўплывала знаёмства з А.С. Пушкіным і В. Бялінскім. У вершах 1825—1830, напісаных у духу сентыментальнай і рамантычнай паэзіі, паявіліся і рэалістычныя рысы («Падарожны», «Начлег чумакоў»). Пісаў пасланні, элегіі, рамансы, мадрыгалы, трыялеты. Вяршыня творчасці Кальцова — песні, створаныя ў традыцыях рускага фальклору. Многія сталі народнымі песнямі. Апяваў працу земляроба, красу роднай прыроды («Песня аратага»,«Ураджай», «Касец»), распавядаў пра цяжкі лёс беднаты («Горкая доля», «Гора», «Доля бедняка»), пра імкненне народных мас да лепшай долі, выказваў пратэст супраць прыгонніцтва («Дума сокала», «Лес»). Паэзія Кальцова вызначаецца рэалізмам і народнасцю, глыбокім лірызмам і шчырасцю, выразнасцю мовы, рытміка-інтанацыйным багаццем. Паасобныя вершы Кальцова на беларускую мову пераклалі Л. Дайнека, Я. Міклашэўскі, М. Мятліцкі.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1959), 4 завулка и праезд.

**Літаратура:**

Кальцоў Аляксей Васілевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.7. - Мінск, 1998. - С. 493.

Кольцов Алексей Васильевич // Минск: энциклопедический справочник –Минск, 1983.-С.197.

Скатов, Николай Николаевич. Кольцов / Николай Скатов. - М. : Мол.гвардия, 1989. - 300с,[16]л.фот. - ( Жизнь замечательных людей ; Вып.1).

(імёны)

## Корш-Саблін Уладзімір Уладзіміравіч (1900 —1974)

**Корш-Саблін (сапр. Саблін ) Уладзімір Уладзіміравіч** нарадзіўся ў 29.03.1900 у г. Масква.

Беларускі кінарэжысёр; адзін з пачынальнікаў беларускай мастацкай кінематаграфіі. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1935). Народны артыст Беларусі (1955). Народны артыст СССР (1969). З 1923 працаваў у тэатрах Расіі, здымаўся ў кіно, быў асістэнтам рэжысёра Ю. Тарыча. З 1926 у беларускім кінематографе. У 1945—1960 і 1969—1974 мастацкі кіраўнік кінастудыі «Беларусьфільм», у 1957—1974 першы сакратар Саюза кінематаграфістаў Беларусі. Як рэжысёр дэбютаваў фільмам «У агні народжаная» (1929). Пастаноўшчык першага гукавога фільма ў беларускім іграваым кіно «Першы ўзвод» («Заходні фронт», 1933), прысвечанага падзеям 1-й сусветнай вайны. Фільм «Залатыя агні» (1935) пра будаўнікоў першай на Беларусі электрастанцыі вызначаўся падзелам герояў на свядомых і несвядомых, увядзеннем у сюжэт характэрнай для тагачаснай драматургіі лініі шкодніцтва. У кінааповесці «Дачка Радзімы» (1937), лірычных камедыях «Шукальнікі шчасця» (1936) і «Маё каханне» (1940) ідэалізацыя савецкай рэчаіснасці. У гады Вялікай Айчынай вайны паставіў «Беларускія навелы» (з Тарычам, 1942), кінаканцэрт «Жыві, родная Беларусь!» (з М.Садковічам, 1944). Да сучаснасці звяртаўся ў фільмах «Новы дом» (1947), «Пяюць жаваранкі» (з К.Саннікавым, 1953) і «Хто смяецца апошнім» (1955) па п'есах К.Крапівы, «Пасеялі дзяўчаты лён» (1956), але глыбокага асэнсавання закранутых праблем не дасягнуў. Асноўны кірунак кінатворчасці Корш-Сабліна — паказ гераікі барацьбы за ідэалы рэвалюцыі: «Вогненныя гады» (1939), «Канстанцін Заслонаў» (з А.Файнцымерам, 1949; Дзяржаўная прэмія СССР 1950), «Чырвонае лісце» (1958), «Масква—Генуя» (з А.Спешневым, П.Армандам, 1964; Дзяржаўная прэмія Беларусі 1968), «Запомнім гэты дзень» (1967), «Крушэнне імперыі» (1970). Паставіў дылогію «Першыя выпраба-ванні» (1960—1961) паводле трылогіі Я.Коласа «На ростанях», многія калізіі, сюжэтныя лініі якой увасоблены з уласцівай рэжысёру кінематаграфічнай выразнасцю. Для творчасці Корш-Сабліна характэрны яснасць грамадзянскай пазіцыі, рэвалюцыйны пафас, выразнасць вобразаў галоўных герояў.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1975), дзе на доме № 1, так сама на доме, дзе ён жыў (пр. Незалежнасці, 19), на будынку кінастудыі (пр. Незалежнасці, 98) мемарыяльныя дошкі.

**Літаратура:**

Корш-Саблін (сапр. Саблін ) Уладзімір Уладзіміравіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.8. - Мінск, 1999. - С. 425.

Корш-Саблин Владимир Владимирович // Минск: энциклопедический справочник – Минск, 1983. - С.204-205.

Бондарева, Ефросинья Леонидовна. Кинолента длинною в жизнь : очерк творческой биографии народного артиста СССР кинорежиссера В.В. Корш-Саблина / Е.Л. Бондарева. – Минск : Издательство БГУ, 1980.- 207с.

Цвяткоў, Ю. А я памятаю зусім іншае... / Юрый Цвяткоў // Культура. - 2010. - 10-16 крас. - С. 13.

(імёны)

## Крамской Іван Мікалаевіч

## (1837 – 1887)

**Крамской Іван Мікалаевіч** нарадзіўся 8.06.1837 у г. Астрагожск Варонежскай вобл., Расія.

Расійскі жывапісец і ідэйны кіраўнік дэмакратычнага руху ў рускім мастацтве 1860—1880-х г. Вучыўся ў Пецярбургскай Акадэміі мастацтва (1857—1863). Выкладаў у Рысавальнай школе Таварыства заахвочвання мастакоў (1863—1868). Ініцыятар «бунту чатырнаццаці», завершанага выхадам з Акадэміі мастацтва яе выпускнікоў, якія стварылі Арцель мастакоў. Адзін са стваральнікаў і ідэолагаў Таварыства перасоўных мастацкіх выставак. Лідэр рэалістычнага кірунку ў рускім жывапісе 2-й паловы 19 ст. Працаваў пераважна ў жанры партрэта. Стварыў галерэю вобразаў прадстаўнікоў дэмакратычнай інтэлігенцыі Расіі: Л.Талстой, І.Шышкін (абодва 1873), П.Траццякоў (1876), М.Някрасаў (1877), М.Салтыкоў-Шчадрын (1879), С.П.Боткін (1880) і інш., шэраг твораў на мяжы партрэта і тэматычнай карціны: «Някрасаў у перыяд «Апошніх песень» (1877—1878), «Невядомая» (1883), «Несуцешнае гора» (1884). Пранікнёнае назіранне народнага тыпажу, пераасэнсаванне рэлігійнай тэматыкі ў маральна-філасофскім плане, ідэю гераічнага самаахвяравання ўвасобіў у творах «Палясоўшчык» (1874), «Міна Майсееў» (1882), «Селянін з аброццю» (1883), «Хрыстос у пустыні» (1872).У Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі знаходзяцца яго творы «Жаночы партрэт» (1870-я г.), «Дзеці ў лесе» (1887).

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1962).

**Літаратура:**

Крамской Іван Мікалаевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.8. - Мінск, 1999. - С. 447.

Крамской Иван Николаевич // Минск: энциклопедический справочник –Минск, 1983.- С.205.

(імёны)

## Крапоткін Пётр Аляксеевіч

## (1842 – 1921)

**Крапоткін Пётр Аляксеевіч** нарадзіўся 9.12.1842 у г. Масква.

Рускі вучоны-энцыклапедыст, дзеяч расійскага і міжнароднага рэвалюцыйнага руху, тэарэтык анархізму.

Скончыў Пажскі корпус (1862). У 1864—1866 падарожнічаў па раёнах Паўночнай Маньчжурыі, паўночным схіле Усходняга Саяна, даследаваў Патамскае нагор'е і Віцімскае пласкагор'е. З 1867 сакратар аддзялення фізічнай геаграфіі Рускага геаграфічнага таварыства ў Пецярбургу. Удзельнік анархісцкага (бакунінскага) крыла І Інтэрнацыянала (1872), народніцкага гуртка чайкоўцаў. У 1874 арыштаваны і зняволены ў Петрапаўлаўскую крэпасць. З 1876 у эміграцыі ў Швейцарыі, Францыі і Англіі. З 1879 рэдактар штотыднёвіка анархістаў «Le Revolte» («Бунтар»). У чэрвені 1917 вярнуўся ў Расію, у жніўні на Дзяржаўнай нарадзе ў Маскве выступіў з заклікам да «сацыяльнага міру» і прапанаваў ператварыць Расію на ўзор ЗША у федэратыўную рэспубліку.

У 1917—1918 старшыня створанай у Маскве Лігі федэралістаў. Асноўныя палажэнні сацыялагічнага вучэння Крапоткіна, якое ён называў анархічным камунізмам, выкладзены ў

творах «Прамова бунтаўшчыка» (1885), «Хлеб і воля» (1892), «Анархія, яе філасофія, яе ідэал» (1896), «Вялікая французская рэвалюцыя, 1789—1793» (1909), «Сучасная навука і анархія» (1913) і інш. Крытэрыем сац. прагрэсу Крапоткін лічыў вызва-ленне чалавека з-пад прыгнёту дзяржавы і яго поўную, нічым не абмежаваную свабоду, выступаў за стварэнне федэрацыі свабодных вытв. абшчын (камун) адразу пасля перамогі сац. рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, «калі кіруючыя класы сваёй сляпой упартасцю зробяць яе непазбежнай». У адрозненне ад П.Ж.Прудона, М.Бакуніна, М.Штырнера і інш. ідэолагаў анархізму ён бачыў у сац. рэвалюцыі не стыхійны бунт, а ўсвядомленае народнае дзеянне, накіраванае на ўсталяванне ў грамадстве гарманічных адносін салідарнасці, справядлівасці, самаахвярнасці і ўзаемадапамогі паміж людзьмі. Дзяржаўны федэралізм лічыў пераходнай формай да бездзяржаўнага ладу (таксама як і розныя формы мясцовай аўтаноміі, рэгіянальнага самакіравання) і сродкам тэр.і функцыянальнай дэцэнтралізацыі ўлады, больш поўнага ўліку нацыянальных асаблівасцей і разнастайнасці быту.

Для філасофскіх поглядаў Крапоткіна характэрны натуралізм, крытычныя адносіны да дыялектычнага метаду Г.Гегеля і К.Маркса, які ён прапанаваў замяніць «адзіна навуковым індуктыўным метадам». Анархічная дактрына Крапоткіна непасрэдна звязана з яго прырода-знаўчанавуковымі ўяўленнямі. У галіне біялогіі ён выказаў ідэі аб узаемадапамозе і падтрымцы як фактары эвалюцыі, аб адсутнасці ўнутрывідавой барацьбы. Распрацаваў схему араграфіі Паўночна-Усходняй Азіі, выявіў сляды старажытнага абледзянення і вулканізму на Усходнім Саяне. У працы «Даследаванні пра ледніковы перыяд» (1876) прывёў доказы шырокага распаўсюджвання ў антрапагенны час мацерыковага абледзянення на тэр. Еўропы, Азіі і Паўночнай Амерыкі, выказаў думку аб геалагічнай роднасці Канады і Сібіры. Удзельнічаў у падрыхтоўцы выдання «Зямля і людзі. Усеагульная геаграфія» Э.Рэклю.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1922), 2 завулка.

**Літаратура:**

Крапоткін Пётр Аляксеевіч// Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.8. - Мінск, 1999. - С. 453.

Кропоткин Пётр Алексеевич // Их именами названы…: энциклопедический справочник. - Минск,1987.-С. 323.

Кропоткин Пётр Алексеевич // Минск: энциклопедический справочник.– Минск, 1983.-С. 208.

(імёны)

## Крыловіч Уладзімір Мікалаевіч
## (1895-1937)

**Крыловіч Уладзімір Мікалаевіч** нарадзіўся 1.11.1895 у в. Крыловічы Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці.

Беларускі акцёр; адзін з заснавальнікаў беларускага тэатра. Заслужаны артыст Беларусі (1931). Скончыў Мінскае гарадское вучылішча (1914). З 1915 выступаў на аматарскай сцэне. З 1921 БДТ-1 (цяпер Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я.Купалы). Акцёр шырокага творчага дыяпазону: выконваў ролі сацыяльных і рамантычных герояў, характарныя і камедыйныя. Валодаў яркімі сцэнічнымі данымі, высокай культурай мовы, дасканаласцю грыму, мімікі і жэстаў, майстэрствам поўнага пераўвасаблення, узбуйненай тыпізацыі характараў, імправізацыі пры тонкім адчуванні акцёрскага ансамбля. Яго раняй творчасці ўласцівая яскравая рамантычная афарбоўка (Машэка, Кастусь Каліноўскі ў аднайм. п'есах Е.Міровіча). Па-майстэрску непераўзыдзена стварэў вобразы нацыянальнай драматургіі: Сцяпан Крыніцкі («Паўлінка» Я.Купалы), Кручкоў («Пінская шляхта» В.Дуніна-Марцінке-віча), Ваявода, Грaковіч і Вагін («Каваль-ваявода», «Перамога» і «Запяюць верацёны» Міровіча), Жрэц, Чужакоў («Вір» і «Мост» Я.Рамановіча), Шчураў («Міжбур'е» Дз.Курдзіна), Карнейчьгк («Канец дружбы» К.Крапівы) і інш. Сярод іншых роляў: Мароз («Гута» Р.Кобеца), Шагабутдзінаў («Мяцеж» паводле Дз.Фурманава), Вяршынін («Браняпоезд 14—69» У.Іванова), Малько («Далёкае» А.Афінагенава), Бераст («Платон Крэчат» А.Карнейчука), Чадаў («Жыццё кліча» У.Біль-Белацаркоўскага). У характарных і камедыйных ролях вынаходзіў трапныя дэталі, непаўторныя нюансы: Тарквіній («Жрэц

Тарквіній» С.Паліванава), Муфці («Мешчанін у дваранах» Мальера), Крэспа («Вясковы суддзя» П.Кальдэрона) і інш. Здымаўся ў кіно: «Двойчы народжаны», «Дняпро ў агні». На магіле Крыловіча на Вайсковых могілках у Мінску ўстаноўлены яго бюст.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1968), 2 завулка.

**Літаратура:**

Крыловіч Уладзімір Мікалаевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.8. - Мінск, 1999. - С. 508.

Крылович Владимир Николаевич // Их именами названы…: энциклопедический справочник. - Минск,1987. - С. 327-328.

Крылович Владимир Николаевич // Минск: энциклопедический справочник –Минск, 1983. - С.208.

(імёны)

## Куйбышаў Валяр'ян Уладзіміравіч

## (1888 – 1935)

**Куйбышаў Валяр'ян Уладзіміравіч** нарадзіўся ў 1888 у г. Омск, Расія.

Савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч. З 1904 ў рэвалюцыйным руху бальшавікоў. За ўдзел у рэвалюцыі 1905—1907 выключаны з Ваенна–медыцынскай акадэміі ў Пецярбургу (1906). Неаднаразова быў арыштаваны і ў ссылцы. Адзін з кіраўнікоў Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 у г. Самара, удзельнік грамадзянскай вайны (пераважна як палітычны камісар). З 1921 член Прэзідыума, з 1926 старшыня Вышэйшага савета народнай гаспадаркі, кіраваў ажыццяўленнем плана ГОЭЛРО. Член ЦК (з 1922) і Палітбюро (з 1927) ЦК ВКП(б), Прэзідыума ЦКК (1923-1926). У 1930—1934 старшыня Дзяржаўнай планавай камісіі. Паводле афіцыйнай версіі атручаны; у яго смерці абвінавачваліся падсудныя на т.зв. працэсе 21-го (працэс праватрацкісцкага блока). У 1935-1991 яго імем назван г. Самара.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1935).

**Літаратура:**

Куйбышаў Валяр'ян Уладзіміравіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.8. - Мінск, 1999. - С. 566.

Куйбышаў Валяр'ян Уладзіміравіч // Их именами названы…: энциклопедический справочник.- Минск, 1987.- С. 332.

Куйбышев Валериан Владимирович // Минск: энциклопедический справочник – Минск, 1983.-С.208.

(імёны)

## Кульман Хелена Андрэеўна

## (1920-1943)

**Кульман Хелена Андрэеўна** нарадзілася 31.01.1905 ў г. Тарту, Эстонія.

З 1940 вучылася ў Талінскім педвучылішчы У пачатку Вялікай Айчыннай вайны прымала ўдзел у абароне Таліна. З 9.01.1942 баец 7-й эстонскай стралковай дывізіі. З крас. 1942 у разведцы штаба Балтыйскага флота. У верас. 1942 закінута ў тыл ворага ў раён Тарту на тэрыторыі Эстоніі. Перадавала у Ленінград звесткі аб дыслакацыі варожых часцей у раёне Чудскага возера і Пярну. У канцы 1942 схоплена гітлераўцамі. 03.01.1943 пасля жорсткіх катаванняў пакарана смерцю ў Тарту. Герой Савецкага Саюза (1965).

**Вуліца** ў Савецкім раёне атрымала імя Х.А. Кульман у 1976 г., на доме № 2 знаходзіцца мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Кульман Хелена Андреевна // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 209.

Кульман Леэн (Хелена) Андреевна // Их именами названы…: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 336.

Денисова, С. Подвиг разведчицы / Светлана Денисова // Женский Журнал. - 2010. - № 5. - С. 19.

Леэн Кульман // Минский курьер. – 2005. - 7 мая.- С. 9.

Чернушевич А. Улица имени... // Минский курьер. – 2004. - 2 июля.- С. 14.

(імёны)

# Ламаносаў Міхаіл Васілевіч
# (1711 – 1765)

**Ламаносаў Міхаіл Васілевіч** нарадзіўся 19.11.1711 у в. Дзянісаўка, цяпер с. Ламаносава Халмагорскага раёна Архангельскай вобл., Расія.

Рускі вучоны-прыродазнавец, паэт, мастак, гісторык, асветнік. Акадэмік Пецярбургскай АН (1745), член расійскай Акадэміі мастацтваў (1763). Ганаровы член Шведскай (1760) і Балонскай (1764). Вучыўся ў Славяна-грэка-лацінскай акадэміі ў Маскве (1731—1735), у акадэмічным ун-це ў Пецярбургу (1735), у Германіі (1736—1741). З 1742 у Пецярбургскай АН, прафесар хіміі (з 1745). З 1748 працаваў у першай у Расіі хімічнай лабараторыі пры АН (створана па яго ініцыятыве), адначасова (з 1756) на заснаванай ім шкляной фабрыцы. Навуковыя даследаванні па хіміі, фізіцы, астраноміі, геаграфіі, геалогіі, металургіі. Распрацаваў асновы карпускулярнага (атамна-малекулярнага) вучэння; малекулярна-кінетычную тэорыю цяпла і газаў, тэорыю колераў. Эксперыментальна даказаў закон захавання масы рэчыва ў хімічных рэакцыях (1756), сфармуляваў прынцып захавання матэрыі і руху. Адзін з заснавальнікаў фізічнай хіміі. Абгрунтаваў неабходнасць выкарыстання фізічнага метаду ў хіміі, даў фізічнай хіміі азначэнне, блізкае да сучаснага, напісаў “Увядзенне ў сапраўдную фізічную хімію» (1752). Прапанаваў канструкцыю шэрагу (каля 100) розных прылад, у т.л. аптычных. Адкрыў існаванне атмасферы на Венеры (1761). У працы «Першыя асновы металургіі або рудных спраў» (1763) апісаў уласцівасці металаў і практычныя метады іх атрымання. Выклаў асновы тэорыі геалагічнага развіцця Зямлі і зямной кары. Растлумачыў паходжанне многіх карысных выкапняў і мінералаў. Быў кіраўніком Геаграфічнага дэпартамента. З яго ўдзелам складаўся геаграфічны «Атлас Расійскі». Даследаваў марскія льды і даў іх першую класіфікацыю. Выказаў ідэю аб важнасці для Расіі даследавання Паўночнага марскога шляху і асваення Сібіры. У 1755 па ініцыятыве Ламаносава створаны Маскоўскі універсітэт.

Ламаносаў — адзін з пачынальнікаў новай рускай літаратуры, рэфарматар рускага вершаскладання. У «Лісце аб правілах расійскага вершаскладання» (1739, апубл. 1778) абгрунтаваў сілаба-танічную сістэму вершаскладання. Стваральнік новых літаратурных жанраў, у т. л. рускай оды філасофскага і высокага грамадзянскага гучання («На ўзяцце Хаціна», 1751, і інш.). Аўтар паэмы «Пётр Вялікі» (незавершаная, часткова апубл. 1760—1761), трагедый у вершах «Таміра і Селім» (1750), «Дземафонт» (1752) і інш., вершаў на выпадак (надпісы, эпіграмы і г.д.). Яго сатыра «Гімн барадзе» распаўсюджвалася ў спісах (апубл. 1859). Асноўныя рысы паэзіі Ламаносава — грамадзянскасць, патрыятызм, пачуццё ўласнай годнасці паэта. Перакладаў Гамера, Вергілія, Авідзія і інш. антычных аўтараў. Напісаў фундаментальныя філалагічныя працы: «Кароткі дапаможнік красамоўства» (1748; першая руская рыторыка), «Расійская граматыка» (1757; першая руская граматыка), «Прадмова пра карысць кніг царкоўных у расійскай мове» (1758; першая спроба рускай стылістыкі). На дакументальнай аснове склаў «Старажытную расійскую гісторыю ад пачатку расійскага народа да... 1054 года» (ч. 1—2, 1754—1758, апубл. 1766), «Кароткі расійскі летапісец з радаводам» (1760), у якіх крытыкаваў нарманскую тэорыю. Вынайшаў і распрацаваў новы спосаб вырабу смальты для мазаік, заснаваў мазаічную майстэрню, у якой ствараліся партрэты, абразы, ландшафты («Вобраз Хрыста», 1753; пано «Палтаўская баталія», 1762—1764).

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1940) і **завулак**.

**Літаратура:**

Ламаносаў Міхаіл Васілевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.9. - Мінск, 1999. - С. 112-113.

Ломоносов Михаил Васильевич // Их именами названы…: энциклопедический справочник.- Минск,1987.- С. 372.

Ломоносов Михаил Васильевич // Минск: энциклопедический справочник – Минск,1983.-С. 219.

(імёны)

## Лук`яновіч Трыфан Андрэевіч
## (1919-1945)

**Лук`яновіч Трыфан Андрэевіч** нарадзіўся ў в. Рэпішча Лагойскага р-на Мінскай вобл.

З 1939 працаваў слесарам на Мінскім радыёзаводзе. На фронце з 1941 года. Удзельнік Сталінградскай бітвы, баёў на Сандамірскім плацдарме, штурму Берліна. 25.4.1945 старшы сяржант Лук'яновіч пры выратаванні нямецкай дзяўчынкі смяротна паранены. Пра гэта ў красавіку 1945 расказаў пісьменнік Б. Палявой у газеце «Правда» і ў артыкуле «Помнім імя тваё...» у газеце «Комсомольская правда» (1.4.1976). Высакародны гуманны ўчынак Лук'яновіча, які ў час вайны страціў жонку і дваіх дзяцей, маці і бацьку, пакладзены ў аснову кампазіцыі помніка-ансамбля воінам Савецкай Арміі, якія загінулі ў барацьбе з фашызмам, у Трэптаў-парку ў Берліне (скульптар Я. Вучэціч, архітэктар Я. Белапольскі). На месцы самаахвярнага подзвігу Лук'яновіча ў Берліне (на Эльзенштрасе) устаноўлены мемарыяльны знак.

У Мінску яго імя носіць **вуліца**, на будынку вытворчага аб'яднання «Белвар» (пр. Незалежнасці, дом № 58) устаноўлена мемарыяльная дошка з гарэльефамі воіна і выратаванай ім дзяўчынкі (скульптар З. Азгур, архітэктар Ю. Казакоў).

**Літаратура:**

Лук`яновіч Трыфан Андрэевіч // Беларуская энцыклапедыя : У 18 т. Т. 9.-Мінск, 1999.-С. 367-368.

Масляніцына І. Салдат з Трэптаў-парка / Ірына Масляніцына, Мікола Багадзяж // Женский журнал.-2011.-№ 2. - С. 62-63.

Терещенко, Н. Жизнь - за слезинку ребенка / Николай Терещенко // Сов. Белоруссия (Беларусь сегодня). - 2010. - 8 мая. - С.

(імёны)

## Мележ Іван Паўлавіч
## (1921-1976)

**Мележ Іван Паўлавіч** нарадзіўся 8.2.1921 ў вёске Глінішча Хойніцкага раёна Гомельскай вобл.

Беларускі пісьменнік. Народны пісьменнік Беларусі (1972). Скончыў БДУ (1945). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1942 пад Растовам цяжка паранены. У 1941—1942 вёў дзённік. З 1945 працаваў у часопісе «Полымя», у апараце ЦК КП(б)Б. З 1966 сакратар, у 1971—1976 намеснік старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Дэбютаваў вершамі ў 1939. Як празаік упершыню выступіў у 1943 у газеце «Бугурусланская правда». Першае апавяданне на беларускай мове «Сустрэча ў шпіталі» (1944). Адно з ранніх апавяданняў — «У завіруху» — высока ацаніў К.Чорны. У 1946 яно дало назву зборніку. Аповесць «Гарачы жнівень» (1946) пра цяжкасці аднаўленчага перыяду. Першы раман «Мінскі напрамак» (1952). У 1960—70-я г. гэты твор перапрацаваны і стаў больш шматпланавым і маштабным па ахопе падзей, багатым на сапраўдныя народныя характары, праз якія пераканаўча паказана гераіка і трагедыя вайны. Выдаў зборнікі апавяданняў «Блізкае і далёкае» (1954), «У гарах дажджы» (1957), «Што ён за чалавек» (1961). Аўтар п'есы пра інтэлігенцыю «Пакуль вы маладыя» (1956, паст. Беларускім тэатрам імя Я.Купалы 1957), гісторыка-рэвалюцыйнай драмы «Дні нараджэння» (1958, паст. тамсама 1959). Найвялікшым дасягненнем Мележа і ўсёй беларускай літаратуры стала трылогія з цыкла «Палеская хроніка» — раманы «Людзі на балоце» (1961, Літаратурная прэмія імя Я.Коласа 1962), «Подых навальніцы» (1964—1965, за абодва Ленінская прэмія 1972) і «Завеі, снежань» (1976). Раман «Людзі на балоце» Мележ пачаў як твор лірычны і называў яго «лірычным раманам», а наступныя раманы трылогіі ствараў ужо як трагедыйныя раманы-даследаванні. У іх выявілася грамадзянская смеласць і ідэйна-мастацкая маштабнасць у асэнсаванні складаных абставін калектывізацыі на Палессі, жыцця Беларусі 1920—30-х г., праўдзівасць і шчырасць аўтара ў спалучэнні з яго высокай прафесійнай культурай, глыбокім і тонкім псіхалагізмам, разуменнем душы беларускага селяніна.

Непаўторная мастацкая канцэпцыя тагачаснага жыцця народа, вялікі ідэйны змест данесены праз дасканалую мастацкую форму і адметныя вобразы. Лёс і драма жыцця і кахання Васіля Дзятла і Ганны індывідуальныя, глыбока народныя; і астатнія вобразы паказаны ва ўсёй іх складанасці, глыбіні і непаўторнасці, яны сцвярджаюць чалавечнасць у чалавеку. «Палеская хроніка» — глыбокае філасофска-мастацкая асэнсаванне жыцця беларускага народа на вельмі важным гістарычным этапе, яна стала нацыянальнай эпапеяй. У 1975 Мележ выдаў кнігу літаратурна-крытычных артыкулаў, эсэ, інтэрв'ю і публіцыстыкі «Жыццёвыя клопаты» (Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Я.Коласа 1976), у 1977 выйшла «Першая кніга» (дзённікі, запісы ваенных гадоў). Паводле «Палескай хронікі» Беларускае тэлебачанне паставіла 3-серыйны тэлеспектакль (1965), у 1979 — тэлеспектакль па рамане «Завеі, снежань». Беларускі тэатр імя Я.Купалы паставіў спектакль «Людзі на балоце» (1966, інсцэніроўка Т.Абакумоўскай і З.Браварскай). Паводле матываў гэтага рамана К.Цесакоў стварыў радыёоперу «Барвовы золак» (1983). Жыццю і творчасці пісьменніка прысвечаны дакументальны фільм «Іван Мележ» (сцэнарый В.Адамчыка, 1978). Рэжысёры В.Тураў і Дз.Зайцаў на студыі «Беларусьфільм» паставілі мастацкія кінафільмы «Людзі на балоце» (1982, Дзяржаўная прэмія СССР 1984) і «Подых навальніцы» (1983). У 1984 Тураў зняў 8-серыйны тэлефільм.

І.Мележ быў старшынёй праўлення Беларускага аддзялення таварыства «СССР — Францыя», старшынёй Беларускага камітэта абароны Міру, член Сусветнага Савета Міру. Яго імем названы школа ў в. Глінішча, бібліятэка ў Гомелі, цеплаход. У в. Глінішча адкрыты літаратурны музей Івана Мележа. У 1980 устаноўлена Літаратурная прэмія Саюза пісьменнікаў Беларусі імя Івана Мележа.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1977), дзе на доме № 1, таксама на доме, дзе ён жыў (вул. Я. Купалы, 7) мемарыяльныя дошкі.

**Літаратура:**


Мележ Іван Паўлавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.10. - Мінск, 2000. - С. 271-272.

Мележ Иван Павлович // Их именами названы…: энциклопедический справочник.- Минск,1987.- С. 414-415.

Мележ Иван Павлович // Минск: энциклопедический справочник –Минск,1983.-С. 232.

Іван Мележ (1921-1976): Праўда аб "Людзях на балоце" // Мяснікоў, А.Ф. Сто асоб беларускай гісторыі: гістарычныя партрэты.- Мінск, 2008. - С. 290-293.

Журавлев, В. Образ времени в романах Ивана Мележа / В. Журавлев // Нёман. - 2004. - № 12. - С. 149-161.

Тычына, М.А. Людзі на світанні // Тычына М.А. Карані і крона. - Мн., 2002.- С. 110-142.

Некалькі згадак пра Івана Мележа // Бугаёў Д. Служэнне Беларусі.- Мн., 2003.- С. 169-181.


(імёны)

## Мірашнічэнка Пётр Апанасавіч (1922 – 1944)

**Мірашнічэнка Пётр Апанасавіч** нарадзіўся 26.11.1922 у с. Запселле Краснапольскага раёна Сумскай вобл., Украіна.

Удзельнік баёў на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1944). Камандзір узвода разведкі лейтэнант Мірашнічэнка вызначыўся пры вызваленні Гомельскай вобл.: у цяжкім баі каля в. Печышчы Парыцкага раёна сваім целам закрыў амбразуру варожага дзота.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1976), на доме № 9 мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**


Мірашнічэнка Пётр Апанасавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.10. - Мінск, 2000. - С. 464.

Мирошниченко Пётр Афанасьевич // Их именами названы…: энциклопедический справочник.- Минск, 1987.- С. 423.

Мирошниченко Пётр Афанасьевич // Минск: энциклопедический справочник – Минск,1983.-С. 270.

(імёны)

## Міхайлаў Барыс Аляксандравіч
## (1923-1944)

**Міхайлаў Барыс Аляксандравіч** нарадзіўся 24.05.1923 у в. Менькова Пушкіна-Горскага р-на Пскоўскай вобл.

Скончыў 9 класаў. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1941. Званне Героя Савецкага Саюза атрымаў у 1944 за праяўлены гераізм пры фарсіраванні Дняпра. 3.07.1944 група аўтаматчыкаў на чале з гвардыі лейтынантам Б.А. Міхайлавым у баі каля Астрашыцкага Гарадка адбіла некалькі атак праціўніка, нанесла значны ўрон варожай пехоце. Б.А. Міхайлаў загінуў у гэтым баі, пахаваны на Вайсковых могілках ў Мінску. Герой Савецкага Саюза (1944).

**Вуліца** Савецкага раёна носіць яго імя, на доме №1 мемар. дошка (1976).

**Літаратура:**

Михайлов Борис Александрович // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 270.

Михайлов Борис Александрович // Герои Советского Союза: Краткий биограф. слов.: В 2 т. - Т.2. - Мн., 1988. - С. 92.

Чернушевич А. Улица имени... // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 20.

(імёны)

## Мулявін Уладзімір Георгіевіч
## (1941-2003)

**Мулявін Уладзімір Георгіевіч** нарадзіўся 12.1.1941 у г. Екацярынбург, Расія.

Беларускі артыст эстрады, кампазітар. Народны артыст Беларусі (1979). Заслужаны дзеяч культуры Польшчы (1980). Народны артыст СССР (1990). Вучыўся ў Свярдлоўскім музычным вучылішчы(1956—1958). З 1962 артыст Беларускай філармоніі, з 1969 мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага беларускага эстраднага ансамбля *«Песняры»*. У творчай дзейнасці своеасаблівае выканальніцкае майстэрства спалучаецца з глыбокім веданнем народнай песеннай творчасці, захаваннем і ўзбагачэннем яе лепшых традыцый. Аўтар шматлікіх апрацовак беларускіх народных песень, якія вызначаюць стыль і творчую накіраванасць ансамбля, арганічна спалучаюць стылістыку беларускай народнай песеннасці і сучаснай эстраднай музыкі («Касіў Ясь канюшыну», «Па ваду ішла», «А ў месяцы верасні», «Рэчанька», «Купалінка», «Перапёлачка», «А ў полі вярба», «Каліна» і інш.). Сярод твораў: опера-прытча «Песня пра долю» (1972), вакальны цыкл «Я не паэта...» (1981) і песенна-інструментальная кампазіцыя «Песня — бясцэнны дар» (1982) на словы Я.Купалы, музычны спектакль «На ўвесь голас» на словы У.Маякоўскага (1988), песенна-інструментальныя кампазіцыі «Ванька-Устанька» на словы Я.Еўтушэнкі (1975), «Праз усю вайну» на словы беларускіх і расійскіх паэтаў (1985), «Вянок Багдановічу» на вершы М.Багдановіча (1991), вакальная кампазіцыя «Крык птушкі» на словы Ю.Рыбчынскага, песні, у т.л. «Александрына», «Завушніцы», «Чырвона ружа», «Ой, ка-лядачкі»; «Балада пра чатырох заложнікаў»; музыка да драматычных спектакляў і кінафільмаў. Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі 1976. Лаўрэат Усесаюзных конкурсаў артыстаў эстрады (1970), выканаўцаў савецкай песні (1973, 1-я прэмія), міжнароднага фестывалю песні «Залаты леў» (1973, Лейпцыг), 2-га фестывалю палітычнай песні ў Хельсінкі (1978). Галоўны прыз фірмы «Мелодыя» «Залаты дыск» (1982).

У Мінску яго імя носіць **бульвар** (2003), на доме, дзе ён жыў (вул. Л. Бяды, 13) — мемарыяльная дошка. Музей Уладзіміра Мулявіна ў Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

**Літаратура:**

Мулявін Уладзімір Георгіевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т.- Т. 11.-Мінск, 2000.-С. 24.

Владимир Мулявин. Нота судьбы : [воспоминания,интервью,исследования / редактор-составітель Л. Крушинская]. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2004.- 446с.,1л.портр.

Мулявина-Пенкина, С. Неизвестное об известном - очень известном человеке : [беседа с директором музея В.Г. Мулявина, женой музыканта Светланой Мулявиной-Пенкиной] / беседовала Тамара Бунто // Алеся. - 2011. - № 1. - С. 14-21.

Климов, О. Всенародный артист / Олег Климов// Сов. Белоруссия (Беларусь сегодня). - 2011. - 12 янв. - С. 18.

Мулявіна-Пенкіна, С. У госці да Мулявіна: [гутарка з загадчыцай Музея У.Мулявіна Святланай Мулявінай-Пенкінай] /гутарыў Андрэй Старжынскі // Культура. - 2007. - 24-30 лістап. - С. 14.

Трефилов, С. "Песняры" и белорусская литература // Советская Белоруссия (Беларусь сегодня). - 2007. - 1 сентяб. - С. 8.

Луста, Т. Рускі самародак, які стаў набыткам Беларусі // Роднае слова.- 2007. - № 7.- С. 46-48.

Дарашэвіч, І. Талент як наканаванне // Беларусь. - 2006. - № 2. - С. 34-35.

(імёны)

## Нікіцін Іван Савіч
## (1824 – 1861)

**Нікіцін Іван Савіч** нарадзіўся 3.10.1824 у г. Варонеж, Расія.

Рускі паэт. Вучыўся ў духоўнай семінарыі (1839 — 1843). У 1859 адкрыў кніжны магазін, які стаў цэнтрам літаратурна-грамадскага жыцця Варонежа. Друкаваўся з 1853. У ранніх вершах (1849—1854) побач з рэлігійнымі «Вечнасць», «Малітва» гучаць сацыяльныя матывы («Цішыня ночы», «Помста»). У творчасці 1850-х г. звярнуўся да тэмы народнага жыцця («Бурлак», «Жонка ямшчыка», «Араты», паэмы «Кулак», «Тарас»). Рэвалюцыйныя матывы ў вершах «Ганебна гіне наш час!...», «Цяжкі крыж нясем мы, браты», «Падзе ганебнае тыранства...». Майстар паэтычнага пейзажу («Вечар пасля дажджу», «Раніца»). У празаічным «Дзённіку семінарыста» (1861) адлюстраваў побыт бурсы, стварыў вобраз разначынца. Многія вершы Нікіціна пакладзены на музыку М. Рымскім-Корсакавым, Р. Гліэрам, С. Манюшкам і інш. На беларускую мову асобныя яго творы пераклаў Х. Жычка.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1961) і 2 завулкі.

**Літаратура:**

Нікіцін Іван Савіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.11. - Мінск, 2000. - С. 343.

Никитин Иван Саввич // Их именами названы…: энциклопедический справочник.- Минск, 1987.- С. 449.

Никитин Иван Саввич // Минск: энциклопедический справочник –Минск, 1983.-С. 287.

Серова, Л. "Пойми живой язык природы..." // Наука и жизнь. - 2008. - № 3. - С. 112-116.

(імёны)

## Някрасаў Мікалай Аляксеевіч
## (1821 – 1878)

**Някрасаў Мікалай Аляксеевіч** нарадзіўся 10.12.1821 у в. Сінькі Ульянаўскага раёна Кіраваградскай вобл., Украіна.

Рускі паэт. Вучыўся ў Яраслаўскай гімназіі (1832—1837). У 1839—1840 вольнаслухач Пецярбургскага універсітэта. Першы зборнік вершаў — «Мары і гукі» (1840). У 1845 выдаў зб. «Фізіялогія Пецярбурга» (ч. 1—2), у 1846 — «Пецярбургскі зборнік», у якіх змешчаны творы пісьменнікаў натуральнай школы. Выдаваў і фактычна рэдагаваў часопіс «Современник» (1847—1866), з 1868 рэдактар часопіса «Отечественные записки». Зблiжэнне з В.Бялінскім, пазней супрацоўніцтва з М.Чарнышэўскім і М.Дабралюбавым зрабілі ўплыў на фарміраванне яго рэвалюцыйна-дэмакратычнага светапогляду і глыбока народную рэалістычную творчасць. Вершы 1840-х г. востра сацыяльныя, у іх спалучаецца пранікнёны лірызм з бязлітаснай сатырай. Праз усю творчасць Някрасава праходзіць тэма народа, увасобленая ў разнастайнасці тыпаў і характараў: цыкл вершаў «Пра надвор'е», вершы «Роздум каля параднага пад'езда», «На Волзе», «Плач дзяцей», «Чыгунка», «Песня пра

свабоднае слова», паэмы «Мароз, Чырвоны нос» (1863—1864), «Каму на Русі жыць добра» (1866—1881, не завершана; на беларускую мову пераклаў А.Якімовіч, 1940) і інш. Аўтар паэм «Няшчасныя» (1858, не завершана), «Дзядуля» (1870), «Рускія жанчыны» (1872—1873; прысвечана жонкам дзекабрыстаў), сатырычная «Сучаснікі» (ч. 1—2, 1875—1876), раманаў «Тры краіны свету» (1848—1849), «Мёртвае возера» (1851, абодва ў сааўт. з А.Панаевай) і інш. Пісаў апавяданні, нарысы, фельетоны, драматычныя творы, публіцыстычныя і крытычныя артыкулы, творы для дзяцей і інш.

Адзін з першых звярнуў увагу на гаротнае жыццё беларускага народа, стварыў вобраз беларуса («Чыгунка» і «Каму на Русі жыць добра»). Грамадзянская, дэмакратычная, цесна звязаная з фальклорам, паэзія Някрасава зрабіла вялікі ўплыў на развіццё рускай літаратуры і літаратуры іншых народаў, у т.л. беларускай.

Беларуская паэзія развівалі някрасаўскую павагу да мужіка, заклікалі народ да барацьбы за сацыльная і духоўнае вызваленне. Пад знакам ідэй : «песняра гора народнага» развівалася паэзія У.Сыракомлі, Ф.Багушэвіча, Я.Лучыны. А.Гурыновіч шырока выкарыстоўваў вобразнасць Някрасава ў сваіх вершах, пераклаў на беларускую мову паэму «Мароз, Чырвоны нос». Новым этапам у асваенні традыцый Някрасава з'явілася творчасць Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, Цёткі. Агульнасць маральна-этычных пазіцый Я.Купалы і Някрасава адчуваецца ў вершах «Пашкадуй мужыка», «Жніво», паэме «Яна і я». Коласаўскія вобразы сялян — працаўнікоў, праўдашукальнікаў — блізкія да вобразаў паэмы «Каму на Русі жыць добра». У 2-й палове 19 ст. на Беларусі ставіліся прасякнутыя сацыяльна-дэмакратычнымі матывамі вадэвілі Някрасава. «Вось што значыць пакахаць актрысу», «Шыла ў мяшку не ўтоіш, а дзяўчыну пад замком не ўтрымаеш», «Акцёр», меладрама «Мацярынскае благаславенне, або Беднасць і гонар» (пераклад-пераробка французскай п'есы А.Дэнеры і Г.Лемуана), драма «Асенні сум». Паэтызацыя працы (асабліва сялянскай), прыроды, гуманізм, прага дабра і справядлівасці — гэтыя рысы паэзіі Някрасава паўплывалі на фарміраванне эстэтычнага ідэалу беларускай паэзіі. Беларускія паэты выкарыстоўвалі вопыт Някрасава па збліжэнні паэзіі з прозай (празаізацыя паэзіі), з інш. літаратурнымі жанрамі. Бліскучыя ўзоры ўзаемапранікнення лірычнага і публіцыстычнага пачаткаў у творах Някрасава садзейнічалі творчаму росту многіх беларускіх паэтаў (П.Броўка, А.Куляшоў, М.Танк, П.Панчанка, Г.Бураўкін, А.Вялюгін, АВярцінскі, Н.Гілевіч, А.Русецкі і інш.). На беларускую мову асобныя творы Някрасава пераклалі Я.Купала, П.Броўка, М.Танк, Р.Барадулін, А.Бачыла, Г.Бураўкін, А.Вярцінскі, М.Лужанін, Я.Семяжон і інш.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1937) і завулак.

**Літаратура:**


Някрасаў Мікалай Аляксеевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.11. - Мінск, 2000. - С. 408.

Некрасов Николай Алексевич // Их именами названы…: энциклопедический справочник.- Минск,1987.- С. 444-445.

Некрасов Николай Алексеевич // Минск: энциклопедический справочник – Минск,1983.- С. 286.

Илюшин,А.А. Поэзия Некрасова / А.А. Илюшин. - М. : Изд-во Моск.ун-та, 1998. - 76с. - ( Перечитывая классику).

Курков, И. Русские классики о белорусах / Илья Курков // Обозреватель. - 2010. - 2 апр. - С. 21.

Гапоненко, П.А. О "Поэте и гражданине" Н.А. Некрасова /П.А. Гапоненко // Литература в школе. - 2007. - № 6. - С. 47.

Романова, Е.В. Стихи Некрасова о любви / Е.В. Романова // Литература в школе. - 2007. - № 6. - С. 26-27.

Грачева, И.В. Художественное своеобразие поэмы Н.А. Некрасова "Русские женщины" / И.В. Грачева // Литература в школе. - 2007. - № 6. - С. 20-23.

Николай Некрасов (1821-1877). [О стихотворениях] "Я за то глубоко презираю себя...", "Где твое личико смуглое...", "Калистрат" // Русова, Н.Ю. Тайна лирического стихотворения. От Державина до Ходасевича.- Москва, 2005.- С. 72-77.

Сухих, И. Русская литература. XIX век. Николай Алексеевич Некрасов (1821-1877) / И. Сухих // Звезда. - 2007. - № 11. - С. 212-230.

(імёны)

## Пугачоў Емяльян Іванавіч
## (1742 – 1775)

**Пугачоў Емяльян Іванавіч** нарадзіўся каля 1742 у б. станіце Зімавейская-на-Доне, цяпер тэрыторыя Валгаградскай вобл., Расія.

Кіраўнік сялянскай вайны 1773—1775. Данскі казак, харунжы (1770). Удзельнік Сямігадовай 1756—1763 і руска-турэцкай 1768—1774 войнаў. У 1771 уцёк ад ваеннай службы на р. Церак, там выбраны станічным атаманам. У лютым 1772 арыштаваны, уцёк да стараveраў у Ветку на Гомельшчыне, у лістападзе — на р. Яік (цяпер Урал), дзе агітаваў казакаў пайсці на вольныя землі за р. Кубань. Арыштаваны, засуджаны на катаргу. У маі 1773 уцёк з казанскага астрога на Яік, дзе паводле дамоўленасці з групай казакоў абвясціў сябе імператарам Пятром III (верасень 1773). Выступаў з утапічнай ідэяй «справядлівага» казацка-сялянскага царства. У час сялянскай вайны непісьменны Пугачоў паказаў вялікія арганізатарскія і ваенныя здольнасці. Жорстка распраўляўся з дваранамі і ўсімі, хто не прызнаваў яго імператарам. Пасля канчатковага паражэння ад урадавых войск Пугачоў 19.9.1774 схоплены групай сваіх прыбліжаных і неўзабаве выдадзены ўладам. Пакараны смерцю (чвартаваны) ў Маскве.

У Мінску ў гонар Е.І. Пугачова названа **вуліца** - Пугачоўская (1922).

**Літаратура:**

Пугачоў Емяльян Іванавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.13. - Мінск, 2001. - С. 116.

Пугачев Емельян Іванович // Их именами названы…: энциклопедический справочник.- Минск,1987.- С. 501-502.

Пугачев Емельян Иванович // Минск: энциклопедический справочник –Минск,1983.- С. 346.

Рогалев, А. Ветковская страница "Истории Пугачева" / Александр Рогалев // Неман. - 2006. - № 3. - С. 156-164.

(імёны)

## Слуцкая Вера Кліменцьеўна
## (1874 – 1917)

**Слуцкая Вера Кліменцьеўна** (сапр. Берта Браніславаўна) нарадзілася 17.9.1874 у Мінску. Удзельніца рэвалюцыйнага руху на Беларусі. З 1901 член Бунда, з 1902 член РСДРП(б). У 1898 зняволена, потым жыла ў Мінску пад наглядам паліцыі, у 1901 за рэвалюцыйную агітацыю выслана ў мяст. Мір, у рэвалюцыю 1905—1907 у Мінску. З 1909 у эміграцыі. З 1913 на партыйнай рабоце ў Пецярбургу. У 1917 член Петраградскага гарадскога камітэта, сакратар Васільеўстраўскага райкома РСДРП(б), член жаночага бюро ЦК РСДРП(б), член выканкома Петраградскага Савета. Загінула каля Царскага Сяла ў час наступлення войск Керанскага—Краснова на Петраград.

У Мінску яе імя носіць **вуліца** (1970) і завулак, на доме № 2 мемарыяльная дошка (1974).

**Літаратура:**

Слуцкая Вера Кліменцьеўна // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.15. - Мінск, 2002. - С. 28.

Слуцкая Вера Климентьевна // Их именами названы…: энциклопедический справочник.- Минск,1987.- С. 557-558.

(імёны)

## Смалячкоў Феадосій Арцемьевіч
## (1923-1942)

**Смалячкоў Феадосій Арцемьевіч** нарадзіўся 12.07.1923 у в. Падгор`е Быхаўскага р-на Магілёўскай вобл.

Вучыўся ў школе ФЗВ у Ленінградзе. Працаваў каменшчыкам на будоўлях Ленінграда. На Ленінградскім фронце з 1941. Адзін з ініцыятараў снайперскага руху за адкрыццё асабістага рахунку знішчаных фашыстаў. Пачын снайпера Ф.А. Смалячкова быў

распаўсюджаны на Ленінградскім і іншых франтах. Ф.А. Смалячкоў асабіста падрыхтаваў 10 снайпераў, знішчыў 125 гітлІраўцаў. Пагіб у баі 15.01.1942. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена пасмяротна 6.02.1942.

**Вуліца** ў Савецкім раёне названа яго імем у 1955, на доме № 1 мемарыяльная дошка (1965).

**Літаратура:**

Смолячков Феодосий Артемьевич // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 370.

Смолячков Феодосий Артемьевич // Герои Советского Союза: Краткий биограф. слов.: В 2 т. - Т. 2. - М., 1988. - С. 490.

Исайчук, Д. Геройская улица / Дмитрий Исайчук // Минский курьер. - 2011. - 30 марта. - С. 13.

(імёны)

## Собінаў Леанід Віталевіч
## (1872 – 1934)

**Собінаў Леанід Віталевіч** нарадзіўся 7.06.1872 у г. Яраслаўль, Расія.

Рускі спявак (лірычны тэнар), прадстаўнік рускай класічнай вакальнай школы.

Народны артыст Рэспублікі (1923). Скончыў юрыдычны факультэт Маскоўскага універсітэта (1894), музычна-драматычнае вучылішча Маскоўскага філарманічнага таварыства (1897). З 1897 у Вялікім тэатры ў Маскве (у 1917—1918 і ў 1921 - дырэктар). У дасканаласці валодаў мастацтвам італьянскага бельканта. У аснове яго мастацтва высокая адухоўленасць, паэтызацыя музычнага вобраза, адзінства бездакорнага вакальнага майстэрства і драматычна асэнсаванай ігры. Адзін з лепшых выканаўцаў партый Ленскага («Яўген Анегін» П.Чайкоўскага) і Лаэнгрына («Лаэнгрын» Р.Вагнера) на сусветнай сцэне. З іншых партый: Сінадал («Дэман» А.Рубінштэйна), Берандзей, Ляўко («Снягурачка», «Майская ноч» М.Рымскага-Корсакава), Рудольф («Багема» Дж.Пучыні), Альфрэд, Герцаг («Травіята», «Рыгалета» Дж.Вердзі). Вёў актыўную канцэртную дзейнасць. Прапагандыст рускай вакальнай лірыкі, тонкі інтэрпрэтатар класічнай камерна-вакальнай музыкі. Канцэртны рэпертуар складалі творы М.Глінкі, П.Чайкоўскага, С.Рахманінава, Л.Бетховена, Р.Шумана, Ф.Шуберта, Ш.Гуно.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1954) і 2 завулкі.

**Літаратура:**

Собінаў Леанід Віталевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.15. - Мінск, 2002. - С. 73-74.

Собинов Леонид Витальевич // Их именами названы…: энциклопедический справочник.- Минск,1987.- С. 563.

Собинов Леонид Витальевич // Минск: энциклопедический справочник –Минск,1983.- С. 370.

(імёны)

## Сурганаў Фёдар Анісімавіч
## (1911-1976)

**Сурганаў Фёдар Анісімавіч** нарадзіўся 7.061911 у в. Суднікі Віцебскага р-на.

Скончыў Беларускі сельскагаспадарчы інстытут. У 1931 -1934 аграном Калхозцэнтра. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў саставе Магілеўскага абласнога штаба народнага апалчэння. У 1942 - 1945 сакратар ЦК ЛКСМБ. Займаўся падборам камсамольцаў у знішчальныя атрады, фарміраваннем атрадаў самаабароны, падрыхтоўваў кдры для падполнай работы ў тыле ворага. У 1942 -1943 на Калінінскім фронце ў складзе аператыўнай групы ЦК КП(б) і БШПР, жн. 1943 – ліп. 1944 у тыле ворага. Адзін з кіраўнікоў партыз. руху і падполля на тэрыторыі Вілейскай, Баранавіцкай і Беластоцкай абл. З 1945 на савецкай і партыйнай рабоце. У 1971 - 1976 старшыня Прэзідыума ВС БССР, нам. Старшыні Вярхоўнага Савета СССР. Загінуў у аўтакатастрофе.

**Вуліца** ў Першамайскім і Савецкім раёнах Мінска названа яго імем у 1977.

**Літаратура:**

Сурганов Федор Анисимович // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 15. - Мн., 1997. - С. 280.
Сурганаў Фёдар Анісімавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 582.
Сурганов Федор Анисимович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 583.
Антонович, С. До последнего удара сердца... // Судьба до востребования. / Славомир Антонович. - Минск, 2011. - С. 225-236.
Сурганов Федор Анисимович // Жучкевич В. А. Улицы помнят. - Мн., 1979. - С. 62.
Чернушевич А. Улица имени... // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 22.

(імёны)

## Тургенеў Іван Сяргеевіч
## (1818 – 1883)

**Тургенеў Іван Сяргеевіч** нарадзіўся 9.11.1818 у г. Арол, Расія.

Рускі пісьменнік. Чл.-кар. Пецярбургскай АН (1860). Вучыўся ў Маскоўскім універсітэце (1833 — 1834), скончыў Пецярбургскі універсітэт (1837).

Літаратурную дзейнасць пачаў як паэт — рамантычныя вершы і паэма «Сцяно» (нап. 1834, апубл. 1913). На фарміраванне яго літаратурна-эстэтычных поглядаў паўплываў В. Бялінскі. Пад уплывам натуральнай школы напісаў паэму «Памешчык» (1846), аповесць «Петушкоў» (1848), пачаў развенчваць рамантычнага, «дэманічнага» героя (аповесці «Андрэй Коласаў», 1844; «Тры партрэты», 1846; «Брэтэр», 1847).

У цыкле апавяданняў «Запіскі паляўнічага» паказ духоўных якасцей і адоранасці рускага сялянства, паэтызацыя прыроды.У голагеўскіх традыцыях напісаны п’есы «Безграшоўе» (1846), «Нахлебник» (1848, апубл. 1857), «Месяц у вёсцы» (1855), «Снеданне ў прадвадзіцеля» (паст. 1849) і інш. Сацыяльные, маральныя і духоўныя праблемы ў аповесцях «Муму» (1854), «Заезны дом» (1855). У лірыка-філасофскіх аповесцях «Дзённік лішняга чалавека» (1850), «Паездка ў Палессе» (нап.1853—1857), «Зацішша» (1854), «Якаў Пасынкаў» (1855), «Перапіска», «Фауст» (обедзве 1856), «Ася» (1858), «Першае каханне» (1860) тып «лішняга чалавека», псіхалагічна глыбокія жаночыя характары, гісторыі трагічнага, нераздзеленага кахання. У рамане «Рудзін» (1856) тэма «лішняга чалавека» раскрыта глыбей і шырэй. Адно з найвялікшых яго мастацкіх дасягненняў — «Дваранскае гняздо» (1859). У аснове рамана «Напярэдадні» (1860) думка аб неабходнасці свядома-гераічнай асобы. Раман«Бацькі і дзеці» (1862) пра ідэйныя, сацыяльныя, філасофскія, эстэтычныя спрэчкі 1860-х г. Пазней у творах Тургенева з'явіліся песімістычныя настроі (аповесці «Здані», 1864; «Даволі», 1865; раман «Дым», 1867). У перыяд народніцкага руху вярнуўся да вобраза «лішняга чалавека» (аповесць «Веснавыя воды», 1872) і гераічнай тэмы (раман «Новае», 1877). У кн. «Вершы ў прозе» (ч. 1, 1882) роздум над жыццём, сутнасцю паэзіі. Тургенеў — мастак-рэаліст, тонкі псіхолаг, пранікнёны лірык. Яго творчасць паўплывала на развіццё сусветнай літаратуры. У 19 — пачатку 20 ст. ўрыўкі з яго твораў перадрукоўваліся ў газетах, што выходзілі на Беларусі. Шырока адзначыла беларуская дэмакратычная грамадскасць яго юбілейныя даты. Першыя пераклады твораў Тургенева на беларускую мову апублікаваны ў газеце «Наша ніва». З 1860-х г. п'есы Тургенева вядомы беларускаму гледачу. Іх паказвалі мясцовыя і прыезджыя тэатральныя калектывы; п'есы «Нахлебнік», «Безграшоўе» і «Месяц у вёсцы» былі ў рэпертуары беларускіх аматарскіх калектываў. Інсцэніроўкі рамана «Напярэдадні» былі ўвасоблены на сцэнах Беларускага тэатра імя Я.Коласа (1950), Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра (1952), рамана «Дваранскае гняздо» — абласных драматычных тэатраў Брэсцкага (1950) і Пінскага (1953), п'еса «Месяц у вёсцы» паст. Брэсцкім тэатрам драмы і музыкі (1996). На Беларускім тэлебачанні паводле твораў Тургенева пастаўлены фільмы «Жыццё і смерць двараніна Чартапханава» (1971), «Гамлет Шчыгроўскага павета» (1975), «Зацішша» (1982), «Бацькі і дзеці» (1984). Творчасць пісьменніка даследавалі беларускія літаратуразнаўцы А.Вазнясенскі, І.Замоцін. На беларускую мову асобныя творы Тургенева пераклалі Я.Сіпакоў, Я.Шарахоўскі, У.Шахавец, В.Шашалевіч, А.Якімовіч і інш.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1953).

**Літаратура:**

Тургенеў Іван Сяргеевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.16. - Мінск, 2003. - С. 40-41.

Тургенев Иван Сергеевич // Их именами названы…: энциклопедический справочник.- Минск,1987.- С.616.

Тургенев Иван Сергеевич // Минск: энциклопедический справочник –Минск,1983.- С.411.

Труайя, Анри. Иван Тургенев/ Анри Труайя.- Москва: ЭКСМО, 2005.- 318с.,[8]л.фот.

Топоров, В.Н.Странный Тургенев: четыре главы/В.Н. Топоров.-М.: Рос.гос.гуманитар.ун-т, 1998.-190с.

Новикова, А.А. Лирико-символическое начало в романе И.С. Тургенева "Накануне"/А.А. Новикова // Литература в школе.- 2008.- № 11.- С. 12-16.

Новикова, А.А. И.С. Тургенев и Ф.И. Тютчев/А.А. Новикова // Литература в школе.- 2008.- № 10.- С. 2-7.

Щеблыкин, И.П. Правдивая книга о народе/И.П. Щеблыкин // Литература в школе.- 2008.- № 10.- С. 7-11.

Лебедев, Ю.В. Россия и русские в романе И.С. Тургенева "Дворянское гнездо"/Ю.В. Лебедев // Литература в школе.- 2008.- № 10.- С. 12-18.

Щитова, Е.И. Семья Базаровых/Е.И. Щитова // Литература в школе.- 2008.- № 10.- С. 30-32

Валагин, А.П. Герасим и Муму/А.П. Валагин // Литература в школе.- 2008.- № 10.- С. 2-3.

Фефёлова, Н.Н. Язык рассказа И.С. Тургенева "Певцы"/Н.Н. Фефёлова // Литература в школе.- 2008.- № 10.- С. 7-8.

Холомьёв, Н.Г. Легко ли беречь барский лес?/Н.Г. Холомьёв // Литература в школе.- 2008.- № 10.- С. 9-11.

Вологжанина, В.В. И.С. Тургенев. "Стихотворения в прозе"/В.В. Вологжанина // Литература в школе.- 2008.- № 10.- С. 11-14.

Ануфриева, А.М. О стихотворении И.С. Тургенева "Как хороши, как свежи были розы..."/А.М. Ануфриева // Литература в школе.- 2008.- № 10.- С. 15.

Никольский, С.А. Мировоззрение русского земледельца в романной прозе И.С. Тургенева/С.А. Никольский // Вопросы философии.- 2008.- № 5.- С. 87-103.

(імёны)

## Халтурын Сцяпан Мікалаевіч (1857 – 1882)

**Халтурын Сцяпан Мікалаевіч** нарадзіўся 2.1.1857 г. у в. Верхнія Жураўлі Кіраўскай вобласці, Расія.

Расійскі рабочы-рэвалюцыянер. Арганізатар (1878) і кіраўнік (з І.П Абнорскім) «Паўночнага саюза рабочых». З 1879 у «Народнай волі». У лютым 1880, каб здзейсніць замах на Аляксандра II, учыніў выбух у Зімнім палацы (цар уцалеў), дзе працаваў сталяром. З сакавіка 1881 член Выканкома «Народнай волі». Пакараны смерцю (павешаны) за ўдзел у забойстве (сакавік 1882) адэскага ваеннага пракурора.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** і 2 завулкі (1957).

**Літаратура:**

Халтурын Сцяпан Мікалаевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.16. - Мінск, 2003. – С.533.

Халтурин Степан Николаевич // Их именами названы…: энциклопедический справочник.- Минск,1987.- С.642.

Халтурин Степан Николаевич // Минск: энциклопедический справочник – Минск,1983.-С.422.

(імёны)

## Харужая Вера Захараўна
## (1903-1942)

**Харужая Вера Захараўна** нарадзілася 27.09. 1903 у г. Бабруйск Магілёўскай вобл.

Удзельніца грамадз. Вайны 1918 - 1920. Настаўнічала, працавала ў Мазырскім і Бабруйскім пав. к-тах КСМБ. Скончыла Цэнтр. сав.-парт. школу (1922). З 1924 на падп. работце ў Зах. Беларусі, адзін з арганізатараў і 1-ы рэдактар органа ЦК КСМЗБ газеты “Малады камуніст”. 15.09.1925 арыштавана польскімі ўладамі. На паліт. працэсе 31-го (студз. 1927, Брэст) прыгаворана да 6 гадоў, на працэсе 133-х (крас. – май 1928, Беласток) – да 8 гадоў зняволення. У вер. 1932 у ліку 40 абмененых палітвязняў Польшчы прыехала ў Мінск. Працавала ў замежнай частцы Цэнтр. рэдакцыі КПЗБ, Мінскай школе КПЗБ. У 1935 арыштавана АДПУ БССР і выслана на “Балхашбуд” (Сярэдняя Азія). Пасля вызвалення Зах. Беларусі на парт. рабоце ў Целяханах, Пінску. У першыя дні Вялікай Айчыннай вайны – партызанка атрада В.З. Каржа. З вясны 1942 у апараце ЦК КП(б)Б у Маскве. У вер. 1942 на чале групы накіравана ў Віцебск для арганізацыі і умацавання патрыятычнага падполля. Збірала і перадавала камандаванню Чырв. Арміі і партызанам каштоўныя звесткі пра ворага. 13.11.1942 арыштавана фашыстамі і пасля жорсткіх катаванняў расстраляна. Герой Савецкага Саюза (1960).

**Вуліца**, якая знаходзіцца ў Цэнтральным і Савецкім раёнах Мінска, атрымала імя В.Харужай у 1976, на доме № 1 знаходзіцца мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**


Харужая Вера Захараўна // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 16. - Мн., 2003. - С. 552-553.

Харужая Вера Захараўна // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 6. - Мн., 2003. - С. 60-61.

Харужая Вера Захараўна // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 611.

Давыдова, О. Подпольщица геройски погибла // Минский курьер. – 2005. - 13 мая. - С. 5.

Вера Хоружая // Минский курьер. – 2005. - 7 мая. - С. 11.

Чернушевич А. Улица имени... // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 29.

Бараноўскі Я. "Узнагародзіць пасмяротна..." // Звязда. – 2003. - 27 верас. - С. 3.

Каминский В. "Меня освободит революция!" // Сов. Белоруссия.- 2003. - 27 сент. - С. 31.

Михайлова А. Посвящается Вере... // Минский курьер.- 2003. - 29 авг.(№ 82). - С. 19.

Куц Н. Человек-легенда // 7 дней. - 1998. - 26 сент. - С. 13


(імёны)

## Хмяльніцкі Багдан (Зіновій) Міхайлавіч
## (каля 1595 — 1657)

**Хмяльніцкі Багдан (Зіновій) Міхайлавіч** нарадзіўся каля 1595, верагодна, у г. Чыгірын Чаркаскай вобласці, Украіна.

Гетман Украіны (з 1648), дзяржаўны дзеяч, палкаводзец. Паходзіў з дробнай праваслаўнай шляхты. Адукацыю атрымаў у езуіцкім калегіуме ў Львове. Удзельнічаў у паходах супраць туркаў і крымскіх татар, у казацкіх паўстаннях. У рэестравым казацкім войску быў вайсковым пісарам, пасля паўстання 1637—1638 чыгірынскі сотнік. У 1647 арыштаваны за падрыхтоўку новага паўстання супраць Польшчы. Пасля вызвалення ўцёк у Запарожскую Сеч, дзе выбраны гетманам запарожскага войска. У 1648 заключыў саюз з крымскім ханам супраць Польшчы і пачаў баявыя дзеянні. У маі 1648 у бітвах на Жоўтых Водах і каля Корсуня разбіў польскае войска. Пасля чаго на Украіне пачалася вызваленчая вайна (1648—1654). Напачатку быў прыхільнікам аўтаноміі Украіны ў складзе Каралеўства Польскага, што было замацавана Збораўскім дагаворам 1649.

Па ініцыятыве Хмельніцкага Пераяслаўская Рада 1654 зацвердзіла пагадненне з расійскім царом Аляксеем Міхайлавічам пра ўваходжанне Украіны ў склад Расійскага

царства як аўтаномнай дзяржавы. Аднак у 1656 выявіліся супярэчнасці паміж Хмяльніцкім і царскім урадам, які не прытрымліваўся пагаднення аб аўтаноміі Украіны.

Хмяльніцкі пачаў перагаворы са Швецыяй і Малдовай з мэтай замацаваць сваё становішча і забяспечыць сваім сынам пераемнасць улады на пасадзе гетмана. Падтрымліваў кантакты з кіраўніком кальвінісцкай групоўкі ў ВКЛ Б. Радзівілам, якому выдаў універсал на недатыкальнасць Слуцка і Слуцкага княства ад дзеянняў казацкіх атрадаў.

У гісторыю Хмяльніцкі ўвайшоў як дзяржаўны дзеяч, які садзейнічаў адраджэнню ў сярэдзіне 17 стагоддзя Украінскай дзяржавы. Ацэнка яго дзейнасці сярод украінскіх гісторыкаў неадназначная.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1954) і завулак.

**Літаратура:**

Хмяльніцкі Багдан (Зіновій) Міхайлавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.17. - Мінск, 2003. – С.36.

Хмельницкий Богдан (Зиновий) Михайлович // Их именами названы…: энциклопедический справочник. - Минск,1987. - С. 647.

Хмельницкий Богдан (Зиновий) Михайлович // Минск: энциклопедический справочник – Минск,1983. - С.424.

(імёны)

## Чарнышэўскі Мікалай Гаўрылавіч
## (1828 – 1889)

Гл. у Першамайскім раёне.

(імёны)

## Шчэпкін Міхаіл Сямёнавіч
## (1788 – 1863)

**Шчэпкін Міхаіл Сямёнавіч** нарадзіўся 17.11.1788 г. у с. Краснае Шабекінскага раёна Белгародскай вобласці, Расія. Рускі акцёр; заснавальнік рэалізму ў рускім сцэнічным мастацтве. З прыгонных. Дэбютаваў у 1805 у Курскім тэатры. З 1816 у Харкаўскім, з 1818 у Палтаўскім вольных тэарах. У 1822 атрымаў вольную. З 1823 у Маскоўскім тэатры (з 1824 Малы тэатр). Сцвярджаў асветнае, грамадскае значэнне тэатра, патрабаваў падпарадкавання ўсяго творчага працэсу агульнай ідэі. Імкнуўся да натуральнасці ігры, распрацоўваў прынцыпы мастацтва пераўвасаблення. Лепшыя ролі стварыў у рускай сатырычна-выкрывальніцкай драматургіі: Фамусаў («Гора ад розуму» А.Грыбаедава), Гараднічы («Рэвізор» М.Гогаля) і інш. Яркай народнасцю і нацыянальным гумарам вылучаліся яго работы ва ўкраінскіх творах: Чупрун («Маскаль-чараўнік» І.Катлярэўскага), Шальменка («Шальменка-дзяншчык» Р.Квіткі-Аснаўяненкі). Псіхалагічная глыбіня ўласціва вобразам «прыніжаных і зняважаных» у п'есах І.Тургенева «Халасцяк» (Мошкін) і «Нахлебнік» (Кузаўкін), А.Сухаво-Кабыліна «Вяселле Крачынскага» (Мурамскі). Традыцыі рэалізму Шчэпкіна зрабілі вялікі ўплыў на развіццё мастацтва Малога тэатра, які называюць «Домам Шчэпкіна», яны пакладзены ў аснову сістэмы акцёрскага мастацтва К.Станіслаўскага .

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1954) і завулак.

**Літаратура:**

Шчэпкін Міхаіл Сямёнавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.18. Кн. 1. – Мінск, 2004. – С. 6.

Щепкин Михаил Семенович// Их именами названы…: энциклопедический справочник. - Минск,1987. - С. 696-697.

Щепкин Михаил Семёнович // Минск: энциклопедический справочник – Минск,1983.-С.444.

(на пачатак)

## Фрунзенскі раён

(імёны)

## Адзінцоў Лявонцій Яфімавіч
## (1891-1942)

**Адзінцоў Лявонцій Яфімавіч** нарадзіўся 02.07.1891 у г.п. Акцябрскі Гомельскай вобл.

У 1917 арганізатар чырвонагвардейскіх атрадаў у Рудобелцы Бабруйскага павета, камандзір партызанскага атрада (1919 - 1920). З 1921 у павятовых установах Бабруйска, на кіруючых пасадах у ЦВК БССР. У Вялікую Айчынную вайну прымаў актыўны ўдзел у стварэнні і дзейнасці Мінскага патрыятычнага падполля. У акупіраваным Мінску на яго кватэры (ул.Савецкая, 4) праводзіліся пасяджэнні падпольнага гаркома КП(б)Б, хавалася зброя, патрыятычная літаратура і медыкаменты. 24.10.1942 быў арыштаваны фашыстамі. Спалены у лагеры смерці Трасцянец.

**Вуліца** ва Фрунзенскім раёне Мінска атрымала яго імя ў 1977, на доме № 2, кор.2 мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Адзінцоў Лявонцій Яфімавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 1. - Мн., 1996. - С. 109.

Адзінцоў Лявонцій Яфімавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 1. - Мн., 1993. - С. 53.

Одинцов Леонтий Ефимович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 455.

Одинцов Леонтий Ефимович // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 292.

Шумейка М. Кавалер беларускага ордэна: [Да 100-годдзя з дня нараджэння аднаго з арганізатараў Мінскага партыйнага падполля Л. Я.Адзінцова] // Звязда. – 1991. – 16 ліп.

Маціеўская Л. Мужны патрыёт – падпольшчык: [Пра Л. Я. Адзінцова] // Вячэрні Мінск. – 1989. – 27 сак.

Салаўёў М. Вечна ў памяці людской: [Пра мінскага падпольшчыка Л. Я. Адзінцова] // Вячэрні Мінск. – 1983. – 4 лют. – (Іх імёнамі названы вуліцы).

Салаўёў М. З кагорты мужных: [Пра аднаго з арганізатараў Мінскага камуністычнага падполля Л. Я. Адзінцова] // Мінская праўда. – 1982. – 2 снеж. – (Іх імёнамі названы вуліцы).

(імёны)

## Адоеўскі Аляксандр Іванавіч
## [26.11.(8.12).1802) – 15 (27).1802)]

Адоеўскі Аляксандр Іванавіч рускі паэт, дзекабрыст. Належыў да старажытнага роду князёў чарнігаўскіх. Атрымаў хатнюю адукацыю. Літоўскія погляды Адоеўскага шмат чым супадалі з пазіцыяй А.С. Грыбаедава, В.Ф. Адоеўскага, А.А. Бястужава-Марлінскага, К.Ф. Рылеева, якія супрацьстаялі сентыментальна-меланхалічным тэндэнцыям у літаратуры. Зімой 1824-25 быў прыняты ў Паўночнае грамадства дзекабрыстаў, належаў да яго радыкальнай часткі. Удзельнік паўстання 14 снежня 1825, пасля паражэння якога быў заключаны ў Петрапаўлаўскую крэпасць. У 1827-37 адбываў катаргу і ссылку ў Сібіры, затым, па прыказу цара, адпраўлены радавым у дзейнічую армію на Каўказ, дзе зблізіўся з М.Ю. Лермантавым і М.П. Агаровым. Вершы, напісаныя да 1825, амаль не захаваліся. Пасля 1825 ў творчасці Адоеўскага гучыць тэма адданасці мінулым ідэалам: верш «Струн вещих пламенные звуки» (1827), адказ на вядомае «Послание в Сибирь» А.С. Пушкіна і інш. Для паэмы «Василько» (1829-30), вершаў «Зосима»(1827-1829), «Старица-пророчица»(1829) і інш. твораў Адоеўскага, якія працягнулі традыцыі дзекабрысцкай рамантычнай паэзіі з яе ўвагай да нацыянальна-гістарычнай тэматыкі, характэрны акцэнт на маральна-філасофскае асмысленне мінулага. Пашырэнне філасофскага пачатка ў лірыцы Адоеўскага ў значнай ступені прадвяшчала развіццё лермантаўскай лініі ў рускай паэзіі.

**Вуліца** ва Фрунзенскім раёне Мінска атрымала імя А.І. Адоеўскага ў 1954.

**Літаратура:**

Адоеўскі Аляксандр Іванавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. - Т. 5. Гальцы – Дагон / рэдкал.: Г. Пашкоў і інш. – Мн.:БелЭн, 1997. – С. 537-538.

Адоевский Александр Иванович // Большая советская энциклопедия : в 30т. - Т.18 / гл. ред. А.М. Прохоров. - М: Советская энциклопедия, 1974. – С. 928.

Адоевский Александр Иванович // Краткая литературная энциклопедия / гл. ред. А.А. Сурков. – М.: Советская энциклопедия, 1968. – С. 394-395.

Иосифова, Б. «Почтите сон его священный…» (об А. Одоевском) // Иосифова Б. Декабристы. – М., 1983. – С. 182-195.

(імёны)

## Аладаў Мікалай Ільіч (1890 – 1972) Аладава Алена Васілеўна (1907 – 1986)

**Аладаў Мікалай Ільіч** нарадзіўся 21.12.1890 у г. С.-Пецярбург.

Беларускі кампазітар і педагог. Народны артыст Беларусі (1955). Скончыў С.-Пецярбургскую кансерваторыю экстэрнам (1910). Працаваў ва Усходняй кансерваторыі (Казань), у Дзяржаўным інстытуце музычнай навукі (Масква). Уваходзіў у Беларускую песенную камісію. З 1924 у Мінску. Адзін з арганізатараў і выкладчыкаў Беларускага музычнага тэхнікума і кансерваторыі (з 1946 праф., у 1944—1948 дырэктар), удзельнічаў у стварэнні беларускай кампазітарскай арганізацыі (1932). Рэдактар многіх музычных выданняў (у т.л. твораў М.Чуркіна, Р.Пукста), збіральнік і даследчык беларускага, марыйскага, чувашскага, якуцкага фальклору, аўтар апрацовак народных песень. Творчасць адметная праграмнасцю, сімфанічнасцю мыслення, шырокім выкарыстаннем сродкаў поліфаніі, нацыянальнай характэрнасцю музыкі Сваімі творамі 1920—1930-х г. залажыў асновы такіх жанраў беларускай прафесійнай музыкі, як кантата («10 год», 1927), вакальна-сімфанічная паэма («Над ракою Арэсай» на вершы Я.Купалы, 1933), камерна-інструментальны ансамбль (фп. квінтэт, 1925). Своеасаблівасцю жанравага вырашэння вылучаецца опера «Тарас на Парнасе» — «музычна-драматычны жарт» (па матывах беларускіх ананімных паэм «Тарас на Парнасе» і «Энеіда навыварат» і паэмы В.Дуніна-Марцінкевіча «Гапон», 1927). Стварыў першыя ў беларускай музыцы ўзоры драматычнац (2-я, 1930) і лірыка-псіхалагічнай (4-я і 5-я, 1954—1956) сімфоніі.

Іншыя творы: опера «Андрэй Касценя» (1947 паст. 1970); кантата «Сорак год» (1956); 10 сімфоній (1921—1971), сімфаньета (1936), сімфанічная паэма «З дзенніка партызана» і сімфонія-балада «У суровыя дні» (1942), 4 сюіты-фантазіі для сімф. арк., канцэртныя фантазіі для скрыпкі і флейты з арк.; камерныя ансамблі; санаты; зб. Памансаў на вершы А. Кальцова, Я.Купалы, М.Багдановіча, М.Танка, Н. Гілевіча і інш.; хары, песні.

**Аладава Алена Васілеўна** нарадзілася 22.5.1907 у г. Пружаны.

Беларускі мастацтвазнавец. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1966) Жонка М. І. Аладава. Скончыла БДУ (1928). З 1937 працавала ў музеях Мінска. У 1944—1977 дырэктар Дзяржаўнага мастацкага музея Беларусі. Яе намаганнямі ў пасляваенныя гады адноўлены фонд музея, сабраны творы беларускага, рускага, зарубежнага мастацтва (у 1977 больш за 15 тыс. экспанатаў), арганізаваны шматлікія экспазіцыі і выстаўкі. Аўтар кніг пра творчасць І.Ахрэмчыка, П.Гаўрыленкі, ***В***.Цвіркі, пра Дзяржаўны мастацкі музей Беларусі (1958), беларускі жывапіс (1978) і інш.

**Вуліца** ў Фрунзенскім раёне Мінска атрымала імя Аладавых (2007).

**Літаратура:**

Аладава Алена Васілеўна // Беларуская энцыклапедыя: у18 т. Т. 1. – Мінск, 1996. – С. 225-226.

Аладаў Мікалай Ільіч // Беларуская энцыклапедыя: у18 т. Т. 1. – Мінск, 1996. – С. 226.

Елена Аладова. Музей - ее судьба: воспоминания, документы, исследования [жизни и деятельности директора Национального художественного музея Республики Беларусь, искусствоведа] / [авторы концепции и составители: Б.Крепак, Прокопцов, Н.Усова].- Минск:

Мастацкая літаратура, 2006. – (Беларусь мастацкая) . – 319с., [16]л. рэпрод.фото. – (Беларусь мастацкая)

22 мая - 100 год з дня нараджэння А.В. Аладавай (1907 - 1986), мастацтвазнаўца // Новыя кнігі. Па старонках беларускага друку. Даты беларускага календара (май-чэрвень 2007 г) . – 2007.-№ 2. – С. 4 - 5.

Аладава, Р. Мікалай Аладаў у каардынатах часу: успаміны дачкі кампазітара / Р. Аладава// Роднае слова 2000-№ 12.-С.69-72.

Аладава, Р."Тарас на Парнасе": музычнае прачытанне / Р. Аладава // Роднае слова.- 2000.- № 7.-С.86-88

(імёны)

## Альшэўскі Мікалай Міхайлавіч (1919-1944)

**Альшэўскі Мікалай Міхайлавіч** нарадзіўся 27.01.1919 у г.Сквіра Кіеўскай вобл., Украіна.

З 1941 на Заходнім, Ленінградскім і 3-м Беларускім франтах. Удзельнік вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Камандзір танка мал.лейтэнант М.М.Альшэўскі вызначыўся пры вызваленні Віцебшчыны і Міншчыны. 26.061944 каля в. Кісялі Талачынскага р-на знішчыў варожы танк “тыгр”, 4 гарматы і 8 аўтамашын. На ст. Коханава вызваліў больш за 150 грамадзян, якіх акупанты збіраліся вывезці ў Германію. У час ліквідацыі варожай групоўкі ў Мінскім “катле” знішчыў 2 танкі, 20 аўтамашын з ваеннымі грузамі, узяў у палон больш за 200 варожых салдат і афіцэраў. Загінуў у баі. Герой Савецкага Саюза (1945).

**Вуліца** ва Фрунзенскім раёне Мінска носіць яго імя (1969), на доме № 1 мемарыяльная дошка (1975).

**Літаратура:**

Альшэўскі Мікалай Міхайлавіч // Беларуская савецкая энцыклапедыя: У 12 т. - Т. 1. - Мн., 1969. - С. 278.

Ольшевский Николай Михайлович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 460-461.

Ольшевский Николай Михайлович // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 295.

Асмалоўскі А. Франтавое пісьмо: [Пра Героя Савецкага Саюза, удзельніка вызвалення Оршы М.М.Альшэўскага] // Віцебскі рабочы. – 1982. – 3 ліп.

Іваноў Я. Танкавы таран: [Аб подзвіге Героя Савецкага Саюза ўкраінца М.Альшэўскага пры вызваленні вёскі Кісялі і станцыі Коханава Талачынскага раёна…] // Віцебскі рабочы. – 1982. – 5 студз.

Коржыкаў Ю. М.М.Альшэўскі: [Пра Героя Савецкага Саюза] // Вячэрні Мінск. – 1974. – 24 крас. – (Іх імёнамі названы вуліцы).

(імёны)

## Бельскі Іосіф Аляксандравіч (1903-1966)

**Бельскі Іосіф Аляксандравіч** нарадзіўся 08.09.1903 у в. Лошыца 1-я, цяпер у межах Мінска.

З 1921 на гаспадарчай і партыйнай рабоце. Скончыў Маскоўскую прамысловую акадэмію (1941). З сакавіка 1941 сакратар Мінскага абкома КП(б)Б. У Вялікую Айчынную вайну з 21.07.1941 да ліпеня 1944 сакратар Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б, у маі – чэрвені 1943 камандзір, у лютым – ліпені 1944 выконваючы абавязкі камандзіра Мінскаг партызанскага злучэння, удзельнічаў у стварэнні 63 падпольных партыйных арганізацый у Мінскай і Палескай абл., у баявых аперацыях партызанаў. З 1944 сакратар Мінскага гаркома КП(б)Б. Герой Савецкага Саюза (1944).У 1948 – 1958 старшыня Белсаўпрофа, у 1952 – 1960 член ЦК КПБ. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1947 – 1951, 1955 – 1959.

**Вуліца** атрымала імя І.А. Бельскага у 1973, на доме № 23 знаходзіцца мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Бельскі Іосіф Аляксандравіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 3. - Мн., 1996. - С. 91-92.

Бельскі Іосіф Аляксандравіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 2. - Мн., 1994. - С. 9.

Бельский Иосиф Алекандрович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 63.

Акаловіч М. У тыле ворага: [Да 80-годдзя з дня нараджэння Героя Савецкага Саюза, сакратара Мінскага падпольнага абкама партыі У. А. Бельскага] // Мінская праўда. – 1983. – 4 кастр.

(імёны)

## Берут Баляслаў
## (1892-1956)

**Берут Баляслаў** нарадзіўся 18.04.1892 у г.Руры Езуіцкія каля г. Люблін, Польшча.

З 1912 удзельнік рэвалюцыйнага руху. З 1918 у Камуністычнай партыі Польшчы. У 1930 – 1932 дзеяч Камуністычнага Інтэрнацыянала ў Аўстрыі, Чэхаславакіі і Балгарыі. У 1933 – 1939 зняволены ў польскую турму. У час 2-й сусветнай вайны ў падполлі ў Мінску, Кіеве, Беластоку (1939 – 1944).

У 1944 - 1947 старшыня Краёвай Рады Нарадовай. У 1947 - 1952 прэзідэнт ПНР, у 1952 - 1954 старшыня Савета Міністраў ПНР. З 1948 старшыня, з сак. 1954 першы сакратар ЦК ПАРП.

У гонар Б.Берута названа **вуліца** ва Фрунзенскім раёне Мінска (2007), на доме № 3 мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Берут Баляслаў // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 3. - Мінск, 1996. - С. 123.

Берут Болеслав // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мінск, 1987. - С. 69.

(імёны)

## Бірузоў Сяргей Сямёнавіч
## (1904-1964)

**Бірузоў Сяргей Сямёнавіч** нарадзіуся 08.08.1904 у г. Скапін Разанскай вобл., Расія.

У Чырвонай Арміі з 1922. Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1937). У гады Вялікай Айчыннай вайны камандуючы арміяй, начальнік штаба 4-га, 3-га Украінскіх франтоў. Удзельнік баёў на Паўночна-Заходнім і Бранскім франтах, Сталінградскай бітвы, Міускай і Яска-Кішынёўскай аперацый, вызвалення Югаславіі. З 1955 нам. Міністра абароны, Маршал Савецкага Саюза. Герой Савецкага Саюза (1958). З 1963 начальнік Генштаба Узброеных Сіл СССР. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1946 – 1950 і ў 1954. Аўтар мемуараў з часоў Вялікай Айчыннай вайны.

**Вуліца** ва Фрунзенскім раёне Мінска названа яго імем у 1964, на доме № 13 мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Бірузоў Сяргей Сямёнавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 3. - Мн., 1996. - С. 157.

Бирюзов Сергей Семёнович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 71-72.

Бирюзов Сергей Семёнович // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 103.

Дзмітрыеў А. У полымі бітваў: [Пра Героя Савецкага Саюза, маршала С.С.Бірузова] // Вячэрні Мінск. – 1985. – 14 сак. – (Іх імёнамі названы вуліцы).

(імёны)

## Брыкет Фелікс Антонавіч
## (1928 - 1991)

**Брыкет Фелікс Антонавіч** нарадзіўся 28.06.1928 г. у вёсцы Змяёўка Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці.

Скончыў Чырвонабярэжскі сельскагаспадарчы тэхнікум (1945-1948). Служыў у Савецкай Арміі (1950-1952). Вучыўся ў Мелітопальскім інстытуце механізацыі і

электрафікацыі сельскай гаспадаркі (1957-1959). У 1959-1963 гг. – галоўны інжынер саўгаса “Уваравічы” Гомельскай вобласці. У 1963-1990 гг. - генеральны дырэктар саўгаса-агракамбіната “Ждановічы”.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, ордэнам Дружбы народаў, прысвоена ганаровае званне “Заслужаны механізатар сельскай гаспадаркі БССР”.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (2003).

(імёны)

## Бурдзейны Аляксей Сямёнавіч (1908-1987)

**Бурдзейны Аляксей Сямёнавіч** нарадзіўся 18.10.1908 у г. Жытомір, Украіна.

У Чырвонай Арміі з 1931. Скончыў Саратаўскае бранятанкавае вучылішча (1932), ваенныя акадэміі механізацыі і матарызацыі РСЧА (1940), Генштаба (1949). На фронце з чэрв. 1941, камандзір палка, начальнік штаба танкавай брыгады, корпуса. Удзельнік абароны Кіева, Харкава, баёў пад Варонежам, Сталінградскай і Курскай бітваў. З восені 1943 на Заходнім, 3-м Беларускім франтах. Вызваляў Оршу. Пад яго камандваннем 2-гі Тацінскі танкавы корпус першым уварваўся ў Мінск 3 ліп. 1944 года. Удзельнік баёў у Літве, Усходняй Прусіі. Герой Савецкага Саюза (1945). З 1954-1963 на адказных ваенных пасадах, да 1974 – у Міністэрстве абароны СССР. Генерал-палкоўнік (1961). Пачэсны грамадзянін Мінска.

**Вуліца** Фрунзенскага раёна Мінска названа яго імем (1982)**.**

**Літаратура:**

Бурдзейны Аляксей Сямёнавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 3. - Мн., 1996. - С. 348.

Бурдзейны Аляксей Сямёнавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 2. - Мн., 1994. - С. 135.

Генерал Бурдейный: "В два часа ночи, 3 июля..." // Моя столица. - Мн., 2004. - С. 77 - 90.

Алексей Семенович Бурдейны // Почётные граждане города Минска. – Мн., 1980. – С. 7 – 8.

Почётные граждане города Минска: [Н.И. Колычев, А.С. БУРДЕЙНЫЙ, Д.Г. Булахов, Д.И. Барашкин, М.Б. Осипова, И.М. Жижель] / Составитель А. Гущинская. – Мн.: Полымя, 1972. – 1 лист, сложенный в 10 раз.

Современники // Столичная. - 1999. - 23-29 апр. - С. 3.

Михайлов Н. В эфире – «555»: [О Герое Советского Союза, генерале - полковнике А. С. Бурдейном, почетном гражданине Минска] // Во славу Родины. – 1996. – 3 июля.

Акулаў П. На Мінскім напрамку: [Аб подзвігах воінаў 2-га гвардзейскага Тацынскага танкавага корпуса пад камандаваннем А. С. Бурдзейнага] // Мінская праўда. – 1984. – 23 чэрв.

(імёны)

## Верашчагін Васіль Васілевіч (1842 – 1904)

**Верашчагін Васіль Васілевіч** нарадзіўся 26.10.1842, горад Чарапавец Валагодскай вобл., Расія.

Рускі жывапісец-баталіст. Вучыўся ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (1860-1863), у майстэрні Ж.Л. Жэрома ў Парыжы (1864-1865). Вандраваў па Расіі, Заходняй Еўропе, Сірыі, Палесціне, Індыі, Японіі, ЗША і інш. Удзельнічаў у заваяванні Сярэдняй Азіі (1867-1868), руска-турэцкай (1877-1878) і руска-японскай (1904-1905) войнах.

Быў блізкі да перасоўнікаў. У тэматычных серыях карцін “Туркестанская” (1871-1874), “Балканская” (1877-1878 і 1880), на тэму вайны 1812 (1887-1904) і інш. паказаў жорсткія будні вайны (“Пасля няўдачы. (Пераможаныя)”, 1868), цяжар і героіку ратнай працы (трыптых “На Шыпцы ўсё спакойна!”, 1878-1879), мужнасць і маральную сілу

народа-змагара (“Не чапай, дай падысці!”, 1887-1895). У яго творах рамантычнае ўвасабленне ваенных сутыкненняў саступіла месца філасофскім разважанням пра вайну (“Апафеоз вайны”, “Нападаюць знянацку”, 1871), выкрыццю рэлігійнага фанатызму (“Трыумфуюць”, 1872), каланіялізму (“Задушэнне індыйскага паўстання англічанамі”, 1884). Па ўласных замалёўках і натурных эцюдах стварыў адметны жанр дакументна-этнаграфічнага жывапісу, дзе спалучыў дакументальную дакладнасць адлюстравання з дасканала распрацаванай кампазіцыяй, выразным малюнкам, каларыстычным рашэннем (“У гарах Алатау”, 1869-1870, “Дзверы Цімура (Тамерлана)”, 1872-1873, “Маўзалей Тадж-Махал у Агры”, 1874-1878, і інш.).

Загінуў у Порт-Артуры пры выбуху на браняносцы “Петрапаўлаўск” 13.04.1904.

**Вуліца** ў Фрунзенскім раёне атрымала імя В.В. Верашчагіна ў 1954 г. Яе працягласць 982 м. – ад Кальварыйскага праезда да вуліцы Харкаўская. На вуліцы размешчаны жылая малапавярховая забудова, Кальварыйскія могілкі, вароты якіх з’яўляюцца помнікам архітэктуры 19 ст.

**Літаратура:**

Верашчагін Васіль Васілевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 4. – Мн.,1996. – С. 98-99.

Верещагин Василий Васильевич // Большая советская энциклопедия: в 30 т. – Т. 4. – М.: Советская энциклопедия, 1971. – С. 531.

Верашчагін Васіль Васілевіч // Беларуская савецкая энцыклапедыя: у 12 т. – Т.3. – Мн.;1971. – С. 35.

Верещагин, В.В. Избранные письма / сост., предисл., примеч. А. К. Лебедев. – М., Изобраз. искусство, 1981. – 320 с.

Верещагин, В.В. Воспоминания сына художника. – Л.: Художник РСФСР, 1982. – 182 с.

Демин, Л.М. С мольбертом по земному шару: мир глазами В.В. Верещагина. – М.: Мысль, 1991. – 374 с.

Лебедев, А.К. В.В. Верещагин. – М.: Искусство, 1968. – 63 с.

Кенько, Т. Как увидеть Беларусь на картинах Верещагина // Всемирная литература. – 2007. – № 2. – С. 221-239.

(імёны)

## Вышалескі Сяргей Мікалаевіч (1874 – 1958)

**Вышалескі Сяргей Мікалаевіч** нарадзіўся 1.11.1874 у г.п. Обаль Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці.

Беларускі эпізаатолаг. Акадэмік АН Беларусі (1928), прафесар (1924), ганаровы член УАС-ГНІЛ (1956). Заслужаны дзеяч навукі Расіі (1940). Скончыў Варшаўскі ветэрынарны інстытут (1899). Да 1906 працаваў земскім ветурачом у Віцебскай губерніі. і Закаўказзі. У 1906—1927 у ветэрынарных навукова-даследчых установах і ВНУ Расіі. У 1928—1930 у Віцебскім ветэрынарным інстытуце, з 1931 у ветэрынарных інстытутах Казахстана і Масквы. Навуковыя працы па тэарэтычных і практычных пытаннях барацьбы з інфекцыйнымі хваробамі жывёл, у т.л. з чумой, сібірскай язвай, рожай, туберкулёзам, бруцэлёзам, запаленнем лёгкіх буйной рагатай жывёлы, паратыфам цялят і інш. Выявіў узбуджальніка інфекцыйнага энцэфаламіэліту коней. Работы Вышалескага па вывучэнні сапу коней сталі асновай для арганізацыі ў СССР мерапрыемстваў па ліквідацыі гэтай інфекцыі. Дзяржаўная прэмія СССР 1941. Устаноўлены Залаты медаль імя Вышалескага, стыпендыя яго імя для студэнтаў Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. Імя Вышалескага присвоена Беларускаму НДІ эксперыментальнай ветэрынарыі.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (2004).

**Літаратура:**

Вышалескі Сяргей Мікалаевіч // Беларуская энцыклапедыя: у18 т. Т. 4. – Мінск, 1997. – С. 329.

(імёны)

# Галубок Уладзіслаў Іосіфавіч
# (1882 – 1937)

**Галубок (сапр. Голуб) Уладзіслаў Іосіфавіч** нарадзіўся 3(15).5.1882, ст. Лясная Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці.

Беларускі пісьменнік, рэжысёр, акцёр, тэатральны дзеяч, мастак. Буйны дзеяч нацынальнай сцэны, першы народны артыст Беларусі (1928).

Вучыўся ў Мінскім гарадскім вучылішчы. Працаваў грузчыкам на чыгунцы, прыказчыкам у магазіне, слесарам у Мінскім дэпо і інш. У 1906 пачаў дзейнасць як паэт і празаік. Друкаваўся ў газеце «Наша ніва», часопісе «Лучынка», альманаху «Маладая Беларусь» і інш., выдаў зборнік «Апавяданні» (Пецярбург, 1913).

У вершах («Доля мужыка», «Забытая хатка», «Сярмяжнік», «Будучыня» і інш.) і апавяданнях («Голад», «Памылка вучонага», «Навальніца», «Мінуўшчына» і інш.) адлюстраваў цяжкае жыццё сялян, сацыяльную няроўнасць паміж людзьмі. Пісаў таксама гумарэскі, сатырычныя апавяданні («Гонар», «Вясковы астраном», «Як Сымон у воласці выкруціўся», «Адвага» і інш.). З 1917 выступаў як драматург. Напісаў каля 40 драм і камедый на гістарычныя, гісторыка-рэвалюцыйныя і бытавыя тэмы з народнага жыцця. У іх апавядалася пра лёс працоўнага народа ў дарэвалюцыйным мінулым, раскрываліся непрымірымыя канфлікты паміж беднымі і багатымі, выкрываліся рэлігійныя забабоны, амаральныя ўчынкі. П'есы вызначаліся сцэнічнасцю, вастрынёй канфлікту, дакладнасцю аўтарскай пазіцыі. Камедыі насычаны сакавітым народным гумарам, для іх характэрны вострыя сітуацыі з сатырычнай абмалёўкай, бытавым тэмам нададзена сацыяльнае гучанне, многія з іх напісаны ў жанры меладрамы. Усе п'есы Галубка ставіліся ў беларускіх прафесійных і самадзейных тэатрах. Значнае месца яны занялі ў Першым таварыстве беларускай драмы і камедыі, дзе Галубок у 1917—1920 выступаў як акцёр і рэжысер: «Апошняе спатканне» і «Пісаравы імяніны» (1917), «Бязвінная кроў» (1918), «Бязродны» і «Праменьчык шчасця» (1919). У Беларускім дзяржаўным тэатры (цяпер Нацыянальны тэатр імя Я. Купалы) пастаўлены «Залёты дзяка» («Пісаравы імяніны»), «Ганка», «Апошняе спатканне» і «Бязродны» (усе 1921). Найбольш поўна і ўсебакова ўвасоблена драматургія Гаруна ў Беларускім трэцім дзяржаўным тэатры, які ён стварыў у 1920 і дзе ярка раскрыўся яго шматгранны талент арганізатара, настаўніка, рэжысёра, акцёра, мастака. Тут пастаўлены яго п'есы «За мураванаю сцяною» (1920), «Душагубы» («Чорная душа»), «Акрываўлены падатак» («Белы вянок»), «На курорце» і «Залаты бог» (1921), «Ветрагоны» («Дваяжэнцы»), «Фанатык», «Ганка» (прайшла 448 разоў) і «Шчасце мужыцкае» (1922). «Князь Качэргін», «Пан Сурынта», («Блуд»). «Дзіця вуліцы», «Залатая рыбка» і «Плытагоны» (1923), «Беларускія зажынкі» (1925), «Пінская мадонна» і «Краб» (1927), «Васіль Хмель» (1928), «Рыкашэт» (1935) і інш. Галубок наследаваў традыцыі беларускага народнага тэатра, творча развіваў вопыт Першай беларускай трупы Ігната Буйніцкага, мастацкія дасягненні *Ф.* Ждановіча ў Першым беларускім таварыстве драмы і камедыі. Як рэжысёр падкрэсліваў драматычныя ці камедыйныя калізіі, меў схільнасць да яркіх сцэнічных эфектаў, акцёрскай імправізацыі, шырока выкарыстоўваў песенна-музычную і харэаграфічную народную творчасць.

Галубок — яркі акцёр, выканаўца характарных, драматычных, камедыйных роляў. Яго сцэнічныя вобразы вызначаліся сацыяльна-бытавой і псіхалагічнай дакладнасцю, завостранасцю і ўзбуйненасцю агульнага малюнка. З роляў: Дзяк («Пісаравы імяніны»), Палкоўнік («Ганка»), Сурынта («Пан Сурынта»), Ксёндз («Пінская мадонна»), Стражнік («Бязродны»), Вар'ят («Васіль Хмель»), Міхалка (аднайм. п'еса Далецкіх), Гусак («Дыктатура» І. Мікітэнкі), Андрон («Мой сябра» М. Пагодзіна), Каравулаў («Чужое дзіця» В. Шкваркіна). Выхаваў многіх беларускіх акцёраў: А. Бараноўскага, С. Бірылу, Б. Бусла, К. Быліча, У. Дзядзюшку, А. Згіроўскага, Г. Качынскую, З. Лідскую, К. Мартыненка, Т. Шашалевіч і інш. Праводзіў вялікую культурна-асветніцкую работу сярод насельніцтва. Выступаў у друку з публіцыстычнымі і тэатразнаўчымі артыкуламі. Вядомы як мастак-

дэкаратар (афармляў пастаноўкі ўсіх сваіх п'ес) і як пейзажыст (карціны «Раніцай», «Туманы», «На рацэ Бярозе», «Сож»; удзельнічаў у шэрагу рэспубліканскіх выставак).

У канцы 1920-х г. на Галубка пачаліся ганенні і абвінавачанні ў нацыяналізме. У 1931 яго адхілілі ад мастацкана кіраўніцтва тэатрам, працаваў дырэктарам і акцёрам. У 1937 рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1957.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (2007).

**Літаратура:**


Галубок (сапр. Голуб)Уладзіслаў Іосіфавіч // Беларуская энцыклапедыя: у18 т. Т. 4. – Мінск, 1997. – С. 472.

Галубок (сапр. Голуб)Уладзіслаў Іосіфавіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусь: у 5 т. Т. 2. – Мінск, 1985. – С. 20.

Карабанава, Л.В. Драматургія Уладзіслава Галубка / Л.В. Карабанава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982. – 128с.

Адхінуўшы заслону часу... : успаміны пра Уладзіслава Галубка / [Склад.Г.Марчук]. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1979. – 127с.

Сабалеўскі, А. Тэатр Уладзіслава Галубка / Анатоль Сабалеўскі // Роднае слова. – 2007. –№ 5. – С. 76-80.

Вабішчэвіч, В. Беларускі "Шэкспір" Уладзіслаў Галубок (1882-1937) / Віктар Вабішчэвіч // Настаўніцкая газета. – 2007. – 24 мая. – С. 4.

Ціхановіч, В. Уладзіслаў Галубок – мастак / В. Ціхановіч // Роднае слова. – 2002. – №5. – С.76-80.

Завадская, І. Яму не было замены... / І. Завадская // Роднае слова. – 2002. – №5. – С.72-76.


(імёны)

## Гарун Алесь
## (1887 – 1920)

**Гарун Алесь** (сапр. Прушынскі Аляксандр Уладзіміравіч) нарадзіўся 11.3.1887 у б. фальварак Новы Двор Мінскага раёна.

Беларускі пісьменнік, дзеяч нацыянальна-вызваленчага руху. Скончыў мінскія гарадское (1897) і рамеснае (1902) вучылішчы. Працаваў у Мінску сталяром. З 1904 член партыі эсэраў-максімалістаў. За антыўрадавую дзейнасць у 1907 арыштаваны і ў 1908 сасланы ў Кірэнскі павет Іркуцкай губерніі. З 1912 з Я.Лёсікам у Мельнічным выселку каля Кірэнска. Пасля працаваў на Лене і Віціме, на залатых капальнях у Бадайбо. У Мінск вярнуўся ў верасні 1917 хворы на сухоты. Удзельнічаў у дзейнасці беларускіх арганізацый. Віцэ-старшыня Усебеларускага з'езда 1917, удзельнічаў у стварэнні БНР, рэдагаваў газету «Беларускі шлях», у 1919—1920 узначальваў Беларускі нацыянальны камітэт, быў членам Беларускай вайсковай камісіі. У 1920 хвароба абвастрылася. Па дарозе на курорт Закапанэ памёр у Кракаве.

Раннія творы не зберагліся. 1905 датуецца паэма «Мае коляды» (Вільня, 1920, пад псеўд. А.Сумны) — гісторыя абуджэння нацыянальнай свядомасці ў вясковага хлопчыка. З 1907 друкаваўся ў газеце «Наша ніва». Пісаў пераважна лірычныя вершы, якія вызначаюцца меладычнасцю, багаццем рытміка-інтанацыйнага ладу, спалучэннем філасофскай заглыбленасці з публіцыстычнасцю і тонкім лірызмам, творчым засваеннем фальклорных традыцый. Паводле матываў і тэматыкі яго паэзія блізкая да паэзіі Я.Купалы і Я.Коласа. У ёй выказана такое ж неадольнае жаданне лепшай долі для народа, непрымірымасць да несправядлівасці, гатоўнасць ахвяраваць сабой дзеля шчасця людзей і Бацькаўшчыны. Аўтар зб. паэзіі «Матчын дар» (1918, 2-е выд. 1929, факсімільнае выд. 1988). Адметнасць прозы Гаруна — яе ідэйна-тэматычнае багацце. Пісаў пра нацыянальнае бяспраўе беларуса («Пан Шабуневіч»), пра тое, як астрог калечыць лёс чалавека, разбурае яго псіхалогію («Чалавек без крыві», «Маладое»). Сцэны з жыцця беларускага пасяленца ў Сібіры паказаў у апавяданні «Свята». Празаічны трыпціх «П'ера і Каламбіна» аб'ядноўвае тэма кахання, мастацкі роздум аб загадкавай сіле гэтага пачуцця Празаічныя творы падпісваў псеўд. І

Жывіца. У зб. «Жывыя казкі» (1920) увайшлі п'есы для дзіцячага тэатра, прасякнутыя жыццесцвярджальным аптымізмам, непрымірымасцю да фальшу і несправядлівасці.

Яго імем названа **вуліца** ў Мінску.

**Літаратура:**


Гарун Алесь Уладзіміравіч // Беларуская энцыклапедыя: у18 т. Т. 5. – Мінск, 1997. – С. 72.

Лойка, А Псеўданімы - не мімы... // Займальная літаратура / А. Лойка. – Мінск, 2009. – С. 49-57.

Мяснікоў, А.Ф Алесь Гарун (1887-1920): Так хацеў пастаяць за сябе і Айчыну! // Сто асоб беларускай гісторыі : гістарычныя партрэты / А.Ф Мяснікоў. – Мінск, 2008. – С. 191-193.

Ляшук В.Я.Алесь Гарун (1887-1920)] // Літаратурная Берасцейшчына / Ляшук В.Я., Снітко, Г.М. – Мінск, 2008. – С. 184-186.

Рагойша, У. Алесь Гарун у кантэксце ўкраінскай літаратурнай класікі / Усевалад Рагойша // Роднае слова. – 2007. – № 3. – С. 8-11.

Рагуля, А. З чыстым сэрцам, з няласкавай доляй: сацыяльная і эстэтычная праблематыка твораў Алеся Гаруна. IX клас / Аляксей Рагуля // Роднае слова. – 2007. – № 3. – С. 29-32.

Казбярук, Уладзімір Міхайлавіч. Светлай волі зычны звон : Алесь Гарун / У.М.Казбярук. – Мн. : Навука і тэхніка, 1991. – 61с.:іл – ( Нашы славутыя землякі).


(імёны)

## Гарэцкі Максім Іванавіч
## (1893 - 1938)

**Гарэцкі Максім Іванавіч** нарадзіўся 18.02.1893, в. Багацькаўка Мсціслаўскага р-на Магілёўскай вобл.

Беларускі пісьменнік, літаратуразнавец, публіцыст, фалькларыст, грамадскі дзеяч. Адзін з пачынальнікаў нацыянальнай мастацкай прозы. Зрабіў вялікі ўклад у развіццё беларускай культуры, у фарміраванне нацыянальнай свядомасці.

Скончыў Горацкае каморніцка–агранамічнае ў 1913 годзе, Паўлаўскае ваеннае вучылішчы.

У 1913–14 працаваў на Віленшчыне, у 1914–17 на фронце, быў цяжка паранены. З канца 1917 у Смаленску, супрацоўнічаў у “Известиях Смоленского Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов”, у газеце “Звезда” у 1918 годзе, з рэдакцыяй якой пераехаў у Мінск, на пачатку 1919 – у Вільню.

У выніку захопу горада польскімі войскамі апынуўся на акупіраванай тэрыторыі. Выкладаў на беларускіх настаўніцкіх курсах і ў Віленскай беларускай гімназіі. Рэдактар газеты “Наша думка”, з верасня 1921 выдавец і рэдактар газеты “Беларускія ведамасці”. У студзені 1922 арыштаваны і зняволены ў Лукішскую турму. У кастрычніку 1923 пераехаў у Мінск. Выкладаў беларусазнаўства на рабфаку БДУ, беларускую мову і літаратуру ў Камуністычным універсітэце Беларусі. Працаваў у Інбелкульце, у Горацкай сельска–гаспадарчай акадэміі, у АН Беларусі. 4.11.1937 быў арыштаваны, 5.01.1938 прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны ў 1957.

Літаратурную дзейнасць пачаў з газетных нататак і карэспандэнцый. Першае апавяданне “У лазні” апублікавана ў 1913. Дамінуючая тэма яго творчасці – лёс беларускага сялянства, працоўнай вёскі на гістарычным зломе эпох, народ і інтэлігенцыя, пошукі ёю шляхоў сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення. Зборнікам апавяданняў “Рунь”(1914), драматызаванай аповесцю “Антон”(1914) і іншымі творамі пашырыў тэматычныя і жанрава–стылёвыя межы беларускай прозы, увёў новага героя – вясковага інтэлігента (“Роднае карэнне” і інш.) і форму лірыка–экспрэсіўнага спасціжэння рэчаснасці (“Патаёмнае”, “Страхаццё”). Да гэтага перыяду адносіцца паспяховая спроба мастацкага асваення гістарычнай тэмы і жанру філасофіі, інтэлектуальнай прозы (цыкл апавяданняў “За што?”). Гарэцкі прайшоў шлях ідэйна–творчага і светапогляднага развіцця. Апавяданні ваеннай тэматыкі (“Літоўскі хутарок”, ”Генерал”, “Рускі”) прасякнуты антымілітарысцкім пафасам, пратэстам супраць разбурэння маральных асноў быцця.

У творчасці 1930–х г. адзначаецца далейшае паглыбленне эпічных асноў, больш грунтоўная распрацоўка тэм інтэлігенцыя і народ, будучыня Беларусі. Своеасаблівыя этапы духоўнай біяграфіі вясковай моладзі адлюстраваны у аповесцях “У чым яго крыўда?” (1926), “Меланхолія” (1920), дакументальна–мастацкі дзённік “На імперыялістычнай вайне” (1926).

Творы Гарэцкага засведчылі новы падыход у адлюстраванні падзей вайны і зараджэнне традыцыі “акопнай праўды” як літаратурна–эстэтычнай з’явы. Панарама жыцця беларускага народа ад часоў прыгоннага права да 1930–х г.г. створана ў аповесці “Камароўская хроніка”.

Гарэцкі – аўтар “Гісторыі беларускай літаратуры”, “Практычнага расійка–беларускага слоўніка”. Пераклаў на беларускую мову раман А. Фадзеева “Разгром”, аповесці Ю. Лібядзінскага “Тыдзень”, ”Камісары”. Рукапісная спадчына Гарэцкага захоўваецца у аддзеле рэдкай кнігі і рукапісаў Цэнтральнай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай АН Беларусі. Творы пісьменніка перакладзены на рускаю, украінскую, балгарскую, латвійскую, літоўскую, нямецкую, польскую мовы. На радзіме пісьменніка створаны музей, пастаўлены помнік ў Мінску, Вязьме, імем Гарэцкага названы вуліцы ў Мсціславе, Горках. У 1997 створаны Міжнародны фонд братоў Гарэцкіх.

**Вуліца** ў Фрунзенскім раёне Мінска атрымала імя М.І. Гарэцкага ў 1992. Яе працягласць 3140 м. – ад вуліцы Алібегава да перакрыжавання вуліц Мазурава і Лабанка. На вуліцы размешчаны жылая шматпавярховая забудова, сярэдняя школа № 217.

**Літаратура:**


Гарэцкі Максім Іванавіч // Беларуская энцыклапедыя: у18т. – Т. 5. – Мн., 1997. – С. 81.

Лявонава, Е.А. "І няма нічога вышэйшага..." // Лявонава Е.А. Агульнае і адметнае. – Мн., 2003. – С. 65-72.

Чыгрын, Іван Пятровіч. Паміж былым і будучым: Проза Максіма Гарэцкага / І.П. Чыгрын. – Мн.: Бел.навука, 2003.

Амплітуда Адраджэння // Янушкевіч Я. За архіўным парогам: бел. літ. XIX - XX ст.ст. у святле арх. пошукаў. – Мн., 2002. – С. 275-279.

Наш Дарагі Прыхільнік: Максім Гарэцкі і аўтакефальная царква / Янушкевіч Я. За архіўным парогам : бел. літ. XIX - XX ст.ст. у святле арх. пошукаў. – Мн., 2002. – С. 143–153.

Праблема “Дзвюх душ” у творчасці М. Гарэцкага // Максімовіч В.А. Шыпшынавы край. – Мн., 2002. – С. 100-118.

Мархель, У. “Гісторыя...” Максіма Гарэцкага і “Тыпова нашыя камбінацыі” // Роднае слова. – 2007. – № 2. – С. 16-18.

Андрэйкавец, Н.Д. Творчасць Максіма Гарэцкага часу імперыялістычнай вайны // Беларуская мова і літаратура. – 2006. – № 11. – С. 24-29.

Лявонава, Е.А. Беларуская літаратура XX стагоддзя і замежны мастацкі вопыт // Беларуская мова і літаратура. – 2006. – № 10. – С. 14-27.

Гарэцкі, Р. Сяброўства творцаў // Роднае слова. – 2006. – № 9. – С. 100-104.

Метадычныя матэрыялы па курсе беларускай літаратуры ў XII класе (паглыблены ўзровень) // Беларуская мова і літаратура. – 2006. – № 5. – С. 42-53.

Мачульская, С. Прымач у “панстве” і пасынак вёскі // Роднае слова. – 2005. – № 9. – С. 10-12.

Мачульская, С. Сугучнасць і дысананс // ЛіМ. – 2005. –13 мая. – С. 6.

Новік, М. Слова і вобраз у “Скарбах жыцця” Максіма Гарэцкага // Роднае слова. – 2005. – № 4. – С. 12-14.

Гарэцкі, Р. Браты Гарэцкія і Уладзімір Дубоўка // Роднае слова. – 2005. – № 2. – С.86-90.

Мачульская, С. “Роднае карэнне наша...” // Полымя. – 2004. – № 11. – С. 199-204.

Кіявіцкая, Т. Апавяданні Максіма Гарэцкага ў X класе // Роднае слова. – 2004. – № 3. – С. 48-49.

Караткоў, М. Беларус у апавяданні “Роднае карэнне” Максіма Гарэцкага // Роднае слова. – 2004. – № 2. – С. 20-23.

Падстаўленка, В.”Не забі ў сабе добрае карэнне!” // Роднае слова. – 2003. – № 12. – С. 15-17.

Дасаева, Т. “Нялёгкім аказаўся мой лёс” // Роднае слова. – 2003. – № 11. – С. 88-91.

Васючэнка, П. Зачараванасць “Патаёным” // Роднае слова. – 2003. – № 2. – С. 12-15.

Гоўзіч, І. Максім Гарэцкі і Янка Сіпакоў : да праблемы стылёвага падабенства // Роднае слова. – 2003. – № 2. – С. 16-19.

Ліўшыц, Ул. У Малую Багацькаўку, да Максіма Гарэцкага // Роднае слова. – 2003. – № 2. – С. 73-76.

Нячай, В. Роднае карэнне Максіма Гарэцкага // Роднае слова. – 2003. – № 2. – С. 89-92.

Сільнова, Л. “Эх, пайсці і сілу сваю на ўвесь свет паказаць...” // Роднае слова. – 2003. – № 2. – С. 102-103.

Губская, В. Беларуская гісторыя ў аповесці Максіма Гарэцкага “Ціхая плынь” // Роднае слова. – 2003. – № 2. – С. 82-84.

Андрэйкавец, Н. Старая Беларусь у творчасці Янкі Купалы і Максіма Гарэцкага // Янка Купала і праблемы беларускага самапазнання. – Мн., 2002. – С. 135-138.

Вайніцкі, П. Апошняя праца Мікалая Рыжанкова // Роднае слова. – 2002. – № 12. – С. 80-82.

Голуб, Т. Лабірынтамі творчай задумы // Роднае слова. – 2002. – № 12. – С. 29-34.

Тарасава, Т. Драматычныя абразкі “Чырвоныя ружы” Максіма Гарэцкага. Жанрава-стылёвыя асаблівасці // Роднае слова. – 2002. – № 10. – С. 15-17.

Захараў, В. Выкарыстанне элементаў шматаспектнага аналізу на ўроках літаратуры // Роднае слова. – 2002. – № 10. – С. 38-40.

Ляшук, В. Маральнае выхаванне шасцікласнікаў пры вывучэнні раздзела “Горкая прамудрасць” з аповесці М. Гарэцкага “Ціхая плынь” // Роднае слова. – 2000. – № 10. – С. 49-53.

Цімашкова, К. Псіхалагічнае даследаванне паводле аповесці Максіма Гарэцкага “Ціхая плынь” // Роднае слова. – 2000. – № 10. – С. 54-57.

Мушынскі, М. Максім Гарэцкі. Перыяды творчасці // Полымя. – 2000. – № 10. – С. 172-189.

Лявонава, Е. “Я жыў, але ранейшага мяне навекі няма...”// Роднае слова. – 1999. – № 3. – С. 24-30.

Максим Горецкий: жизнь и творчество // Неман. – 1998. – № 11/12. – С. 233-265.

Эпоха трибуналов // Неман. – 1998. – № 6. – С. 198-209.

Кенька, М. Дакументалізм прозы Максіма Гарэцкага // Роднае слова. – 1998. – № 6. – С. 67-70.

Кныш, Л. Моўныя сродкі ў творах Максіма Гарэцкага // Роднае слова. – 1998. – № 6. – С. 72-81.

Мушынскі, М. Максім Гарэцкі: перыяды творчасці // Полымя. – 1998. – № 5. – С. 219-237.

Пятровіч, А. Біблейскія вобразы ў апавяданні Максіма Гарэцкага”Рускі” // Роднае слова. – 1997. – № 11. – С. 44-56.

Рагойша, В. Каб жыць у эпохах // Роднае слова. – 1997. – № 6. – С. 42-49.

Конан, У. У містычных сферах быцця // Полымя.– 1997. – № 3. – С. 261-271.

Чыгрын, Іван Пятровіч. Паміж былым і будучым: проза Максіма Гарэцкага / І.П. Чыгрын. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994.

Дасаева, Т.М. Летапіс жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага /АН Беларусі. Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993.

(імёны)

## Глебка Пётр Фёдаравіч
## (1905 – 1969)

**Глебка Пётр Фёдаравіч** нарадзіўся 06.07.1905 у в. Вялікая Уса Уздзенскага р-на Мінскай вобл.

Беларускі паэт. Акадэмік АН БССР. Скончыў БДУ. Працаваў сакратаром рэдакцыі часопіса “Узвышша”, у газеце “Калгаснік Беларусі”, часопісе “Полымя рэвалюцыі”. З 1945 у Акадэміі навук Беларусі: у Інстытуце літаратуры, мовы і мастацтва, у 1952–1956 загадчык сектара лексікаграфіі, у 1956–1957 дырэктар Інстытута мовазнаўства, у 1957–1969 дырэктар Інстытута мастацвазнаўства, этнаграфіі і фальклору.

Друкаваўся з 1924 года. Першы зборнік лірыкі “Шыпшына” (1927) выявіў прыхільнасць да рамантычнай паэзіі, літаратуры і фальклорных традыцый. Кнігі “Урачыстыя дні” (1930), “Хада падзей” (1932), “Чатыры вятры” (1935) вызначаюцца жанравай разнастайнасцю, узмацненнем грамадзянскіх матываў. Асобныя вершы 1930–х гадоў рытарычныя, дэкларацыйныя.

Тэма рэвалюцыі і Грамадзянскай вайны ў паэмах “Трывожны сігнал” (1929), “Арлянка” (1931), “Мужнасць” (1934), “У тыя дні “ (1937), драматычнай паэме “Над Бярозай ракой” (1940).

Вершы часоў Айчыннай вайны прасякнуты філасофскім роздумам, напоўнены пачуццём любові да Радзімы, лірызмам. Галоўныя тэмы пасляваеннай творчасці – аднаўленне, памяць вайны, барацьба за мір. Аўтар лібрэта оперы “Андрэй Касценя”, вершаванай п’есы “Святло з усходу” (пастаноўка ў 1957).

Вёў даследчую работу ў галіне беларускай лексікаграфіі, мастацвазнаўста і фалькларыстыкі. Пераклаў на беларускую мову асобныя творы А. Пушкіна (“Барыс Гадуноў”, вершы) М. Лермантава, М. Горкага (паэма “Дзяўчына і смерць”, апавяданні), У. Маякоўскага, Т. Шаўчэнкі і інш.

**Вуліца** атрымала імя П.Ф. Глебкі ў 1970 годзе. Працяглась вуліцы 2520 метраў – ад вуліцы Прытыцкага да вуліцы Лынькова. На ёй размешчаны СШ № 132, 140, сярэдняя агульнаадукацыйная школа мастацтв № 150, магазін ОАО “Азарэнне”, гасцініца “Урсула”, ЗАО Унівірсам “Масюкоўшчына”.

**Літаратура:**


Глебка Пятро // Беларуская энцыклапедыя: у 18т. – Т.5. – Мн., 1997. – С. 576.

Акадэмік [П. Глебка] // Барадулин, Р. Аратай, які паставіў аблокі: Сяброўскае слова, эсэ і некананізаваныя ўспаміпы. – Мн.,1995. – С. 165–167.

“...І сябе асудзіў на пакуты” // Максімовіч В.А. Шыпшынавы край. – Мн., 2002. – С. 32-45.

Мальдзіс, А. Калектыўны партрэт песняра: П. Глебка // Мальдзіс А.І ажываюць спадчыны старонкі.– Мн.,1994.– С. 458–462.

Хелемский, Я. Дар естественности: [П. Глебка] // Хелемский, Я. Чистота звучания .– Мн.,1988.–С.63–84.

Гніламедаў, У. Нашчадкам у спадчыну: Пятро Глебка // Гніламедаў,У. Класікі і сучаснікі .– Мн, 1987. – С. 77–84.

Лужанін, М. Маладая руплівасць: [пра П.Глебку] // Іменем чалавечнасці. – Мн., 1986. – С. 82–84.

Шамякін, І. Так жылі паэты: [П. Глебка] // Шамякін, І Карэнні і галіны. – Мн., 1986. – С. 99–121.

Лынькоў, М. Памяці таварыша і друга [П.Глебкі] // Лынькоў, М. Літаратура і жыццё. – М., 1982.

Такім яго помню[ П. Глебка]//Панчанка, П. На паэтычным небасхіле.– Мн.,1977.– С. 132–135., С. 136–141.

Лужанін, М. Маладая руплівасць // Пра таварышаў па пяру. – Мн., 1976. – С. 94–97.

Яскевіч, А.Імкненне да ідэалу // Полымя. – 2006. – № 2. – С. 181-184.

Поэт-академик Петро Глебка // Нёман. – 2005. – № 11. – С. 173-176.

Мураўёва, Т. “Хто верыць у сучаснае з душой...” // Роднае слова. – 2005. – № 7. – С. 6-12.

Несцяровіч, В.Б. Голас мужнасці і пяшчоты // Пачатковая школа. – 2005. – № 7. – С. 27.

Лісты Юркі Віцьбіча да Пятра Глебкі // Полымя. – 1998. – № 1. - С. 174-217.


(імёны)

## Гурскі Ілья Данілавіч
## (26.04.1899 – 11.08.1972)

**Гурскі Ілья Данілавіч** нарадзіўся ў в. Замосце Ўздзенскага р-на Мінскай вобл.

Беларускі пісьменнік. Заслужаны дзеяч культуры БССР. Скончыў БДУ (1932). З 1924 года ў Галоўліце БССР, Галоўрэперткоме, у Галоўмастацтве БССР. У 1935-1941 рэдактар газеты "Літаратура і мастацтва", у Вялікую Айчынную вайну – газеты "За свабодную Беларусь" і сатырычнага лістка "Партызанская дубінка", у 1944-1960 – часопіса "Беларусь".

Друкаваўся з 1926 г. Аўтар п'ес "Дрыгва" (1928), "Качагары (1930), "Хлеб" (1948), "Свае людзі" (1950) і інш. У артыкулах 1930-х аддаў даніну вульгарнаму сацыялагізму. Асноўныя тэмы пасляваеннай творчасці: барацьба з нямецка-фашысцкімі захопнікамі (апавяданні, аповесць "Лясныя салдаты", 1945; раман "У агні", 1952; новая рэдакцыя 1959), Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Петраградзе і на Заходнім фронце, у Беларусі (раман-хроніка "Вецер веку", 1966). Аўтар рамана-памфлета "Чужы хлеб" (1969). На беларускую мову перакладаў творы М. Горкага, А. Чэхава, М. Твэна і інш.

**Вуліца** атрымала імя Л.Д. Гурскага ў 1973 годзе. Працяглась вуліцы 1005 метраў – ад вуліцы Панамарэнка да вуліцы Глаголева. На ёй размешчаны жылая малапавярховая забудова, УП "Мінскаблгаз", прамысловая зона.

**Літаратура:**

Гурскі Ілья Данілавіч // Беларуская энцыкдапедыя: у 18 т. Т. 5: Гальцы – Дагон / рэдкал.: Г. Пашкоў [і інш.] – Мн.: БелЭн, 1997. – С. 537-538.

Гурскі, Л. Успаміны пра бацьку // Беларуская думка. – 1999. – № 4. – С. 158–162.

(імёны)

## Гусоўскі Мікола
## (1470 – пасля 1533)

**Гусоўскі Мікола** нарадзіўся, найбольш верагодна, у в. Уса (Усава) цэнтральнай Беларусі, у сям'і лоўчага (паляўнічага).

Паэт-гуманіст, прадстаўнік новалацінскай паэзіі эпохі Адраджэння ў ВКЛ. Добра ведаў прыроду, жыццё простага чалавека, звычкі жыхароў беларускіх пушчаў. У сталыя гады жыў пераважна ў Польшчы, служыў пры двары свайго мецэната, полацкага біскупа Эразма Вітэлія (Цёлка), які ў 1492-1499 працаваў сакратаром вялікакняжацкай канцылярыі ў Вільні. Як сведчыць нядаўна выяўлены ў Варшаве тастамент С. Гальшанскай, складзены ў 1518 г. у Воўпе пад Ваўкавыскам і засведчаны Гусоўскім, ён у той час меў духоўны сан (называў сябе клерыкам Перамышленскай епархіі) і часам выконваў абавязкі публічнага натарыуса. У 1520-1522 у складзе пасольства ВКЛ і Каралеўства Польскага да папы Льва X пабываў ў Рыме. Там напісаў на лацінскай мове паэму «Carmen de statura, feritate ac venatione bisontis" ("Песня пра выгляд, лютасць зубра і паляванне на яго") і шэраг вершаў (выд. ў зб. "Песня пра зубра", Кракаў, 1523). Вярнуўшыся ў Польшчу, напісаў і апублікаваў у Кракаве паэмы "Новая і слаўная перамога над туркамі"(1524) і "Жыццё і подзвігі св. Гіяцынта"(1525). Апошнія гады жыцця паэта прайшлі ў нястачах, хваробах, пошуках мецэнатаў і сталага заробку. Неапублікаваныя творы не захаваліся.

Гусоўскі – заснавальнік лацінамоўнай рэнесансавай паэзіі Беларусі і Літвы. Быў таленавітай высокааадукаванаю асобаю, выхаванай на лепшых нацыянальных і агульнахрысціянскіх культурных традыцыях, шчырым патрыётам сваёй Радзімы. Дасведчанасць у антычнай і еўрапейскай сярэдневяковай літаратуры, выдатнае валоданне латынню сведчаць , што паэт набыў веды ў адным з тагачасных універсітэтаў. Пад уплывам Эразма Вітэлія, які вызначаўся шырокімі культурнымі інтарэсамі і гуманістычнымі поглядамі, агульнай атмасферай рэнесансавай Еўропы паэт канчаткова сфарміраваўся як творчая асоба. Першыя літаратурныя спробы з'явіліся, верагодней за ўсё, яшчэ ў дарымскі перыяд творчасці.

У літаратурнай спадчыне Гусоўскага самы значны і яркі твор – "Песня пра зубра", першая рэалістычная ліра-эпічная паэма пра нашу краіну. Адрасаваная найперш еўрапейскаму лацінамоўнаму чытачу, яна стала ўзнёслай патрыятычнай песняй пра сваю Бацькаўшчыну і пра свой народ. Гэты адносна невялікі твор (1074 радкі гекзаметра),

заснаваны на асабістых назіраннях , уражаннях і перажываннях аўтара, вылучаецца арыгінальнасцю і самабытнасцю, першароднай свежасцю вобразаў і малюнкаў, цеснай сувяззю з тагачаснай беларускай рэчаіснасцю. З вялікай мастацкай сілаю, пачуццём гонару і шчымлівай любоў'ю апісаў паэт спрадвечнае хараство і багацце прыроды роднага краю (называе яго Літвою), праўдзіва падаў ратныя і працоўныя справы свайго народа, яго заняткі, норавы і звычаі, уславіў яго гераічную спадчыну. Амаль палову твора займае апісанне знешняга выгляду, звычак, жыцця зубра. Сцэны палявання, поўныя напружанасці і драматызму, выпісаны з вялікім майстэрствам, эмацыянальна і маляўніча, так рэалістычна і дакладна, што могуць служыць своеасаблівым вершаваным падручнікам для паляўнічых. Паэт захапляецца сілай і высакародствам зубра, з асаблівай цеплынёй і спачуваннем расказвае пра паводзіны цяжка параненага звера. Вобраз зубра для Гусоўскага – сімвал Бацькаўшчыны. З горыччу піша ён пра цяжкае становішча свайго народа з прычыны бесперапыннасці войнаў і сацыяльнага прыгнёту, асуджае эгаістычную, антынародную палітыку ўладароў, няздольных арганізаваць абарону краіны ад знешніх ворагаў, заклікае хрысціянскія народы Еўропы да аб'яднання перад турэцкаю пагрозаю. У эпічных традыцыях Гусоўскі стварыў велічны вобраз вялікага князя Вітаўта як магутнага і справядлівага валадара, таленавітага палкаводца і мужнага воіна, справядлівага патрыёта сваёй дзяржавы, які клапаціўся пра чысціню нораваў людзей, высокі маральны дух і бяздольнасць воінаў, які ўсе сілы аддаваў умацаванню магутнасці , незалежнасці і высокага міжнароднага аўтарытэту сваёй краіны. У паэме выявіўся рэнесансавы эстэтычны ідэал чалавека з яго верай у дзейнага, гарманічнага развітога, духоўна і фізічна дасканалага, гістарычна і нацыянальна свядомага чалавека. Гэтыя ідэі Гусоўскага аб патрыятычным служэнні свайму народу і Бацькаўшчыне, аб дасканалым чалавеку і грамадстве, яго клопат аб развіцці культуры ў краіне пераклікаюцца з ідэямі Ф. Скарыны і паслужылі ідэалагічнай асновай першага беларускага Адраджэння. У празаічнай прадмове, звернутай да каралевы Боны, паэт асабліва падкрэслівае непасрэдную сувязь магутнасці дзяржавы са станам навукі, літаратуры і мастацтваў, з духоўным абліччам яе грамадзян. "Песня пра зубра" – каштоўная крыніца для вывучэння біяграфіі аўтара, яго поглядаў і творчых прынцыпаў, для пазнання эпохі, у якой ён жыў, этнаграфіі, асаблівасцей духоўнага жыцця і побыту нашых продкаў, прыроды і гісторыі Беларусі позняга сярэднявечча і ранняга Адраджэння. Ідэі хрысціянскага гуманізма гучаць і ў іншых вершаваных творах Гусоўскага, прысвечаных розным актуальным тэмам, праблемам і падзеям свайго часу. Паэта глыбока хвалявалі сацыяльная няроўнасць і неспакой у грамадстве, падзенне нораваў і паслабленне веры ў Бога, а таксама небяспека хрысціянскай царкве, што зыходзіла ад рэфармацыі, якая пачалася ў Еўропе. У гэтым ключы напісана паэма "Жыццё і подзвігі св. Гіяцынта". У творы ў сярэдневяковых агіяграфічных традыцыях выведезены вобраз польскага місіянера 13 ст., які вандраваў па землях Польшчы, Літвы і Русі, паказваючы ўласным прыкладам жыцця, паводзін і учынкаў узор самаахвярнага служэння царкве і людзям у духу хрысціянскіх ідэалаў. Асобныя творы М. Гусоўскага перакладзены на польскую (Я. Каспяровіч), літоўскую (Б. Казаўскас), рускую (Я. Парэцкі) і інш. На беларускую мову яго творы перакладалі Я. Семяжон, У. Шатон, Н. Арсеннева. Да творчасці Гусоўскага звярталіся беларускія мастакі Э. Агуновіч, У. Басалыга, А. Кашкурэвіч, Я. Кулік, М. Купава, А. Марачкін, М. Селяшчук і інш., драматургі (А. Петрашкевіч), кінематаграфісты.

**Вуліца** ў Фрунзенскім раёне Мінска атрымала імя М. Гусоўскага ў 1980 (мемарыяльная дошка на доме № 65). Яе працягласць 868 м. – ад вуліцы Кальварыйскай да вуліцы Харкаўская. На вуліцы размешчаны жылая малапавярховая забудова, прамысловыя прадпрыемствы

**Літаратура:**

Гусоўскі Мікола // Беларуская энцыкдапедыя: у 18 т. Т. 5: Гальцы – Дагон / Рэдкал.:Г. П:ашкоў і інш. – Мн.: БелЭн, 1997. – С. 537-538.

Выразнік роўнасці народаў (Мікола Гусоўскі) // Авакян, Г.С. Палітычныя мысліцелі і гуманісты Беларусі. – Мн., 2002. – С. 54-57.

Фалалееў, У.У. Дыктат жанра ці свавольства перакладчыка // Личность-слово-социум. – Мн., 2002. – С. 8-11.

Некрашэвіч-Кароткая, Ж.В. “Песня пра зубра” М. Гусоўскага ў кантэксце лацінамоўнай кніжнай культуры Беларусі эпохі Рэнесансу (Х клас) // Беларская мова і літаратура. – 2005. – № 3. – С. 29-35.

Лапцёнак, І. Беларускія пераклады “Песні пра зубра”, альбо Другое жыццё паэмы // ЛіМ. – 2004. – 19 сак. – С. 7.

Нафрановіч, А. Мікола Гусоўскі // Роднае слова. – 2004. – № 2. – С. 110.

(імёны)

## Дунін-Марцінкевіч Вінцэнт (Вікенцій Іванавіч)
## (1808 - 1884)

**Дунін-Марцінкевіч Вінцэнт (Вікенцій Іванавіч)** нарадзіўся 04.02.1808 ў фальварку Панюшкавічы Бабруйскага р-на Магілёўскай вобл. Паэт, драматург, класік беларускай літаратуры 19 ст.

Лічыцца, што ў 1824 скончыў Бабруйскае вучылішча, працягваў вучобу ў Пецярбургу пад апекай сваяка С.І. Богуш-Сестранцэвіча. З 1828 каморнік Мінскага межавога суда, служачы палаты крымінальнага суда, перакладчык пры каталіцкай духоўнай кансісторыі. У 1840 набыў маёнтак Люцынка (Люцінка, Валожынскі раён) і пакінуў дзяржаўную службу. У час паўстання 1863-1864 паліцыя прыпісвала Дуніну-Марцінкевічу аўтарства антыўрадавых выданняў (напр. “Гутаркі старога дзеда”). З кастрычніка 1864 да снежня 1865 зняволены ў мінскую турму, потым быў пад наглядам паліцыі (зняты ў 1872-1874 , зноў устаноўлены ў 1876 ), яго дачка Каміла з 1863 адбывала ссылку ў Салікамску.

Як драматург і акцёр дэбютаваў у Мінску, паставіўшы аперэту “Рэкруцкі яўрэйскі набор”(1841) і выканаўшы ў ёй адну з галоўных роляў. У 1864 апублікаваны музычна-драматычны твор “Сялянка” (“Ідылія”), у якім сяляне гавораць па-беларуску. Опера была пастаўлена 09.02.1852 на мінскай сцэне створаным ім тэатральным калектывам.

У 1890-я гг. распрацоўваў новыя жанравыя формы – вершаванае апавяданне і аповесць, баладу, вытрыманыя ў павучальна-дыдактычным духу (“Вечарніцы”,”Гапон”,1855 ,“Купала”, 1855 , “Шчароўскія дажынкі”, 1857 , “Травіца брат-сястрыца” і “Быліцы, расказы Навума”, нап. 1857). У гэтых творах сплавіліся рамантычная цікаўнасць да народных звычаяў, традыцый і рэалістычнае імкненне перанесці на грунт рэальнага жыцця матывы, вобразы народных легенд, казак, паданняў. У творчасці Дуніна-Марцінкевіча сфарміраваўся своеасаблівы метад рамнтычнага этнаграфізму, які адпавядаў пачатковаму этапу развіцця беларускай літаратуры 19 ст. Адыход ад сентыментальна-ідэлічных форм і жанраў выявіўся ў структуры вершаваных твораў, іх вострай канфліктнасці, імкненні вылучыць на першы план маральна-бытавую праблематыку, у спробах асэнсаваць некаторыя надзенныя з’явы сацыяльна-гістарычнай рэчаіснасці.

У распацоўцы жанру балады паэт апіраўся на багатыя традыцыі рамантызму славянскіх літаратур, яе вытокі бачыў у народнай творчасці. Пра шырыню і плённасць творчых інтарэсаў Дуніна-Марцнкевіча сведчаць яго вершаваныя апавяданні на польскай мове, прысвечаныя актуальным з’явам грамадскага жыцця (“Благаславёная сям’я” 1856), гістарычных падзеях (“Славяне ў 19 стагоддзі”,1856, “Люцынка, або Шведы на Літве”, нап. 1857).

У камедыі “Пінская шляхта” (аўтарскае вызначэнне: фарс-вадэвіль, нап. 1866) аўтар выкрывае паразітычную сутнасць царскага чыноўніцтва. Тут многа камедыйна-бытавых сцэн, дзеянне часта суправаджаецца песнямі і танцамі.

Сатырычная камедыя “Залёты” (нап. 1870) напісана ў традыцыях двухмоўя і прысвечана праблеме расслаення парэформеннай вёскі.

Творчае станаўленне Дуніна-Марцінкевіча складанае. Ён паэтызаваў жыццё і побыт селяніна як носьбіта высокіх маральных і эстэтычных каштоўнасцей, што садзейнічала нараджэнню новых дэмакратычных ідэй у беларускай літаратуры. Вялікая заслуга Дуніна-Марцінкевіча ў развіцці беларускай літаратурнай мовы, сілабічнага вершаскладання, у выпрацоўцы новых жанрава-стылістычных форм (ідылія, вершаванае апавяданне і аповесць, балада, камедыя). Імя пісьменніка прысвоена Магілёўскаму абласному тэатру драмы і камедыі ў Бабруйску.

**Вуліца** ў Фрунзенскім раёне Мінска атрымала імя В. Дуніна-Марцінкевіча ў 1977 (мемарыяльная дошка на доме № 2, к. 2). Яе працягласць 942 м. – ад вуліцы Бельскага да праспекта Пушкіна. На вуліцы размешчаны жылая шматпавярховая забудова, Мінскі гарадскі суд, суд Фрунзенскага раёна г. Мінска, рынак "Ракаўскі кірмаш", універсам "Славянскі".

**Літаратура:**


Дунін-Марцінкевіч Вінцэнт // Беларуская энцыклапедыя: ў 18 т. Т. 6. – Мн.: 1996. – С. 260-261.

Вінцэнт Якуб Дунін-Марцінкевіч: Жыццё і творчасць: [Фотаальбом] / Аўт.-склад. Ул. Содаль. – Мн.: Нар. асвета, 1997. – 104с.

Навуменка, І. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1992. – 216с.

Янушкевіч, Язэп Язэпавіч. Беларускі дудар: праблемы славянскіх традыцый і ўплываў у творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча. – Мінск.: Навука і тэхніка, 1991. – 142с.

Кісялёў, Генадзь Васільевіч. Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча: Спроба навуковай сістэматызацыі дакументаў і матэрыялаў: Праблемы крыніцазнаўства і атрыбуцыі бел. літ. XIX ст. – Мн.: Універсітэцкае, 1988. – (Са скарбніцы беларускай культуры).– 160с.

Янушкевіч, Я. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч (1808-1884) // Славутыя імёны Бацькаўшчыны. - Мн., 2000. - Вып.1. - С. 233-247.

Прыбраны ў мужыцкую сярмягу // Янушкевіч Я. За архіўным парогам : Бел. літ. XIX - XX стст. у святле арх. пошукаў. - Мн., 2002. - С. 17-33.

За свой хлеб // Янушкевіч Я. За архіўным парогам : Бел. літ. XIX - XX стст. у святле арх. пошукаў. - Мн., 2002. - С. 3-16.

Арыгінал "Пінскай шляхты": Пастскрыптум да арыгінала "Пінскай шляхты" // Янушкевіч Я. За архіўным парогам : Бел. літ. XIX - XX стст. у святле арх. пошукаў. - Мн., 2002. - С. 34-45.

Радаводнае дрэва Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, або Працяг - будзе ! // Янушкевіч Я. За архіўным парогам : Бел. літ. XIX - XX стст. у святле арх. пошукаў. - Мн., 2002. - С. 50-60.

Цвірка, К. Гладыятар на арэне беларушчыны // Цвірка К. Камяні тых сядзібаў. - Мн., 2004. - С. 233-240.

Янушкевіч, Я. Трагікамедыя ў Люцынцы. Люцынскі пасаг // Полымя. - 2007. - № 1. - С. 94-111.

Тарасюк, Л.К. Мастацкія кірункі і плыні ў літаратуры Беларусі XIX стагоддзя // Беларуская мова і літаратура. - 2006. - № 5. - С. 33-42.

Янушкевіч, Я. Люцінка - крыніца натхнення Вінцэнта Дуніна Марцінкевіча // Роднае слова. - 2006. - № 5. - С. 106-107.

Ганчарова-Грабоўская, С. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч і Янка Купала : праблема ўзаемасувязі // Род. слова. - 2005. - № 5. - С. 14-15.

Цвірка, К. З аўтарам "Пінскай шляхты" // Полымя. - 2004. - № 7. - С. 178-184.

Думовіч, С. Рамантык з Люцынкі // Беларусь. Belarus. - 2006. - № 4. - С. 40-41.

Запрудскі, І. Лірыка кахання Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча // Род. слова. - 2002. - № 9. – С. 59-63.

Липский, В. Дунин-Марцинкевич и пинская шляхта // Неман. - 1998. - N4. - С. 221-254.

Содаль, У. Беларускі дудар // Роднае слова. - 1998. - N1. - С. 186-188.


## Ефрасіння Полацкая

## (каля 1101 – 1167)

**Ефрасіння Полацкая [Еўфрасіння Полацкая]**, свецкае імя Прадслава; каля 1101 (не пазней 1104), Полацк — 23 або 25.5.1167], полацкая князёўна, асветніца, ігумення манастыра св. Спаса ў Полацку, беларуская святая. Дачка малодшага сына князя Усяслава Брачыславіча Святаслава-Георгія і Сафіі (?), дачкі Уладзіміра Манамаха. Калі дасягнула паўналецця (12 гадоў), адмовілася ад дынастычнага шлюбу і пайшла ў манастыр (пасля 1113). Пасля 1116 пасялілася ў келлі Полацкага Сафійскага сабора, дзе ў храмавым скрыпторыі перапісвала і, магчыма, перакладала кнігі, вяла актыўную міратворчую і асветніцкую дзейнасць. Пабудавала на свае сродкі 2 царквы ў Полацку, заснавала пад Полацкам жаночы і мужчынскі манастыры, якія сталі асяродкам асветы ў Полацкім княстве (працавалі вучыльні, бібліятэкі. скрыпторыі, багадзельня, верагодна, іканапісная і ювелірная майстэрні). Па яе заказе Лазар Богша зрабіў крыж (Крыж Ефрасінні Полацкай). Мужчынскаму манастыру падаравала выдатны твор візантыйскага мастацтва — абраз «Маці боская Адзігітрыя Эфеская». Паломнічала на святых мясцінах у Іерусалім (1167), дзе па мерла і была пахавана ў манастыры св. Феадосія (недалёка ад Іерусаліма). У 1187 перапахавана ў Феадосіеву пячору Кіеўскай лаўры, у 1910 — у Полацк (у 1871 сюды была перанесена частка яе мошчаў). Першая жанчына, кананізаваная рускай праваслаўнай царквой (1547). У спісах 16—18 ст. захаваліся царкоўныя спевы пра Ефрасінню Полацкаю. Адзіная крыніца біяграфічных звестак пра ігуменню — «Жыціе Ефрасінні Полацкай», дзе ўслаўляецца яе імкненне да ведаў і духоўнай дасканаласці, у строгай храналагічнай паслядоўнасці перадаюцца сапраўдныя гістарычныя факты (звесткі пра Полацк, яго культурнае жыццё. побыт княжацкай сям'і). Ефрасіння Полацкая прылічана да Сабора Беларускіх Святых (1984).

У Мінску яе імем названа **вуліца** (2010).

**Літаратура:**

Ефрасіння Полацкая // Беларуская энцыклапедыя: ў 18 т. Т. 6. – Мінск, 1996. – С. 405.

Коўтун, Валянціна. Пакліканыя : раман-жыціе / Валянціна Коўтун. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. – 247с.

Еўфрасіння Полацкая : жыццяпіс і даследаванне спадчыны Асветніцы / [аўтар-укладальнік У.А. Арлоў]. – Мінск : Полымя, 2000. – 271с. – ( Нашы славутыя землякі).

Преподобная Евфросиния Полоцкая : [книга-альбом / Минское Епархиальное Управление Белорусской православной Церкви; автор-составитель А.Мельников] . – Минск : Четыре четверти, 1997. – 112, [3]с.: іл. – ( Наши духовные ценности ; Вып.3).

Кніга жыцій і хаджэнняў : [пераклад са старажытнарускай, старабеларускай і польскай мовы / укладанне, прадмова і каментарыі А. Мельнікава; навуковы рэдактар В. Чамярыцкі] . – Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. –503 с., [19] л. іл. – ( Літаратурныя помнікі Беларусі)

Аповесць жыцця і смерці Еўфрасінні Полацкай //Беларуская літаратура X-XV стст. – Мінск, 2010. – С. 62-83.

Короткевич, В. Святая Предслава / Владимир Короткевич // Неман. - 2010. – № 11. – С. 147-148.

Гордун, С. Преподобная Евфросинья Полоцкая - слава земли белорусской / Сергий Гордун // Адукацыя і выхаванне. – 2010. – № 6. – С. 75-79.

Тарасаў, С. Еўфрасіння Полацкая / С. Тарасаў // Беларуская мова і літаратура. – (Серыя "У дапамогу педагогу"). – 2009. – № 7. – С. 62.

Бушыла, Н.В. Вобраз Еўфрасінні Полацкай ў мастацкай літаратуры / Н.В. Бушыла // Беларуская мова і літаратура. – (Серыя "У дапамогу педагогу"). – 2009. – № 7. – С. 59-61.

Арлоў, У. Асветніца з роду Усяслава / Уладзімір Арлоў // Таямніцы полацкай гісторыі / / Уладзімір Арлоў. – Мінск, 2009. – С. 91-141.

## Жудро Васіль Сцяпанавіч
## (1917-1942)

**Жудро Васіль Сцяпанавіч** нарадзіуся 20.04.1942 у вёсцы Карані Светлагорскага раёна Гомельскай вобл.

Адзін з кіраўнікоў Мінскага патрыятычнага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1941 у Мінску вучыўся на юрыдычных курсах. У пачатку акупацыі горада ўстанавіў сувязь з падпольнай групай у раёне Камароўкі і партызанскай групай "Дзядзькі Васі" (Васіля Варанянскага). Арганізоўваў вывад з Мінска да партызан людзей, адпраўку зброі, баепрыпасаў. Удзельнічаў у правядзенні дыверсій на аўтамагістралях каля горада. 17.04.1942 цяжка паранены, памёр ад ран. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны.

У гонар В.С. Жудро ў 1969 годзе названа **вуліца** ва Фрунзенскім раёне Мінска.

**Літаратура:**


Жудро Васіль Сцяпанавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 6. - Мн., 1997. - С. 442.

Жудро Васіль Сцяпанавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 3. - Мн., 1996. - С. 372.

Жудро Василий Степанович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 218-219.

Жудро Василий Степанович // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 168-169.

Его призвание: [также о В.С.Жудро] // Петраченко, Д.Н. Именами героев. – Мн., 1978. – С. 92 -96.


## Жыновіч Іосіф Іосіфавіч
## (1907 – 1974)

**Жыновіч (Жыдовіч) Іосіф Іосіфавіч** нарадзіўся 14.5.1907 у в. Арэшкавічы Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці.

Беларускі цымбаліст, дырыжор, кампазітар, педагог. Народны артыст СССР (1968). Прафесар (1963). Скончыў юрыдычны факультэт БДУ (1931), Беларускую кансерваторыю (1941). Выступаў як сельскі музыкант-самавук. Прафесійную дзейнасць пачаў у 1922 як саліст-цымбаліст БДТ (Нацыянальны тэатр імя Я.Купалы). У 1930—1935 кіраўнік, у 1938—1941 саліст, канцэртмайстар і педагог, з 1946 мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Дзяржаўнага акадэмічнага народнага оркестра Рэспублікі Беларусь (з 1974 імя Жыновіча). З 1944 педагог Беларускай кансерваторыі, дзе заснаваў клас цымбалаў і кафедру народных інструментаў (у 1946—1963 яе загадчык). Як прафесійны выканаўца на беларускіх цымбалах тонка адчуваў прыроду інструмента, выдатна выяўляў яго выразныя магчымасці. Яго ігра вызначалася віртуозным размахам, артыстызмам, беражлівым стаўленнем да аўтарскага тэксту. Сольны рэпертуар складаўся з уласных арыгінальных твораў («Беларускія танцы», «Працяжная і карагодная» і інш.) пералажэнняў п'ес Ф.Шапэна, Г.Вяняўскага,І.Штрауса, Ф.Крэйслера. Канцэртаваў як віртуоз-цымбаліст у Германіі, Фінляндыі, Канадзе, Польшчы. Стварыў унікальны па складзе народны аркестр, для станаўлення якога вялікае значэнне меў яго ўдзел ў рэканструкцыі музычных інструментаў, найперш цымбалаў. Выключны уклад Жыновіча ў стварэнне рэпертуару для гэтага калектыву, у т.л. уласных твораў («Беларуская мелодыя» для ансамбля цымбалаў і 2 арфаў, «Сказ-быліна аб зямлі беларускай», канцэртныя

апрацоўкі народных танцаў «Лявоніха» і «Мікіта», а таксама пералажэнняў – 7 –й сімфаньеты «Беларускія картынкі» М. Чуркіна, фіналаў 1-га канцэрта для фп. з арк. і серэнады для стр. аркестра П. Чайкоўскана, фп. п'ес «У манастыры» з «Маленькай сюіты» А. Барадзіна і «Багатырскія вароты» з «Карцінак з выстаўкі» М.Мусаргскага і інш. твораў класічнай і сучаснай музыкі). Асабліва вялікі уклад Жыновіча ў падрыхтоўку выканальніцкіх і педагагічных кадраў — стварэнне *ім* першай школы ігры на беларускіх цымбалах. Сярод яго вучняў В.Бурковіч, Я.Гладкоў Т.Сцяпанава, М.Шмелькін і інш. Лаўрэат 1-га Усесаюзнага агляду выканаўцаў на народных інструментах (1939). Дзяржаўная прэмія Беларусі 1968. З 1987 на Беларусі праводзіцца Рэспубліканскі конкурс імя Жыновіча

У Мінску яго імем названа **вуліца** (2007), на доме, дзе жыў Жыновіч, устаноўлена мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Жыновіч (Жыдовіч) Іосіф Іосіфавіч // Беларуская энцыклапедыя: у18 т. Т. 6. – Мінск, 1998. – С. 469.

Трафілава, І. Паданне пра зямлю беларускую: споўнілася сто гадоў з дня нараджэння Іосіфа Жыновіча, першага беларускага цымбаліста-прафесіянала, кампазітара, стваральніка унікальнага аркестра // Беларусь. Belarus. – 2007. – № 7. – С. 46-47.

Яканюк, Н."Маладняк" і беларускія цымбалы / Н. Яканюк // Роднае слова. – 2002. – № 1. – С.88-89.

## Жэбрак Антон Раманавіч
## (1901 – 1965)

**Жэбрак Антон Раманавіч** нарадзіўся 27.12.1901 г. у в. Збляны Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці.

Беларускі генетык і селекцыянер. Акадэмік АН Беларусі (1940), доктар біялагічных навук, прафесар (1936). Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1944). Скончыў Маскоўскую сельска-гаспадарчую акадэмію (1925), Інстытут чырвонай прафесуры (1929). У 1930—1931 стажыраваўся ў ЗША. У 1934—1948 загадчык кафедры Маскоўскай сельска-гаспадарчай акадэміі.

У 1940—1947 член Прэзідыума АН Беларусі. У сакавіку 1945 прадстаўнік Беларусі ў рабоце Усеславянскага сабора ў Сафіі, член дэлегацыі БССР на канферэнцыі ў Сан-Францыска (ЗША), дзе з іншымі ўдзельнікамі 26.6.1945 падпісаў Статут ААН. У 1947 прэзідэнт АН Беларусі. 16.10.1947 зняты з пасады прэзідэнта. Фармальнай падставай для гэтага паслужыла публікацыя Жэбрака ў амерыканскім штотыднёвіку «Science» («Навука»), у якой ён выказаў крытыку ў адрас антынавуковай тэорыі Т.ДзЛысенкі. З 1949 загадчык кафедры Маскоўскага фармацэўтычнага інстытута. У 1953—1965 кіраваў работамі па эксперыментальнай поліплаідыі ў Інстытуце біялогіі, з 1963 у Аддзеле генетыкі і цыталогіі АН Беларусі. Навуковыя працы па гібрыдызацыі, поліплаідыі і імунітэце раслін, філагеніі і біялагічных асновах селекцыі пшаніцы і грэчкі. Атрымаў гібрыдныя пладавітыя формы ад скрыжавання шэрагу відаў пшаніцы

У Мінску яго імем названа вуліца (2004).

Літаратура:

Жэбрак Антон Раманавіч // Беларуская энцыклапедыя: у18 т. Т. 6. – Мінск, 1998. – С. 477-478.

Дуброўскі, Ігнат Цімафеевіч. Гаснуць вулканы : дакументальны раман [аб жыцці і творчасці грамадскага дзеяча, таленавітага вучонага (батаніка, генетыка, селекцыянера) А.Р.

Жэбрака і яго паплечнікаў] / Ігнат Дуброўскі. – Мінск : Мастацкая літаратура,1997. – 318с., 1 л. партр.

Мяснікоў, А.Ф. Антон Жэбрак (1901-1965): Бессмяротнасць хлеба і чалавека // Сто асоб беларускай гісторыі: гістарычныя партрэты / А.Ф. Мяснікоў. – Мінск, 2008. – С. 247-250.

Академик А. Р. Жебрак // Люди белорусской науки : воспоминания современников / [составители: О.А.Гапоненко, Н.В.Токарев; под редакцией А.И.Лесниковича]. – Минск, 2007. – Вып. 1. – С. 181-244.

(імёны)

## Ігнатоўскі Усевалад Макаравіч
## (1881 – 1931)

**Ігнатоўскі Усевалад Макаравіч** нарадзіўся 19.4.1881 у в. Такары Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці.

Беларускі гісторык, грамадскі і палітычны дзеяч. Акадэмік Беларускай АН (1928). Скончыў Тартускі універсітэт (1911). У 1914—1919 выкладчык, старшыня педагагічнага савета Мінскага настаўніцкага інстытута. У 1915 стварыў культурна-асветніцкую арганізацыю «Наш край» (у 1917 пераўтворана ў арганізацыю «Маладая Беларусь»). Член ЦК Беларускай сацыялістычнай грамады (1917) і ЦК БПС-Р (1918). У час польскай акупацыі ў студзені 1920 на базе «Маладой Беларусі» стварыў Беларускую камуністычную арганізацыю (БКА) Як старшыня БКА удзельнічаў у падпісанні «Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь» (31.7.1920). 30.7.1920 прыняты ў РКП(б). Са жніўня 1920 член ВРК БССР, народны камісар земляробства, са снежня 1920 народны камісар асветы БССР. У 1926 старшыня, з 1927 прэзідэнт Інстытута беларускай культуры. Са снежня 1928 прэзідэнт Беларускай АН, дырэктар Інстытута гісторыі. У 1921—1930 член праўлення, прафесар БДУ. Член ЦВК і Прэзідыума ЦВК БССР у 1922—1930, Прэзідыума ЦВК СССР у 1924, член Бюро ЦК КП(б)Б у 1924—1930, загадчык агітацыйна-прапагандысцкага аддзела ЦК КП(б)Б у 1924—1926. Адыграў значную ролю ў правядзенні палітыкі беларусізацыі, у вырашэнні праблемы ўзбуйнення БССР, спрыяў вяртанню беларускай эміграцыі ў БССР. У час кампаніі супраць «нацыянал-дэмакратызму» 26.12.1930 вызвалены ад пасады прэзідэнта Беларускай АН, 16.1.1931 пастановай ЦК КП(б)Б выключаны з партыі, як «лідэр нацыянал-дэмакратычнай контррэвалюцыі», выклікаўся на допыты ў АДПУ. Скончыў самагубствам.

Навуковыя працы Ігнатоўскага склалі падмурак канцэпцыі гісторыі беларускага народа, у аснове якой перыядызацыя паводле прынцыпу дзяржаўнасці і грамадскага стану беларускіх зямель. Гісторыю Беларусі падзяляў на 5 перыядаў: полацкі (9—12 ст.) — час існавання незалежнага Полацкага княства; літоўска-беларускі (13 — 1-я пал. 16 ст.) — Беларусь і Літва ў складзе ВКЛ; польскі (2-я пал. 16 — 18 ст.) — Беларусь і Літва ў складзе Польскай дзяржавы; расійскі (канец 18 — пач. 20 ст.) — Беларусь у складзе Расійскай імперыі; Беларусь пасля звяржэння царызму. Праца Ігнатоўскага «1863 год на Беларусі» (1930) — першае ў беларускай гістарыяграфіі грунтоўнае навуковае даследаванне паўстання 1863—1864, пабудаванае на дакументальных крыніцах.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (2007).

**Літаратура:**

Ігнатоўскі Усевалад Макаравіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т. 7. – Мінск, 1998. – С. 162.

Брыгадзін, П.І. Усевалад Ігнатоўскі: палітычны дзеяч, вучоны / П.І. Брыгадзін, І. Д. Мацяс. – Мн.: Полымя, 1998. – 95с.: іл. – ( Нашы славутыя землякі).

Мяснікоў, А.Ф. Нацдэмы : лёс і трагедыя Ф. Шантыра, У. Ігнатоўскага, Я. Лёсіка / А.Ф. Мяснікоў. – Мн.Беларусь, 1993. – 110с.

Усевалад Ігнатоўскі (1881-1931): жыццё, загубленае часам // Сто асоб беларускай гісторыі: гістарычныя партрэты /А.Ф. Мяснікоў. – Мінск, 2008. – С. 157-160.

[У.М. Ігнатоўскі (1881-1931)] // Ляшук В.Я., Снітко, Г.М. Літаратурная Берасцейшчына: краязнаўчыя нарысы, партрэты, артыкулы. – Мінск, 2008. – С. 148-150.

Токараў, М. Усевалад Ігнатоўскі і стварэнне Беларускай Акадэміі навук / Мікалай Токараў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 4. – С. 28-34.

Карзенка, Г.У. Жыццё цудоўнае і трагічнае / Г.У. Карзенка; пераклад на беларускую мову А.А. Язерскай // Адукацыя і выхаванне. – 2006. – № 4. – С. 74-77.

(імёны)

## Кавалёў Іван Кірылавіч (1906-1943)

**Кавалёў Іван Кірылавіч** нарадзіўся 12.06.1906 у в.Бабічы Чачэрскагар-на Гомельскай вобл.

Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага патрыятычнага падполля у Вялікую Айчынную вайну. Скончыў Вышэйшую камуніст. сельска-гаспадарчую школу імя Леніна ў Мінску (1938). З 1940 сакратар Заслаўскага райкома КП(б)Б. У пачатку вайны быў пакінуты ў тыле ворага для падпольнай работы. З канца жн. 1941 прыступіў да стварэння ў Мінску падпольнай арганізацыі, з ліст. 1941 сакратар Мінскага падпольнага гаркома КП(б)Б, кіраваў падпольнай барацьбой у горадзе і разгортваннем партызанскага руху ў прыгарадных раёнах. У 1942 арыштаваны гітлераўцамі, падвяргаўся катаванням. Быў павешаны ў ліку дзесяці кіраўнікоў мінскага падполля на гарадскім стадыёне "Дынама". Ілжыва абвінавачаны ў здрадзе Радзіме, у крас. 1990 рэабілітаваны.

**Вуліца** Фрунзенскага раёна Мінска названа яго імем у 1998 г. (мемарыяльная дошка на доме № 43). Працягласць вуліцы 1303 м, ад стыка вуліц Новая і Міхалова. На ней размешчана малапавярховая забудова.

**Літаратура:**

Кавалёў Іван Кірылавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 7. - Мн., 1997. - С. 394.

Кавалёў Іван Кірылавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 3. - Мн.,1996. - С. 518.

Чернушевич А. Улица имени... // Минский курьер. – 2004. - 2 июля. - С. 14.

Их именами названы улицы. Участники Минского подполья// Минский курьер.- 2008.- 2 июля.- С. 10-11.

Ковалев// Минский курьер.- 2009.- 24 марта.- С. 9.

(імёны)

## Калеснік Уладзімір Рыгоравіч (1911-1943)

**Калеснік Уладзімір Рыгоравіч** нарадзіўся 28.06.1911 у г. Асцёр Казялецкага раёна Чарнігаўскай вобл., Украіна.

У 1942 скончыў Ленінградскія бранятанкавыя курсы. На фронце са жн. 1942. Удзельнік вызвалення Беларусі, камандзір узвода танкаў. Вызначыўся ў баі пад в. Віць Хойніцкага р-на Гомельскай вобл. Яго машына была падбіта варожым снарадам. Экіпаж вёў нероўны бой на працягу 12 гадзін, знішчыл шмат гітлераўцаў і варожай тэхнікі. У гэтым баі 25.11.1943 У.Р. Калеснік загінуў. Герой Савецкага Саюза (1944). На месцы гібелі экіпажа танка пастаўлены абеліск.

**Вуліца** Фрунзенскага раёна Мінска названа яго імем.

**Літаратура:**

Калеснік Уладзімір Рыгоравіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 7. - Мн., 1997. - С. 462-463.

Калеснік Уладзімір Рыгоравіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 4. - Мн., 1997. - С. 27.

Колесник Владимир Григорьевич // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 218-219.

Брухавецкі І. Бой за вышыню 130,1: [Пра Героя Савецкага Саюза У.Р.Калесніка, які загінуў каля вёскі Загалле Хойніцкага раёна] // Гомельская праўда. – 1979. – 21 крас.

(імёны)

## Калеснікаў Пімен Рыгоравіч
## (1906 – 1996)

**Калеснікаў Пімен Рыгоравіч** нарадзіўся 24.7.1906 у г. Мікалаеў, Украіна.

Удзельнік вызвалення Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза (1945). Скончыў ваенна-тэарытычную (1933) і Арэнбургскую ваенную авіяцыйную школы лётчыкаў (1934). У Чырвонай Арміі з 1931. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 на Волхаўскім, Паўднёвым, Заходнім, 1-м і 2-м Беларускім франтах. Старшы штурман штурмавой авіяцыі маёр Калеснікаў вызначыўся ў 1944 пры вызваленні Рагачова, Бабруйска, Мінска, Слоніма, ліквідацыі груповак праціўніка ў бабруйскім “катле”. Да 1957 у Савецкай Арміі.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (2000), мемарыяльная дошка на доме № 4.

**Літаратура:**

Калеснікаў Пімен Рыгоравіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.7. – Мінск, 1998. – С. 463.

Колесников Пимен Григорьевич // Герои Советского Союза: краткий биографический словарь: в 2 т. – Т. 1. – М., 1987. – С. 696.

Колесников // Минский курьер. – 2009. – 26 марта. – С. 8.

Овчаренко В.Новой улице - имя Героя / В. Овчаренко // Минский курьер. – 2003. – 8 мая. – С.3.

(імёны)

## Лабанок Уладзімір Елісеевіч
## (1907-1984)

**Лабанок Уладзімір Елісеевіч** нарадзіўся 3.07.1907 у в. Востраў Пухавіцкага р-на Мінскай вобл.

Скончыў БСГА (1931). З 1941 1-ы сакратар Лепельскага райкома КП(б)Б. З жн. 1941 да чэрв. 1944 з’яўляўся 1-м сакратаром Лепельскага падпольнага райкома партыі. Адначасова з сак. 1942 камандаваў партызанскім атрадам № 68, са жн. 1942 камісар партызанскай брыгады Чашніцкай “Дубава”, з ліп. 1943 камандзір партызанскай брыгады Лепельскай імя Сталіна. У снеж. 1943 узначаліў аператыўную групу ЦК КП(б)Б і БШПР па Полацка-Лепельскай партызанскай зоне. Герой Савецкага Саюза (1943). З 1944 у апараце ЦК КПБ, старшыня Полацкага і Гомельскага аблвыканкомаў, 1-ы сакратар Палескага, Віцебскага абкомаў КПБ. З 1962 на кіруючых дзяржаўных пасадах у БССР. З 1974 нам. Старшыні Прэзідыума Вярх. Савета БССР. Аўтар кніг “У баях за Радзіму”, “Партызаны прымаюць бой”. Памёр 4.11.1984.

**Вуліца** Фрунзенскага раёна Мінска названа яго імем.

**Літаратура:**

Лабанок Уладзімір Елісеевіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 9. - Мн., 1999. - С. 80.

Лабанок Уладзімір Елісеевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 4. - Мн., 1997. - С. 324.

Лобанок Владимир Елисеевич // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 369-370.

Клочкова В. Владимир Елисеевич Лобанок // Клочкова, В.А. Мысли о прошлом. Очерки. Рассказы: Вторая часть книги «Мы из XX века». – Мн.: Технопринт, 2003. – С. 21-30.

Владимир Лобанок // Минский курьер. – 2005. – 7 мая. – С.11.

Аб прысваенні імя У.Е.Лабанка Ушацкаму музею народнай славы: Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, 4 сакавіка 1999 г., № 320 // Рэспубліка. – 1999. – 10 сакавіка. – С.2.

Кірпіч М. Не зламалі жыццёвыя нягоды: [Пра удзельніка партызанскага руху на Ушаччыне У.Е.Лабанка] // Беларуская думка. – 1997. - № 9. – С.100-102.

(імёны)

## Лынькоў Міхась (Міхась Ціханавіч) (1899-1975)

**Лынькоў Міхась Ціханавіч** нарадзіўся 30.11.1899 у в. Зазыбы Віцебскага р–на.

Беларускі пісьменнік, літаратуразнавец, грамадскі дзеяч. Народны пісьменнік Беларусі (1962). Акадэмік АН Беларусі (1953, чл.-кар. 1936).

Скончыў Рагачоўскую настаўніцкую семінарыю (1917). У грамадзянскую вайну ўдзельнічаў у партызанскім руху. Настаўнічаў у Буда-Кашалёўскім і Рагачоўскім р-нах (1917–1919 і 1922–1925). У 1919–1922 у Чырвонай Арміі. З 1925 працаваў адказным сакратаром, рэдактарам бабруйскай акруговай газеты «Камуніст». З 1930 у Дзяржаўным выдавецтве «Беларусь», у 1933–1941 галоўны рэдактар часопіса «Полымя рэвалюцыі». Быў арганізатарам і кіраўніком Бабруйскай філіі «Маладняка», адным з кіраўнікоў БелАПП. Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі (1938–1948). Рэдактар газеты «Беларуская звязда» (1939), «За Савецкую Беларусь» (1941–1942). У 1943–1946 і 1949–1952 дырэктар Інстытута літаратуры, мовы і мастацтва АН Беларусі.

Друкаваўся з 1919. Асабліва моцны ўплыў зрабілі на М. Лынькова стылёва-выяўленчыя традыцыі рускай літаратуры. У апавяданнях 1920–1930-х г. (зборнікі «Апавяданні», 1927; «Гой», 1929, «Андрэй Лятун», 1930, «Саўка-агіцірнік», 1933, «На вялікай хвалі», 1934, і інш.) пераважна на аснове асабістага жыццёвага вопыту пісаў пра рэвалюцыю і грамадзянскую вайну, паказваў барацьбу за новы грамадскі лад («Над Бутам», «Крот», «Манчжур», «Кватармайстар Бадай», «Сінія галіфэ» і інш.), як змяняліся міжнацыянальныя адносіны («Гой»), усталёўваўся новы побыт («У мястэчку»). Паэтызаваў працу простых людзей, асэнсоўваў яе як крыніцу сапраўднай духоўнасці («Андрэй Лятун»). Шмат увагі аддаваў паказу гарадскога і местачковага жыцця, рабочага асяроддзя («Гома», «Чыгунныя песні», «Журавель мой, журавель» і інш.). Рэалістычны паказ старой беларускай вёскі складае асноўны змест няскончанага рамана «На чырвоных лядах» (1934). У аповесцях для дзяцей «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» (1935) і «Міколка-паравоз» (1936, кінафільм 1957) створана дынамічная і займальная падзейная плынь, у якой яркая і маляўнічая апавядальнасць атрымала лірыка-гумарыстычную афарбоўку. Жыццё працоўных Заходняй Беларусі паказаў у зборніку апавяданняў «Сустрэчы» (1940).

Гераізм і самаахвярная мужнасць народа ў барацьбе з фашызмам у перыяд Вялікай Айчыннай вайны паказаны ў напоўненых драматызмам і трагедыйнасцю апавяданнях са зборніка «Астап» (1944). У многіх з іх гучыць тэма знявечанага фашысцкай акупацыяй дзяцінства («Дзіцячы башмачок», «Недапетыя песні», «Пацалунак» і інш.). Яркія эпізоды партызанскай вайны на Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў атрымалі эмацыянальна-ўсхваляванае адлюстраванне ў рамане «Векапомныя дні» (1958; Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Я. Коласа 1968).

На матэрыяле замежных паездак напісаў кнігі замалёвак, нарысаў і апавяданняў «За акіянам» (1962). Публіцыстычнае майстэрства М. Лынькова выявілася ў артыкулах і сатырычных замалёўках перыяду Вялікай Айчыннай вайны («Смачны жабе арэх, ды зубоў бог не даў...», «Цешыўся старац, што пяражыў марац, ажно ў маю нясуць яго да гаю...» і інш.), у нарысах «Шляхамі вайны» (1945), «Пад сонцам Індыі» (1957).

У літаратуразнаўчых і крытычных работах абараняў праўдзівасць, даследчы пафас літаратуры, змагаўся супраць спрошчанага, вульгарызатарскага яе разумення, пісаў пра жыццё і творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, К. Крапівы, К. Чорнага, І. Мележа, Я. Брыля, І. Шамякіна і інш. беларускіх пісьменнікаў, Т. Шаўчэнку, рускіх і зарубежных класікаў (А. Пушкіна, М. Гогаля, М. Някрасава, Л. Талстога, Ф. Дастаеўскага, А. Чэхава, М. Горкага, Р. Тагора), дзеячаў сусветнай культуры (Я. Каменскага і інш.). На беларускую мову перакладаў творы М. Горкага і М. Ціханава. Помнікі Лынькову ў в. Крынкі Лёзненскага раёна і на магіле ў Мінску (на Усходніх могілках); музеі ў Крынкаўскай і Бронніцкай (Буда-Кашалёўскі р-н) школах.

**Вуліца** ў Фрунзенскім раёне Мінска атрымала імя М. Лынькова ў 1977 годзе (мемарыяльная дошка ўстаноўлена на будынку № 93 па пр. Пушкіна). Працягласць вуліцы 2934 м. – ад праспекта Пушкіна да вуліцы Центральнай. На вуліцы размешчаны жылая шматпавярховая забудова, прамысловыя прадпрыемствы, універсам “Спартак”.

**Літаратура:**


Лынькоў Міхась (Міхась Ціханавіч) // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т.9. – Мн., 1999. – С. 383.

Лынькоў Міхась (Міхась Ціханавіч) // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 4. – Мн., 1997. – С. 407.

Лынькоў Міхась (Міхась Ціханавіч) // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. Т. 3. – Мн., 1986. – С. 310-311.

Лынькоў Міхась (Міхась Ціханавіч) // Беларускія пісьменнікі: біябіліяграфічны слоўнік : у 6 т. Т. 4. – Мн., 1994. – С. 117-132.

Лынькоў Міхась (Міхась Ціханавіч) // Беларускія пісьменнікі (1917-1990) : даведнік. – Мн., 1994. – С. 348-349.

Кенька, Міхаіл Паўлавіч. Міхась Лынькоў : летапіс жыцця і творчасці. – Мн., 1987 . – 128 с.

Куляшоў, Фёдар Іванавіч. Міхась Лынькоў : нарыс жыцця і творчасці : [для сярэд. і ст. шк. узросту] / Фёдар Куляшоў. – Мн., 1979. – 191с. – (Народныя пісьменнікі БССР).

Святло яго душы: успаміны пра Міхася Лынькова / [Склад.: С. Лынькова-Куспіц ,Ю. Пшыркоў]. – Мн. : Маст.літ., 1979. – 368с.

Сэрца ў яго сапраўды было шчодрае // Бугаёў Д. Служэнне Беларусі. – Мн., 2003. – С. 169-180.

Міхась Лынькоў // Бугаёў, Д. Спавядальнае слова. – Мн., 2001. – С. 158-183.

Локун, В. “Векапомныя дні” – пра вогненныя гады // Беларуская думка. – 2005. – № 7. – С. 152-156.

Жураўлёў, В. Мастацкая функцыя побыту ў рамане Міхася Лынькова “На чырвоных лядах” // Роднае слова. – 2001. – № 5 . – С. 32-35.

Тычына, М. Пясняр рамантычнага парыву // Роднае слова. – 1999. – № 11. – С. 11-26.


(імёны)

## Ляшчынскі Адам Браніслававіч (1920)

**Ляшчынскі Адам Браніслававіч** нарадзіўся 24.12.1920 у в. Якубавічы Капыльскага р-на Мінскай вобл.

У Краснай Арміі з 1940. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Скончыў паскораныя курсы Чкалаўскага танкавага вучылішча (1942), 2-га Кіеўскага артыл. вучылішча (1943). З чэрв. 1941. ваяваў на Заходнім, Варонежскім, 1-м Украінскім франтах, удзельнік абарончых баёў на Беларусі, Маскоўскай бітвы, вызвалення Украіны. Вызначыўся ў баях за Днепр (1943). Камандзір батарэі самаходнага артыл. палка лейтынант А.Б. Ляшчынскі на чале экіпажа самаходнай гарматы знішчыў шмат агнявых кропак і жывой сілы праціўніка у час прарыву абароны ворага на правым беразе Дняпра. Калі гармата была падбіта, паранены працягваў бой гранатамі і аўтаматным агнём. Герой Савецкага Саюза (1944). Да 1948 служыў у Савецкай Арміі, да 1984 працаваў у народнай гаспадарцы.

У гонар А.Б.Ляшчынскага названа **вуліца** Фрунзенскага раёна Мінска.

**Літаратура:**


Ляшчынскі Адам Браніслававіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т.9.- Мн., 1999. - С. 438.

Ляшчынскі Адам Браніслававіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 4. - Мн., 1997. - С. 431.

Герасимов Г. Кавалер Золотой Звезды: [О Герое Советского Союза А.Б. Лещинском, уроженце Копыля] // Гродненская правда. – 1984. – 13 сент.


(імёны)

## Мазураў Кірыла Трафімавіч
## (1914-1989)

**Мазураў Кірыла Трафімавіч** нарадзіўся 7.04.1914 у в. Рудня-Прыбыткоўская Гомельскага р-на.

Скончыў Гомельскі аўтадарожны тэхнікум (1933). З 1933 тэхнік, нач. Камарынскага раённага дарожнага аддзела. У 1936 – 1939 у Чырв. Арміі, палітаддзеле Беларускай чыгункі З 1939 заг. аддзела Гомельскага абкома, 1-ы сакратар Брэсцкага абкома ЛКСМБ. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 на фронце: палітрук роты, камандзір батальёна, інструктар палітаддзела 21-й арміі (падпалкоўнік). З вер. 1942 прадстаўнік ЦШПР у партызанскіх злучэннях, член Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б, сакратар ЦК ЛКСМБ. З кастр. 1947 у аппраце ЦК КП(б)Б. З 1949 2-і, 1-ы сакратар Мінскага гаркома, з 1950 1-ы сакратар абкома партыі. З ліп. 1953 Старшыня Савета Міністраў БССР. У 1956 – 1965 член Ваеннага савета БВА. У 1965 – 1978 1-ы нам. Старшыні Савета Міністраў СССР. З 1986 Старшыня Усесаюзнага савета ветэранаў вайны і працы, член Міжнароднай федэрацыі барацьбітоў супраціўлення. Пахаваны на Новадзявочых могілках у Маскве.

**Вуліца** ва Фрунзенскім раёне сталіцы названа яго імем.

**Літаратура:**

Мазураў Кірыла Трафімавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 9. - Мн., 1999. - С. 511.

Мазураў Кірыла Трафімавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 5. - Мн., 1999. - С. 35.

Мазуров К. Воспоминания, выступления, интервью / авторы-составители: С.М.Белов и др.; предисловие А.Н.Аксенова. – Мн.: Бел. изд. Товарищество «Хата», 1999.

Симуров А.Т. Осторожный белорус // Симуров, А.Т. Вожаки, вожачки. Тайными коридорами власти: [Воспоминания корресподента «Правды]. – Мн.: ООО «Парадокс», 1999. – С.9-18.

Верой и правдой: [О К.Т.Мазурове: Воспоминания / Сост. А.Н.Аксенов, А.Ф.Хацкевич]. – Мн.: Беларусь, 1995. – 118с.: ил., 4 л. ил.

Менеджер с партбилетом: 90 лет со дня рождения Кирилла Трофимовича Мазурова // Директор. – 2004. - №3. – С. 54 – 55.

Белугин А. «Таково моё мнение»: [К 80 - летию со дня рождения К. Т. Мазурова – советского государственного и партийного деятеля Беларуси: Воспоминания] // Беларуская думка. – 1994. - №4. – С. 62-64.

(імёны)

## Матусевіч Іван Іванавіч
## (1884-1942)

**Матусевіч Іван Іванавіч** нарадзіўся 20.01.1884 у в. Лапаравічы Мінскага р-на.

У 1941 годзе служачы на Мінскім чыгуначным вузле, у пачатку акупацыі Мінска адзін са стваральнікаў падпольнай групы на вагонарамонтным заводзе, з верасня 1942 сакратар Чыгуначнага падпольнага райкома КП(б)Б г. Мінска. 2.10.1942 арыштаваны, загінуў у фашысцкіх засценках. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны.

У гонар І.І. Матусевіча ў 1971 названа **вуліца** Фрунзенскага раёна Мінска, на доме № 1 мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Матусевіч Іван Іванавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 10. - Мн., 2000. - С. 207.

Матусевіч Іван Іванавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 5. - Мн., 1999. - С. 96.

Матусевич Иван Иванович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 409-410.

Матусевич Иван Иванович // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 227.

Иван Матусевич // Минский курьер. – 2005. – 7 мая. – С.10.

(імёны)

# Маўр Янка (Фёдараў Іван Міхайлавіч)
# (1883-1971)

**Маўр Янка (Фёдараў Іван Міхайлавіч)** нарадзіўся 10.05.1883 у г. Ліепая, Латвія. Беларускі пісьменнік, адзін з пачынальнікаў беларускай дзіцячай літаратуры. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1968 г.).

З 1899 г. вучыўся ў Панявежскай настаўніцкай семінарыі, адкуль з апошняга курса выключаны за вальнадумства; у 1903 здаў экзамен экстэрнам. У 1903-1906 настаўнічаў. У 1906 за ўдзел у нелегальным з'ездзе настаўнікаў у вёсцы Мікалаеўшчына (Стаўбцоўскі раён) звяволены з працы і трапіў пад нагляд паліцыі. З 1911 настаўнічаў у Мінску. У 1920-я г. працаваў у Наркамаце асветы Беларусі, у рэспубліканскім саюзе работнікаў асветы, Беларускім дзяржаўным выдавецтве.

Друкаваўся з 1923. Аповесць "Чалавек ідзе!.." (1926-1927) распавядае пра паходжанне чалавека. У апавяданнях "Слёзы Тубі", "Незвычайная прынада", "Лацароні" і інш., у прыгодніцкіх аповесцях "У краіне райскай птушкі" (1927), "Сын вады" (1928) апавядаў пра экзатычныя краіны свету, антычалавечую сутнасць каланіялізму. Першы ў беларускай літаратуры прыгодніцкі раман "Амок" (1929) пра паўстанне на Яве, напісаны на матэрыяле, які атрымаў ад сяброў-эсперантыстаў. Тут шмат прыгод, таямнічага, загадкавага, апісана жыццё мясцовага насельніцтва, прырода. Гумарам, дынамічнымі дыялогамі, элементамі прыгодніцкага жанру адметна аповесць "Палескія рабізоны" (1930, паводле сцэнарыя Маўра экранізавана ў 1935). "Аповесць будучых дзён" (1932) – першая ў беларускай літаратуры спроба ў жанры сацыяльнай утопіі. Аповесць "ТВТ..." (1934) пра цікаўных, дапытлівых і вынаходлівых школьнікаў. У творы паэтызуецца павага да працы і добрых спраў. Асвойваў навукова-фантастычны і аўтабіяграфічны жанры. У 1927 апублікаваў казку "Вандраванне па зорках". Фантастычная аповесць "Фантамабіль прафесара Цылякоўскага" (1954-1955) прысвечана міжпланетным падарожжам. Сваёй асноўнай кнігай лічыў аўтабіяграфічную аповесць "Шлях з цемры" (частка 1-я напісана ў 1920, апублікавана ў 1984, частка 2-я – ў 1956, апублікавана ў 1960, частка 3-я – 1957, апублікавана ў 1975). У ёй паказаў сваё дзяцінства, вучобу ў рамесным вучылішчы, у настаўніцкай семінарыі, раскрыў дыялектыку душы галоўнага героя. Глыбокім псіхалагізмам вызначаюцца яго апавяданні "Бярозавы конь", "Яно", "Шчасце", "Максімка", "Завошта?". Маўр – аўтар п'есы "Памылка" (1940), аднаактовак "Хата з краю" (1941), "Балбатун" (1946), рэдактар кнігі "Ніколі не забудзем" (1948) – успамінаў дзяцей пра вайну. На беларускую мову пераклаў паасобныя творы Дз. Маміна-Сібірака, М. Прышвіна, А. Чэхава, Х.К. Андэрсэна, Ж. Верна, Р. Кіплінга, М. Твена і інш.

У 1972 Маўру прысуджаецца дзяржаўная прэмія Беларусі. З 1993 прысуджаецца літаратурная прэмія яго імя за лепшыя творы для дзяцей. Імем Маўра названа дзіцячая абласная бібліятэка ў Мінску.

**Вуліца** ў Фрунзенскім раёне Мінска атрымала імя Янкі Маўра ў 1973 годзе. Працягласць вуліцы 1774 м. – ад вуліцы Дуніна-Марцінкевіча да прамысловай зоны. На вуліцы размешчаны жылая забудова, гімназія № 149 і сярэдняя школа № 126, УП "Мінскі завод будаўнічых матэрыялаў", УП "Мінскі аптовы рынак", гастраном "Азарэнне".

**Літаратура:**


Маўр Янка // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т. 10. – Мн.: Беларуская энцыклапедыя, 2000. – С. 218.

Гурэвіч, Э.С. Янка Маўр : нарыс жыцця і творчасці. – Мн.: Навука і тэхніка, 1983. – 150с.

Яфімава, Маргарыта Барысаўна. Цэлы свет – дзецям: творчы партрэт Янкі Маўра. – Мінск : Выдавецтва БДУ, 1983. – 128с.,1 л. партр.

Рунец, П.Н. Чалавек з крылатай фантазіяй: [аб жыцці і творчай дзейнасці Янкі Маўра]. – Мн.: Нар.асвета, 1983. – 64с.

Миронов, А.Е. Дед Мавр: Повесть-воспоминания: [для детей ср.и ст.шк.возраста]. – Мн.: Маст. літ., 1979. – 168с., ил.

Жуковіч, М.В. Сістэма ўрокаў па вывучэнні аповесці Янкі Маўра "Палескія рабінзоны" ў VII класе // Беларуская мова і літаратура. – 2006. – № 3. – С. 3-17.

Мацвеева, Я. Урок па апавяданні "Шчасце" Янкі Маўра // Роднае слова. – 2006. – № 2. – С. 53-55.

Зубкоўскі, Б. Другое чаканне Маўра //Беларуская думка. – 2005. – № 5. – С. 172-177.

Яфімава, М. Летуценнік з краіны райскай птушкі // Маладосць. – 2003. – № 5. – С.106-110.

Ефимова, М. Таким он был... // Нёман. – 2003. – № 5. – С. 161-168.

Яфімава, М. "Чую біццё чалавечага сэрца" // Роднае слова. – 2003. – № 5. – С. 90-93.

10 мая - 115 год з дня нараджэння Янкі Маўра (1883 - 1971), пісьменніка // Новыя кнігі. Па старонках беларус. друку. – 1998. – № 1. – С. 20-22.

Яфімава, М.Б. Сустрэчы з Янкам Маўрам // Пачатковая школа. – 2003. – № 4. – С. 22-23.

Грышкова, І.М. Пісьменнік з багатай фантазіяй // Пачатковая школа. – 2003. – № 4. – С. 29-30.

(імёны)

## Мачульскі Раман Навумавіч
## (1903-1990)

**Мачульскі Раман Навумавіч** нарадзіўся 30.11.1903 ў в. Крываносы Старадарожскага р-на Мінскай вобл.

Скончыў Рэспубліканскую школу прапагандыстаў пры ЦК КП(б)Б (1937).З 1937 на партыйнай рабоце ў Грэску, Чэрвені, Плешчаніцах. У гады Вялікай Айчыннай вайны з'яўляўся сакратаром Мінскага падпольнага абкома партыі. У кастр. 1942 – маі 1943 выконваў абавязкі камандзіра Мінскага партызанскага злучэння, з жніўня 1943 камандзір партызанскага злучэння Барысаўска-Бягомльскай зоны. Герой Савецкага Саюза (1944). Пасля вайны – на гаспадарчай і партыйнай рабоце. Намеснік Старшыні Пэзідыума Вярхоўнага Савета БССР у 1947 – 1951. З 1950 1-ы сакратар Пінскага абкома КПБ, у 1954 – 1959 старшыня Брэсцкага аблвыканкама. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1947 – 1955, Вярхоўнага Савета СССР у 1954 – 1962. Аўтар мемуараў "Старонкі бессмяротнасці" (1972), "Людзі высокага абавязку" (1975), "Вечны агонь" (1978), "На вогненнай зямлі" (1983). Заслужаны работнік культуры БССР (1980).

**Вуліца** Фрунзенскага раёна Мінска носіць імя Р.Н. Мачульскага.

**Літаратура:**

Мачульскі Раман Навумавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 10. - Мн., 2000. - С. 235.

Мачульскі Раман Навумавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 5. - Мн., 1999. - С. 100.

Мінск. Выканаўчы кам. Аб прысваенні агульнаадукацыйнай сярэдняй школе № 104 г. Мінска імя Р.Н. Мачульскага // Минский курьер. – 2005. - 7 февр. - С. 5.

Доморад К. Партизанский вожак: [О Р.Н.Мачульском] // Ветераны ленинской партии. – Мн., 1987. – С. 191-204.

Кейзаров А.С. Эхо на Полесье: [О Герое Советского Союза Р.Н. Мачульском]. – М.: Политиздат, 1979. – (Герои Советской Родины).

Мачульский Р.Н. «Норма поведения – героизм!»: [Беседа с Героем Советского Союза, командиром партизанского соединения] // Знамя юности. – 1985. – 24 марта.

Мачульский Р. Крах операции «Корморан»: [Из воспоминаний Героя Советского Союза, бывшего командира Борисовско-Бегомльского соединения ] // Советская Белоруссия. – 1984. – 5 июня.

Мачульский Р. На огненной земле: [Записки Героя Советского Союза, бывшего секретаря Минского подпольного обкома партии о партизанском движении в Минской области]. – Мн.: Беларусь, 160 с.

[(імёны)]

## Панамарэнка Панцеляймон Кандратавіч
## (1902-1984)

**Панамарэнка Панцеляймон Кандратавіч** нарадзіўся 27.07.1902 на хутары Шалкоўскі Беларэчанскага р-на Краснадарскага краю, Расія.

Скончыў Маскоўскі ін-т інжынераў чыгуначнага транспарту (1932). У 1918 и 1932 – 1939 у Чырвонай Арміі. З 1922 на камсам. Рабоце. У 1936 ва Усесаюзным эл.-тэхн. ін-це. З 1937 у апараце ЦК ВКП(б). З 1938 па 1947 – першы сакратар ЦК КП(б)Б, адначасова у 1942 – 1944 з'яўляўся начальнікам Цэнтральнага штаба партызанскага руху пры Стаўцы Вярх. Галоўнакамандавання. Генерал-лейтэнант (1943). Член ваен. саветаў Заходняга, Цэнтральнага, Бранскага франтоў. Адзін з распрацоўшчыкаў і кіраўнік аперацы "рэйкавая вайна". У 1944 – вер. 1948 Старшыня СНК (з 1946 Савет Міністраў) БССР. У першыя пасляваен. гады шмат зрабіў для аднаўлення і развіцця разбуранай вайной народнай гаспадаркі Беларусі. У 1948 – 1953 сакратар ЦК ВКП(б), адначасова ў 1950 – 1953 міністр нарыхтовак СССР. У 1953 – 1954 міністр культуры СССР. З 1955 на дыпламатычнай рабоце. У 1961 – 1962 прадстаўнік СССР у Міжнар. агенцтве па атамнай энергіі ў Вене. У 1965- 1978 на выкладчыцкай рабоце. Даследчык гісторыі партызанскага руху і падпольнай барацьбы, аўтар кніг "Партызанскі рух у Вялікай Айчыннай вайне" (1943), "Усенародная барацьба ў тыле нямецка-фашысцкіх захопнікаў, 1941 – 1944" (1986). Узнагароджаны трымя ордэнамі Леніна.

У гонар П.К. Панамарэнкі названа **вуліца** Фрунзенскага раёна Мінска.

**Літаратура:**


Панамарэнка Панцеляймон Кандратавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 12. - Мн., 2001. - С. 42.

Панамарэнка Панцеляймон Кандратавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 5. - Мн., 1999. - С. 398.

Пономаренко Пантелеймон Кондратьевич // Их именами названы...: Энцикл. справ. – Мн., 1987. - С. 491.

Николаев В.М. Преемник Сталина: [О партийном и государственном деятеле П.К.Пономаренко: Беседа с его бывшим помощником В.М. Николаевым] // Патриот. – 2003. – нояб. (№ 45/46). – С.8-9, 12.

Колос А. Десять лет у руля Беларуси: [О политическом, государственном деятеле П.К. Пономаренко] // Рэспубліка. – 1998. – 5 чэрв. – С. 11; 6 чэрв. – С. 7.

За парадай да «бацькі» Сталіна: [Пра версію аб заступніцтве першага сакратара ЦК КПБ П.К.Панамарэнкі за Я.Купалу І Я.Коласа: Па дакументах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь] // ЛіМ. – 1993. – 15 кастр. (№41). – С.3, 14 – 15.

Сульянов А. Допишет время…: [О первом секретаре КП Беларуси П.Пономаренко] // Неман. – 1993. - № 3. – С. 163 – 171.

Чернявский И. «Знай, мол, наших…»: Мои встречи с первым секретарем ЦК КП белоруссии П.К. Пономаренко // Коммунист Белоруссии. – 1989. - №12. – С.54-56.


**[(імёны)]**

## Панчанка Пімен Емяльянавіч
## (1917-1995)

**Панчанка Пімен Емяльянавіч** нарадзіўся 23.08.1917 у г. Талін, Эстонія.

Беларускі паэт, народны паэт Беларусі (1973). Ганаровы акадэмік Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі (1994).

У 1933 працаваў рабочым у Бабруйску. Скончыў педагагічныя курсы ў Бабруйску (1934), Мінскі педагагічны інстытут (1939). З 1934 настаўнічаў на Магілёўшчыне. З 1939 ў Чырвонай Арміі, удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі (верасень 1939). У Вялікую Айчынную вайну быў спецыяльным карэспандэнтам армейскіх і франтавых газет. З 1946 з'яўляўся загадчыкам аддзела часопіса "Вожык", з 1948 – загадчыкам аддзела, намеснікам галоўнага рэдактара газеты "Літаратура і мастацтва". З 1953 быў галоўным рэдактарам

альманаха “Советская Отчизна”, з 1958 – часопіса “Маладосць”. У 1966-1971 Сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Друкаваўся з 1934. У першых зборніках “Упэўненасць” (1938), “Вераснёвыя сцягі” (1940) настрой і пачуцці яго пакалення – рамантычна-ўзнёслыя парыванні, летуценні маладосці і кахання, трывога ў прадчуванні нарастаючай пагрозы вайны. У гады вайны стварыў зборнікі “Табе, Беларусь” (1942), “Дарога вайны” (1943), “Далёкія станцыі” (1945), галоўныя тэмы якіх – горыч растання з Беларуссю, вера ў яе вызваленне, героіка народнага змагання. Вершы ваеннага часу (“Краіна мая”, “Будуць вечна сады расцвітаць...”, “Герой” і інш.) спалучаюць чыстыя, светлыя малюнкі жыцця з драматычным, нярэдка па-баладнаму сціслым і ёмістым паказам ваенных выпрабаванняў. Уражанні ад знаходжаня з савецкімі войскамі ў Іране (1944-1945) сабраны ў патрыятычным цыкле “Іранскі дзённік” (1944-1947). У зборніках “Гарачыя вятры” (1947), “Вершы” (1948), “Прысяга” (1949), “За шчасце, за мір!” (1950), “Вершы і паэмы” (1952), “Шырокі свет” (1955) тэма мірнай працы, суровая памяць вайны, услаўленне працоўнага энтузіязму, імкненне да сацыяльнай значнасці і дзейснасці паэзіі. Вынік паездак у ЗША і іншыя краіны – зборнікі “Кніга вандраванняў і любові” (1959), “Нью-Йоркскія малюнкі” (1960), “Тысячы небасхілаў” (1962), “Чатыры кантыненты” (1964). Сведчаннем творчай сталасці з’яўляюцца зборнікі “Пры святле маланак” (1966, Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Я. Купалы, 1968), “Снежань” (1972), “Крык сойкі” (1976), “Вячэрні цягнік” (1977), “Дзе начуе жаўранак” (1979, у перакладзе на рускую мову, Дзяржаўная прэмія СССР 1981), “Маўклівая малітва” (1981), “Лясныя воблакі” (1985) і іншыя, дзе найбольш поўна рэалізаваліся магчымасці і выявіліся лепшыя рысы таленту Панчанкі. Паэт ярка выражанага грамадзянска-публіцыстычнага тэмпераменту, глыбока ўражлівы, па-маладому няўрымслівы; ён усё жыццё працягваў змаганне за маральна-этычную вартасць і сутнасць чалавечай асобы, за нацыянальную свядомасць, мову і культуру беларусаў. З сярэдзіны 1980-х яго творчасць вылучаецца публіцыстычнай адкрытасцю, трыбуннасцю, вастрынёй прамаўлення, сатырычным пафасам і адначасова застаецца па-ранейшаму глыбока лірычнай, уражлівай, чуйнай да чужога болю (кнігі “І вера, і вернасць, і вечнасць”, 1986; “Горкі жолуд”, 1988; “Высокі бераг”, 1993). У пасмяротную кнігу паэзіі розных гадоў “Зямля ў мяне адна” (1996) увайшла і напісаная ў гады вайны паэма “Вандраванне ў нянавісць”. Панчанка – аўтар лірычных паэм “Беластоцкія вітрыны” (1940), “Маладосць у паходзе” (1946), “Патрыятычная песня” (1957, Літаратурная прэмія імя Я. Купалы 1959) і іншых. Выступаў як крытык: кнігі “На паэтычным небасхіле” (1977) і “Высокі бераг” (1993), у якіх змешчаны артыкулы, эсэ, успаміны пра Я. Купалу, Я. Коласа, А. Куляшова, А. Фадзеева і іншых пісьменнікаў, пра падзеі літаратурнага жыцця. Пераклаў на беларускую мову асобныя творы А. Міцкевіча, М. Нагнібеды, Я. Райніса, А. Суркова, Ф. Шылера і іншых.

**Вуліца** ў Фрунзенскім раёне Мінска атрымала імя П. Панчанка ў 1996 годзе. Працягласць вуліцы 885 м. – ад вуліцы Сухарэўскай да вуліцы акадэміка Фёдарава. На вуліцы размешчаны жылая шматпавярховая забудова, сярэдняя школа № 199, гастраном “Днестр” і інш.

**Літаратура:**


Панчанка Пімен Емяльянавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.12. – Мн., 2001. – С. 56-57.

Пімен Панчанка : [Кніга-альбом / Аўт.тэксту М. Стральцоў]. – Мн., 1987. - 72с.

Бярозкін, Рыгор Саламонавіч. Пімен Панчанка: крытыка-біягр. нарыс / Рыгор Бярозкін. – Мн.: Беларусь, 1968. – 231 с.

Лазарук, Міхаіл Арсеневіч. Пімен Панчанка: літ.-крыт. нарыс / М. Лазарук. –Мн.: Дзяржвыд БССР, 1959. – 144 с.

Ляшук, В.Я. Вывучэнне жыцця і творчасці Пімена Панчанкі ў 10 класе // Беларуская мова і літаратура. - 2007. - № 8. - С. 51-61.

Барадзіна, М.В. Праблематыка паэзіі Пімена Панчанкі // Беларуская мова і літаратура. - 2007. - № 8. - С. 48-50.

Капцялова, А.В. Экалагічная скіраванасць верша Пімена Панчанкі "Сармацкае кадзіла" // Беларуская мова і літаратура. - 2007. - № 8. - С. 44-48.

Запрудскі, І. Чытайце Брыля, чытайце Панчанку // Маладосць. - 2007. - № 8. - С. 127-130.
Алейнік, Л. "Пакуль сонца не згасне, пакуль свецяцца зоры..." // Полымя. - 2007. - № 8. - С. 172-176.
Ляшук, В.Вывучэнне творчасці Пімена Панчанкі //Роднае слова. – 2007. – № 1. – С. 46-53.
Куляшова, В. Адчуць сябе плыўцом... // Род. слова. - 2005. - № 1. - С.89-90.
Дзёрзкае праўдалюбства // Аўрамчык М. Знаёмыя постаці.- Мн., 2004. - С.137-149.
Законнікаў, С. Народжаная для любові // Род. слова. - 2004. - № 3. - С.92-94.
Пра чалавечнасць Пімена Панчанкі // Бугаёў Д. Служэнне Беларусі. - Мн., 2003. - С.181-190.
Бугаёў, Д. Пра чалавечнасць Пімена Панчанкі // Род. слова. - 2003. - № 12. - С.77-80.
Навумчык, М. Праблемны аналіз верша "Сармацкае кадзіла" Пімена Панчанкі // Род. слова. - 2003. - № 12. - С.37-39.
Дарняк, Ю. "Не дай мне, Божа, стаць ілжывым..." // Род. слова. - 2003. - № 12. - С.18-20.
Старычонак, В. "Я вершы пішу, бо дужа растрывожаны любоўю і болем за кожнага з вас" // Род. слова. - 2002. - № 8. - С.33-35.
Дзям`янка, В. Педагагічная майстэрня // Род. слова. - 2002. - № 7. - С.50-51.
Гарэлік, Л. Кантрасты і парадоксы жыцця // Род. слова. - 2002. - № 7. - С.22-26.
Званы чалавечнасці // Макарэвіч, В. Пяро і бліскавіца.- Мн., 2001. - С.292-319.
Бородулин, Р. Сам себя не выдумывал // Нёман. - 2000. - № 12. - С.206-217.
Гніламёдаў, У. З любоўю і болем // Полымя. - 2000. - № 8. - С.187-211.
Бельскі, А. "Каб... навек засталіся людзьмі" // Род. слова. - 2000. - № 10. - С.44-48.
Барадулін, Р. Сам сябе не выдумляў... // Полымя. - 2000. - № 4. - С.162-173.
Лісты Аркадзя Куляшова і Максіма Танка да Пімена Панчанкі // Полымя. - 1997. - N8. - С.279-306.
Законнікаў, С. "Любоў мая цяжкая..." // Полымя. - 1997. - N8. - С.263-278.
Аўрамчык, М. Дзёрзкае праўдалюбства // Маладосць. - 1997. - N8. - С.229-237.
Бураўкін, Г. З жаўранкам у душы // Роднае слова. - 1997. - N8. - С.177-185.
Панчанка, П. Зямля ў мяне адна // Полымя. - 1997. - N5. - С.308-314.

(імёны)

## Прытыцкі Сяргей Восіпавіч
## (1913-1971)

**Прытыцкі Сяргей Восіпавіч** нарадзіўся 01.02.1913 у в. Гаркавічы Падляскага ваявоцтва, Польшча.

Дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. У 1933 за рэв. Дзейнасць зняволены ў турму. У 1934 – 1935 вучыўся у парт. школе КПЗБ у Мінску. 7.1.1936 у Віленскім акр. судзе ў час працэсу над 17 рэвалюцыянерамі страляў у правакатара, у час арышту цяжка паранены. У 1936 прыгавораны да пакарання смерцю. Дзякуючы актыўнаму пратэсту грамадскасці, смяротны прыгавор заменены пажыццёвым турэмным зняволеннем. У вер. 1939 вызвалены з турмы. Пасля вызвалення Зах. Беларусі 1939 – 1941 нам. старшыні Беластоцкага аблвыканкома. У Вялікую Айчынную вайну адзін з арганізатараў патрыятычнага падполля і партызанскага руху на Беларусі. Са жн. 1941 на фронце, удзельнічаў у стварэнні абарончых збудаванняў вакол Магілёва і фарміраванні нар. апалчэння ў Гомелі, у 1942 - 1944 другі сакратар ЦК ЛКСМБ. У 1944 -1945 нам. начальніка, начальнік Польскага штаба партызанскага руха. У мірны час займаў адказныя дзяржаўныя пасады. У 1949 – 1962 сакратар Гродзенскага, Баранавіцкага, Маладзечанскага, Мінскага абкомаў КПБ. У 1962 – 1968 сакратар ЦК КПБ. З 1968 Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР. Аўтар успамінаў пра рэв. рух у Зах. Беларусі, партыз. барацьбу ў Вялікую Айчынную вайну. Пра яго дзейнасць зняты маст. кінафільм “Чырвонае лісце” (1958).

**Вуліца** Фрунзенскага раёна Мінска названа яго імем ў 1971, на доме № 32 і доме, дзе ён жыў (Бранявы зав.,4) мемарыяльныя дошкі.

**Літаратура:**

Прытыцкі Сяргей Восіпавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 13. - Мн., 2001. - С. 85.

Прытыцкі Сяргей Восіпавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 5. - Мн., 1999. - С. 584.

Притыцкий Сергей Осипович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 498.

Притыцкий Сергей Осипович // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 342-343.

Якутов В. Д. Сергей Притыцкий: Страницы биографии. – Мн.: Беларусь, 1991. – 175 с.: ил.

Егорычев В. Красные листья / Владимир Егорычев // Советская Белоруссия (Беларусь сегодня). – 2013. – С. 6.

Вальковский М. Портрет в интерьере эпохи // Рэспубліка. – 2003. - 15 лют. - С. 15.

Белугин А. Он отдал себя народу: [С.О. Притыцкий (1913 – 1971) – советский партийный и государственный деятель Беларуси] // Беларуская думка. – 1993. - №3. – С.70-73.

## Пушкін Аляксандр Сяргеевіч (1799 – 1837)

**Пушкін Аляксандр Сяргеевіч** нарадзіўся 6.06.1799 у Маскве.

Рускі пісьменнік, пачынальнік новай рускай літаратуры, заснавальнік сучаснай рускай літаратурнай мовы.

Скончыў Царскасельскі ліцэй (1817). Ліцэйскія гады – перыяд інтэнсіўнага творчага развіцця Пушкіна: сваеасабліва выкарыстаўшы каноны рацыяналістычнай паэтыкі класіцызму, ён напісаў вершы “Успаміны ў царскім сяле”, “Гарадок”, “Ліцынію” і інш. Па заканчэнні ліцэя служыў у Калегіі замежных спраў. Уваходзіў у літаратурныя гурткі “Зялёная лампа”, “Арзамас”. У вершах гэтага часу вольналюбівыя настроі, імкненне пераадолець нарматыўнасць паэтыкі 18 – пач. 19 ст., адысці ад жанрава-стылевой рэгламентацыі, дасягнуць свабоды паэтычнага слова (“Вольнасць”, 1817, “Да Чаадаева”, 1818, “Вёска”, 1819 і інш.). Вольналюбівыя і антытыранічныя матывы ранняй лірыкі, незалежнасць асабістых паводзін сталі прычынай ссылак: паўднёвая (1820–1824, Екацярынаслаў, Каўказ, Крым, Адэса) і ў в. Міхайлаўскае (Пскоўская вобласць, маёнтак маці, 1824–1826). Паўднёвая ссылка – перыяд росквіту рамантызу Пушкіна, які найбольш выявіўся ў створаных тут паэмах. У творчасці Пушкіна “паўднёвыя паэмы” адыгралі вялікую ролю: “Каўказкі нявольнік” (1820–1821, апубл. у 1822), у многім падрыхтаваў “Яўгена Анегіна”; важнае месца ў далейшым будзе адведзена тэме мяцежнай “волі” і маральнага закона, заяўленых у “Братах – разбойніках” (1821–1822), супастаўленню і проціпастаўленню гармоніі і стыхіі, “анёльскага” і “дэманічнага”, пачатыя ў “Бахчысарайскім фантане” (1821–1823). У гэтых паэмах упершыню выразна акрэсліваецца філасофскі падыход Пушкіна да праблем свабоды, кахання, асобы. У Міхайлаўскім стварыў шэраг паэтычных шэдэўраў: “Перайманне Карана”, “Я помню дзіўнае імгненне”, “Жаданне славы”, сатырычную паэму “Граф Нулін”(1825, апубл. 1827), цэнтральныя главы (3–6) рамана ў вершах “Яўген Анегін”; вывучаў гісторыю Расіі, запісваў народныя песні і казкі.

Вырашальным момантам творчай эвалюцыі Пушкіна стала трагедыя “Барыс Гадуноў” (1824–25, апубл. 1831), якая заклала асновы рэалізму, народнасці, гістарызму ў рускай літаратуры. У верасні 1826, пасля пакарання і ссылкі дзекабрыстаў, Пушкін атрымаў “дараванне”, але за ім была ўстаноўлена асабістая царская цэнзура. У яго павялічылася цікавасць да гісторыі Расіі як дзяржавы, да дзейнасці Пятра I, да праблемы месца і ролі

асобнага чалавека ў гісторыі краіны. Раман пра свайго продка “Арап Пятра Вялікага” (1827–1828, не завершаны, апублік. 1837) – першая спроба працы Пушкіна у буйных празаічных жанрах; гістарычнае мінулае ў ім паказана ў паўсядзённым побыце, у канкрэтных асобах і лёсах. Восень 1830 Пушкін правёў у в. Болдзіна (Ніжагародская вобласць, маёнтак бацькі), дзе за тры месяцы стварыў 50 твораў розных жанраў.

У 1836 годзе пачаў выдаваць часопіс “Современник”. У паэме “Медны коннік” (1833, апубл. 1837) на велізарную вышыню абагульнення ўзнята тэма дзяржавы і асобы, гісторыі і асобнага лёсу, узаемаадносін чалавека і свету, у сімвалічным плане спрадвечна–трагедыйных калізій, яія ўзнікаюцьу гэтых узаемаадносінах, глыбокі філасофскі сэнс набывае тэма вар’яцтва (“Медны коннік”; “Пікавая дама” 1833, апубл. 1834; верш “Не дай мне божа страціць розум” і іншыя). Пушкін упершыню паставіў многія вядучыя праблемы рускай літаратуры: народ як гістарычная сіла і маральны крытэрый (“Барыс Гадуноў”); асоба ў яе ўзаемаадносінах з асяроддзем і абставінамі (“Яўген Анегін”, “Медны коннік”); лёс “маленькага чалавека” (цыкл “Аповесці нябожчыка Івана Пятровіча Белкіна”, “Стрэл”, “Завея”, “Паненка–сялянка”); улада грошай над чалавечымі душамі (“Пікавая дама”) і іншыя. У маленькіх трагедыях (“Скупы рыцар”, “Моцарт і Сальеры”) на матэрыяле розных краін і гістарычных эпох у гранічна лаканічнай форме даследуюцца філасофскія і маральныя праблемы усечалавечага маштаба, дадзены глыбокія ўзоры філасофска–псіхалагічнай драмы.

Значэнне творчасці і масштабы генія Пушкіна дазваляюць назваць яго выключнай з’явай сусветнай культуры. Яго мастацкія дасягенні вызначылі і шмат чым абумовілі далейшая развіццё рускай і іншых літаратур.

Пэўнае месца ў творчасці Пушкіна заняла гісторыя Беларусі, лёс беларускага народа. У маі 1820 і жніўні 1824 паэт праязджаў праз беларускія землі. У артыкуле “Збор твораў Георгія Каніскага, архіепіскапа Беларускага” (1836) ён пісаў пра пакуты “народа спрадвечна нам роднага, але адлучанага ад Расіі лёсам вайны”, сцвярджаючы адзінства рускага і беларускага народаў. Ведаць пра Беларусь Пушкін мог ад кіраўніка Болдзінскага маёнтка беларуса В.М. Пянькоўскага. Сучаснікі сцвярджалі, што прататыпам героя рамана “Дуброўскі” быў беларускі дваранін Астроўскі (як спачатку і называўся раман). Творчасць Пушкіна зрабіла велізарны ўплыў на развіццё беларускай літаратуры.Шырокае асваенне беларускай літаратурай ідэйна-мастацкіх традыцый Пушкіна пачалося з прыходам у літаратуру Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча. Творы Пушкіна на беларускую мову перакладалі М.Багдановіч, Я.Купала, Я.Колас, К.Чорны, К.Крапіва, А.Куляшоў, П.Глебка, А.Аляксандровіч, А.Якімовіч, Р.Барадулін, А.Бачыла, П.Броўка, М.Лужанін, М.Танк і інш.

У Мінску яго імем назван **праспект** (1966), мемарыяльная дошка на доме № 41.

**Літаратура:**


Пушкін Аляксандр Сяргеевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.13. – Мінск, 2001. – С. 138-140.

Тыркова-Вильямс, А. Жизнь Пушкина: [в 2 т.] / Ариадна Владимировна Тыркова–Вильямс. – М.: Молодая гвардия. – 2006. – Т.1. – 471с., [16]л.ил. – (Жизнь замечательных людей : серия биографий вып.1169 (969)).

Тыркова-Вильямс, А. Жизнь Пушкина: [в 2 т.] / Ариадна Владимировна Тыркова–Вильямс. – М.: Молодая гвардия. – 2006. – Т.2. – 514с., [16]л.ил. – (Жизнь замечательных людей : серия биографий вып. 1170 (970)).

Терц, А. Прогулки с Пушкиным : [новое прочтение и истолкование великих книг прошлого и великой писательской судьбы] / Абрам Терц (Андрей Синявский). – Москва : Глобулус, 2005. – 110с. – ( Литературный семинар).

Ткачев,М. Мицкевич и Пушкин: истоки и традиции русской поэзии / Михаил Ткачев. – Минск : Славянский путь, 2003. – 199с.

Сергуненков, Б. Пушкинские ключи / Б. Сергуненков // Наш современник. – 2010. – № 2. – С. 141-149.

Юстинская, Г.М. Искусство слова и личностный рост читателя / Г.М. Юстинская // Народная асвета. – 2010. – № 1. – С. 21-25.

Исаченкова, Н.В. Чудо болдинской осени / Н.В. Исаченкова // Литература в школе. – 2007. – № 3. – С. 41-45.

Передреев, А. Мир поэта / А. Передреев // Наш современник. – 2007. – № 1. – С. 229-232.

Коленчикова, Н.В. "Друзья мои, прекрасен наш союз!" / Н.В. Коленчикова // Литература в школе. – 2007. – № 1. – С.38-41.

Хрунова, Ю.А. Урок пушкинского стиха / Ю.А. Хрунова // Литература в школе. – 2006. – № 11. – С.42-44.

Баршчэўскі, Л. Ранні рускі рамантызм. Жыццё і творчасць Аляксандра Пушкіна / Лявон Баршчэўскі, Пятро Васючэнка, Міхась Тычына // Роднае слова. – 2006. – № 2. – С. 48-52.

Люкевіч, В.В. Пушкін і Гогаль у мастацкім светаўспрыманні Якуба Коласа і Івана Буніна (XI клас) / В.В. Люкевіч // Беларуская мова і літаратура. (У дапамогу педагогу). – 2006. – № 2. – С. 41-48.

(імёны)

## Скрыганаў Вікенцій Васілевіч (1903-1945)

**Скрыганаў Вікенцій Васілевіч** нарадзіўся 22.06.1903 у в. Надзейкавічы Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.

У Чырв. Арміі з 1920, удзельнік грамадз. вайны і баёў з інтэрвентамі на Зах. і Паўд. франтах. Скончыў пяхотную школу (1925), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1938). Да 1935 у войсках БВА: камандзір батарэі, нам. нач. штаба брыгады, нач. артылерыі палка. У Вялікую Айчынную вайну з 1942 намеснік камандзіра, камандзір стралковай дывізіі, удзельнічаў у баях на Паўднёвым, Закаўказскім, Паўночна-Каўказскім, Паўночна-Заходнім, 3-м, 2-м, 1-м Украінскіх франтах. Стралковая дывізія на чале з генерал-маёрам В.В. Скрыганавым вызначылася на тэрыторыі Польшчы, у студзені 1945 дывізія з баямі выйшла да ракі Одэр і фарсіравала яе. Герой Савецкага Саюза (1945). Памёр ад ран.

У гонар В.В.Скрыганава названа **вуліца** (1964) ва Фрунзенскім раёне Мінска, на доме № 1 мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Скрыганаў Вікенцій Васілевіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 14. - Мн., 2002. - С. 472.

Скрыганаў Вікенцій Васілевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 6. – Кн. 1. - Мн., 2001. - С. 325.

Скрыганов Викентий Васильевич // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 554-555.

Скрыганов Викентий Васильевич // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 368.

Вперед на Берлин: [О В.В.Скрыганове] // Петраченко Д.Н. Именами героев. – Мн., 1978. – С. 31-33.

Лизарев А. Герой битвы на Одере: [О командующем 14-й гвардейской стрелковой дивизии им. Фабрициуса, гвардии генерал-майоре В.В.Скрыганове] // Гомельские ведомости. – 2003. – 16 окт. – С.4.

Пристром И. Сердцем заслонивший Родину: [К 100-летию со дня рождения Героя Советского Союза генерал-майора В.В.Скрыганова, уроженца Беларуси] // Во славу Родину. – 2003. – 24 июля.

Петрачэнка Д. Герой Одэрскай пераправы: [Пра В.В.Скрыганава] // Мінская праўда. – 1971. – 20 жніўня. –( Іх імёнамі названы вуліцы).

(імёны)

## Скрыпнікаў Леанід Антонавіч (1930 - 1963)

**Скрыпнікаў Леанід Антонавіч** нарадзіўся 13 красавіка 1930 г у с. Чарнянка Чарнянскага раёна Белградскай вобласці, Расія.

З 18 кастрычніка 1950 года па 12 лістапада 1953 - курсант, камандзір аддзялення, памочнік камандзіра ўзвода вучэбна-танкавага батальёна вайсковай часці 6214.

23 Верасень 1958 года прыняты на службу ў органы ўнутраных спраў - залічаны курсантам ў Мінскую спецыяльную сярэднюю школу міліцыі МУС СССР, з 1 кастрычніка 1960 - дзяржаўтаінспектар ДАІ ўпраўлення міліцыі Мінгарвыканкама, з 1 лютага 1961 года - оперупаўнаважаны крымінальнага вышуку Фрунзенскага РАУС г. Мінска. Спецыяльнае званне - лейтэнант міліцыі.

3 жніўня 1963 г. пры выкананні службовага абавязку пры затрыманні злачынца атрымаў пранікальнае нажавое раненне, ад якога 10 жніўня 1963 года памёр. Пахаваны на Кальварыйскіх могілках г. Мінска.

Яго імем названая **вуліца** (2002) ў Фрунзенскім раёне г. Мінска і ўстаноўлена мемарыяльная дошка. Імя Скрыпнікава Л.А. занесена на мемарыяльныя дошкі ГУУС Мінгарвыканкама і Фрунзенскага РУУС г. Мінска.

На падставе рашэння адміністрацыі Фрунзенскага раёна г. Мінска № 273 ад 17.04.2009 г. Скрыпнікава Леаніда Антонавіча, які загінуў пры выкананні свайго службовага абавязку па абароне правоў і законных інтарэсаў грамадзян, прысвоена званне «Ганаровы жыхар Фрунзенскага раёна горада Мінска» пасмяротна.

**Літаратура:**

Олейник, Е. Тайна Кембриджского списка / Евгений Олейник // Минский курьер. – 2011. – 14 дек. – С. 12.

## Фёдараў Фёдар Іванавіч
## (1911 – 1994)

**Фёдараў Фёдар Іванавіч** нарадзіўся 19.6.1911 г. у в. Турэц Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці.

Беларускі фізік-тэарэтык, заснавальнік навуковай школы па тэарэтычнай фізіцы. Акадэмік АН Беларусі (1966, чл.-кар. з 1956), доктар фізіка-матэматычных навук (1955), прафесар (1957). Герой Сацыялістычнай Працы (1978). Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1968). Сын Я.Маўра. Скончыў БДУ (1931), дзе і працаваў з 1936 (у 1938—1941 і ў 1943 — 1962 загадчык кафедры, у 1943—1950 дэкан), адначасова ў 1936—1938 і 1953—1955 у Фізіка-тэхнічным інстытуце АН Беларусі. З 1955 загадчык лабараторыі, з 1987 галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута фізікі, з 1963 акадэмік-сакратар Аддз. фізіка-матэматычных навук, з 1987 саветнік прэзідыума АН Беларусі. Ініцыятар стварэння і першы прэзідэнт (1990) Беларускага фізічнага таварыства.

Навуковыя працы па крышталяоптыцы, тэорыі пругкіх хваль у крышталях, фізіцы элементарных часціц, квантавай тэорыі поля, тэорыі гравітацыі. Пабудаваў тэорыю аптычных уласцівасцей магнітных і паглынальных крышталёў, развіў каварыянтныя метады прамога тэнзарнага злічэння ў оптыцы і акустыцы крышталёў. Распрацаваў метад праектыўных аператараў у тэорыі элементарных часціц, вектарную параметрызацыю групы Лорэнца. Прапанаваў універсальную фармулёўку нелінейных ураўненняў фундаментальных фізічных палёў, развіў тэтрадны падыход у агульнай тэорыі адноснасці. Прадказаў новую з'яву ў галіне крышталяоптыкі, зарэгістраваную як адкрыццё (1980). Дзяржаўная прэмія Беларусі 1972, Дзяржаўная прэмія СССР 1976.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (1996).

**Літаратура:**

Фёдараў Фёдар Іванавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 16. – Мінск, 2003. – С. 366.

Академик Ф.И. Федоров // Люди белорусской науки : воспоминания современников / [составители: О.А.Гапоненко, Н.В.Токарев; под редакцией А.И.Лесниковича]. – Минск, 2007. – Вып. 1. – С. 391-443.

(імёны)

## Цімашэнка Сямён Канстанцінавіч
## (1895-1970)

**Цімашэнка Сямён Канстанцінавіч** нарадзіўся 19.02.1895 у в. Фурманаўка Кілійскага р-на Адэскай вобл., Украіна.

Дзяржауны і ваенны дзеяч СССР. У арміі з 1915, у Чырв. Арміі з 1918. Удзельнік 1-й сусветнай вайны. У грамадз. вайну камандаваў узводам, эскадронам, палком, кав. брыгадай, дывізіяй. Скончыў вышэйшыя ваен. – акад. курсы (1922), курсы ўдасканалення вышэйшага камсаставу (1927), курсы камандзіраў-адзінаначальнікаў пры Ваен. – паліт. акадэміі (1930). З 1925 камандаваў кав. корпусам. З 1933 нам. камандуючага войскамі БВА, з 1935 – Кіеўскай ваен. акругі. З 1937 камандуючы войскамі Паўн. – Каўказскай, Харкаўскай, Кіеўскай асобай ваен. акруг. У час паходу Чырв. Арміі ў Зах. Украіну (1939) камандаваў Укр. фронтам. У сав. – фін. вайну 1939 – 1940 камандаваў войскамі Паўн. – Зах. фронту, які са значнымі стратамі прарваў "лінію Манергейма". 1940 - 1941 нарком абароны СССР, на пачатку Вялікай Айчыннай вайны старшыня Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандавання, галоўнакамандуючы вайскамі Зах., Паўд. – Зах., Паўн. – Зах., Сталінградскага франтоў. Пасля вайны камандуючы войскамі Баранавіцкай (1945 - 1946), Паўд. – Уральскай (1946 – 1949), Беларускай (1946, 1949 – 1960) ваен. акруг. Маршал Савецкага Саюза (1940). Двойчы Герой Савецкага Саюза (1940, 1965). З 1960 у Групе ген. інспектараў Міністэрства абароны СССР, у 1961 – 1970 старшыня Сав. камітэта ветэранаў вайны. Узнагароджаны ордэнам "Перамога".

**Вуліца** Фрунзенскага раёна Мінска (1977) і спартыўна-стралковы комплекс названы яго імем, на доме № 14 вуліцы і на будынку Міністэрства абароны РБ мемарыяльныя дошкі.

**Літаратура:**

Цімашэнка Сямён Канстанцінавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 17. - Мн., 2003. - С. 114.

Цімашэнка Сямён Канстанцінавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 6. - Кн. 2. - Мн., 2003. - С. 103.

Тимошенко Семён Константинович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 600-601.

Тимошенко Семён Константинович // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 403.

Иоффе Э.Г. Нарком обороны: [С.К.Тимошенко] // Иоффе Э.Г. Советские военачальники на белорусской земле: Путеводитель по местам жизни и деятельности. - Мн., 1988. – С.163-166.

Козлов И. Маршал Тимошенко / Игорь Козлов // 7 дней. – 2013. – 31 янв. – С. 12-13.

Лисевич О. Назначенный революцией: Правда и ложь о маршале С.К.Тимошенко // Во славу Родины. – 2004. – Начало: 18 февр., окончание: 18 марта.

Таварыш Маршал: [Пра С.К. Цімашэнку] // Звязда. – 1975. – 18 лют.

Артыка Г. Выдатны савецкі военачальнік: Да 75-годдзя з дня нараджэння маршала Савецкага Саюза С.К.Цімашэнкі // Вячэрні Мінск. – 1970. – 18 лют.

## Ціміразеў Клімент Аркадзевіч
## (1843-1920)

Гл. Цэнтральны раён

(імёны)

## Чыгладзе Сярго Гедэванавіч
## (1923-1944)

**Чыгладзе Сярго Гедэванавіч** нарадзіўся 12.03.1923 у в. Зоды Чыятурскага р-на, Грузія.

Удзельнік баёў на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. На фронце з 1943. Малодшы сяржант, кулямётчык С. Чыгладзе вызначыўся ў баі пры вызваленні в. Дуброва

Светлагорскага р-на Гомельскай вобл. З групай разведчыкаў 1.02.1944 уварваўся ў вёску, знішчыў з кулямёта больш за 70 гітлераўцаў. Паранены не пакінуў поля бою і прадаўжаў наступленне: заглушыў 2 кулямётныя кропкі ворага, знішчыў каля 50 гітлераўцаў. Загінуў у гэтым баі. Герой Савецкага Саюза (1944).

**Вуліца** Фрунзенскага раёна Мінска названа яго імем у 1976, на доме № 4 мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**


Чыгладзе Сярго Гедэванавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 17. - Мн., 2003. - С. 296.

Чигладзе Серго Гедеванович // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 669.

Чигладзе Серго Гедеванович // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 438-439.

Салаўёў Н. У імя будучага: [Пра Героя Савецкага Саюза грузіна С.Г.Чыгладзе, які загінуў пры вызваленні вёскі Дуброва Светлагорскага раёна] // Вячэрні Мінск. – 1982. – 12 крас.

Жура М. Пісьмы з Грузії: [Пра удзельніка Вялікай Айчынай вайны, грузіна С.Чыгладзе] // Чырвоная змена. – 1979. – 3 ліп.

Меквабишвили В. Вечная память: [Серго Чигладзе, участник освобождения Белоруссии от немецких захватчиков] // Коммунист. – 1964. – 4 июня.


(імёны)

## Шамякін Іван Пятровіч
## (1921 – 2004)

**Шамякін Іван Пятровіч** нарадзіўся 30.1.1921г. у в. Карма Добрушскага раёна Гомельскай вобласці.

Беларускі пісьменнік, грамадскі дзеяч. Народны пісьменнік Беларусі (1972). Акадэмік Нацыянальнай АН Беларусі (1994, чл.-кар. 1980). Герой Сацыялістычнай Працы (1981).

Скончыў Гомсльскі тэхнікум будаўнічых матэрыялаў (1940), Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КП(б)Б (1950). У 1945—1948 настаўнічаў, з 1950 рэдактар Беларускага дзяржаўнага выдавецтва, з 1952 галоўны рэдактар альманаха «Советская Отчизна». .З 1954 намеснік старшыні, з 1966 сакратар, з 1968 2-і сакратар, з 1971 1-ы намеснік старшыні, з 1976 1-ы сакратар праўлсння Саюза пісьменнікаў Беларусі. У 1980—1992 галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя». У 1971—1985 Старшыня Вярхоўнага Савета БССР.

Друкуецца з 1941 (нарысы і вершы). Першая аповесць — «Помста» (1945). Раман «Глыбокая плынь» (1947—1948, Дзяржаўная прэмія СССР 1951) пра падзеі часоў акупацыі і ўсенароднага змагання супраць фашыстаў на Гомельшчыне. Асэнсаванне пасляваеннай рэчаіснасці ў кн. аповесцей і апавяданняў «На знаёмых шляхах» (1949), «У Маскву» (1950), «Дзве сілы» (1951), «Апавяданні» (1952), «Першае спатканне» (1956), рамане «У добры час» (1953) і інш. У рамане «Крыніцы» (1956, Літаратурная прэмія імя Я. Коласа 1959) выкрыццё валюнтарысцкіх метадаў кіравання эканомікай, сацыяльным і палітычным жыццём. У пенталогіі «Трывожнас шчасце» («Непаўторная вясна», 1957; «Начныя зарніцы», 1958; «Агонь і снег» і «Пошукі сустрэчы», 1959; «Мост», 1965) лёс герояў асацыіруецца з лёсам усяго пакалення, якое прайшло праз цяжкія выпрабаванні вайны. змагаючыся з ворагам на франтах і ў партызанскіх атрадах, і ў цяжкіх пасляваенных умовах аднаўляла народную гаспадарку. Надзённыя праблемы жыцця ў зборніках прозы «Матчыны рукі» (1961), «Вячэрні сеанс» (1968). У раманах «Сэрца на далоні» (1963, разам з «Трывожным шчасцем» Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Я. Коласа 1968) і «Снежныя зімы» (1968) праблемы грамадзскай адказнасці чалавека перад самім сабой, народам, гісторыяй. Апавяданне «Хлеб», аповесці «Першы генерал» (апубл. пад назвай «Лес майго земляка»), «Браняпоезд «Таварыш Ленін» (абедзве 1970), кінааповесць «Эшалон прайшоў» (1971. кінафільм «Хлеб пахне порахам», 1974), раман «Петраград—Брэст» (1981—1983) на гісторыка-рэвалюцыйную тэму. У раманах «Атланты і карыятыды» (1974), «Вазьму твой боль» (1978, аднайм. кінафільм, 1981; Дзяржаўная прэмія Беларусі 1982) паказ актыўнай пазіцыі сучасніка, яго непрымірымасці да кансерватызму, бюракратызму. Аповесці «Шлюбная ноч»

(1975, кінафільм «Вясельная ноч», 1980) і «Гандлярка і паэт» (1976, аднайм. кінафільм, 1978) пра складаныя шляхі людзей з народных нізоў да актыўнай барацьбы ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У рамане «Зеніт» (1987) падзеі апошняга года Вялікай Айчыннай вайны. Аповесці «Ахвяры» (1990), «Падзенне» (1994), раман «Злая зорка» (1991), «Аповесці Івана Андрэевіча» (1993) і інш. пра жыццё Беларусі ў постчарнобыльскі час. У аповесцях «Выкармак» (1996), «Завіхрэнне» (1998), «Пошукі прытулку» (1999), «У засенні палаца», «Стары рамантык», рамане «Губернатар» (усе 2000) і інш. вострая крытыка сацыяльных выдаткаў працэсу капіталізацыі краіны, які прывёў да антыгуманных праяў у грамадстве. Раман «Вялікая княгіня» (1996) на гістарычную тэматыку. Майстрам вострага, дынамічнага сюжэта, займальнай інтрыгі выявіў сябе ў драматургічнай творчасці. Яго п'есы вызначаюцца шырокім падзейна-тэматычным і ідэйна-пафасным дыяпазонам. Творчая манера драматурга эвалюцыяніравала ад распрацоўкі дэтэктыўна-прыгодніцкіх фабул «Не верце цішыні» і паказу пераважна знешняй падзейнасці «Дзеці аднаго дома» да ўсебаковага даследавання мікракосмасу грамадства: рэзкай крытыцы падвергнута мяшчанства ў п'есе «Выгнанне блудніцы», праблемы няпростага сталення маладой асобы склалі сэнсава-выяўленчы. стрыжань п'ес «Экзамен на восень», «Баталія на лузе», «Залаты медаль». Псіхалагічная драма «І змоўклі птушкі» — апалогія чуласці, спагаднасці, душэўнай далікатнасці ва ўзаемаадносінах паміж людзьмі. Літаратурна-крытычныя артыкулы, выступленні, партрэты знаёмых і сваякоў у кнігах «Размова з чытачом» (1973). «Карэнні і галіны» (1986), аповесці «Слаўся. Марыя» (1999) і інш.

Імем І. П. Шамякіна названа **вуліца** ва Фрунзенскім раёне г. Мінска (2006). На доме, у якім жыў пісьменнік (вул. Я. Купалы, 11) – мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**


Шамякін Іван Пятровіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Т. 17. – Мінск, 2003. – С. 367-368.

Іван Шамякін: вядомы і невядомы : успаміны, эсэ, аповесць / [укладальнік Т. Шамякіна]. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. – 269, [2] с.

Іван Шамякін. Летапісец эпохі : успаміны, інтэрв'ю, эсэ / [укладанне А. Шамякінай]. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2010. – 381, [1] с., 1 л. партр., [24] л. фот. – (Жыццё знакамітых людзей Беларусі).

Гальперович, Н. На высоких крыльях воспоминаний : эссе / Наум Гальперович // Неман. – 2011. – № 7. – С. 186-193.

Дзегцярова, В. Маладое пакаленне ў рамане "Сэрца на далоні" Івана Шамякіна:урок беларускай літаратуры / Валянціна Дзегцярова // Роднае слова. – 2011. – № 9. – С. 62.

Мушынскі, М. Вайна, жанчына, каханне ў аповесці "Гандлярка і паэт" Івана Шамякіна/Міхась Мушынскі // Роднае слова. – 2011. – № 1. – С. 15-20.

Прохар, М. Эсхаталагічныя матывы Чарнобыля ў творчасці Івана Шамякіна / Маргарыта Прохар// Полымя. – 2011. – № 4. – С. 135-141.

Штэйнер, І. "Паклон табе, слынная кузніца кадраў!":Іван Шамякін і Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт / Іван Штэйнер // Роднае слова. – 2011. – № 1. – С. 21-24.

30 студзеня - 90 гадоў з дня нараджэння І.П. Шамякіна (1921-2004), народнага пісьменніка Беларусі : [бібліяграфічны спіс] / складальнікі М.А. Арлова, К.Д. Варанько, Н.А. Шашэнька; рэдактар К.Д. Варанько // Новыя кнігі. Па старонках беларускага друку. Даты беларускага календара (лістапад - снежань 2010 г., студзень - люты 2011 г.). – 2010. – № 10. – С. 25-27.


(імё ны)

## Шаранговіч Васіль Фаміч (1897-1938)

**Шаранговіч Васіль Фаміч** нарадзіўся 20.2(4.3). 1897 у в. Качаны Вілейскага павета Віленскай губерніі, цяпер Мядзельскі раён. Партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР, удзельнік барацьбы за савецкую ўладу на Беларусі, грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі 1918—1920. З 1918 у Чырвонай Арміі. У 1919—1920 на падпольнай партыйнай рабоце ў Мінскай губерніі, захопленай польскімі войскамі; ствараў партызанскія атрады, кіраваў баявымі

аперацыямі. У маі 1920 арыштаваны акупацыйнымі ўладамі паводле даносу правакатара і прыгавораны польскім дарожным надзвычайным судом да расстрэлу, які быў заменены 20 гадамі катаргі. У 1921 абменены савецкім урадам на польскіх вязняў, вярнуўся на Беларусь. З 1921 намеснік наркома юстыцыі, з 1922 пракурор БССР, з 1924 заг. арганізацыйнага аддзела і адказны сакратар Цэнтральнага савета прафесійных саюзаў Беларусі. У 1926—1929 на адказнай прафсаюзнай рабоце ў Сібіры. З 1929 1-ы сакратар Іркуцкага акр камітэта ВКП(б). У кастрычніку 1930 —лют. 1934 2-і сакратар і член Бюро ЦК КП(б)Б. На XVII з'ездзе ВКП(б) абраны членам Камісіі партыйнага кантролю пры ЦК ВКП(б), у 1934 упаўнаважаны КПК па Казахстане, у 1936 — па Харкаўскай вобласці 3 сак. да ліп. 1937 1-ы сакратар і член Бюро ЦК КП(б)Б. Член ЦК КП(б)Б у 1925—1927, 1932—1934, 1937. Член ЦВК БССР у 1925—1926, 1931—1934 і яго Прэзідыума ў 1931—1934.

Зняты з пасады 1-га сакратара ЦК КП(б)Б паводле пастановы Палітбюро ЦК ВКП(б) «Па пытанні аб кіраўніцтве КП(б)Б» ад 27.7.1937, зацверджанай пленумам ЦК КП(б)Б 29 ліпеня, арыштаваны ў той жа дзень ў Маскве. Неабгрунтавана абвінавачаны ў варожай дзейнасці супраць савецкай улады. 13.13.1938 ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны ў Маскве. Рэабілітаваны ў 1957.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (1978), на доме № 19 мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Шаранговіч Васіль Фаміч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 17. – Мінск., 2003. – С. 376-377.

Василий Фомич Шарангович // Иоффе, Э.Г. От Мясникова до Малофеева. Кто руководил БССР/ Э.Г. Іоффе. – Минск, 2008. – С. 84-87.

(імёны)

## Шырма Рыгор Раманавіч
## (1892 – 1978)

**Шырма Рыгор Раманавіч** нарадзіўся 20.1.1892 г. у в.Шакуны Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці.

Беларускі харавы дырыжор, фальклярыст, музычны і грамадскі дзеяч, публіцыст. Народны артыст Беларусі (1949). Народны артыст СССР (1955). Герой Сацыялістычнай Працы (1977).

Скончыў Седлецкі настаўніцкі інстытут (Польшча, 1908). З 1912 настаўнічаў; стваральнік і кіраўнік прафесійных і самадзейных харавых калектываў, у т.л. *Хору* Беларускага студэнцкага саюза ў Вільні. Займаўся культурна-асветніцкай і літаратурна-публіцыстычнай дзейнасцю (лектарскай, выдавецкай, наладжваў вечары славянскай песні, дні беларускай культуры і інш.). Сакратар Гал. управы Т*аварыства беларускаіі школы* (1926—1937), арганізатар, выдавец і аўтар друкаванага органа таварыства часопіса «Беларускі летапіс»і інш. Спрыяў творчаму станаўленню маладых беларускіх паэтаў М. Васілька, В. Таўлая. М. Засіма. С. Крыўца. М. Танка. Двойчы быў зняволены ўладамі Польшчы.

У 1940 арганізаваў і па 1970 узначальваў Дзяржаўную харавую капэлу Рэспублікі Беларусь (з 1978 яго імя). У І966—1978 старшыня праўлення Саюза кампазітараў Беларусі і сакратар праўлення Саюза кампазітараў СССР.

Збіральнік і даследчык беларускага музычнага фальклору, арыентаваўся на максімальна шырокі ахоп меладычных сты-ляў з уласцівымі лакальнымі тыпамі на-певаў. Асноўная частка іх увайшла ў фальклорныя зборнікі. у *т.л.* «Беларускія народныя песні» (1929), «Двесці беларускіх народных песень» (1958). «Беларускія народныя- песні» (т. 1—4, 1959—*1976).* Складальнік зборнікаў харавых апрацовак з рэпертуару Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы Беларусі «Беларускія народныя песні (для хору)» (т. 1—2, 1971—1973). Выступаў як публіцыст. музычны і літаратурны крытык (асн. артыкулы сабраны ў зб. «Песня — душа народа», 1976). Дзяржаўныя прэміі 1966, 1974.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (2008).

**Літаратура:**

Шырма Рыгор Раманавіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Т. 18, кн. 1. – Мінск, 2004. – С. 20.

Песня на ўсё жыццё : успаміны пра Р.Р. Шырму / [складальнік В.А. Сізко]. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1983. – 350с.

Рыгор Шырма / аўтар-складальнік В.Д. Ліцвінка. – Мінск : Беларусь, 1990. – 63с.

20 студзеня - 120 гадоў з дня нараджэння Р.Р. Шырмы (1892-1978), харавога дырыжора, фалькларыста, музычнага і грамадскага дзеяча, публіцыста, народнага артыста Беларусі і СССР // Новыя кнігі. Па старонках беларускага друку. Даты беларускага календара (лістапад-снежань 2011 г., студзень-люты 2012 г.). – 2011. – № 10. – С. 20-21.

(ім
ёны)

## Якубоўскі Іван Ігнатавіч
## (1912-1976)

**Якубоўскі Іван Ігнатавіч** нарадзіўся 7.01.1912 у в. Зайцава Горацкага р-на Магілёўскай вобл.

У Чырв. Арміі з 1932. Скончыў Аб`яднаную Бел. ваен. школу імя ЦВК БССР (1934), Ленінградскія бранятанкавыя курсы ўдасканалення каманднага саставу (1935), Ваен. акадэмію Генштаба (1943). З 1934 на камандных пасадах у войску, быў выкладчыкам у Пухавіцкім пяхотным вучылішчы, камандзірам вучэбнага батальёна. Удзельнік паходу Чырв. Арміі восенню 1939 у Зах.Беларусь і Зах. Украіну, сав. – фін. вайны 1939 – 1940. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 на Зах., Паўд., Паўд. – Зах.,Сталінградскім, Данскім, Бранскім, Цэнтр., Варонежскім і 1-м Укр. франтах: камандзір танкавага батальёна, палка, брыгады, нам. камандзіра танкавага корпуса. Удзельнік абарончых баёў пад Мінскам, Магілевам, Тулай і інш. Удзельнік Сталінградскай і Курскай бітваў, баёў на Беларусі, вызвалення Украіны, Польшчы, Львоўска-Сандамірскай, Сандамірска-Селезскай, Вісла-Одэрскай, Берлінскай і Пражскай аперацый. Пасля вайны камандаваў танкавай дывізіяй, бранятанк. і механіз. Войскамі ў Ленінградскай і Прыкарпацкай ваен. акругах і танкавай арміяй. З 1957 1-ы нам. і Галоўнакамандуючы Групай сав. войск у Германіі, з 1965 камандуючы войскамі Кіеўскай ваен. акругі. З 1967 1-ы нам. міністра абароны СССР і Галоўнакамандуючы Аб`яднанымі ўзбр. сіламі краін – удзельніц Варшаўскага дагавора. Маршал Савецкага Саюза (1967). Двойчы Герой Савецкага Саюза (студз., вер. 1944), герой Чэхаславакіі (1970). Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1961 – 1976. Аўтар кніг “Баявая садружнасць”, “Зямля ў агні” і інш.

Ва Фрунзенскам раёне Мінска яго імем названа **вуліца** (1978), на ёй устаноўлены бюст (2005), на доме № 15 кор. 1 - мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Мінск. Выканаўчы кам. Аб увекавечанні памяці двойчы Героя Савецкага Саюза Якубоўскага І.І. // Минский курьер. – 2004. - 15 нояб. - С. 6.

Якубоўскі Іван Ігнатавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. - Т. 18. - Кн. 1.- Мн., 2004. - С. 257.

Якубоўскі Іван Ігнатавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. - Т. 6. - Кн. 2. - Мн., 2003. - С. 292.

Якубовский Иван Игнатьевич // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 707.

Якубовский Иван Игнатьевич // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 452.

Долготович, Б. Иван Якубовский / Борис Долготович // Вечер. Минск. - 2010. - 26 янв. - С. 3.

Гавриленко Н. Память в бронзе // Сов. Белоруссия (Беларусь сегодня). – 2005. - 3 февр. - С. 9.

Гарэцкі П. Сустрэчы з маршалам [І. І. Якубоўскім] // Полымя. – 1995. - №7. – С. 232 – 239.

Володин Л. У дважды Героя Советского Союза [генерал-майора И.И.Якубовского] // Советская Белоруссия. – 1946. – 6 июня.

(ім
ёны)

## Янкоўскі Фёдар Міхайлавіч
## (1918 – 1989)

**Янкоўскі Фёдар Міхайлавіч** нарадзіўся 21.9.1918 у в. Клетнае Глускага раёнаМагілёўскай вобласці.

Беларускі мовазнавец, пісьменнік; заснавальнік беларускай фразеалогіі. Заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1972). Доктар філалагічных навук (1970), прафесар (1971). Скончыў Гродзенскі педагагічны інстытут (1948). Працаваў настаўнікам. З 1953 у Мінскім педагагічным інстытуце (у 1956—1982 заг. кафедры). Даследаваў фанетыку, арфаэпію, лексіку, фразеалогію, граматыку беларускай народнай і літаратурнай мовы, яе гісторыю: «Дыялектны слоўнік» вып. 1—3, 1959—1970), «Беларускае літаратурнае вымаўленне» (1960), «Беларуская фразеалогія» (1981), «Гістарычная граматыка беларускай мовы» (1983) і нш. Упершыню ў беларускім мовазнаўстве аткрыў сутнасць перакладу фразеалагізмаў (немагчымасць даслоўнага перакладу, неабходнасць падбору адпаведнікаў у мове перакладу). Складальнік зборнікаў крылатых слоў і афарызмаў, прыказак і прымавак, параўнанняў, фразеалагічных і тлумачальных слоўнікаў: «Крылатыя словы і афарызмы: З беларускіх літаратурных крыніц» (1960), «Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы» (1962), «Беларуская фразеалогія. Фразеалагізмы, іх значэнне і ўжыванне» (1968), «Фразеалагічны слоўнік. Для сярэдняй школы» (1973, у сааўт.). адзін з аўтараў і рэдактар дапаможнікаў для ВНУ («Сучасная беларуская літаратурная мова», 1976, і інш.). Пісаў навелы, апавяданні, літаратурныя мініяцюры (кн. “Абразкі», 1975; «Прыпыніся на часіну», 1979; «І за гарою пакланюся», 1982; «Радасць і боль», 1984; «Само слова гаворыць», 1986; «З нялёгкіх дарог», 1988) інш.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (1994).

**Літаратура:**

Янкоўскі Фёдар Міхайлавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 18, кн. 1. – Мінск, 2004. – С.273.

Яўдошына, Л. Устаўныя канструкцыі ў прозе Фёдара Янкоўскага / Ларыса Іванаўна Яўдошына// Роднае слова. – 2009. – № 6. – С. 42-46.

Яўдошына, Л. Адметнасці сінтаксічнай арганізацыі прозы Федара Янкоўскага / Ларыса Яўдошына // Роднае слова. – 2008. – № 9. – С. 47-51.

Гаўрош, Н. Чарадзей роднага слова: да 90-годдзя з дня нараджэння Федара Янкоўскага / Ніна Гаўрош, Ніна Нямковіч // Роднае слова. – 2008. – № 9. – С. 45-46.

Новік, М. "Напіцца... з самой крыніцы": вобраз маці-матулі ў мастацкай прозе Федара Янкоўскага / Марыя Новік// Роднае слова. – 2008. – № 9. – С. 52-56.

Буланда, В. Нястомны руплівец: сцэнарый вечарыны, прысвечанай жыццю і творчасці Федара Янкоўскага / Вера Буладна // Роднае слова. – 2008. – № 9. – С. 82-89.

21 верасня - 90 год з дня нараджэння Ф.М. Янкоўскага (1918-1989), мовазнаўца, пісьменніка, фальклярыста // Новыя кнігі. Па старонках беларускага друку. Даты беларускага календара (ліпень-верасень 2008 г.). – 2008. – № 5. – С. 28-32.

(на пачатак)

# Цэнтральны раён

(імёны)

## Азізаў Дамуло
## (1913-1943)

**Азізаў Дамуло** нарадзіўся 2.03.1913 у кішлаке Кастакоз Хаджэнцкага р-на Самаркандскай вобл., Узбекістан.

З 1935 настаўнічаў на радзіме. На фронце з 1942. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра ў Лоеўскім р-не Гомельскай вобл. 15.10.1943 адным з першых уварваўся ў варожую

траншэю, знішчыў групу аўтаматчыкаў праціўніка. Загінуў у баі. Герой Савецкага Саюза (1943).

**Вуліца** Цэнтральнага раёна Мінска атрымала імя Д.Азізава ў 1976, на доме № 2 знаходзіцца мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Азизов Домулло // Герои Советского Союза: Краткий биогр. слов. - В 2 т. – Т. 1. - М., 1987. - С. 31-32.

Азизов Домулло // Их именами названы...: Энцикл справ. - Мн., 1987. - С. 22.

(імёны)

## Антонаў Аляксей Інакенцьевіч (1896-1962)

**Антонаў Аляксей Інакенцьевіч** нарадзіўся 27.09.1896 у г.Гродна.

Ваенны дзеяч. Генерал Арміі (1943). Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1931) і акадэмію Генштаба (1937). У арміі з 1916, у Чырвонай Арміі з 1919. Удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў. З 1938 на выкладчыцкай рабоце. У Вялікую Айччынную вайну начальнік Штаба Паўднёвага, Паўночна-Каўказскага і Закаўказскага франтоў, Чарнаморскай групы войскаў. З 1942 1-ы нам. начальніка Генштаба і начальнік Аператыўнага ўпраўлення, удзельнік распрацоўкі плана Беларускай аперацыі 1944. З лют. 1945 начальнік Генштаба, удзельнік Крымскай і Берлінскай (Патсдамскай) канферэнцый. У 1946 – 1948 і з 1954 1-ы нам. начальніка Генштаба, з 1955 адначасова начальнік Штаба Аб`яднаных узброеных сіл дзяржаў – удельніц Варшаўскага Дагавора.

**Вуліца** Цэнтральнага раёна Мінска атрымала імя А.І.Антонава ў 2004.

**Літаратура:**

Антонаў Аляксей Інакенцьевіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 1. - Мн., 1996. - С. 387.

Антонаў Аляксей Інакенцьевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Т. 1. - Мн., 1993. - С. 123-124.

Антонаў Аляксей Інакенцьевіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 39.

(імёны)

## Бакунін Міхаіл Аляксандравіч (1814 – 1876)

**Бакунін Міхаіл Аляксандравіч** нарадзіўся 30.05.1814 г. у в. Прамухіна Таржоцкага раёна Цвярской вобласці, Расія.

Рускі сацыяліст-утапіст, адзін з заснавальнікаў і тэарэтыкаў анархізму. Атрымаў ваенную адукацыю. У 1840 выехаў за мяжу. Як прыхільнік стварэння агульнаславянскай федэрацыі быў адным з арганізатараў Славянскага з'езда 1848 у Празе. За ўдзел у рэвалюцыях 1848—1849 у Еўропе саксонскім і аўстрыйскім ваенным судом двойчы прыгавораны да пакарання смерцю. У 1851 выдадзены рускім уладам. Адбываў пакаранне ў Петрапаўлаўскай і Шлісельбургскай крэпасцях, ссылку ў Заходняй Сібіры, адкуль уцёк за мяжу. У Лондане супрацоўнічаў з А.Герцэнам і М.Агаровым у «Колоколе». Падтрымаў паўстанне 1863—1864, звязваючы з ім ідзею на агульнаславянскае паўстанне. У 1864 стварыў тайнае «Інтэрнацыянальнае брацтва», у 1868 — «Альянс сацыялістычнай дэмакратыі», які далучыўся да 1-га Інтэрнацыянала. З-за асабістага канфлікту з К.Марксам і праграмна-тэарэтычных разыходжанняў у 1872 выключаны з 1-га Інтэрнацыянала. Стварыў міжнародную анархісцкую арганізацыю, якая дзейнічала да 1878.

У сваіх філасофскіх і грамадска-палітычных поглядах эвалюцыяніраваў ад гегельянства да радыкальнага анархізму, анархісцкую ідэю свабоды асобы аб'яднаў з ідэяй калектыўнай уласнасці. Бакунін прыкметна паўплываў на народніцкі рух, быў прыхільнікам ідэі сялянскага бунту. Анархісцкая тэорыя Бакуніна канчаткова склалася да канца 1860-х г. У поглядах на прыроду прытрымліваўся матэрыялізму, імкнуўся сфармуляваць вучэнне пра грамадства ў духу прудонаўскай ідэі знішчэння дзяржавы. Аўтар прац «Аб філасофіі» (1840), «Навука і надзённая рэвалюцыйная справа» (1870), «Бізунова-

германская імперыя і сацыяльная рэвалюцыя» (1871), «Дзяржаўнасць і анархія» (1873) і інш.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1922).

**Літаратура:**

Бакунін Міхаіл Аляксандравіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.2. - Мінск, 1996. - С. 234.

Бакунин Михаил Александрович // Их именами названы…: энциклопедический справочник.- Минск,1987. - С. 46 – 47.

Бакунин Михаил Александрович // Минск: энциклопедический справочник. – Минск,1983.-С.84 - 85.

Судьбы революционного народничества: (М.А.Бакунин, П.Л.Лавров, П.Н.Ткачев) // История России в портретах. – Т. 1. - Смоленск;Брянск, 1996. - С.103-138.

(імёны)

## Гай Гая Дзмітрыевіч
## (1887 – 1937)

**Гай Гая Дзмітрыевіч (сапр. Бжышкян Гайк)** нарадзіўся 18.2.1887г. у г. Тэбрыз, Іран.

Савецкі ваенны дзеяч, камкор (1935). Прафесар (1933). Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1927). Удзельнік 1-й сусветнай вайны, прапаршчык. З 1918 камандзір 1-й зводнай Сімбірскай пяхотнай дывізіі, з 1919 камандуючы 1-й арміяй Усходняга фронту. У 1920 на Заходнем фронце, камандзір 3-га коннага корпуса. З 1922 нарком па ваенных справах Арменіі. З 1923 камандзір і ваенком 7-й Самарскай кавалерыйскай дывізіі, якая размяшчалася на Беларусі. У 1924 адрадзіў 3-і конны корпус, названы імем БССР (штаб знаходзіўся ў Мінску). З 1933 выкладчык, начальнік кафедры Ваенна-паветранай акадэміі. Член ЦВК БССР у 1924 — 1925. Аўтар прац і нарысаў па гісторыі грамадзянскай вайны. У 1935 арыштаваны, расстраляны. Рэабілітаваны.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1964).

**Літаратура:**

Гай Гая Дзмітрыевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.4. - Мінск, 1997. - С. 436.

Гай Гая Дмитриевич // Их именами названы…: энциклопедический справочник.- Минск,1987. - С. 130.

Гай Гая Дмитриевич // Минск: энциклопедический справочник. – Минск,1983.-С. 133.

Иоффе, Э. Комкор Гай / Эмануил Иоффе // Вечер. Минск. - 2007. - 19 февр. - С. 2.

(імёны)

## Гастэла Мікалай Францавіч
## (1907 – 1941)

**Гастэла Мікалай Францавіч** нарадзіўся 6.5.1907 г. у г.Масква, Расія.

Герой Савецкага Саюза (1941). Беларус. Скончыў Луганскую ваенную школу лётчыкаў (1933). У Чырвонай Арміі з 1932. Удзельнік баёў на р. Хал-хін-Гол у 1939, савецка-фінляндскай вайны 1939 — 1940. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны капітан Гастэла камандаваў эскадрылляй, удзельнічаў у бамбардзіроўцы танкавых і механізаваных калон праціўніка. 26 чэрвеня ў час бамбардзіроўкі варожай танкавай калоны на дарозе Маладзечна—Радашковічы з членамі экіпажа А.А.Бурдзенюком, А.А.Калініным, Р.М.Скарабагатавым накіраваў ахоплены полымем самалёт на скопішча варожых танкаў, аўтамашын і бензацыстэрнаў. На месцы подзвігу, на шашы Мінск – Вільнюс, помнік-мемарыял экіпажу.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1947).

**Літаратура:**

Гастэла Мікалай Францавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.5. - Мінск, 1997. - С. 86.

Гастелло Николай Францевич // Их именами названы…: энциклопедический справочник. - Минск,1987. - С. 137 - 138.

Гастелло Николай Францевич // Минск: энциклопедический справочник. – Минск,1983. - С.133.

Гастелло // Минский курьер. - 2009. - 17 янв. - С. 8.

Ермоленко,В. Навечно в памяти народной // Неман. - 2007. - № 5. - С. 140-146.

Гастелло,В. Память об отце // Наш современник. - 2007. - № 5. - С. 151-158.

(імёны)

## Герцэн Аляксандр Іванавіч
## (1812 – 1870)

**Герцэн Аляксандр Іванавіч** (псеўд. Іскандэр) нарадзіўся 6.4.1812 у г. Масква.

Рускі пісьменнік, публіцыст, філосаф. Вучыўся ў Маскоўскім універсітэце (1829—1833). Духоўнае развіццё адбывалася пад уплывам дзекабрыстаў, рускай літаратуры, французскага асветніцтва і утапічнага сацыялізму. У 1834 за ўдзел у студэнцкім палітычным гуртку, які заснаваў разам з М.Н.Агаровым, Герцэн арыштаваны і высланы ў Перм, потым у Вятку. У 1842 вярнуўся ў Маскву. У філасофскіх працах 1840-х г. (цыклы арт. «Дылетантызм у наву-цы», 1842—1843, і «Пісьмы пра вывучэнне прыроды», 1845—1846) матэрыялістычна вытлумачыў асновы гегелеўскай дыялектыкі. У літаратурнай творчасці Герцэн праходзіць эвалюцыю ад рамантызму ранніх аповесцей і драм да рэалізму ў рамане «Хто вінаваты?» (ч. 1—2, 1845—1846), аповесцях «Доктар Крупаў» (1847) і «Сарока-зладзейка» (1848). З 1847 у эміграцыі; еўрапейскі нацыянальна-вызваленчы рух і рэвалюцыйныя ўзрушэнні адлюстраваліся ў яго творах мастацкай публіцыстыкі — цыклах артыкулаў «Пісьмы з Францыі і Італіі» (1847—1852) і «З таго берага» (1847—1850). Пасля паражэння еўрапейскіх рэвалюцый 1848—1849 распрацаваў тэорыю «рускага сацыялізму», стаў адным з пачынальнікаў народніцтва. У 1853 заснаваў у Лондане Вольную рускую друкарню, выдаваў альманах «Полярная звезда» (1855—1868) і газету «Колокол» (1857—1867, разам з Агаро-вым). Літаратурная і грамадская дзейнасць Герцэна падрыхтавала з'яўленне «Былога і дум» (1852—1868) — аднаго з лепшых твораў рускай мемуарнай літаратуры, у якім раскрыта цэлая эпоха духоўнага развіцця рускай інтэлігенцыі, а асабісты лёс пісьменніка ўключаны ў шырокі гістарычны кантэкст. У канцы жыцця Герцэн імкнуўся зразумець і прыняць навуковы сацыялізм. Падтрымліваў нацыянальна-вызваленчы рух у Польшчы, Беларусі і Літве, выступаў за нацыянальнае самавызначэнне беларусаў. Выданні Вольнай рускай друкарні распаўсюджваліся на Беларусі, а газета «Колокол» пісала пра бяспраўнае становішча беларускага сялянства, дэспатызм памешчыкаў, арміі і ўрадавай бюракратыі, вітала «Мужыцкую праўду» К.Каліноўскага. Народніцкія і рэвалюцыйна-дэмакратычныя ідэі Герцэна паўплывалі на станаўленне света-погляду Ф.Багушэвіча, АТурыновіча і інш. беларускіх пісьменнікаў. У перакладзе на беларускую мову выдадзены «Былое і думы» (т. 1, ч. 1—2, 1940), раман «Хто вінаваты?», аповесці «Сарока-зладзейка», «Доктар Крупаў» і інш. (у кн. «Мастацкія творы», 1941).

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1922).

**Літаратура:**

Герцэн Аляксандр Іванавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.5. - Мінск, 1997. - С. 202.

Герцен Александр Иванович // Их именами названы…: энциклопедический справочник. - Минск,1987. - С.140 - 141.

Герцен Александр Иванович // Минск: энциклопедический справочник. – Минск,1983.-С.135.

Тодоров,Л.В. Драматургический стих Грибоедова / Л.В. Тодоров // Литература в школе.- 2007.- №9.- С. 7-11.

Пантин,И.К. А.И. Герцен: начало либерального социализма / И.К. Пантин // Вопросы философии.- 2006.- № 3.- С. 118-131.

(імёны)

## Грыбаедаў Аляксандр Сяргеевіч
## (1795 – 1829)

**Грыбаедаў Аляксандр Сяргеевіч** нарадзіўся 15.1.1795 (паводле іншых крыніц 1790) у г.Масква.

Рускі пісьменнік, дыпламат. Скончыў Маскоўскі універсітэт (1810). У 1812 пайшоў добраахвотнікам у армію, у 1813—1816 служыў у Кобрыне, Брэсце. У 1816 у Пецярбургу зблізіўся з А.Пушкіным, В.Кюхельбекерам, П.Каценіным. 3 1817 на службе ў Калегіі замежных спраў, у 1818—1822 сакратар рускай дыпламатычнай місіі ў Персіі. У 1826 за сувязь з дзекабрыстамі арыштаваны, але з-за адсутнасці доказаў вызвалены. 3 1828 паўнамоцны пасол Расіі ў Персіі. Забіты ў Тэгеране фанатычным натоўпам мусульман (пахаваны ў Тбілісі). Аўтар камедый «Студэнт» (1817, выд. 1889, з Каценіным), «Свая сям'я, ці Замужняя нявеста» (1818, з А.Шахаўскім і М.Хмяльніцкім), «Прытворная нявернасць» (1818, з А.Жандрам). Сусветную вядомасць Грыбаедаву прынесла камедыя ў вершах «Гора ад розуму» (нап. 1822—1824). Забароненая цэнзурай (пры жыцці аўтара апублікаваны толькі ўрыўкі ў альманаху Ф.В.Булгарына «Русская Талия за 1825 г. »), камедыя распаўсюджвалася ў рукапісах (налічвалася каля 40 тыс. экз.). Поўнасцю ў Расіі яна надрукавана ў 1862. «Гора ад розуму» — адзін з самых злабадзённых і вольналюбівых твораў рускай драматургіі 19 стагоддзя. Сінтэтычнасць драматургічнай паэтыкі Грыбаедава (спалучэнне ямба з жывой мовай), сінтэз традыцый і наватарства стварылі новую эстэтычную якасць — мастацкі рэалізм, які стаў этапным у развіцці рускай і сусветнай драматургіі. У Гомельскім абласным краязнаўчым музеі зберагаецца унікальны варыянт камедыі (належаў графу І.Ф.Паскевічу) з радкамі на рускай і французскай мовах, дапісаных рукой Грыбаедава. На беларускую мову камедыю пераклаў М. Лужанін (1949), у 1963 яна была пастаўлена ў Магілёўскім драматычным тэатры.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1947).

**Літаратура:**


Грыбаедаў Аляксандр Сяргеевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.5. - Мінск, 1997. - С. 469.

Грибоедов Александр Сергеевич // Их именами названы…: энциклопедический справочник.- Минск,1987.- С.163.

Грибоедов Александр Сергеевич // Минск: энциклопедический справочник. – Минск,1983.-С.144.

Сергеенко Н.Е. Изучение комедии А.С. Грибоедова "Горе от ума"/ Н.Е. Сергеенко // Русский язык и литература. Серия "У дапамогу педагогу". - 2008. - № 8. - С. 22-30.

Радомская,Т.И. Проблемы книги, ума и знания в творческом мире А. С. Грибоедова / Т.И. Радомская // Литература в школе. - 2007. - № 10. - С. 11-13.

Гапоненко,П.А. Урок-спор по комедии А. С. Грибоедова "Горе от ума". IX класс / П.А. Гапоненко // Литература в школе. - 2007. - №9. - С. 27-30.

Влащенко,В.И. Сны в произведениях Грибоедова и Пушкина ("Горе от ума" и "Метель")В.И. Влащенко // Литература в школе. - 2007. - №9. - С. 2-7.

(імёны)

## Даватар Леў Міхайлавіч
## (1903-1941)

**Даватар Леў Міхайлавіч** нарадзіўся 20.02.1903 у в. Хоціна Бешанковічскага р-на Віцебскай вобл.

У 1924-1926 служыў у 7-й Самарскай дывізіі, штаб якой размяшчаўся ў Мінску. Скончыў кавалерыйскае вучылішча (1926), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1939). У пярыяд Вялікай Айчыннай вайны з жн. па верас. 1941 кавалерыйская група на чале з генерал-маёрам Л.Даватарам зрабіла рэйд па тылах ворага ў Смаленскай вобл., вяла абарончыя баі на р.Мёжа на Валакаламскім напрамку. З ліст. 1941 камандаваў кавалерыйскім корпусам, удзельнічаў у абароне Масквы, паказаў сябе мужным і таленавітым камандзірам, за якога гітлераўцы прызначылі вялікую ўзнагароду. Загінуў у баі каля в. Палашкіна на подступах да г. Руза Маскоўскай вобл. Герой Савецкага Саюза (1941). Помнікі ў яго гонар знаходзяцца на шашы Лепель – Ула, у в. Хоціна, г. п. Ула, дзе ёсць і мемарыяльны музей Л.Даватара.

**Вуліца** ў Цэнтральным раёне Мінска названа яго імем у 1953, на доме № 1 мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Даватар Леў Міхайлавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т.5. - Мн., 1997. - С. 561.
Доватор Лев Михайлович// Их именами названы...: Энциклопедический справочник. – Мн.,1987. – С. 178-179.
Петухов А. В белоснежных полях под Москвой // Минский курьер. – 2005. - 13 янв. - С. 5.
Иофф Э. "Красный генерал" // Рэспубліка. – 2004. - 22 снеж. - С. 5.

**(імёны)**

## Даўман Анс Эрнеставіч
## (1885 – 1920)

**Даўман Анс Эрнеставіч** нарадзіўся 26.11.1885 на хутары Крэйпі, Рыжскага раёна, Латвія. Савецкі ваенны дзеяч. Скончыў Пскоўскае каморніцкае вучылішча (1906). Удзельнік рэвалюцыі 1905—1907. З 1914 на фронце, прапаршчык. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 гарадскі галава, потым старшыня выканкома Нарвенскага Савета, старшыня Нарвенскага ВРК. З 1918 на камандных і палітычных пасадах у Чырвонай Арміі. У кастрычніку 1919 — жніўні 1920 член РВС 16-й арміі ў Беларусі, адначасова ў чэрвені — ліпені 1920 начальнік 10-й стралковай дывізіі, удзельнік вызвалення Пухавіч, Клецка, Чэрвеня, Бярозы, Кобрына, Брэста ад польскіх войск. Загінуў у Брэсце. Узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонага Сцяга.

Яго імем названа **вуліца** (1928), на доме № 1 мемарыяльная дошка (1977).

**Літаратура:**

Даўман Анс Эрнеставіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.6. – Мінск, 1998. – С. 67.
Дауман Анс Эрнестович // Их именами названы...: энциклопедический справочник. – Мн.,1987. – С. 178-179.

**(імёны)**

## Дзімітроў Георгі Міхайлаў
## (1882 – 1949)

**Дзімітроў Георгі Міхайлаў** нарадзіўся 18.6.1882 г. у с. Кавачэўцы, каля г. Пернік, Балгарыя.

Палітычны і дзяржаўны дзеяч Балгарыі, дзеяч міжнароднага камуністычнага руху. Друкар. У 1902 — 1919 у сацыял-дэмакратычным, адначасова ў прафсаюзным руху (1905 — 1923). Дэпутат парламента (1913 — 1923). Адзін з заснавальнікаў і лідэраў Балгарскай камуністычнай партыі (1919), яе генеральны сакратар (з 1945). Адзін з арганізатараў

Вераснёўскага паўстання 1923, пасля яго ліквідацыі ўладамі эмігрыраваў. 9.3.1933 арыштаваны ў Берліне і абвінавачаны германскімі нацыстамі ў падпале рэйхстага, на Лейпцыгскім працэсе 1933 даказаў сваю невінаватасць, яго прамова на працэсе зрабіла значны ўплыў на фарміраванне антыфашысцкага руху. У 1937 — 1945 у СССР. Генеральны сакратар Выканкома Камуністыстычнага Інтэрнацыянала (1935 — 1943), прапанаваў ідэю Народнага фронту. У 1946 — 1949 старшыня СМ Балгарыі.

У Мінску яго імя носіць **вуліца** (1934) і **завулак.**

**Літаратура:**

Дзімітроў Георгі Міхайлаў // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.6. – Мінск, 1998. – С. 116.

Димитров Георгий Михайлович // Их именами названы...: Энциклопедический справочник. – Мн.,1987. – С. 188-199.

Ганчовский, Неделчо. Георгий Димитров, каким я его видел и запомнил / Неделчо Ганчовский.- Москва: Политиздат, 1979.- 383с.

(ім
ёны)

## Заборскі Георгій Уладзіміравіч
## (1909 – 1999)

**Георгій Уладзіміравіч Заборскі** нарадзіўся 11.11.1909 г. у Мінску.

Беларускі архітэктар. Заслужаны будаўнік Беларусі (1961). Народны архітэктар СССР (1981). Акадэмік Расійскай Акадэміі архітэктуры і будаўнічых навук (1995). Скончыў Ленінградскую Акадэмію мастацтваў (1939). У 1952 – 1964 выкладчык БПІ (дацэнт з 1954). Працаваў у інстытутах: “Белдзяржпраект”, “Мінскпраект”, з 1964 у БелНДІдзіпрасельбудзе (у 1966 – 1979 кіраўнік майстэрні).

Асноўныя работы ў Мінску: корпус Лечсанупраўлення (1948), ансамбль жылых дамоў на вул. Леніна (1949 – 1956), карпусы педагагічнага універсітэта (1951 – 1959), гасцініца Беларускага саюза мастакоў, Літаратурны музей Я. Коласа (абедзве 1952), рэканструкцыя будынка сувораўскага вучылішча (1953), Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (1967), кінатэатр “Піянер”, тэатр лялек (абедзве 1964).

Сааўтар генплана Полацка (1949). Сярод работ у сельскім будаўніцтве: сааўтар планіроўкі і забудовы вёсак Верцялішкі (Дзяржаўная прэмія СССР 1971), Сарачы і Рэдкавічы Любанска

га раёна (1969). Аўтар Палаца культуры, гандлёвага цэнтра у в. Сноў (1970-я г.) і інш.

Творы манументальнага мастацтва: манумент Перамогі, помнік Я. Коласу (1972) у Мінску, мемарыяльны комплекс Зыслаў.

У Мінску **вуліца** (каля сувораўскага вучылішча) носіць імя Г.У. Заборскага.

**Літаратура:**

Заборскі Георгій Уладзіміравіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.6. – Мінск, 1998. – С. 489.

Мінск., Выканаўчы камітэт. Аб установоўцы мемарыяльнай дошкі [архітектору Г.У.Заборскаму]: [Рашэнне, 18.11.2004, № 2371] // Минский курьер. – 2004. – 29 нояб. – С.7.

Малашенков, В. Линии зодчего бессмертны / Василий Малашенков // Вечер. Минск. – 2009. – 24 сент. – С. 4.

Казакова, А. Родной город - любимому зодчему / А. Казакова // Минский курьер. – 2005. – 3 июня. – С. 3.

Панаскина, Т. Памятник народному архитектору / Т. Панаскина // Вечер. Минск. – 2004. – 17 нояб. – С.1.

(імёны)

## Карастаянава Лілія Аляксандраўна
## (1917-1943)

**Карастаянава Лілія Аляксандраўна** нарадзілася 28.05.1917 у г.Лом, Балгарыя.

Удзельніца партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. З сям’і балгарскіх рэвалюцыянераў. За ўдзел у Вераснёўскім антыфаш. паўстанні 1923 бацька

расстраляны, маці разам з дзецьмі зняволена ў турму. З 1927 у СССР, выхоўвалася ў сям'і вядомага грамадскага дзеяча Е.М. Ярасла ўскага. З 1938 працавала ў рэдакцыі газеты "Комсомольская правда". У Вялікую Айчынную вайну спецкар газеты, з лістап. 1942 у партызанскіх атрадах на Браншчыне і Беларусі. 6.02.1943 загінула ў баі з фашыстамі каля в.Будзішча Чачэрскага р-на Гомельскай вобл.

**Вуліца** Цэнтральнага раёна атрымала імя Л.І. Карастаянавай у 1975, на доме № 1 знаходзіцца мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Карастаянава Лілія Аляксандраўна // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 251.

Карастоянова Лилия Александровна // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 258.

(імёны)

## Кірыла і Мяфодзій
## (827 – 869) (815 – 885)

**Кірыла і Мяфодзій** славянскія асветнікі, стваральнікі славянскай азбукі, прапаведнікі хрысціянства. Браты; нарадзіліся ў г. Салунь (цяпер Салонікі, Грэцыя). Большасць вучоных лічаць іх балгарамі.

**Кірыла** (да прыняцця манаства ў 869 — Канстанцін; каля 827 — 14 2.869). Атрымаў адукацыю пры двары імператара Міхаіла ў Канстанцінопалі, прыняў сан святара і стаў бібліятэкарам патрыярха Фоція. Пазней прызначаны настаўнікам філасофіі, за што празваны Філосафам. У пачатку 860-х г. з дыпламатычна-рэлігійнай місіяй наведаў хазар у грэчаскай калоніі Херсанес (Крым).

**Мяфодзій** (815 — 6.4.885). Быў на ваеннай службе і 10 гадоў кіраваў адной з падуладных Візантыі славяна-балгарскіх абласцей, потым ігумен манастыра Паліхрон на беразе Мармуровага мора.

У 863 Кірыла і Мяфодзій запрошаны ў Маравію для пропаведзі хрысціянства на славянскай мове. Прыбылі сюды са створанай імі славянскай азбукай і ўласнымі перакладамі рэлігійных кніг на славянскую мову, царкоўную службу вялі па-славянску. З-за незадаволенасці нямецкіх місіянераў, якія ў сваёй службе выкарыстоўвалі латынь, былі вымушаны пакінуць Маравію. У 867 па запрашэнні папы Мікалая I прыбылі ў Рым, дзе абаранялі права славян на родную мову ў літургіі. Пасля смерці ў Рыме Кірылы Мяфодзій пасвячоны ў сан епіскапа. У 882—884 жыў у Візантыі і Маравіі, дзе працягваў прапаведніцкую і асветніцкую дзейнасць.

Імёны Кірыла і Мяфодзія сталі сімвалам культурнай еднасці і самастойнасці славян. Назва старажытнай славянскай азбукі кірыліца паходзіць ад імя Кірыла. Браты фактычна сталі стваральнікамі літаратурнай стараславянскай мовы, зразумелай тады ўсім славянскім народам. На Беларусі пра дзейнасць Кірыла і Мяфодзія ведалі ўжо з 11 ст. праз творы Чарнарызца Храбра «О письменах» і праз жыцці Кірыла і Мяфодзія. Асветнікі кананізаваны праваслаўнай царквой як Роўнаапостальныя Кірыла і Мяфодзій, настаўнікі Славенскія.

11 мая (с. ст.) — Дзень св. Кірыла і Мяфодзія, якія ў Балгарыі, а з 1986 і ў славянскіх рэспубліках б. Савецкага Саюза, у т.л. на Беларусі, адзначаецца як дзень славянскага пісьменства і культуры. Ушаноўваюцца як святыя і каталіцкай царквой. У Балгарыі існуе ордэн Кірыла і Мяфодзія, якім на Беларусі ўзнагароджаны П. Броўка, Н. Гілевіч, В. Нікіфаровіч.

У Мінску **вуліца** носіць імя Кірыла і Мяфодзія (1990).

**Літаратура:**

Кірыла і Мяфодзій // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.8. – Мінск, 1999. – С. 285.

Тахиаос, Антоний-Эмилий Н.

Святые братья Кирилл и Мефодий, просвятители славян / Антоний-Эмилий Н.Тахиаос. – Сергиев Пасад: Свято-Троицкая Сергиева Лавра, 2005. – 391с.

Князев, А.С. Святые равноапостольные Кирилл и Мефодий просветители славян / А.С.Князев. – Минск: Православная инициатива, 2004. – 239с.

Истрин, В.А. 1100 лет славянской азбуки. – М.: Наука, 1988. – 192с.

(імёны)

## Кісялёў Ціхан Якаўлевіч
## (1917 – 1983)

**Кісялёў Ціхан Якаўлевіч** нарадзіўся 12.8.1917 у в. Агародня-Кузьмініцкая Добрушскага раёна Гомельскай вобласці. Дзяржаўны і партыйны дзеяч, Герой Сацыялістычнай Працы (1977). Скончыў Гомельскі педагагічны інстытут (1941), ВПШ пры ЦК ВКП(б) (1946). З 1936 на педадагічнай рабоце ў школах Ельскага раёна Гомельскай вобласці. З 1941 выкладчык, дырэктар школы ў Сталінградскай вобласці. З 1944 на партыйнай рабоце ў Гомелі, Брэсце. З 1952 1-ы сакратар Брэсцкага абкома КПБ, з ліпеня 1955 сакратар, затым 2-і сакратар ЦК КПБ. З 1959 Старшыня Савета Міністраў БССР, з 1978 1-ы намеснік старшыні Савета Міністраў СССР, з кастрычніка 1980 1-ы сакратар ЦК КПБ. Член ЦК з 1952, Бюро ЦК КПБ у 1955—1978 і з 1980. Член ЦК КПСС з 1961. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР з 1951, Вярхоўнага Савета СССР з 1954, намеснік старшыні Савета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР у 1958—1962. Член Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР і СССР з 1981.

Яго імем названа **вуліца** ў Мінску (1983).

**Літаратура:**

Кісялёў Ціхан Якаўлевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 8. – Мінск, 1999. – С. 296.

Киселев Тихон Яковлевич// Их именами названы...: Энциклопедический справочник. - Мн., 1987. - С. 271.

Антонович, С. Тихон Киселев // Судьба до востребования / Славомир Антонович. – Минск, 2011. – С. 7-28.

Иоффе Э. Роль Киселевых в истории Беларуси / Эмануил Иоффе// Беларуская думка.- 2008.- № 10.- С. 110-119.

Градюшко, Н. Его звали Тихон / Николай Градюшко // Рэспубліка. – 2007. – 11 жн. – С. 6.

(імёны)

## Ленін Уладзімір Ільіч
## (1870 – 1924)

**Ленін Уладзімір Ільіч (сапр. Ульянаў)** нарадзіўся 22.4.1870, г. Сімбірск, цяпер Ульянаўск, Расія.

Расійскі і савецкі палітычны, дзяржаўны дзеяч, дзеяч міжнароднага, рабочага руху. Нарадзіўся ў сям'і інспектара народных вучылішчаў, які стаў патомным расійскім дваранінам. Старэйшы брат Леніна пакараны смерцю (1887) за ўдзел у замаху на цара Аляксандра III. Ленін вучыўся ў Казанскім універсітэце (1887), з якога за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях выключаны і сасланы ў с. Какушкіна Казанскай губерніі Экстэрнам здаў экзамен за юрыд. факультет у Пецярбургскім універсітэце (1891). Працаваў пам. прысяжнага паверанага ў г. Самара. У 1895 удзельнічаў у стварэнні Пецярбургскага «Союза барацьбы за вызваление рабочага класа», арыштаваны і высланы на 3 гады ў с. Шушанскае Енісейскай губерніі. У ссылцы вітаў стварэнне ў Мінску ў 1898 Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (РСДРП) і асноўныя палажэнні яе «Маніфеста». У 1900 выехаў за мяжу і разам з Г.В.Пляханавым пачаў выданне газ. «Искра», якая падрыхтавала праект Праграмы

РСДРП. У розны час быў рэдактарам бальшавіцкіх газет «Пролетарий», «Рабочая газета», «Правда». На II з'ездзе РСДРП (1903, Брусель—Лондан) Ленін узначаліў бальшавіцкую плынь РСДРП.

У працах «Што рабіць?» (1902), «Крок наперад, два крокі назад» (1904) ён сфармуляваў ідэйныя і арганізацыйныя асновы партыі новага тыпу. З 1905 у Санкт-Пецярбургу, з 1907 зноў у эміграцыі. У перыяд рэвалюцыі 1905—1907 распрацоўваў тэорыю перарастання буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў сацыялістычную, абгрунтаваў неабходнасць вядучай ролі ў іх рабочага класа («Дзве тактыкі сацыял-дэмакратыі ў дэмакратычнай рэвалюцыі», 1905). Член ЦК партыі з лістапада 1903 (кааптаваны), у 1905—1906 і з 1912 (канд. у 1907—1912), член Палітбюро ЦК у кастрычніку 1917 і з 25.3.1919. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі ў красавіку 1917 вярнуўся ў Петраград, абвясціў курс на перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі мірным шляхам, пераходам улады да Саветаў. Узначальваў кіраўніцтва Кастрычніцкім узброенным паўстаннем у Петраградзе. На II Усерасійскім з'ездзе Саветаў 25—27.10(7—9.11).1917 выбраны Старшынёй Савета Народных Камісараў (СНК) РСФСР. Адначасова з 1918 Старшыня Савета Рабочай і Сялянскай Абароны (з 1920 Савет Працы і Абароны). З сакавіку 1918 у Маскве. Адыграў вырашальную ролю ў заключэнні Брэсцкага міру 1918. 30.8.1918 пры замаху на яго жыццё эсэркай Ф.Каплан быў цяжка паранены. Адобрыў стварэнне Усерасійскай надзвычайнай камісіі (ВЧК) па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам, якая разам з палітычнымі выкарыстоўвала метады насілля і рэпрэсій у адносінах да духавенства, інтэлігенцыі, апазіцыйных партый. Адзін з ініцыятараў стварэння ў 1922 Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР), у які ў якасці сузаснавальніка ўвайшла і Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэс-публіка (БССР). З 6.7.1923 Старшыня СНК і Савета Працы і Абароны СССР. Член ВЦВК з 1917, ЦВК СССР з 1922. У 1922 цяжка захварэў і актыўна не ўдзельнічаў у палітычным жыцці. Пахаваны ў Маўзалеі на Краснай плошчы ў Маскве.

Ленін рана стаў прыхільнікам ідэй К.Маркса і Ф.Энгельса. Развіваў іх вучэнне аб пераўтварэнні грамадства на камуністычных начатках у прымяненні да новых гістарычных умоў. Найважнейшым сродкам рэвалюцыйнай барацьбы лічыў стварэнне партыі прафесійных рэвалюцыянераў — «партыі новага тыпу», у адрозненне ад парламенцкіх сацыял-дэмакратычных партый. Ленін адстойваў прынцып «дэмакратычнага цэнтралізму» ў пабудове партыі. Вызначаўся непрымірымым атэізмам. Прыйшоў да высновы, што капіталізм уступіў у апошнюю стадыю — імперыялізм, і перадавыя краіны Еўропы выспелі для сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі. Адстойваў курс на ўсталяванне замест дыктатуры буржуазіі дыктатуры пралетарыяту. Лічыў, што Расія павінна пачаць сусветную сацыялістычную рэвалюцыю. У процівагу II Інтэрнацыяналу ён стварыў III Камуністычны Інтэрнацыянал. Востры крызіс у краіне пасля грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі 1918—1920 прывёў Леніна да прызнання неабходнасці замены палітыкі «ваеннага камунізму» і пераходу да «новой эканамічнай палітыкі».

Ленін пакінуў вялікую навуковую і літаратурна-публіцыстычную спадчыну.

У яго працах больш за 400 выказванняў, тэлеграм, запісак і інш. дакументаў, якія непасрэдна тычацца Беларусі. У творы «Развіццё капіталізму ў Расіі» (1899) асветлена сацыянальна-эканамічнае становішча беларускіх губерняў на мяжы 19—20 ст., паказана развіццё капіталістычных вытворчых адносін у сельскай гаспадарцы Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай і Гродзенскай губ., наяўнасць рэшткаў прыгонніцтва, параўнальна хуткі рост гарадскога насельніцтва, наяўнасць у беларускіх губернях пераважна дробных і сярэдніх прадпрыемстваў, вызначаны некаторыя спецыфічныя рысы ў сацыянальна-эканамічным развіцці Беларусі, што адбівалася на класавай барацьбе і дзейнасці мясцовых партыйных арганізацый. Вывучэнне сацыянальна-эканамічнага становішча Беларусі дало Леніну магчымасць паказаць, што гаспадарка краю развіваецца па шляху капіталізму, што ў Беларусі ёсць усе ўмовы для развіцця сацыял-дэмакратычна руху. У працы «Вынікі дыскусіі аб самавызначэнні» (1916) ён адзначыў што беларусы цярпелі сацыяльны і нацыянальны прыгнёт не толькі рускага царызму, але польскіх памешчыкаў, што яшчэ з часоў, калі Беларусь была ў складзе Рэчы Паспалітай, Польшча захавала за сабой правы, якія «заключаюцца ў прыгнечанні чужых народаў», бо «польскі памешчык прыгнятае

украінскага і беларускага «хлопа». Ленін адносіў Беларусь *і* Украіну да тых рэгіёнаў Расіі, дзе нацыянальны рух яшчэ не завяршыўся і не вычарпаў сваёй прагрэсіўнай місіі. У працы «Аб карыкатуры на марксізм і аб «імперыялістычным эканамізме» (1916, апубл. 1924) ён пісаў: «Для украінцаў і беларусаў... «Бацькаўшчына» тут яшчэ не адспявала ўсёй сваёй гістарычнай песні. «Абарона бацькаўшчыны» яшчэ можа быць тут абаронай дэмакратыі, роднай мовы, палітычнай свабоды супраць прыгнятаючых нацый, супраць сярэдневякоўя...». Ленін рэзка крытыкаваў праграму культурна-нацыянальнай аўтаноміі аўстрыйскіх марксістаў, якую ўзялі на ўзбраенне амаль усе палітычныя партыі Расіі, у т.л. «Беларуская сацыялістычная грамада» (арт. «Да гісторыі нацыянальнай праграмы ў Аўстрыі і Расіі», 1914). Вызваленне беларускаша народа ад сацыянальнага і нацыянальнага прыгнёту Ленін звязваў з перамогай сацыялістыянай рэвалюцыі ў Расіі. Беларусь і Заходні фронт разглядаў як важны ваеннапалітычны фактар, які мог станоўча паўплываць на перамогу Кастрычніцкага ўзброеннага паўстання 1917. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 падтрымліваў Абласны выканаўчы камітэт Саветаў рабочих, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту, адобрыў разгон Усебеларускага з'езда 1917, які не прызнаў мясцовую савецкую ўладу; адмоўна ставіўся да Беларускай Народной Рэспублікі і падтрымліваў ініцыятыву беларускіх секцый РКП(б) аб стварэнні БССР.

У аналізе дзейнасці Леніна і яго ідэй, якія значна паўплывалі на ход гісторыі ў 20 ст., існуе шырокі спектр ацэнак — ад пазітыўных да рэзка крытычных.

Яго імем названа **вуліца** (1945).

**Літаратура:**


Ленін Уладзімір Ільіч (сапр. Ульянаў) // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 9. – Мінск, 1999. – С. 200-202.

Сопельняк, Борис Николаевич. Три покушения на Ленина / Борис Сопельняк. – Москва: Молодая гвардия, 2005. – 345с., [8]л.фот. – ( Дело №.... Сенсации минувших лет).

Волкогонов, Д. Семь вождей: галерея лидеров СССР : в 2 кн. Кн.1. Владимир Ленин / Дмитрий Волкогонов. – Москва: Новости,1995. – 494, [1]с., 1л. портр., [24]л. фот.

И вечно в памяти людской: В.И.Ленин и Белоруссия/ [составители: Э.А. Забродский,Э.А. Корнилович] . – Мн.: Беларусь, 1990. – 204с.

Ленин. Человек - мыслитель - революционер: воспоминания и суждения современников/ составители: С.Е. Гречихо, О.А. Зимарин, А.К. Сорокин. – Москва: Политиздат, 1990. – 574с.

Корнилович, Э.А. "Политика ведется через людей..." / Э.А. Корнилович // Политические мыслители. – Минск., 1997. – С.124-138.

Гогин, С. Фантомные боли Симбирска / Сергей Гогин; фото Макса Авдеева // Вокруг света. – 2010. – № 4. – С. 74-79.

Яров, С. Риторика вождей: В. И. Ленин и И. В. Сталин как ораторы / Сергей Яров // Звезда. – 2007. – № 11. – С. 168-179.


(імёны)

## Масквін Іван Міхайлавіч
## (1874 – 1946)

**Масквін Іван Міхайлавіч** нарадзіўся 18.6.1874 г. у Маскве. Расійскі акцёр. Народны артыст СССР (1936). Скончыў Музычна-драматычнае вучылішча Маскоўскага філарманічнага таварыства (1896). З 1896 у Яраслаўскім тэатры, тэатры Корша ў Маскве. З 1898 у МХТ (з 1943 дырэктар). Творчасць Масквіна вызначалася мастацтвам пераўвасаблення, жыццёвай дакладнасцю вобразаў, імкненнем да раскрыцця іх унутранай сутнасці, ярка выражаным нацыянальным характарам. Сярод роляў: цар Фёдар («Цар Фёдар

Іаанавіч» А.Талстога), Федзя Пратасаў («Жывы труп» Л .Талстога), Фама Апіскін («Сяло Сцяпанчыкава» паводле Ф.Дастаеўскага), Наздроў («Мёртвыя душы» паводле М.Гогаля), Епіходаў («Вішнёвы сад» А.Чэхава), Хлынаў («Гарачае сэрца» А.Астроўскага), Лука («На дне» М.Горкага), Пугачоў («Пугачоўшчына» К.Транёва) і інш. Выступаў як рэжысёр: «Сіняя птушка» М.Метэрлінка і «Рэвізор» Гогаля (1908), «Месяц на вёсцы» І.Тургенева (1909) і інш. Здымаўся ў кіно: «Палікушка» (1919, вып. 1922), «Калежскі рэгістратар» (1925) і інш. У 1941 з тэатрам гастраліраваў у Мінску. Дзяржаўныя прэміі СССР 1943, 1946.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (1948) і **завулак**.

**Літаратура:**

Масквін Іван Міхайлавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.10. – Мінск, 2000. – С. 173-174.

(імёны)

## Машэраў Пётр Міронавіч
## (1918-1980)

**Машэраў Пётр Міронавіч** нарадзіўся 26.02.1918 у в. Шыркі Сенненскага р-на Віцебскай вобл.

Партыйны і дзярж. дзеяч Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. Скончыў Втцебскі педагагічны Ін-т. У 1939-1941 выкладчык фізіцы і матэматыкі ў Расонскай СШ Віцебскай вобл. З жн. 1941 кіраўнік Расонскага патрыятычнага падполля. З крас. 1942 камандзір партызанскага атрада імя Шчорса. З сак. 1943 камісар партызанскай брыгады імя К.К. Ракасоўскага. З вер. 1943 1-ы сакратар Вілейскага падпольнага абкома ЛКСМБ. З ліп. 1944 1-ы сакратар Маладзечанскага абкома ЛКСМБ. З ліп. 1946 сакратар, з кастр. 1947 1-ы сакратар ЦК ЛКСМБ. З сак. 1965 першы сакратар ЦК КПБ. Герой Савецкага Саюза (1944), Герой Сацыялістычнай Працы (1978). Трагічна загінуў у аўтакатастрофе (1980).

**Праспект** у Цэнтральным раёне Мінска атрымаў імя П.М.Машэрава ў 1980, на доме № 13 ( вул. Чырвонаармейская) знаходзіцца мемарыяльная дошка, у 2005 вуліцы Іерусалімская, Дразда и Варвашени атрымалі назву праспекта Машэрава.

**Літаратура:**

Машэраў Пётр Міронавіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 10. - Мн., 2000. - С. 240-241.

Машэраў Пётр Міронавіч // Энцыклапедыя гісторыя Беларусі: У 6 т. – Т. 5. - Мн., 1999. - С. 102.

Машэраў Пётр Міронавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 336.

Машеров Пётр Миронович // Имена в истории: Краткий биогр. справ. - Мн., 1993. - С. 106-107.

З ягонай лёгкае рукі // Аўрамчык М. Знаёмыя постаці. - Мн., 2004. - С. 150-170.

Гвоздева И. Букет для Машерова // Наша Перамога. - Мн., 2004. - С. 232-235.

Кебич В. Наш Пётр Миронович // Мы - беларусы. - Мн., 2003. - С. 32-33.

Клочкова В.А. Боец партии // Клочкова В.А. Мы из ХХ века. - Мн., 2002. - С. 53-58.

Пронько,Ольга Мироновна. Семья Машеровых: Биогр.повесть. - Гродно, 2000.

Антонович С.В. Петр Машеров. - Мн., 1993.

Іофе Э. Настаўнік на чале ЦК / Эмануіл Іофе //Настаўніцкая газета. – 2012. – С. 14-15.

Ломсадзе Л. Под сводами души высокой // Бел. думка. - 2003.- № 2. - С. 16-23.

Петрашкевич А. Петр Машеров: "Теперь я знаю все..." // Нёман. - 2002. - № 1. - С. 203-227.

(імёны)

## Мельнікайтэ Марытэ Юазасаўна
## (1923-1943)

**Мельнікайтэ Марытэ Юазасаўна** нарадзілася 18.03.1923 у г. Зарасай, Літва.

Удзельніца партызанскага руху ў Вялікую Айчынную вайну. У пачатку ліп. 1941 эвакуіравана ў Цюмень, дзе працавала ў калгасе, потым токарам на заводзе “Механік”. У

1942 добраахвотна ўступіла ў 16-ю Літоўскую стралковую дывізію Чырвонай Арміі. Пасля заканчэння спецшколы ў маі 1943 закінута ў тыл ворага на тэрыторыю Беларусі. Потым трапіла ў Літву. Сакратар падпольнага Зарасайскага павятовага камітэта камсамола. Вяла прапаганду сярод насельніцтва, прымала ўдзел у баявых дзеяннях партызанскага атрада імя Кестутіса. У чэрв. 1943 у час правядзення дыверсіі на чыгунке у ст. Дукштас цяжкапараненая была схоплена карнікамі. Пасля катаванняў расстралялі (13.07.1943). Герой Савецкага Саюза (1944).

**Вуліца** Цэнтральнага раёна Мінска атрымала імя М.Ю. Мельнікайтэ ў 1976, на доме № 2 знаходзіцца мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Мельникайте Марите Юозовна // Великая Отечественная война 1941-1945: Энцикл. - М., 1985. - С. 441.

Мельникайте Марите Юозовна // Их именами названы...: Энцикл. справ. - Мн., 1987. - С. 415-416.

Мельникайте Марите Юозовна // Герои Советского Союза: Краткий биогр. слов.: В 2 т. - Т 2. - М., 1987. - С. 68.

(імёны)

## Мікуліч Уладзімір Андрэевіч
## (1920-2000)

**Мікуліч Уладзімір Андрэевіч** нарадзіўся 14.10.1920 у в. Палявая Смалявіцкага р-на Мінскай вобл.

З 1940 у Чырвонай Арміі. Узельнік Вялікай Айчыннай вайны. Партыйны і дзяржаўны дзеяч БССР. З 1945 на камсамольскай рабоце. З 1954 1-ы сакратар Мінскага райкома КПБ. Скончыў ВПШ пры ЦК КПСС (1957). Герой Сацыялістычнай Працы (1958). У 1963 – 77 1-ы сакратар Брэсцкага, у 1977-85 Мінскага абкомаў КПБ. У 1985-1990 нам. Старшыні Прэзідыума Вярх. Савета БССР.

**Вуліца** у Цэнтральным раёне Мінска атрымала імя У.А. Мікуліча ў 2004.

**Літаратура:**

Мікуліч Уладзімір Андрэевіч // Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Т. 10. - Мн., 2003. - С. 366.

(імёны)

## Панфілаў Іван Васілевіч
## (1893-1941)

**Панфілаў Іван Васілевіч** нарадзіўся 1.01.1893 у г. Пятроўск Саратаўскай вобл., Расія.

Скончыў Кіеўскую ваенную школу (1923). Удзельнік грамадзянскай вайны, барацьбы с басмачамі. У Вялікую Айчынную вайну з ліп. 1941 генерал-маёр І.В. Панфілаў камандаваў 316 стралковай дывізіяй, якая з 12.10.1941 утрымлівала абарончы рубеж пад Масквой на Валакаламскім напрамку. 16.10.1941 каля раз`езда Дубасекава 28 байцоў дывізіі ў жорсткім баі падбілі 18 варожых танкаў і сарвалі атаку праціўніка. 18.11.1941 І.В. Панфілаў быў смяротна пранены. Герой Савецкага Саюза (1942).

**Вуліца** Цэнтральнага раёна Мінска носіць яго імя з 1948, на доме № 1 мемарыяльная дошка.

**Літаратура:**

Панфілаў Іван Васілевіч // Беларуская Савецкая Энцыклапедыя: У 12 т. - Т.8. - Мн., 1975. - С. 85.

Панфилов Иван Васильевич // Минск: Энцикл. справ. - Мн., 1983. - С. 303.

(імёны)

## Паўлаў Іван Пятровіч
## (1849 – 1936)

**Паўлаў Іван Пятровіч** нарадзіўся 26.9.1849, г. Разань, Расія.

Расійскі фізіёлаг, стваральнік вучэння пра вышэйшую нервовую дзейнасць. Акадэмік Пецярбургскай АН (1907, чл.-кар. 1901), акадэмік АН СССР (1925). Ганаровы член АН і навуковых таварыстваў многіх краін. Скончыў Пецярбургскі універсітэт (1875) і Медыка-хірургічную акадэмію (1879). Працаваў у ёй і фізіялагічнай лабараторыі пры клініцы С.П.Боткіна. З 1890 прафесар, заг. кафедры Ваенна-медыцынскай акадэміі, адначасова з 1891 узначальваў аддзел Інстытута эксперыментальнай медыцыны. З 1925 дырэктар Фізіялагічнага інстытута АН СССР.

Навуковыя працы па фізіялогіі кровазвароту і стрававання. Распрацаваў новыя метады эксперыментальных даследаванняў: хранічны дослед на жывёлах, дослед з уяўным карміленнем, аперацыю малога страўніка з захаваннем яго інервацыі і інш. Даследаваў нервовыя механізмы рэгуляцыі крывянога ціску, даказаў наяўнасць асобнай нервовай рэгуляцыі дзейнасці сэрца, якая залежыць ад змены абмену рэчываў у сардэчнай мышцы. Стварыў вучэнне аб трафічнай функцыі нервовай сістэмы. У працах па фізіялогіі стрававання высвятліў, што дзейнасць стрававальнага тракту рэгулюецца карой вялікіх паўшар'яў галаўнога мозга; у працах па вышэйшай нервовай дзейнасці метадам умоўных рэфлексаў даказаў, што ў аснове псіхічнай дзейнасці ляжаць фізіялагічныя працэсы ў кары галаўнога мозга. Распрацаваў вучэнне пра другую сігнальную сістэму, адкрыў з'яву тармажэння ў кары галаўнога мозга, стварыў вучэнне пра сон, тыпы нервовай дзейнасці, ахоўнае тармажэнне і інш.

Даследаванні Паўлава па фізіялогіі вышэйшай нервовай дзейнасці зрабілі вялікі ўплыў на развіццё фізіялогіі, медыцыны, псіхалогіі, педагогікі. Нобелеўская прэмія 1904.

У Мінску яго імем названы **вуліца** (1951) **і завулак**.

**Літаратура:**


Паўлаў Іван Пятровіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.12. – Мінск, 2001. – С. 204.

Павлов Иван Петрович // Их именами названы...: Энциклопедический справочник. - Мн., 1987. - С. 468.

Морозова, С. Собаки Павлова / Светлана Морозова // GEO.- 2007.- № 9.- С. 106-108.

Бегишева, А. Антисоветчик в законе / Алия Бегишева // GEO.- 2009.- № 9.- С. 144-152.


(імёны)

## Пархоменка Аляксандр Якаўлевіч (1886 – 1921)

**Пархоменка Аляксандр Якаўлевіч** нарадзіўся 12 (24) .12.1886, в. Макараў Яр Славянасербскага павета Екацярынаслаўскай губерніі.

Герой грамадзянскай вайны. З сялян. Член КПСС з 1904. За рэвалюцыйную дзейнасць тройчы арыштаваны (1906, 1909, 1911). У 1916 вёу рэвалюцыйную агітацыю сярод салдат. Удзельнік Лютаўскай рэвалюцыі 1917 у Маскве, у кастрычніку 1917 у Луганску, член павятовага камітэта РСДРП (б) і нач. Чырвонай гвардыі. У 1918 удзельнічаў у разгроме войск Каледзіна на Доне, у баях супраць нямецкіх акупантаў на Украіне, у абароне Царыцына, у 1919 — у ліквідацыі контррэвалюцыйнага мяцяжу атамана Грыгор'ева, абароне Харкава ад войск Дзянікіна. З снежня 1919 асобаўпаўнаважаны пры РВС 1-й Коннай арміі. З красавіка1920 нач. 14-й кавалерыйскай дывізіі 1-й Коннай арміі, ваяваў супраць войск Польшчы, Урангеля, Махно. Узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонага Сцяга. Загінуў у баі з махноўцамі.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (1951).

**Літаратура:**


Пархоменка Аляксандр Якаўлевіч // Беларуская савецкая энцыклапедыя. – Т. 8. – Мінск,1975.-С. 292.

Пархоменко Александр Яковлевич // Их именами названы...: энциклопедический справочник. – Мн.,1987. – С. 472-473.


(
імё
ны)

# Пашкевіч Алаіза Сцяпанаўна (псеўданім Цётка) (1876 – 1916)

**Пашкевіч Алаіза Сцяпанаўна (псеўданім Цётка)** нарадзілася 15.7.1876, фальварак Пешчын, цяпер Шчучынскі раён Гродзенскай вобласці.

Беларуская паэтэса-рэвалюцыянерка. Скончыла Віленскае 7-класнае вучылішча В.Прозаравай (1901). Настаўнічала ў вёсцы. У 1902 — 1904 вучылася на курсах П.Лесгафта, у 1904 здала экстэрнам экзамены за курс Аляксандраўскай жаночай гімназіі ў Пецярбургу. Вярнуўшыся ў Вільню, працавала фельчарам у Нова-Вілейскай бальніцы. Адна з заснавальнікаў і кіраўнікоў Беларускай сацыялістычнай грамады. Арганізоўвала рэвалюцыйныя рабочыя гурткі, пісала вершы, якія распаўсюджваліся як рэвалюцыйныя пракламацыі, выступала з прамовамі па-беларуску на мітынгах і сходах. У 1905 была дэлегаткай ад віленскіх работніц на з'ездзе жанчын у Маскве, актыўна ўдзельнічала ў рэвалюцыйных маніфестацыях у Вільні. Каб пазбегнуць судовай адказнасці, у канцы 1905 эмігрыравала ў Галіцыю (тады ў складзе Аўстра-Венгрыі). Жыла ў Львове, вучылася на філасофскім факультэце Львоўскага універсітэта.

У 1906 у Жоўкве (каля Львова) у друкарні базыльянскага манастыра надрукавала зборнікі рэвалюцыонных вершаў «Хрэст на свабоду» і «Скрыпка беларуская». Нелегальна прыязджала на радзіму, удзельнічала ў выданні газеты «Наша доля», у 1-м яе нумары надрукавала апавяданне «Прысяга над крывавымі разорамі». Захварэла на сухоты і выехала ў Закапанэ (Польшча). У 1908—1909 жыла ў Кракаве, вучылася на гуманітарным аддзяленні Ягелонскага універсітэта, была членам рэвалюцыйнай арганізацыі моладзі універсітэта «Спуйня» («Згуртаванасць»). Дзеля атрымання навуковай ступені выканала працу «Батлейкі на Беларусі і іх сувязь з польскай драматычнай літаратурай». У 1911 выйшла замуж за С.Кайрыса і вярнулася на радзіму. З тэатрам І.Буйніцкага як актрыса ездзіла па Беларусі. У 1912 у Вільні, Нова-Вілейцы і Лідзе арганізавала некалькі тайных беларускіх школ. У 1914 у Мінску заснавала і рэдагавала 1-ы беларускі часопіс для дзяцей і моладзі «Лучынка». У час 1-й сусветнай вайны сястра міласэрнасці ў тыфозным салдацкім бараку ў Вільні.

Пісаць пачала ў 1902 пад уплывам Ф.Багушэвіча. У «Каляднай пісанцы на 1904 год» і «Велікоднай пісанцы» (абедзве 1904) надрукавала вершы «Мужыцкая доля», «Мужык не змяніўся», «Нямаш, але будзе», «Музыкант беларускі», прасякнутыя спачуваннем цяжкай долі селяніна. Шырока карысталася народна-песеннай сімволікай (вобразы музыкі, скрыпкі, дудкі).

Для твораў перыяду рэвалюцыі 1905—1907 характэрны публіцыстычная завостранасць, рэвалюцыйны пафас, прамоўніцкія інтанацыі, метафарычнасць і алегорыя. Вершы «Мора», «Хрэст на свабоду», «Вера беларуса» і інш. сталі хрэстаматыйнымі. Упершыню ў беларускай паэзіі стварыла вобраз рабочага («Пад штандарам»). Асобны перыяд у яе творчасці складалі вершы 1908—1914, дзе пераважалі матывы грамадзянскай журбы і смутку, тугі па радзіме, выявілася засяроджанасць на долі адзінокага чалавека, зварот да фальклорных вобразаў («З чужыны», «Грайка», «На магіле», «На чужой старонцы», «Арлы-брацця, дайце скрыдлы», «Сірацінка», «Вясковым кабетам», «Гаданне» і інш.).

Цётка адна з пачынальніц беларускай прозы. Яе апавяданні прасякнуты гуманізмам, спачуваннем да чалавека працы, непрыняццем несправядлівасці («Навагодні ліст», «Зялёнка», «Міхаська», «Асеннія лісты», «Лішняя»). Выступала як публіцыст (арт. «Наша народная беларуская песня», «Як нам вучыцца», «Папараць-кветка» і інш), нарысіст («Успаміны з паездкі ў Фінляндыю», «З дарогі»), даследчыца гісторыі беларускага народнага тэатра (брашура «Праграма для збірання матэрыялаў аб батлейках на Беларусі», Вільня, 1910). Звярталася да моладзі з заклікам шанаваць родную мову, рыхтаваць сябе да грамадскай работы («Да вясковай моладзі беларускай», «Шануйце роднае слова!», «Аб душы маладзёжы»). Аўтар «Першага чытання для дзетак беларусаў» (1906). Помнікі Цёткі пастаўлены ў г. Шчучын, г.п. Астрына і ў в. Шастакоўцы Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці.

У Мінску яе імем названа **вуліца** (1974), на доме № 1 мемарыяльная дошка (1976).

**Літаратура:**

Цётка (сапр Пашкевіч Алаіза Сцяпанаўна) // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т.17. – Мінск, 2001. – С. 110-111.

Алаіза Пашкевіч (Цётка) (1876-1916): Прыцягненне матчынага слова // Мяснікоў А.Ф. Сто асоб беларускай гісторыі: гістарычныя партрэты / А.Ф. Мяснікоў. – Мінск, 2008. – С. 150-152.

Успрыманне радзімы ў паэзіі Цёткі і Лесі Украінкі // Бельскі А.І. Галасы і вобразы. – Мінск, 2008. – С. 35-42.

Бруева,Т.А. Жыццёвы і творчы шлях Цёткі // Беларуская мова і літаратура. – 2007. – № 4. – С. 40-43.

(імёны)

## Рылееў Кандрат Фёдаравіч
## (1795 – 1826)

**Рылееў Кандрат Фёдаравіч** нарадзіўся 29.9.1795 г. у с. Батава Гатчынскага раёна Ленінградскай вобласці, Расія. Рускі паэт, дзекабрыст. Скончыу 1-ы кадэцкі корпус у Пецярбургу (1814). Удзельнік замежных паходаў рускай арміі 1814 — 1815. З 1818 у адстаўцы. З 1821 у Пецярбургу засядацель крымінальнай палаты, з 1824 у канцылярыі «Расійска-амерыканскай гандлёвай кампаніі». У 1823 — 1825 з А. Бястужавым выдаваў альманах «Полярная звезда». З 1823 член Паўночнага таварыства дзекабрыстаў, адзін з кіраўнікоў паўстання 14.12.1825 на Сенацкай плошчы. Павешаны ў Петрапаўлаўскай крэпасці.

Друкаваўся з 1820. Стварьгў узоры грамадзянскай палітычнай лірыкі («Грамадзянін», «Бястужаву»). У гістарычных думах «Іван Сусанін», «Смерць Ермака» свабодалюбівыя патрыятычныя ідэі. Аўтар агітацыйных супрацьурадавых песень (разам з Бястужавым), любоўнай лірыкі, паэм «Налівайка» (не завершана), «Вайнароўскі» (1825).

У 1815 жыццёвы шлях Рылеева быў звязаны з Беларуссю: ён служыў у мястэчку Сталовічы Баранавіцкага раёна (тут адбываліся яго сяброўскія сустрэчы з Т.Занам) і ў Нясвіжы. Матэрыялы пра яго зберагаюцца ў Валеўскім народным. краязнаўчым музеі. На беларускую мову думу «Смерць Ермака» Рылеева пераклаў У.Дзюба, думу «Рагнеда» — Г.Кажамякін.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (1951).

**Літаратура:**

Рылееў Кандрат Фёдаравіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 13. – Мінск, 2001. – С. 497-498.

О'Мара, Патрик. К.Ф.Рылеев. Политическая биография поэта-декабриста / Патрик О'Мара**.** – Москва : Прогресс, 1989**.** – 336с.

Афанасьев, В.В. Рылеев: жизнеописание / Виктор Васильевич Афанасьев. – Москва : Молодая гвардия, 1982. – (Жизнь замечательных людей. ; вып.6 (625)) . – 319с.:ил.

Сацукевіч, Д. Вуліцы з рэвалюцыйным духам // Літаратура і мастацтва. – 2008. – 15 жн. – С. 12.

Именами героев // Минский курьер. – 2006. – 28 апр. – С.25.

(імёны)

## Рэпін Ілья Яфімавіч
## (1844-1930)

**Рэпін Ілья Яфімавіч** нарадзіўся 5.8.1844 г. у г. Чугуеў Харкаўскай вобласці, Украіна. Расійскі жывапісец і графік, педагог. Вучыўся ў Рысавальнай школе Таварыства заахвочвання мастакоў у І.Крамскога (1863), Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (1864—1871); у 1873—1876 стыпендыят у Італіі і Францыі. У 1894—1907 выкладаў у Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў (у 1898—1899 рэктар). Член таварыства перасоўных мастацкіх выставак (з 1878). У творчасці Рэпіна ўвасобіліся лепшыя дасягненні дэмакратычнага

мастацтва яго часу. У шматлікіх палотнах адлюстраваў супярэчнасці грамадскага жыцця паслярэформеннай Расіі, выкрываў эксплуатацыю народа, сцвярджаў скрытую ў ім сілу і наспяванне пратэсту («Бурлакі на Волзе», 1870—1873; «Хрэсны ход у Курскай губерні», 1880—1883), стварыў шэраг станоўчых вобразаў, ярка і праўдзіва адлюстраваў сілу і слабасць разначынскага рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху («Адмова ад споведзі», 1879—1885; «Не чакалі», 1884; «Арышт прапагандыста», 1880—1892). У гістарычных карцінах імкнуўся паказаць трагічныя перапляценні чалавечых пачуццяў, моцныя драматычныя характары («Царэўна Соф'я», 1879; «Іван Грозны і сын яго Іван», 1885), раскрыць вальналюбны дух народа («Запарожцы пішуць пісьмо турэцкаму султану», 1878—1891). Стварыў шматгранныя вобразы прадстаўнікоў розных слаёў расійскага грамадства («Мужык з ліхім вокам», «Протадыякан» абедзве 1877), партрэты У.Стасава (1873), М.Мусаргскага (1881), П.Стрэпетавай (1882), Л.Талстога (1887), Э.Дузе (1891), В.А.Сярова (1901), І.Паўлава (1924), групавы партрэт «Урачыстае пасяджэнне Дзяржаўнага савета» (1901—1903; з Б.Кустодзіевым і І.Куліковым), малюнкі «Неўскі праспект» (1887) і інш. У 1892—1904 перыядычна працаваў ва ўласным маёнтку Здраўнёва (Віцебская вобласць). Тут створаны карціны «Беларус», «Асенні букет», «Паляўнічы з ружжом» (усе 1892), «Касец-літвін» (1894), «Дуэль», «Месячная ноч. Здраўнёва», «Партрэт сына Юрыя на тэрасе здраўнёўскага дома» (усе 1896) і інш., шэраг эцюдаў, эскізаў («На Заходняй Дзвіне. Усход сонца», 1892; «Казанне Язафата Кунцэвіча», 1893, і інш). Творам уласціва гарманічнае спалучэнне каларыту і святло-паветранага асяроддзя, строга прадуманая кампазіцыя, арганічная цэласнасць пластычнай формы і колеру, малюнка і жывапісу. Рэпін карыстаўся чыстымі светлымі фарбамі, якія ў яго палотнах аб'ядноўваліся ў адзіную колеравую гаму. У б. маёнтку Здраўнёва адкрыты Ільі Рэпіна музей-сядзіба «Здраўнёва». З 1993 праводзіцца Міжнародны дзіцячы пленэр імя Рэпіна.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (1950).

**Літаратура:**

Рэпін Ілья Яфімавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 14. – Мінск, 2002. – С. 18-19.

Падліпскі, А.М. Здраўнева: тут жыў І.Я.Рэпін/ А.М. Падліпскі; пераклад з рускай мовы Л.І.Рабаданавай.- Мінск: Полымя, 1995.- 63с.:іл.

Курыла, Д. Пад уражаннем творчасці Майстра: юныя мастакі з дзесяці краін СНД сталі ўдзельнікамі летняй школы ў музеі-сядзібе Ільі Рэпіна ў Здраўнёве пад Віцебскам / Дзіяна Курыла // Беларусь. Belarus.- 2009.- № 9.- С. 52.

Курыла, Д. Каштоўны экспанат: памятная манета "І. Рэпін" папоўніла рэпінскую калекцыю Віцебскага абласнога краязнаўчага музея / Дзіяна Курыла // Беларусь. Belarus.- 2009.- № 8.- С. 39.

Гамзовіч, Р. У Здраўнёва да Рэпіна / Рэгіна Гамзовіч // Алеся.- 2008.- № 9.- С. 12-13.

(імёны)

## Украінка Леся
## (1871 – 1913)

**Украінка Леся** (сапр. Косач-Квітка Ларыса Пятроўна) нарадзілася 25.2.1871 у г. Наваград-Валынскі, Украіна.

Украінская пісьменніца. Вучылася дома і ў прыватных педагогаў. Ведала каля 10 моў. Друкавалася з 1884 г. Першы зборнік «На крылах песень» (1893). Вершы Украінкі вызначаюцца багаццем лексікі, рытмікі, паэтычных форм. Тэма свабодалюбства, барацьбы супраць няволі – галоўныя ў цыкле вершаў «Песні пра волю» (1905), драматычных паэмах «Вавілонскі палон» (1903), «На руінах» (1904, абедзве апублікаваны 1908), «У катакомбах» (1905), «Оргія» (1913), драмах «Асенняя казка» (1905, апубл. 1928), «Касандра» (1908), «Каменны гаспадар» (1912) і інш. Вяршыня паэтычнага майстэрства – драма-феерыя «Лясная песня» (1912), напісаная на фальклорным матэрыяле. Матывы грамадзянскай паэзіі Украінкі нагадваюць матывы творчасці М. Багдановіча. Абодва паэты сцвярджаюць сілу і

неўміручасць свайго народа, свайго краю. Аўтар літаратурна-крытычных артыкулаў, апавяданняў, вершаў і казак для дзяцей.

З 10 гадоў хварэла на туберкулёз касцей і суставаў. На лячэнні ў Ялце у 1897 пазнаёмілася з мінскім прапагандыстам марксізму С.К.Мяржынскім. Пад яго ўплывам пачала займацца публіцыстыкай, змясціла шэраг крытычных артыкулаў у пецярбургскім часопісе «Жизнь». Прыязджала ў Мінск да Мяржынскага, цяжка хворага на сухоты; 2 апошнія месяцы яго жыцця правяла каля ложка сябра. Напісала ў гэты час драматычную паэму «Утрапёная». Прысвяціла Мяржынскаму шэраг вершаў. На беларускую мову творы Украінкі перакладалі М.Аўрамчык, А.Вялюгін, Ю.Гаўрук, С.Грахоўскі, Н.Гілевіч, С.Дзяргай, Я.Семяжон, М.Хведаровіч і інш.

Імем Лесі Украінкі названа **вуліца** ў Мінску.

**Літаратура:**

Украінка Леся // Беларуская энцыклапедыя: у18 т. Т. 16. – Мінск, 2003. – С. 206.

Костенко, А.И. Леся Украинка / Анатоль Костенко. – Москва : Молодая гвардия, 1971. – 347, [1] с., [20] с. ил. – (Жизнь замечательных людей ; вып. 19 (507)).

Курков, И. Сломанный цветок Леси Украинки / Илья Курков // Минский курьер. – 2010. – 19 февр. – С. 16.

Бельскі А.І. Успрыманне радзімы ў паэзіі Цёткі і Лесі Украінкі / А.І. Бельскі // Галасы і вобразы / А.І. Бельскі. – Мінск, 2008. – С. 35-42.

Каховский, А. Вечная любовь / Антон Каховский // Женский Журнал. – 2006. – № 4. – С. 62-64.

(імёны)

## Харужая Вера Захараўна (1903-1942)

Гл. Савецкі раён.

(імёны)

## Ціміразеў Клімент Аркадзевіч (1843 – 1920)

**Ціміразеў Клімент Аркадзевіч** нарадзіўся 3.6.1843 г. у Санкт-Пецярбургу.

Расійскі вучоны ў галіне батанікі і фізіялогіі раслін; адзін з заснавальнікаў расійскай навуковай школы фізіёлагаў раслін; тэарэтык дарвінізму. Член-кар. Пецярбургскай акадэміі навук (1890), Расійскай акадэміі навук (1917). Скончыў Пецярбургскі універсітэтт (1866). У 1870—1892 у Пятроўскай земляробчай і лясной акадэміі (цяпер Маскоўская сельска-гаспадарчая акадэмія яго імя). Адначасова з 1877 прафесар Маскоўскага універсітэта. У 1911 з групай выкладчыкаў пакінуў яго ў знак пратэсту супраць парушэння універсітэцкай аўтаноміі. Навуковыя працы па метадах даследавання фізіялогіі раслін, біялагічных асновах аграноміі, гісторыі навукі. Раскрыў заканамернасці фотасінтэзу як працэсу выкарыстання святла для ўтварэння арганічных рэчываў раслін. Папулярызатар дасягненняў у галіне фізіялогіі раслін. Публіцыст («Жыццё расліны», 1878; «Навука і дэмакратыя», 1920).

У Мінску яго імем названа **вуліца** (1940).

**Літаратура:**

Ціміразеў Клімент Аркадзевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 17. – Мінск, 2003. – С. 115.

Великие русские люди : сборник / [составитель В. Володин]. – Москва : Молодая гвардия, 1985. – ( Жизнь замечательных людей ; вып.6(646)) . – 414, [2]с., [16]л. ил.

(імё

н
ы
)

## Чарвякоў Аляксандр Рыгоравіч
## (1892 – 1937)

**Чарвякоў Аляксандр Рыгоравіч** нарадзіўся 8.3.1892 г. у в. Дукарка Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці.

Дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі і СССР. Скончыў Віленскі настаўніцкі інстытут (1915). У час 1-й сусветнай вайны прызваны ў армію, вёў рэвалюцыйную прапагандысцкую работу ў вайсковых гуртках і арганізацыях. 3 мая 1917 член РСДРП. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі бальшавіцкага кірунку. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 у Петраградзе. У лютым—маі 1918 камісар Беларускага нацыянальнага камісарыята. 3 ліпеня 1918 у Чырвонай Арміі: камісар дывізіі, нач. аддзела Усерасійскага бюро ваенных камісараў. Адначасова ўваходзіў у кіруючае ядро Беларускіх секцый РКП(б). У ліку 5 членаў Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі 1.1.1919 падпісаў у Смаленску Маніфест аб абвяшчэнні Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ). У 1919 камісар асветы ССРБ, намеснік наркома асветы Літоўска-Беларускай ССР, нач. палітаддзела Гомельскага ўмацаванага раёна, асобнай Гомельскай крапасной брыгады. Пасля ўступленні; польскіх легіёнаў на тэрыторыі Беларусі ў палітаддзеле Заход. фронту. У 1920 нач. аддзела РВС Заход. фронту, старшыня Мінскага губернскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, ВРК ССРБ. 31.7.1920 ад імя ЦК КП(б)Б падпісаў Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь, Удзельнік мірных перагавораў з Польшчай у Рызе (кастрычнік1920). У 1920—1924 старшыня ЦВК і СНК БССР, у 1924-1937 старшыня ЦВК БССР. Удзельнічаў у падрыхтоўцы ўтварэння СССР, распрацоўцы 5-гадовых планаў развіцця народнай гаспадаркі і культуры СССР і БССР, Канстытуцый СССР і БССР. Вялікую ўвагу аддаваў умацаванню і развіццю беларускай савецкай дзяржаўнасці, нацыянальнай культуры, асветы, ліквідацыі непісьменнасці. Аўтар прац па гісторыі барацьбы беларускага народа за савецкую ўладу, эканамічным і культурным становішчы беларускай рэспублікі. 3 пач. 1930-х г. Чарвякоў падвяргаўся неабгрунтаваным абвінавачанням у адыходзе і скажэнні генеральнай лініі партыі. Скончыў самагубствам. Член ЦБ КП(б)Б у 1920—1924, ЦК *і* Бюро ЦК КП(б)Б у 1924—1937. Член ЦВК БССР у 1919-1937 і яго Прэзідыума, ЦВК СССР і яго Прэзідыума з 1922. Чл. ЦВК Лгт.-Бел. С(М у 1919.

У Мінску яго імем названы **вуліца** (1967) і **завулак** (1974), устаноўлены 2 мемарыяльныя дошкі ( вул. Чарвякова,8 і К. Маркса,30)

**Літаратура:**

Чарвякоў, Аляксандр Рыгоравіч. ... Я ніколі не быў ворагам: выбраныя артыкулы і прадмовы, успаміны сучаснікаў / Аляксандр Чарвякоў. – Мінск: Беларусь, 1992. –183с.

Чарвякоў Аляксандр Рыгоравіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 17. – Мінск, 2003. – С. 224.

Аляксандр Чарвякоў (1892-1937):... А "ворагаў партыі" не выяўляў! // Мяснікоў, А.Ф. Сто асоб беларускай гісторыі: гістарычныя партрэты. – Мінск, 2008. – С. 219-221.

Александр Григорьевич Червяков // Иоффе, Э.Г. От Мясникова до Малофеева. Кто руководил БССР. – Минск, 2008. – С. 169-178.

## Чычэрын Георгій Васілевіч
## (1872 – 1936)

**Чычэрын Георгій Васілевіч** нарадзіўся 24.9.1872 у в. Караул Інжавінскага раёна Тамбоўскай вобласці, Расія.

Расійскі палітычны і дзяржаўны дзеяч. Пляменнік Б.М. Чычэрына. Скончыў Пецярбургскі універсітэт (1896). З 1897 працаваў у Міністэрстве замежных спраў. З 1904 удзельнічаў у сацыял-дэмакратычным руху. У 1904—1917 у эміграцыі (Германія, Франция, Англія). У часы эміграцыі сакратар Цэнтральнага бюро замежных груп рускіх палітэмігрантаў. З 1905 член РСДРП, з 1906 прыхільнік меншавізму. У 1-ю сусветную вайну інтэрнацыяналіст. У студзені 1918 вярнуўся ў Расію. У 1918— 1930 нарком замежных спраў СССР (да 1922 РСФСР). У складзе савецкай дэлегацыі падпісаў Брэсцкі мір 1918. Узначальваў савецкія дэлегацыі на Генуэзской канферэнцыі 1922, Лазанскай канферэнцыі 1922— 1923. Падпісаў Рапальскі дагавор 1922 з Германіяй і інш. Член ЦК ВКП(б) у 1925— 1930. Аўтар прац па гісторыі рэвалюцыйнага руху, міжнародных адносін.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (1922), на доме №1 мемарыяльная дошка (1977)

**Літаратура:**

Чычэрын Георгій Васілевіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 17. – Мінск, 2003. – С. 324.

O'Коннор, Т.Э. Георгий Чичерин и советская внешняя политика 1918-1930 гг. / Т.Э. О'Коннор. – Москва: Прогресс, 1991. – 320с.:ил.

## Чэхаў Антон Паўлавіч
## (1860 – 1904)

**Чэхаў Антон Паўлавіч** нарадзіўся 29.1.1860 г. у г. Таганрог, Расія.

Рускі пісьменнік. Скончыў Маскоўскі універсітэт (1884). Ганаровы акадэмік Пецярбургскай акадэміі навук (1900; у знак пратэсту супраць адмены царом выбрання М.Горкага ганаровым акадэмікам разам з У.Караленкам у 1902 адмовіўся ад звання. Працаваў земскім урачом. Ездзіў на востраў Сахалін (1890), дзе вывучаў жыццё катаржан і ссыльнапасяленцаў. З 1892 жыў у в. Меліхава пад Масквой, у 1899 па стане здароўя пераехаў у Ялту. Літаратурную творчасць пачынаў з фельетонаў і гумарыстычных апавяданняў. Першае апавяданне — «Ліст да вучонага суседа» (1880), першыя зборнікі — «Казкі Мельпамены» (1884) і «Стракатыя апавяданні» (1886).

У ранніх творах тэма «маленькага» чалавека, роздум над прыродай рабскай псіхалогіі («Смерць чыноўніка», «Тоўсты і тонкі», абодва 1883; «Хамелеон», 1884; «Унтэр Прышыбееў», 1885). Матывы драматызму, трагізму жыцця ўзмацніліся ў творах сярэдзіны 1880-х г. («Ванька», 1886, «Спаць хочацца», 1888, і інш.). У апавяданнях «Бабіна царства» (1894), «Мужыкі» (1897), «У яры» (1900) паказаў дзікунства і жорсткасць вясковага жыцця. У сталы перыяд творчасці глыбока аналізаваў уплыў сацыяльных абставін на чалавечыя характары, тонка высвечваў душу чалавека, драматызм і трагізм змякчаў лірызмам і гумарам.

Героі многіх яго твораў — самазадаволеныя абывацелі або змучаныя жыццём цёмныя людзі, даведзеныя да душэўнай тупасці («Чалавек у футарале», «Агрэст», «Іоныч», усе 1898). Вялікай сілы сацыяльна-псіхалагічнага аналізу і мастацкага абагульнення дасягнуў у аповесцях «Стэп» (1888), «Палата №6» (1892), апавяданнях «Дама з сабачкам» (1899), «Архірэй» (1902) і інш. Апавяданні «Чорны манах», «Студэнт» (абодва 1894) пра таямнічую сувязь часоў і глыбіні падсвядомасці чалавека.

Найвялікшы ўплыў на развіццё сусветнай драматургіі зрабілі яго лірычна-псіхалагічныя п'есы «Чайка» (паст. 1896), «Дзядзька Ваня» (паст. 1897), «Тры сястры» (паст. 1901, Грыбаедаўская прэмія), «Вішнёвы сад» (паст. 1904). Унёс новае ў разуменне трагічнага як звычайнага і будзённага, перанёс цэнтр цяжару з сюжэтнай інтрыгі на аналіз душы, на псіхалагічны сюжэт, спалучыў журбу, іронію і сарказм з лірыкай і сцішанай патэтыкай. Выключны ўплыў Чэхава на сусветную літаратуру 20 ст. адзначалі многія пісьменнікі свету.

Творы Чэхава часта передрукоўваліся ў рускіх газетах, што выходзілі на Беларусі («Минский листок», «Витебский голос» і інш.). Газета «Северо-Западный край» публікавала матэрыялы, прысвечаныя творчасці Чэхава, «Голос провинции» падкрэсліваў сацыяльна-выхаваўчыя функцыі яго твораў, «Гомельская мысль» прапагандавала літаратурную спадчыну пісьменніка. З рэцэнзіяй на кнігу «Пісьмы А.П.Чэхава» выступіў М.Багдановіч (1916). Першы пераклад Чэхава на беларускую мову — вадэвіль «Сватанне» (пераклаў Н.Чарноцкі), выдадзены ў 1910 выдавецтвам «Загляне сонца і ў наша аконца»; у 1913 у гэтым выдавецтве выйшаў вадэвіль «Мядзведзь». «Наша ніва» апублікавала пераклады апавядданняў «Пераапранутыя», «Мянтуз». На беларускую мову творы Чэхава перакладалі Я.Брыль, А.Васілевіч, І.Грамовіч, А.Звонак, В.Каваль, К.Крапіва, М.Лужанін, Я.Маўр, П.Пестрак, Я.Рамановіч, Т.Хадкевіч, І.Шамякін, В.Шашалевіч, А.Якімовіч і інш. Пра дабратворны ўплыў Чэхава на іх творчасць сведчылі Я.Колас, М.Лынькоў, Брыль і інш. П'есы Чэхава ставіліся і ставяцца на Беларусі. Многія творы Чэхава экранізаваны. Кінастудыя «Беларусьфільм» паставіла фільмы «Мядзведзь» (1938), «Чалавек у футарале» (1939).

У Мінску яго імем названа **вуліца** (1954).

**Літаратура:**

Чэхаў Антон Паўлавіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 17. – Мінск, 2003. – С. 338-339.

Бердников, Г. А.П.Чехов / Георгий Бердников. – Ростов-на-Дону : Феникс, 1997. – 637с.

Вокруг Чехова : [воспоминания о А.П.Чехове и его окружении / сост. Е.М. Сахарова]. – Москва : Правда, 1990. – 656с.

Громов, М.П. Книга о Чехове / Михаил Петрович Громов. – Москва : Современник, 1989. – 384с. – ( Библиотека "Любителям российской словесности").

Камянов, В.И. Время против безвременья: Чехов и современность / В.И. Камянов. – Москва : Советский писатель, 1989. – 384с.

Рынкевич, В.П. Путешествие к дому с мезонином : [о А.П. Чехове] / В.П. Рынкевич. – Москва : Художественная литература, 1990. – 319с.

Капустин, Д. Главное путешествие Антона Чехова / Дмитрий Капустин// Вокруг света. – 2010. – № 4. – С. 150-158.

Волкович, Т.А. Личностно ориентированный подход к изучению пьесы А.П. Чехова "Вишневый сад". Х класс / Т.А. Волкович// Русский язык и литература. – 2010. – № 2. – С. 16-21.

Медведева, Н.П. Доктор Чехов. Материалы к изучению творчества А.П. Чехова / Н.П. Медведева// Русский язык и литература. – ( Серия "У дапамогу педагогу"). – 2010. – № 1. – С. 44-47.

Каражан, Е.Ф. Герои чеховских рассказов – герои дня сегодняшнего / Е.Ф. Каражан // Народная асвета. – 2009. – № 9. – С. 44-46.

# Шаўчэнка Тарас Рыгоравіч
# (1814 – 1861)

**Шаўчэнка Тарас Рыгоравіч** нарадзіўся 9.3.1814г. у в. Морынцы Звянігародскага раёна Чаркаскай вобласці, Украіна.

Украінскі пісьменнік, мастак, рэвалюцыянер-дэмакрат, заснавальнік новай украінскай літаратуры і нацыянальнай літаратурнай мовы.

Вучыўся ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў у К.Брулова (1838—1845). Як дваровы П.В.Энгельгарта жыў у Вільні (1829—1831), потым у Пецярбургу. У 1838 з дапамогай К. Брулова, В.Жукоўскага і інш. выкуплены з прыгону. З 1845 працаваў у Кіеўскай археаграфічнай камісіі. За ўдзел у тайным Кірыла-Мяфодзіеўскім таварыстве арыштаваны і аддадзены ў салдаты (1847—1857). Пасля ссылкі (з 1858) жыў у Пецярбургу. Прыхільнік рэвалюцыйнага шляху ліквідацыі прыгонніцтва, яднання славянскіх народаў у барацьбе за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

Пісаць пачаў каля 1836—1837. Выдаў зб. «Кабзар» (1840). Творы Шаўчэнкі прасякнуты любоўю да радзімы, напісаны народнай мовай, вызначаюцца блізкасцю да фальклору, разнастайнасцю рытмаў, меладычнасцю.

У ранняй яго творчасці (вершы, балады, паэмы «Кацярына», 1838, «Гайдамакі», 1841; драма «Назар Стадоля», 1843, і інш.) спалучэнне рамантызму з рэалістычнымі тэндэнцыямі. У паэме «Наймічка» (1845) стварыў яркі драматычны вобраз жанчыны-маці. У паэмах «Сон» (1844), «Каўказ», «Ератык» (абедзве 1845), «Неафіты» (1857), цыклах «У казематце» (1847), «Цары» (1848), паэзіі перыяду ссылкі, аповесцях «Княгіня» (1853), «Музыка» (1855) і інш. рэвалюцыйныя і антыпрыгонніцкія матывы. Аўтар паэм «Сляпая» (1842), «Князёўна» (1847), «Марына» (1848), «Юродзівы» (1857), «Марыя» (1859), балады «Сурочаная» (1837), трыпціха «Доля», «Муза», «Слава» (1858), аповесцей «Варнак» (1845), «Няшчасны», «Капітанша», «Блізняты» (усе 1855), «Мастак» (1856), «Прагулка з задавальненнем і не без маралі» (1856—1858). Многія вершы Шаўчэнкі сталі народнымі песнямі.

Шаўчэнка — заснавальнік рэалістычнага кірунку ва ўкраінскім выяўленчым мастацтве. Майстар партрэта, гістарычных і жанравых кампазіцый, ілюстрацый, натурных замалёвак, афортаў («Аўтапартрэт», 1840—1841; «Кацярына», 1842; серыя афортаў «Жывапісная Украіна», выд. 1844, і інш). За працы ў галіне гравюры атрымаў званне акадэміка (1860). Яго мастацкая спадчына прасякнута народнасцю, сацыяльнай накіраванасцю, гуманістычным пафасам.

З Беларуссю Шаўчэнка ўпершыню пазнаёміўся ў час паездкі ў ліку дваровых з Украіны ў Вільню (1829); ён праязджаў праз Беларусь з Пецярбурга на Украіну ў 1843, потым з Кіева ў Пецярбург у 1847. Быў знаёмы з польскім і беларускім мастаком Б.Залескім, літаратарамі Я.Баршчэўскім, Р.Друцкім-Падбярэскім, скульптарам М.Мікешыным. Цікавіўся беларускай літаратурай і фальклорам, успамінаў пра Беларусь у сваім «Дзённіку» (нап. 1857—1858). Пра жыццё прыгонных беларусаў пісаў у аповесці «Музыка». Многія творы Шаўчэнкі ўвайшлі ў беларускі фальклор, сталі народнымі песнямі. Яго паэзія паўплывала на творчасць Ф.Багушэвіча, А.Гурыновіча, Я.Лучыны і інш. Сувязям Шаўчэнкі з Беларуссю прысвечаны арт. «Тарас Шаўчэнка і беларусы» Р.Зямкевіча (1911). Паэтыку Шаўчэнкі даследаваў М.Багдановіч (арт. «Памяці Т.Р.Шаўчэнкі», «Краса і сіла: Спроба даследавання верша Т.Р.Шаўчэнкі», абодва 1914), перакладаў яго вершы на рускую мову.

Шаўчэнку прысвяцілі свае творы беларускія паэты (зб. «У вянок Т.Р.Шаўчэнку», 1939). Творчасць Шаўчэнкі даследавалі і даследуюць С.Александровіч, В.Івашын, А.Мальдзіс, Э.Мартынава. На беларускую мову яго творы пераклалі М.Аўрамчык, Р.Барадулін, П.Броўка, З.Бядуля, Н.Гілевіч, П.Глебка, С.Грахоўскі, С.Законнікаў, В.Зуёнак, М.Клімковіч, Я.Колас, К.Крапіва, А.Куляшоў, Я.Купала, Н.Мацяш, Я.Сіпакоў, Х.Чарнышэвіч.

У Мінску яго імем назван **бульвар** (1964), устаноўлены мемарыяльны знак (1976).

**Літаратура:**

ШаўчэнкаТарас Рыгоравіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 17. – Мінск, 2003. – С. 392.

Белецкий, А.И. Тарас Шевченко : книга для учителя / А.И. Белецкий. – Москва : Просвещение, 1989. – 144с.

Венок России Кобзарю : стихи российских поэтов о Т.Г.Шевченко / [составление и примечания В.Г.Крикуненко, Ю.А.Саенко]. – Москва : Советская Россия, 1989. – 319, [1]с., 1л. портр.

Кирилюк, Е.П. Тарас Шевченко: критико-биографический очерк / Е..П. Кирилюк. – Москва : Художественная литература, 1988. – 349с.

Мархель, У. Беларуска-польска-ўкраінскае судакрананне : духоўнае аблічча нацыі ў творах беларуска-польскіх паэтаў і Тараса Шаўчэнкі / Уладзімір Мархель // Роднае слова. – 2010. – № 4. – С. 9-13.

Шаладонава, Ж. Топасы нацыянальнай прасторы ў мастацкім свеце Якуба Коласа, Мікалая Гогаля, Тараса Шаўчэнкі / Жана Шаладонава // Роднае слова. – 2009. – № 10. – С. 18-21.

Марціновіч А. І Тарас Шаўчэнка, як родны брат... Браніслаў Залескі / Алесь Марціновіч // Хто мы, адкуль мы... : гістарычныя эсэ, нарысы / Алесь Марціновіч. – Мінск, 2008. – Кн. 2. – С. 151-169.

Шаладонава, Ж. "Гусляр" и "Гайдамаки" - свет в конце тоннеля : (духовно-нравственные приоритеты творчества Янки Купалы и Тараса Шевченко) / Жанна Шаладонава // Неман. – 2008. – № 1. – С. 132-138.

## Энгельс Фрыдрых
## (1820 – 1895)

**Энгельс (Engels) Фрыдрых** нарадзіўся 28.11.1820 г. у г. Бармен, Прусія, цяпер г. Вуперталь, Германія.

Дзеяч германскага і міжнароднага сацыялістычнага і рабочага руху; тэарэтык сацыялізму, адзін з заснавальнікаў марксізму. З сям'і фабрыканта. З 1834 вучыўся ў гімназіі ў г. Эльберфельд, у 1838 паехаў у Брэмен для наву-чання камерцыі, займаўся самаадукацыяй. У час адбывання вайсковай павіннасці (1841—1844) слухаў лекцыі ў Берлінскім універсітэце. У 1842 супрацоўнічаў у «Rheinische Zeitung» («Рэйнская газета»), рэдактарам якой быў К.Маркс. У 1842—1844 жыў у г. Манчэстэр, працаваў на фабрыцы, саўладальнікам якой быў яго бацька.

У светапоглядзе Энгельс прайшоў эвалюцыю ад захаплення філасофіяй Г.А. Гегеля і младагегельянцаў да антра-палагічнага матэрыялізму і атэізму Л.В.Ф.Феербаха, у палітычных поглядах праз рэвалюцыйны дэмакратызм прыйшоў да камунізму. Вывучаў сацыяльныя і палітычныя адносіны ў Вялікабрытаніі, напісаў «Накіды да крытыкі палітычнай эканоміі» (1843), дзе зрабіў выснову пра пераходны характар капіталістычнага спосабу вытворчасці, і 3 артыкулы «Становішча ў Англіі» (1844, апубл. ў 1845), дзе выказаў думку пра неабходнасць спалучэння сацыялізму з рабочым рухам. У сумеснай працы Энгельса і Маркса «Нямецкая ідэалогія» (1845— 1846) сфармулявана дыялектыка вытворчых адносін і прадукцыйных сіл, абгрунтавана матэрыялістычнае разумение гісторыі — гістарычны матэрыялізм. Яго праца «Прынцыпы камунізму» (1847) стала асновай «Маніфеста Камуністычнай партыі» (1848), напісанага Энгельсам і Марксам па даручэнні 2-га кангрэса Саюза камуністаў (1847). У час рэвалюцыі 1848—1849 у Германіі быў адным з рэдактараў «Neue Rheinische Zeitung» («Новая Рэйнская газета»), удзельнічаў ва ўзброеннам паўстанні. Пасля падаўлення рэвалюцыі эмігрыраваў у Швейцарыю, потым у Вялікабрытанію. У працах «Сялянская вайна ў Германіі» (1850) і «Рэвалюцыя і контр-рэвалюцыя ў Германіі» (1852), а таксама ў «Звароце Цэнтральнага Камітэта да Саюза

камуністаў» (1850, напісаны разам з Марксам) развіваў ідэі саюзу пралетарыяту і сялянства, узброеннага паўстання як мастацтва, бесперапыннай (перманентнай) рэвалюцыі. У 1850—1870 працаваў у гандлёвай канторы фірмы «Эрмен і Энгельс» у Манчэстэры. Матэрыяльна падтрымліваў Маркса, папулярызаваў яго творы, прымаў удзел у аргані-зацыі Міжнароднага таварыства рабочых (Інтэрнацыянала 1-га), быў членам яго Генеральнага савета, вёў ідэйную барацьбу з ласальянцамі, бакуністамі і пруданістамі. Надзённай неабходнасцю было прадыктавана з'яўленне яго вялікай працы «Пераварот у навуцы, зроблены панам Яўгенам Дзюрынгам» («Анты-Дзюрынг», 1876 — 1878); на аснове 3-й главы гэтай кнігі напісаў працу «Развіццё сацыялізму ад утопіі да навукі» (1880). Энгельс актыўна распрацоўваў пытанні гістарычнага матэрыялізму («Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы», 1884; «Людвіг Феербах і канец класічнай нямецкай філасофіі», 1886, і інш.). Ён лічыў, што гістарычны матэрыялізм ёсць найперш метад вывучэння гісторыі, пазнання грамадства, а «не рычаг для канструявання» (ліст да К.Шміта, 1890). Тэзіс аб мірным, у рамках закону, пераходзе да сацыялізму Энгельс абгрунтоўваў у працах «Развітальны ліст да чытачоў газеты «Sozialdemokrat» (1890), «Сацыялізм у Германіі» (1891 — 1892), «Сялянскае пытанне ў Францыі і Германіі» (1894), «Уводзіны да працы К.Маркса «Класавая барацьба ў Францыі з 1848 да 1850 г.» (1895) і інш. Пры аналізе праекта Эрфурцкай праграмы Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі (1891) Энгельс сцвярджаў, што Сацыял-дэмакрычная партыя Германіі і рабочы клас могуць прыйсці да палітычнага панавання «толькі пры такой палітычнай форме, як дэмакратычная рэспубліка», бо яна ўжо «з'яўляецца нават спецыфічнай формай дыктатуры пралетарыяту». Пры разглядзе вынікаў знешняй палітыкі Бісмарка («Роля насілля ў гісторыі», «Сацыялізм у Германіі» і інш.) Энгельс не выключаў, што ў будучай вайне Германія будзе «расціснута паміж французскім молатам і рускім кавадлам». У выпадку вайны з Расіяй і Францыяй, адзначаў Энгельс, германская сацыял-дэмакратыя можа прыйсці да ўлады «праз два-тры гады», аднак вайна можа прынесці і поўны разгром, таму абавязкам сацыялістаў з'яўляецца барацьба за мір. Ён лічыў, што насельніцтва Беларусі і Літвы «павінна само вызначыць свой лёс — зусім так, як эльзасцы павінны будуць выбіраць паміж Германіяй і Францыяй» і што інтэрнацыянальны рух пралетарыяту «наогул магчымы толькі ў асяроддзі самастойных нацый», «інтэрнацыянальнае супрацоўніцтва магчыма толькі паміж роўнымі». Праз год пасля смерці Энгельса на 4-м кангрэсе Інтэрнацыянала 2-га была прынята Рэзалюцыя аб праве нацый на самавызначэнне.

У Мінску яго імем названа **вуліца** (1922).

**Літаратура:**

Энгельс (Engels) Фрыдрых // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Т. 18. Кн. 1. – Мінск, 2004. – С. 124.

Кузнецов, Н.В. "От утопии - к науке" // Политические мыслители / [В.А.Бобков, И.Н.Браим, В.Л.Ефременко и др.].- Мн., 1997.- С.116-123.

( імёны)

## Ярмак Уладзімір Іванавіч (1924-1943)

**Ярмак Уладзімір Іванавіч** нарадзіўся 15.05.1924 у г. Мінск.

У Вялікую Айчынную вайну з кастр. 1942 на Ленінградскім фронце, радавы. Вызначыўся 19.07.1943 у час разведкі боем каля г.п. Сінявіна Кіраўскага р-на , дзе сваім целам закрыў амбразуру варожага дзота, што дапамагло групе разведчыкаў выканаць баявое заданне. Яго подзвіг увекавечаны ў мемарыяле “Сіняўскія вышыні”. Герой Савецкага Саюза (1944).

**Вуліца** Цэнтральнага раёна Мінска атрымала імя У.І. Ярмака ў 2004.

**Літаратура:**

Ярмак Уладзімір Іванавіч // Энцыклапедыя гісторыя Беларусі: У 6 т. – Т. 6. - Мн., 2003. - С. 304.

Ярмак Уладзімір Іванавіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941-1945: Энцыкл. - Мн., 1990. - С. 650.

Ермак Владимир Иванович // Герои Советского Союза: Краткий биогр. слов.: В 2 т. – Т. 1 - М., 1987. - С. 483.

(імёны)